# КРЫМІНАЛЬНЫ КОДЭКС РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
9 ліпеня 1999 г. № 275-З

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 2 чэрвеня 1999 года*
*Адобраны Саветам Рэспублікі 24 чэрвеня 1999 года*

Змяненні і дапаўненні:
Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 мая 2002 г. № 98-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2002 г., № 55, 2/847) <Н10200098>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 24 чэрвеня 2002 г. № 112-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2002 г., № 75, 2/861) <Н10200112>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2003 г. № 173-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 8, 2/922) <Н10300173>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 14 ліпеня 2003 г. № 220-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 80, 2/969) <Н10300220>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 22 ліпеня 2003 г. № 227-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 83, 2/974) <Н10300227>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 3 жніўня 2004 г. № 309-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2004 г., № 123, 2/1058) <Н10400309>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 мая 2005 г. № 13-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2005 г., № 73, 2/1110) <Н10500013>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 мая 2005 г. № 15-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2005 г., № 74, 2/1112) <Н10500015>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 19 ліпеня 2005 г. № 37-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2005 г., № 120, 2/1134) <Н10500037>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 19 ліпеня 2005 г. № 40-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2005 г., № 121, 2/1137) <Н10500040>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 19 ліпеня 2005 г. № 42-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2005 г., № 121, 2/1139) <Н10500042>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 19 ліпеня 2005 г. № 43-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2005 г., № 121, 2/1140) <Н10500043>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 снежня 2005 г. № 71-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 1, 2/1168) <Н10500071>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 31 снежня 2005 г. № 82-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 6, 2/1179) <Н10500082>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 г. № 97-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 9, 2/1194) <Н10600097>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 чэрвеня 2006 г. № 122-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 92, 2/1219) <Н10600122> – Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 18 верасня 2006 г.;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 29 чэрвеня 2006 г. № 137-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 107, 2/1235) <Н10600137>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2006 г. № 146-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 112, 2/1244) <Н10600146>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2006 г. № 147-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 111, 2/1242) <Н10600147>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 20 ліпеня 2006 г. № 162-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 122, 2/1259) <Н10600162>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 7 мая 2007 г. № 209-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 118, 2/1306) <Н10700209> – Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 16 чэрвеня 2007 г.;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 7 мая 2007 г. № 212-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 118, 2/1309) <H10700212>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 мая 2007 г. № 223-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 119, 2/1319) <H10700223>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 мая 2007 г. № 228-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 120, 2/1325) <H10700228>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 18 мая 2007 г. № 231-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 123, 2/1328) <H10700231>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 27 чэрвеня 2007 г. № 246-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 160, 2/1343) <H10700246>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2007 г. № 264-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 173, 2/1361) <H10700264>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2007 г. № 266-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 173, 2/1363) <H10700266>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 20 ліпеня 2007 г. № 274-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 175, 2/1371) <H10700274>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 3 снежня 2007 г. № 288-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 291, 2/1385) <H10700288>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 20 снежня 2007 г. № 291-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 1, 2/1388) <H10700291> – Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 4 красавіка 2008 г.;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 20 снежня 2007 г. № 297-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 1, 2/1394) <H10700297>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2008 г. № 315-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 14, 2/1412) <H10800315>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 23 чэрвеня 2008 г. № 354-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 158, 2/1451) <H10800354> – Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 3 ліпеня 2009 г.;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 ліпеня 2008 г. № 367-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 170, 2/1464) <H10800367>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2008 г. № 397-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 175, 2/1494) <H10800397> – Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 1 студзеня 2009 г.;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2008 г. № 411-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 184, 2/1508) <H10800411> – Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 5 верасня 2008 г.;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 21 ліпеня 2008 г. № 417-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 184, 2/1514) <H10800417>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 лістапада 2008 г. № 451-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2008 г., № 277, 2/1547) <H10800451>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 2009 г. № 26-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2009 г., № 148, 2/1578) <H10900026> – Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 3 ліпеня 2009 г.;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2009 г. № 42-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2009 г., № 173, 2/1594) <H10900042>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2009 г. № 98-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 16, 2/1651) <H10900098>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 мая 2010 г. № 123-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 120, 2/1675) <H11000123> – Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 22 жніўня 2010 г.;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2010 г. № 146-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 162, 2/1701) <H11000146>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2010 г. № 166-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2010 г., № 183, 2/1718) <H11000166>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 2010 г. № 223-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 4, 2/1775) <H11000223>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 3 ліпеня 2011 г. № 282-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 78, 2/1834) <H11100282>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 лістапада 2011 г. № 309-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 127, 2/1861) <H11100309>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 25 лістапада 2011 г. № 318-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 134, 2/1870) <H11100318>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 25 лістапада 2011 г. № 322-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 134, 2/1874) <H11100322> – Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 6 чэрвеня 2012 г.;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 снежня 2011 г. № 325-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2011 г., № 140, 2/1877) <H11100325>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 7 студзеня 2012 г. № 349-З (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2012 г., № 10, 2/1901) <H11200349> – Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 25 ліпеня 2012 г.;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 ліпеня 2012 г. № 408-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 19.07.2012, 2/1960) <H11200408> – Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 20 кастрычніка 2012 г.;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 13 ліпеня 2012 г. № 409-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 19.07.2012, 2/1961) <H11200409> – Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 30 ліпеня 2012 г.;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 кастрычніка 2012 г. № 435-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 01.11.2012, 2/1987) <H11200435>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 12 ліпеня 2013 г. № 60-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 23.07.2013, 2/2058) <H11300060>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 чэрвеня 2014 г. № 165-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 03.07.2014, 2/2163) <H11400165> – Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 4 студзеня 2015 г.;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 24 кастрычніка 2014 г. № 197-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 06.11.2014, 2/2195) <H11400197>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2015 г. № 241-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 17.01.2015, 2/2239) <H11500241>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 студзеня 2015 г. № 242-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 22.01.2015, 2/2240) <H11500242> – Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 23 ліпеня 2015 г.;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 29 студзеня 2015 г. № 245-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 03.02.2015, 2/2243) <H11500245>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 красавіка 2015 г. № 256-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 01.05.2015, 2/2254) <H11500256>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 4 чэрвеня 2015 г. № 277-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 11.06.2015, 2/2275) <H11500277> – Закон Рэспублікі Беларусь уступае ў сілу 1 ліпеня 2016 г.;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2015 г. № 305-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 23.07.2015, 2/2303) <H11500305>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 студзеня 2016 г. № 356-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 26.01.2016, 2/2354) <H11600356>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 20 красавіка 2016 г. № 358-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 22.04.2016, 2/2356) <H11600358>;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 19 ліпеня 2016 г. № 407-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 22.07.2016, 2/2403) <H11600407> – унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 23 жніўня 2016 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 1 ліпеня 2017 г.;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 19 ліпеня 2016 г. № 407-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 22.07.2016, 2/2403) <H11600407> – унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 23 жніўня 2016 г. і 1 ліпеня 2017 г.;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2017 г. № 53-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 05.08.2017, 2/2491) <H11700053>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2018 г. № 131-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 28.07.2018, 2/2569) <H11800131>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2019 г. № 171-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 18.01.2019, 2/2609) <H11900171>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2019 г. № 220-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 26.07.2019, 2/2659) <H11900220> – унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 27 кастрычніка 2019 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 1 лютага 2020 г.;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2019 г. № 220-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 26.07.2019, 2/2659) <H11900220> – унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 27 кастрычніка 2019 г. і 1 лютага 2020 г.;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 11 лістапада 2019 г. № 253-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 23.11.2019, 2/2691) <H11900253>;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 2021 г. № 85-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 13.01.2021, 2/2805) <H12100085> – унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 сакавіка 2021 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 14 красавіка 2021 г.;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 2021 г. № 85-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 13.01.2021, 2/2805) <H12100085> – унесены змяненні і дапаўненні, якія ўступілі ў сілу 1 сакавіка 2021 г. і 14 красавіка 2021 г.;
Закон Рэспублікі Беларусь ад 26 мая 2021 г. № 112-З (Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 08.06.2021, 2/2832) <H12100112> – унесены змяненні і дапаўненні, што ўступілі ў сілу 19 чэрвеня 2021 г., за выключэннем змяненняў і дапаўненняў, якія ўступяць у сілу 9 верасня 2021 г.

ЗМЕСТ

АГУЛЬНАЯ ЧАСТКА
РАЗДЗЕЛ I. КРЫМІНАЛЬНЫ ЗАКОН
ГЛАВА 1. Агульныя палажэнні
Артыкул 1. Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь
Артыкул 2. Задачы Крымінальнага кодэкса
Артыкул 3. Прынцыпы крымінальнага закона і крымінальнай адказнасці
Артыкул 4. Растлумачэнне асобных тэрмінаў Крымінальнага кодэкса
ГЛАВА 2. Дзеянне крымінальнага закона ў прасторы і ў часе
Артыкул 5. Дзеянне гэтага Кодэкса ў дачыненні да асоб, якія ўчынілі злачынствы на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь
Артыкул 6. Дзеянне гэтага Кодэкса ў дачыненні да асоб, якія ўчынілі злачынства па-за межамі Рэспублікі Беларусь
Артыкул 7. Выдача асобы, якая ўчыніла злачынства
Артыкул 8. Прэюдыцыяльнае значэнне здзяйснення злачынства на тэрыторыі замежнай дзяржавы
Артыкул 9. Дзеянне крымінальнага закона ў часе
РАЗДЗЕЛ II. ПАДСТАВЫ І ЎМОВЫ КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ

ГЛАВА 3. Злачыннае дзеянне
Артыкул 10. Злачынства як падстава крымінальнай адказнасці
Артыкул 11. Паняцце злачынства
Артыкул 12. Катэгорыі злачынстваў
Артыкул 13. Прыгатаванне да злачынства
Артыкул 14. Замах на злачынства
Артыкул 15. Добраахвотная адмова ад злачынства
Артыкул 16. Саўдзел у злачынстве
Артыкул 17. Здзяйсненне злачынства групай
Артыкул 18. Арганізаваная група
Артыкул 19. Злачынная арганізацыя
Артыкул 20. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці ўдзельніка злачыннай арганізацыі або банды
ГЛАВА 4. Віна
Артыкул 21. Віна і яе формы
Артыкул 22. Здзяйсненне злачынства наўмысна
Артыкул 23. Здзяйсненне злачынства з-за неасцярожнасці
Артыкул 24. Віна ў злачынстве, не звязаным з надыходам наступстваў
Артыкул 25. Спалучэнне намеру і неасцярожнасці пры здзяйсненні злачынства (складаная віна)
Артыкул 26. Невінаватае прычыненне шкоды (выпадак)
ГЛАВА 5. Умовы крымінальнай адказнасці
Артыкул 27. Узрост, з якога надыходзіць крымінальная адказнасць
Артыкул 28. Стан поўнай адсутнасці свядомасці
Артыкул 29. Паменшаная наяўнасць свядомасці
Артыкул 30. Крымінальная адказнасць асобы, якая ўчыніла злачынства ў стане ап'янення
Артыкул 31. Здзяйсненне дзеяння ў стане афекту
Артыкул 32. Адміністрацыйная або дысцыплінарная прэюдыцыя
Артыкул 33. Дзеянні, якія цягнуць за сабой крымінальную адказнасць па патрабаванні
ГЛАВА 6. Абставіны, якія выключаюць злачыннасць дзеяння
Артыкул 34. Неабходная абарона
Артыкул 35. Прычыненне шкоды пры затрыманні асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне
Артыкул 36. Крайняя неабходнасць
Артыкул 37. Памылка ў наяўнасці абставін, якія выключаюць злачыннасць дзеяння
Артыкул 38. Знаходжанне сярод саўдзельнікаў злачынства па спецыяльным заданні
Артыкул 39. Дзеянне, звязанае з рызыкай
Артыкул 40. Выкананне загада або распараджэння
ГЛАВА 7. Множнасць злачынстваў
Артыкул 41. Выключаны
Артыкул 42. Сукупнасць злачынстваў
Артыкул 43. Рэцыдыў злачынстваў
РАЗДЗЕЛ III. КРЫМІНАЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ
ГЛАВА 8. Агульныя палажэнні аб крымінальнай адказнасці
Артыкул 44. Крымінальная адказнасць і яе мэты
Артыкул 45. Судзімасць
Артыкул 46. Рэалізацыя крымінальнай адказнасці
Артыкул $46^1$. Спецыяльная канфіскацыя
ГЛАВА 9. Пакаранне і яго віды
Артыкул 47. Паняцце пакарання
Артыкул 48. Віды пакаранняў
Артыкул 49. Грамадскія працы
Артыкул 50. Штраф

Артыкул 51. Пазбаўленне права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю
Артыкул 52. Папраўчыя працы
Артыкул 53. Абмежаванне па ваеннай службе
Артыкул 54. Арышт
Артыкул 55. Абмежаванне волі
Артыкул 56. Выключаны
Артыкул 57. Пазбаўленне волі на пэўны тэрмін
Артыкул 58. Пажыццёвае пазбаўленне волі
Артыкул 59. Пакаранне смерцю
Артыкул 60. Пазбаўленне воінскага або спецыяльнага звання
Артыкул 61. Выключаны
ГЛАВА 10. Прызначэнне пакарання
Артыкул 62. Агульныя прынцыпы прызначэння пакарання
Артыкул 63. Абставіны, якія змякчаюць адказнасць
Артыкул 64. Абставіны, якія абцяжваюць адказнасць
Артыкул 65. Прызначэнне пакарання пры рэцыдыве злачынстваў
Артыкул 66. Прызначэнне пакарання за злачынства, учыненае ў саўдзеле
Артыкул 67. Прызначэнне пакарання за няскончанае злачынства
Артыкул 68. Выключаны
Артыкул 69. Прызначэнне пакарання пры наяўнасці змякчальных абставін
Артыкул 69[1]. Прызначэнне пакарання ў выпадку заключэння дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве
Артыкул 70. Прызначэнне больш мяккага пакарання, чым прадугледжана за дадзенае злачынства
Артыкул 71. Выключаны
Артыкул 72. Прызначэнне пакарання па сукупнасці злачынстваў
Артыкул 73. Прызначэнне пакарання па сукупнасці прыгавораў
Артыкул 74. Правілы складання пакаранняў
Артыкул 75. Правілы заліку тэрмінаў утрымання пад вартай і дамашняга арышту
Артыкул 76. Падлік тэрмінаў пакарання
ГЛАВА 11. Іншыя меры крымінальнай адказнасці
Артыкул 77. Асуджэнне з адтэрміноўкай выканання пакарання
Артыкул 78. Асуджэнне з умоўным непрымяненнем пакарання
Артыкул 79. Асуджэнне без прызначэння пакарання
Артыкул 80. Прэвентыўны нагляд
Артыкул 81. Прафілактычнае назіранне за асуджаным
ГЛАВА 12. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці і пакарання
Артыкул 82. Агульныя палажэнні аб вызваленні ад крымінальнай адказнасці і пакарання
Артыкул 83. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці ў сувязі са сканчэннем тэрмінаў даўнасці
Артыкул 84. Вызваленне ад пакарання ў сувязі са сканчэннем тэрмінаў даўнасці выканання абвінаваўчага прыгавору
Артыкул 85. Непрымяненне тэрмінаў даўнасці
Артыкул 86. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці з прыцягненнем асобы да адміністрацыйнай адказнасці
Артыкул 86[1]. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці з прымяненнем правіл Дысцыплінарнага статута Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь
Артыкул 87. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці ў выніку страты дзеяннем або асобай грамадскай небяспекі
Артыкул 88. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці ў сувязі з дзейным раскаяннем
Артыкул 88[1]. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці ў сувязі з добраахвотнымі пакрыццём прычыненага ўрону (шкоды), выплатай даходу, атрыманага злачынным шляхам
Артыкул 89. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці ў сувязі з прымірэннем з пацярпелым

Артыкул 90. Умоўна-датэрміновае вызваленне ад пакарання
Артыкул 91. Замена неадбытай часткі пакарання больш мяккім
Артыкул 92. Вызваленне ад пакарання або замена пакарання больш мяккім з-за захворвання
Артыкул 93. Адтэрміноўка адбывання пакарання цяжарным жанчынам і жанчынам, якія маюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў
Артыкул 94. Вызваленне ад пакарання з прычыны надзвычайных абставін
Артыкул 95. Амністыя
Артыкул 96. Памілаванне
ГЛАВА 13. Пагашэнне і зняцце судзімасці
Артыкул 97. Пагашэнне судзімасці
Артыкул 98. Зняцце судзімасці
Артыкул 99. Прававое значэнне пагашэння і зняцця судзімасці
РАЗДЗЕЛ IV. ПРЫМУСОВЫЯ МЕРЫ БЯСПЕКІ І ЛЯЧЭННЯ
ГЛАВА 14. Прымусовыя меры бяспекі і лячэння
Артыкул 100. Мэты прымянення прымусовых мер бяспекі і лячэння
Артыкул 101. Прымусовыя меры бяспекі і лячэння, што прымяняюцца да асоб, якія хварэюць на псіхічныя расстройствы (захворванні)
Артыкул 102. Падставы прызначэння прымусовых мер бяспекі і лячэння
Артыкул 103. Змяненне і спыненне прымянення прымусовых мер бяспекі і лячэння
Артыкул 104. Прыцягненне да крымінальнай адказнасці або да адбывання пакарання пасля прымянення прымусовых мер бяспекі і лячэння
Артыкул 105. Залік часу прымянення прымусовых мер бяспекі і лячэння
Артыкул 106. Прымяненне прымусовых мер бяспекі і лячэння ў дачыненні да асоб з паменшанай наяўнасцю свядомасці
Артыкул 107. Прымяненне прымусовых мер бяспекі і лячэння да асоб, якія хварэюць на хранічны алкагалізм, наркаманію або таксікаманію
РАЗДЗЕЛ V. АСАБЛІВАСЦІ КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ АСОБ, ЯКІЯ ЎЧЫНІЛІ ЗЛАЧЫНСТВА ВА ЎЗРОСЦЕ ДА ВАСЯМНАЦЦАЦІ ГАДОЎ
ГЛАВА 15. Пакаранне і яго прызначэнне асобам, якія ўчынілі злачынства ва ўзросце да васямнаццаці гадоў
Артыкул 108. Крымінальная адказнасць непаўналетніх
Артыкул 109. Віды пакаранняў
Артыкул 110. Грамадскія працы
Артыкул 111. Штраф
Артыкул 112. Пазбаўленне права займацца пэўнай дзейнасцю
Артыкул 113. Папраўчыя працы
Артыкул 114. Арышт
Артыкул $114^1$. Абмежаванне волі
Артыкул 115. Пазбаўленне волі
Артыкул 116. Прызначэнне пакарання
Артыкул 117. Асуджэнне непаўналетняга з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару
ГЛАВА 16. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці і пакарання асоб, якія ўчынілі злачынства ва ўзросце да васямнаццаці гадоў
Артыкул 118. Вызваленне непаўналетняга ад крымінальнай адказнасці
Артыкул 119. Умоўна-датэрміновае вызваленне ад пакарання
Артыкул 120. Замена неадбытай часткі пакарання больш мяккім
Артыкул 121. Пагашэнне судзімасці
АСАБЛІВАЯ ЧАСТКА
РАЗДЗЕЛ VI. ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ МІРУ, БЯСПЕКІ ЧАЛАВЕЦТВА І ВАЕННЫЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ
ГЛАВА 17. Злачынствы супраць міру і бяспекі чалавецтва

Артыкул 122. Падрыхтоўка або вядзенне агрэсіўнай вайны
Артыкул 123. Прапаганда вайны
Артыкул 124. Акт тэрарызму ў дачыненні да прадстаўніка замежнай дзяржавы або міжнароднай арганізацыі
Артыкул 125. Напад на ўстановы, якія карыстаюцца міжнароднай абаронай
Артыкул 126. Акт міжнароднага тэрарызму
Артыкул 127. Генацыд
Артыкул 128. Злачынствы супраць бяспекі чалавецтва
Артыкул 129. Вытворчасць, назапашванне або распаўсюджванне забароненых сродкаў вядзення вайны
Артыкул 130. Распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай або іншай сацыяльнай варожасці ці звады
Артыкул 130[1]. Рэабілітацыя нацызму
Артыкул 131. Экацыд
ГЛАВА 18. Ваенныя злачынствы і іншыя парушэнні законаў і звычаяў вядзення вайны
Артыкул 132. Вярбоўка, навучанне, фінансаванне і выкарыстанне наёмнікаў
Артыкул 133. Наёмніцтва
Артыкул 134. Прымяненне зброі масавага паражэння
Артыкул 135. Парушэнне законаў і звычаяў вайны
Артыкул 136. Злачынныя парушэнні норм міжнароднага гуманітарнага права падчас узброеных канфліктаў
Артыкул 137. Бяздзейнасць або адданне злачыннага загаду падчас узброенага канфлікту
Артыкул 138. Незаконнае карыстанне знакамі, якія ахоўваюцца міжнароднымі дагаворамі
РАЗДЗЕЛ VII. ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ЧАЛАВЕКА
ГЛАВА 19. Злачынствы супраць жыцця і здароўя
Артыкул 139. Забойства
Артыкул 140. Забойства маці нованароджанага дзіцяці
Артыкул 141. Забойства, учыненае ў стане афекту
Артыкул 142. Забойства пры перавышэнні мер, неабходных для затрымання асобы, якая ўчыніла злачынства
Артыкул 143. Забойства пры перавышэнні межаў неабходнай абароны
Артыкул 144. Прычыненне смерці з-за неасцярожнасці
Артыкул 145. Давядзенне да самагубства
Артыкул 146. Схіленне да самагубства
Артыкул 147. Наўмыснае прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання
Артыкул 148. Наўмыснае пазбаўленне прафесійнай працаздольнасці
Артыкул 149. Наўмыснае прычыненне менш цяжкага цялеснага пашкоджання
Артыкул 150. Наўмыснае прычыненне цяжкага або менш цяжкага цялеснага пашкоджання ў стане афекту
Артыкул 151. Наўмыснае прычыненне цяжкага або менш цяжкага цялеснага пашкоджання пры перавышэнні мер, неабходных для затрымання асобы, якая ўчыніла злачынства
Артыкул 152. Наўмыснае прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання пры перавышэнні межаў неабходнай абароны
Артыкул 153. Наўмыснае прычыненне лёгкага цялеснага пашкоджання
Артыкул 154. Катаванне
Артыкул 155. Прычыненне цяжкага або менш цяжкага цялеснага пашкоджання з-за неасцярожнасці
Артыкул 156. Незаконнае правядзенне аборту
Артыкул 157. Заражэнне вірусам імунадэфіцыту чалавека
Артыкул 158. Заражэнне венерычным захворваннем
Артыкул 159. Пакіданне ў небяспецы
Артыкул 160. Неаказанне капітанам судна дапамогі асобам, якія церпяць бедства

Артыкул 161. Неаказанне медыцынскай дапамогі хворай асобе
Артыкул 162. Неналежнае выкананне прафесійных абавязкаў медыцынскім работнікам
Артыкул 163. Прымус да дачы органаў або тканак для трансплантацыі
Артыкул 164. Парушэнне ўмоў і парадку забору або трансплантацыі органаў ці тканак чалавека
Артыкул 165. Невыкананне або неналежнае выкананне абавязкаў для загарантавання бяспекі жыцця і здароўя малалетняга
ГЛАВА 20. Злачынствы супраць палавой недатыкальнасці або палавой свабоды
Артыкул 166. Згвалтаванне
Артыкул 167. Гвалтоўныя дзеянні сексуальнага характару
Артыкул 168. Палавыя зносіны і іншыя дзеянні сексуальнага характару з асобай, якая не дасягнула шаснаццацігадовага ўзросту
Артыкул 169. Распусныя дзеянні
Артыкул 170. Прымус да дзеянняў сексуальнага характару
Артыкул 171. Арганізацыя і (або) выкарыстанне займання прастытуцыяй або стварэнне ўмоў для займання прастытуцыяй
Артыкул 171[1]. Уцягненне ў займанне прастытуцыяй або прымус да працягу займання прастытуцыяй
ГЛАВА 21. Злачынствы супраць укладу сямейных адносін і інтарэсаў непаўналетніх
Артыкул 172. Уцягненне непаўналетняга ва ўчыненне злачынства
Артыкул 173. Уцягненне непаўналетняга ў антыграмадскія паводзіны
Артыкул 174. Ухіленне бацькоў ад утрымання дзяцей або ад пакрыцця выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца або знаходзіліся на дзяржаўным забеспячэнні
Артыкул 175. Ухіленне дзяцей ад утрымання бацькоў
Артыкул 176. Злоўжыванне правамі апекуна або папячыцеля
Артыкул 177. Выдаванне тайны ўсынаўлення (удачарэння)
Артыкул 177[1]. Незаконныя дзеянні па ўсынаўленні (удачарэнні) дзяцей
Артыкул 178. Выдаванне ўрачэбнай тайны
Артыкул 179. Выключаны
Артыкул 180. Наўмысная падмена дзіцяці
ГЛАВА 22. Злачынствы супраць асабістай свабоды, гонару і годнасці
Артыкул 181. Гандаль людзьмі
Артыкул 181[1]. Выкарыстанне рабскай працы
Артыкул 182. Выкраданне чалавека
Артыкул 183. Незаконнае пазбаўленне волі
Артыкул 184. Незаконнае змяшчэнне ў псіхіятрычны стацыянар
Артыкул 185. Прымус
Артыкул 186. Пагроза забойствам, прычыненнем цяжкіх цялесных пашкоджанняў або знішчэннем маёмасці
Артыкул 187. Незаконныя дзеянні, накіраваныя на працаўладкаванне грамадзян за мяжой
Артыкул 188. Паклёп
Артыкул 189. Выключаны
ГЛАВА 23. Злачынствы супраць канстытуцыйных праў і свабод чалавека і грамадзяніна
Артыкул 190. Парушэнне раўнапраўя грамадзян
Артыкул 191. Перашкаджэнне ажыццяўленню выбарчых праў, права на ўдзел у рэферэндуме, або рэалізацыі права заканадаўчай ініцыятывы грамадзян, або працы Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, выбарчых камісій, камісій па рэферэндуме, камісій па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата
Артыкул 192. Парушэнне заканадаўства аб выбарах, рэферэндуме, аб адкліканні дэпутата і аб рэалізацыі права заканадаўчай ініцыятывы грамадзян
Артыкул 193. Арганізацыя або кіраўніцтва грамадскім аб'яднаннем, рэлігійнай арганізацыяй, якія замахваюцца на асобу, правы і абавязкі грамадзян
Артыкул 194. Перашкаджэнне законнай дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў

Артыкул 195. Перашкаджэнне законнай дзейнасці рэлігійных арганізацый
Артыкул 196. Перашкаджэнне правядзенню сходу, мітынгу, дэманстрацыі, шэсця, пікетавання або ўдзелу ў іх
Артыкул 197. Праследаванне грамадзян за крытыку
Артыкул 198. Перашкаджэнне законнай прафесійнай дзейнасці журналіста
Артыкул 198[1]. Парушэнне заканадаўства аб сродках масавай інфармацыі
Артыкул 199. Парушэнне заканадаўства аб працы
Артыкул 200. Прымус да забастоўкі або да адмовы ад удзелу ў ёй
Артыкул 201. Парушэнне аўтарскага права, сумежных праў і права прамысловай уласнасці
Артыкул 202. Парушэнне недатыкальнасці жылля і іншых законных валоданняў грамадзян
Артыкул 203. Парушэнне тайны перапіскі, тэлефонных перагавораў, тэлеграфных або іншых паведамленняў
Артыкул 203[1]. Незаконныя дзеянні ў дачыненні да інфармацыі аб прыватным жыцці і персанальных даных
Артыкул 203[2]. Незахаванне мер забеспячэння абароны персанальных даных
Артыкул 204. Адмова ў даванні грамадзяніну інфармацыі
РАЗДЗЕЛ VIII. ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ УЛАСНАСЦІ І ПАРАДКУ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ ЭКАНАМІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ
ГЛАВА 24. Злачынствы супраць уласнасці
Артыкул 205. Крадзеж
Артыкул 206. Рабаванне
Артыкул 207. Разбой
Артыкул 208. Вымаганне
Артыкул 209. Махлярства
Артыкул 210. Раскраданне шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі
Артыкул 211. Прысваенне або растрата
Артыкул 212. Раскраданне маёмасці шляхам мадыфікацыі камп'ютарнай інфармацыі
Артыкул 213. Выключаны
Артыкул 214. Угон транспартнага сродку або маламернага судна
Артыкул 215. Прысваенне знойдзенай маёмасці
Артыкул 216. Прычыненне маёмаснага ўрону без прыкмет выкрадання
Артыкул 217. Незаконнае адчужэнне даверанай маёмасці
Артыкул 218. Наўмысныя знішчэнне або пашкоджанне чужой маёмасці
Артыкул 219. Знішчэнне або пашкоджанне чужой маёмасці з-за неасцярожнасці
Артыкул 220. Выключаны
ГЛАВА 25. Злачынствы супраць парадку ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці
Артыкул 221. Выраб, захоўванне або збыт падробленых грошай ці каштоўных папер
Артыкул 222. Незаконнае абарачэнне сродкаў плацяжу і (або) інструментаў
Артыкул 223. Парушэнне правіл аб здзелках з каштоўнымі металамі і (або) каштоўнымі камянямі
Артыкул 224. Выключаны
Артыкул 225. Невяртанне з-за мяжы грашовых сродкаў
Артыкул 226. Незаконны выпуск (эмісія) каштоўных папер
Артыкул 226[1]. Незаконныя выкарыстанне або выдаванне звестак, унесеных у рэестр уладальнікаў каштоўных папер, або інфармацыі аб выніках фінансава-гаспадарчай дзейнасці эмітэнта каштоўных папер
Артыкул 226[2]. Незаконныя дзеянні з простымі і (або) пераводнымі вэксалямі
Артыкул 226[3]. Маніпуляванне рынкам каштоўных папер
Артыкул 227. Падлог рашэння аб выпуску або праспекта эмісіі каштоўных папер
Артыкул 228. Кантрабанда
Артыкул 228[1]. Незаконнае перамяшчэнне тавараў праз мытную мяжу

Артыкул 229. Незаконныя экспарт або перадача ў мэтах экспарту аб'ектаў экспартнага кантролю
Артыкул 230. Невяртанне на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь гісторыка-культурных каштоўнасцей
Артыкул 231. Ухіленне ад выплаты плацяжоў, якія спаганяюцца мытнымі органамі
Артыкул 232. Выключаны
Артыкул 233. Прадпрымальніцкая дзейнасць, якая ажыццяўляецца без спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі)
Артыкул 234. Выключаны
Артыкул 235. Легалізацыя («адмыванне») сродкаў, атрыманых злачынным шляхам
Артыкул 236. Набыццё або збыт матэрыяльных каштоўнасцей, заведама здабытых злачынным шляхам
Артыкул 237. Незаконнае атрыманне крэдыту або субсідыі
Артыкул 238. Фальшывая эканамічная неплацежаздольнасць (банкруцтва)
Артыкул 239. Скрыванне эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтва)
Артыкул 240. Наўмысная эканамічная неплацежаздольнасць (банкруцтва)
Артыкул 241. Перашкаджэнне пакрыццю страт крэдытору (крэдыторам)
Артыкул 242. Ухіленне ад пагашэння крэдыторскай запазычанасці
Артыкул 243. Ухіленне ад выплаты падаткаў, збораў
Артыкул $243^1$. Ухіленне ад выканання абавязкаў падатковага агента па пералічэнні падаткаў, збораў
Артыкул $243^2$. Падатковае махлярства
Артыкул $243^3$. Ухіленне ад выплаты страхавых узносаў
Артыкул 244. Выключаны
Артыкул 245. Устанаўленне або падтрыманне манапольных цэн
Артыкул 246. Прымус да здзяйснення здзелкі або да адмовы ад яе здзяйснення
Артыкул 247. Выключаны
Артыкул 248. Выключаны
Артыкул 249. Выключаны
Артыкул 250. Распаўсюджванне лжывай інфармацыі аб таварах і паслугах
Артыкул 251. Зрыў публічных таргоў
Артыкул 252. Камерцыйны подкуп
Артыкул 253. Подкуп удзельнікаў і арганізатараў спартыўных спаборніцтваў або відовішчных камерцыйных конкурсаў
Артыкул 254. Камерцыйны шпіянаж
Артыкул 255. Выдаванне камерцыйнай тайны
Артыкул 256. Выключаны
Артыкул 257. Выключаны
Артыкул 258. Незаконныя выраб, выкарыстанне або збыт дзяржаўных прабірных клеймаў
Артыкул 259. Выключаны
Артыкул 260. Выключаны
Артыкул 261. Выключаны
Артыкул $261^1$. Выраб, збыт або выкарыстанне падробленых акцызных марак Рэспублікі Беларусь
Артыкул 262. Выключаны
РАЗДЗЕЛ IX. ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ЭКАЛАГІЧНАЙ БЯСПЕКІ, НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ І ПАРАДКУ ПРЫРОДАКАРЫСТАННЯ
ГЛАВА 26. Злачынствы супраць экалагічнай бяспекі, навакольнага асяроддзя і парадку прыродакарыстання
Артыкул 263. Наўмысныя знішчэнне або пашкоджанне каштоўных прыродных комплексаў або аб'ектаў прыродных тэрыторый, якія асабліва ахоўваюцца

Артыкул 264. Парушэнне рэжыму аховы і выкарыстання прыродных тэрыторый, якія асабліва ахоўваюцца
Артыкул 265. Парушэнне патрабаванняў экалагічнай бяспекі
Артыкул 266. Прыёмка ў эксплуатацыю аб'ектаў, пры будаўніцтве якіх заведама не захаваны патрабаванні экалагічнай бяспекі
Артыкул 267. Непрынятце мер для ліквідацыі наступстваў парушэнняў заканадаўства аб ахове навакольнага асяроддзя і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў
Артыкул 268. Скрыванне або наўмыснае скажэнне звестак аб забруджванні навакольнага асяроддзя
Артыкул 269. Пашкоджанне зямель
Артыкул 270. Знішчэнне або пашкоджанне тарфянікаў
Артыкул 271. Парушэнне правіл аховы нетраў
Артыкул 272. Забруджванне або засмечванне вод
Артыкул 273. Выключаны
Артыкул 274. Забруджванне атмасфернага паветра
Артыкул 275. Забруджванне лесу, асяроддзя вырастання драўнінна-хмызняковай расліннасці
Артыкул 276. Знішчэнне або пашкоджанне лесу, драўнінна-хмызняковай расліннасці з-за неасцярожнасці
Артыкул 277. Незаконная высечка, незаконныя знішчэнне, выдаленне, адабранне або пашкоджанне драўнінна-хмызняковай расліннасці
Артыкул 278. Парушэнне правіл бяспекі пры абыходжанні з генна-інжынернымі арганізмамі, біялагічнымі або хімічнымі рэчывамі
Артыкул 279. Парушэнне правіл бяспекі пры абыходжанні з мікрабіялагічнымі, іншымі біялагічнымі агентамі або таксінамі
Артыкул 280. Парушэнне правіл, устаноўленых для барацьбы з пустазеллем, хваробамі і шкоднікамі раслін
Артыкул 281. Незаконная здабыча рыбы ці іншых водных жывёл
Артыкул 282. Незаконнае паляванне
Артыкул $282^{1}$. Незаконныя перамяшчэнне (транспарціроўка) або разбіранне дзікіх жывёл
Артыкул 283. Выключаны
Артыкул 284. Парушэнне патрабаванняў у галіне ветэрынарнай дзейнасці
РАЗДЗЕЛ X. ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ГРАМАДСКАЙ БЯСПЕКІ І ЗДАРОЎЯ НАСЕЛЬНІЦТВА
ГЛАВА 27. Злачынствы супраць грамадскай бяспекі
Артыкул 285. Стварэнне злачыннай арганізацыі або ўдзел у ёй
Артыкул 286. Бандытызм
Артыкул 287. Стварэнне незаконнага ўзброенага фарміравання
Артыкул 288. Прымус асобы да ўдзелу ў злачыннай дзейнасці
Артыкул 289. Акт тэрарызму
Артыкул 290. Пагроза ўчыненнем акта тэрарызму
Артыкул $290^{1}$. Фінансаванне тэрарыстычнай дзейнасці
Артыкул $290^{2}$. Садзейнічанне тэрарыстычнай дзейнасці
Артыкул $290^{3}$. Праходжанне навучання або іншай падрыхтоўкі для ўдзелу ў тэрарыстычнай дзейнасці
Артыкул $290^{4}$. Стварэнне арганізацыі для ажыццяўлення тэрарыстычнай дзейнасці або ўдзел у ёй
Артыкул $290^{5}$. Арганізацыя дзейнасці тэрарыстычнай арганізацыі і ўдзел у дзейнасці такой арганізацыі
Артыкул 291. Захоп заложніка
Артыкул 292. Захоп будынкаў і збудаванняў
Артыкул 293. Масавыя беспарадкі
Артыкул 294. Раскраданне агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў або выбуховых рэчываў

Артыкул 295. Незаконныя дзеянні ў дачыненні да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў
Артыкул $295^{1}$. Незаконныя дзеянні ў дачыненні да паляўнічай агнястрэльнай гладкаствольнай зброі
Артыкул $295^{2}$. Падробка або наўмыснае знішчэнне маркіроўкі агнястрэльнай зброі
Артыкул $295^{3}$. Незаконныя дзеянні ў дачыненні да прадметаў, паражальнае дзеянне якіх заснавана на выкарыстанні гаручых рэчываў
Артыкул 296. Незаконныя дзеянні ў дачыненні да халоднай зброі
Артыкул 297. Незаконныя дзеянні ў дачыненні да газавай, пнеўматычнай ці кідальнай зброі
Артыкул 298. Неналежнае выкананне абавязкаў па ахове зброі, боепрыпасаў, выбуховых рэчываў і выбуховых прылад
Артыкул 299. Парушэнне правіл абыходжання з агнястрэльнай зброяй, выбухованебяспечнымі, лёгкімі на загаранне, едкімі рэчывамі або піратэхнічнымі вырабамі
Артыкул 300. Неналежнае захоўванне агнястрэльнай зброі
Артыкул 301. Парушэнне правіл вытворча-тэхнічнай дысцыпліны або правіл бяспекі на аб'ектах выкарыстання атамнай энергіі
Артыкул 302. Парушэнне правіл вытворча-тэхнічнай дысцыпліны, правіл бяспекі на выбухованебяспечных прадпрыемствах ці ў выбухованебяспечных цэхах або правіл бяспекі выбухованебяспечных прац
Артыкул 303. Парушэнне правіл бяспекі горных ці будаўнічых прац
Артыкул 304. Парушэнне патрабаванняў пажарнай бяспекі
Артыкул 305. Парушэнне праектаў, абавязковых для захавання патрабаванняў тэхнічных нарматыўных прававых актаў пры правядзенні будаўніча-мантажных прац
Артыкул 306. Парушэнне правіл аховы працы
Артыкул 307. Непрыняцце мер для ратавання людзей
Артыкул 308. Непаведамленне інфармацыі аб небяспецы для жыцця людзей
ГЛАВА 28. Злачынствы супраць бяспекі руху і эксплуатацыі транспарту
Артыкул 309. Наўмыснае прывядзенне ў непрыгоднасць транспартнага сродку або шляхоў зносін
Артыкул 310. Наўмыснае блакаванне транспартных камунікацый
Артыкул 311. Угон або захоп з мэтай угону чыгуначнага рухомага саставу, паветранага або воднага судна
Артыкул 312. Самавольнае без неабходнасці спыненне цягніка
Артыкул 313. Недабраякасны рамонт транспартнага сродку або шляхоў зносін
Артыкул 314. Парушэнне правіл бяспекі руху або эксплуатацыі чыгуначнага, паветранага, воднага транспарту ці метрапалітэна
Артыкул 315. Парушэнне правіл міжнародных палётаў
Артыкул 316. Парушэнне правіл бяспекі руху і эксплуатацыі маламерных суднаў
Артыкул 317. Парушэнне правіл дарожнага руху або эксплуатацыі транспартных сродкаў
Артыкул $317^{1}$. Кіраванне транспартным сродкам асобай, якая знаходзіцца ў стане ап'янення, перадача кіравання транспартным сродкам такой асобе або адмова ад праходжання праверкі (аглядання)
Артыкул $317^{2}$. Кіраванне транспартным сродкам асобай, якая не мае права кіравання
Артыкул 318. Выпуск у эксплуатацыю тэхнічна няспраўнага транспартнага сродку або незаконны допуск да кіравання ім
Артыкул 319. Парушэнне правіл утрымання аўтамабільных дарог, вуліц, чыгуначных пераездаў і іншых дарожных збудаванняў
Артыкул 320. Парушэнне правіл бяспекі пры будаўніцтве, эксплуатацыі або рамонце магістральных трубаправодаў
Артыкул 321. Парушэнне правіл, якія забяспечваюць бяспечную працу транспарту
ГЛАВА 29. Злачынствы супраць здароўя насельніцтва

Артыкул 322. Незаконныя набыццё, захоўванне, выкарыстанне, збыт або разбурэнне радыеактыўных матэрыялаў
Артыкул 323. Раскраданне радыеактыўных матэрыялаў
Артыкул 324. Пагроза небяспечным выкарыстаннем радыеактыўных матэрыялаў
Артыкул 325. Парушэнне правіл абыходжання з радыеактыўнымі матэрыяламі
Артыкул 326. Выключаны
Артыкул 327. Раскраданне наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсараў і аналагаў
Артыкул 328. Незаконнае абарачэнне наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсараў і аналагаў
Артыкул 328[1]. Незаконнае перамяшчэнне праз мытную мяжу Еўразійскага эканамічнага саюза і (або) Дзяржаўную мяжу Рэспублікі Беларусь наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або іх прэкурсараў ці аналагаў
Артыкул 328[2]. Спажыванне наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў ці іх аналагаў у грамадскім месцы або з'яўленне ў грамадскім месцы ці знаходжанне на працы ў стане, выкліканым спажываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных ці іншых адурманьвальных рэчываў
Артыкул 329. Незаконныя сяўба і (або) вырошчванне раслін або грыбоў, якія змяшчаюць наркатычныя сродкі або псіхатропныя рэчывы
Артыкул 330. Парушэнне правіл абыходжання з наркатычнымі сродкамі, псіхатропнымі рэчывамі, іх прэкурсарамі і аналагамі
Артыкул 331. Схіленне да спажывання наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў ці іх аналагаў
Артыкул 331[1]. Схіленне спартсмена да выкарыстання рэчыва і (або) метаду, уключаных у Рэспубліканскі пералік забароненых у спорце рэчываў і метадаў
Артыкул 331[2]. Наўмыснае выкарыстанне ў дачыненні да спартсмена рэчыва і (або) метаду, уключаных у Рэспубліканскі пералік забароненых у спорце рэчываў і метадаў
Артыкул 332. Даванне памяшканняў, арганізацыя або ўтрыманне прытонаў для вырабу, перапрацоўкі і (або) спажывання наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў або іншых адурманьвальных рэчываў
Артыкул 333. Незаконнае абарачэнне моцнадзейных або атрутных рэчываў
Артыкул 333[1]. Незаконнае перамяшчэнне праз мытную мяжу Еўразійскага эканамічнага саюза або Дзяржаўную мяжу Рэспублікі Беларусь моцнадзейных, атрутных рэчываў, радыеактыўных матэрыялаў, агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў, выбуховых рэчываў, выбуховых прылад, зброі масавага паражэння або сродкаў яе дастаўкі, а таксама іншых відаў узбраення і ваеннай тэхнікі
Артыкул 334. Парушэнне правіл абыходжання з моцнадзейнымі і атрутнымі рэчывамі
Артыкул 335. Незаконнае лячэнне
Артыкул 336. Парушэнне санітарна-эпідэміялагічных, гігіенічных патрабаванняў і працэдур, устаноўленых тэхнічнымі рэгламентамі, санітарных норм і правіл, гігіенічных нарматываў
Артыкул 337. Выпуск або рэалізацыя недабраякаснай прадукцыі
Артыкул 338. Выкананне прац або аказанне паслуг, якія не адпавядаюць патрабаванням бяспекі
Артыкул 338[1]. Падробка дакументаў якасці, маркіроўкі, упакоўкі лекавых сродкаў і (або) медыцынскіх вырабаў, дапаможных рэчываў, частак, матэрыялаў, аксесуараў
Артыкул 338[2]. Вытворчасць, увоз у Рэспубліку Беларусь, захоўванне або збыт фальсіфікаваных, няякасных, незарэгістраваных лекавых сродкаў і (або) медыцынскіх вырабаў
РАЗДЗЕЛ XI. ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ГРАМАДСКАГА ПАРАДКУ І ГРАМАДСКАЙ МАРАЛЬНАСЦІ
ГЛАВА 30. Злачынствы супраць грамадскага парадку і грамадскай маральнасці
Артыкул 339. Хуліганства
Артыкул 339[1]. Жорсткае абыходжанне з жывёлай
Артыкул 340. Заведама ілжывае паведамленне аб небяспецы
Артыкул 341. Апаганенне збудаванняў і пашкоджанне маёмасці

Артыкул 341$^{1}$. Прапаганда ці публічнае дэманстраванне, выраб, распаўсюджванне нацысцкай сімволікі ці атрыбутыкі
Артыкул 342. Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх
Артыкул 342$^{1}$. Прапаганда самагубства
Артыкул 342$^{2}$. Неаднаразовае парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў
Артыкул 343. Выраб і распаўсюджванне парнаграфічных матэрыялаў або прадметаў парнаграфічнага характару
Артыкул 343$^{1}$. Выраб і распаўсюджванне парнаграфічных матэрыялаў або прадметаў парнаграфічнага характару з выявай непаўналетняга
Артыкул 344. Наўмысныя знішчэнне або пашкоджанне гісторыка-культурных каштоўнасцей або культурных каштоўнасцей, якім можа быць нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці
Артыкул 345. Знішчэнне, пашкоджанне або страта гісторыка-культурных каштоўнасцей або культурных каштоўнасцей, якім можа быць нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, з-за неасцярожнасці
Артыкул 346. Глумленне з гісторыка-культурных каштоўнасцей
Артыкул 347. Глумленне з трупа або магілы
Артыкул 348. Незаконнае адабранне органаў або тканак у памерлага донара
РАЗДЗЕЛ XII. ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ КАМП'ЮТАРНАЙ БЯСПЕКІ
ГЛАВА 31. Злачынствы супраць камп'ютарнай бяспекі
Артыкул 349. Несанкцыянаваны доступ да камп'ютарнай інфармацыі
Артыкул 350. Знішчэнне, блакаванне або мадыфікацыя камп'ютарнай інфармацыі
Артыкул 351. Выключаны
Артыкул 352. Неправамернае завалоданне камп'ютарнай інфармацыяй
Артыкул 353. Выключаны
Артыкул 354. Распрацоўка, выкарыстанне, распаўсюджванне або збыт шкодных камп'ютарных праграм або спецыяльных праграмных ці апаратных сродкаў
Артыкул 355. Парушэнне правіл эксплуатацыі камп'ютарнай сістэмы або сеткі
РАЗДЗЕЛ XIII. ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ДЗЯРЖАВЫ І ПАРАДКУ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ ЎЛАДЫ І КІРАВАННЯ
ГЛАВА 32. Злачынствы супраць дзяржавы
Артыкул 356. Здрада дзяржаве
Артыкул 357. Змова або іншыя дзеянні, учыненыя з мэтай захопу дзяржаўнай улады
Артыкул 358. Шпіянаж
Артыкул 358$^{1}$. Агентурная дзейнасць
Артыкул 359. Акт тэрарызму ў дачыненні да дзяржаўнага або грамадскага дзеяча
Артыкул 360. Дыверсія
Артыкул 361. Заклікі да дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь
Артыкул 361$^{1}$. Стварэнне экстрэмісцкага фарміравання або ўдзел у ім
Артыкул 361$^{2}$. Фінансаванне экстрэмісцкай дзейнасці
Артыкул 361$^{3}$. Удзел на тэрыторыі замежнай дзяржавы ва ўзброеным фарміраванні або ўзброеным канфлікце, ваенных дзеяннях, вярбоўка або падрыхтоўка асоб да такога ўдзелу
Артыкул 361$^{4}$. Садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці
Артыкул 361$^{5}$. Праходжанне навучання або іншай падрыхтоўкі для ўдзелу ў экстрэмісцкай дзейнасці
ГЛАВА 33. Злачынствы супраць парадку кіравання
Артыкул 362. Забойства супрацоўніка органаў унутраных спраў, ваеннаслужачага
Артыкул 363. Супраціўленне супрацоўніку органаў унутраных спраў або іншай асобе, якія ахоўваюць грамадскі парадак

Артыкул 364. Насілле або пагроза прымянення насілля ў дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў
Артыкул 365. Умяшанне ў дзейнасць супрацоўніка органаў унутраных спраў
Артыкул 366. Насілле або пагроза ў дачыненні да службовай асобы, якая выконвае службовыя абавязкі, або іншай асобы, якая выконвае грамадскі абавязак
Артыкул 367. Паклёп у дачыненні да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
Артыкул 368. Знявага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
Артыкул 369. Знявага прадстаўніка ўлады
Артыкул 369[1]. Дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь
Артыкул 369[2]. Выкарыстанне замежнай бязвыплатнай дапамогі з парушэннем заканадаўства Рэспублікі Беларусь
Артыкул 369[3]. Публічныя заклікі да арганізацыі або правядзення незаконных сходу, мітынгу, вулічнага шэсця, дэманстрацыі ці пікетавання або ўцягненне асоб ва ўдзел у такіх масавых мерапрыемствах
Артыкул 370. Глумленне з дзяржаўных сімвалаў
Артыкул 371. Незаконнае перасячэнне Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь
Артыкул 371[1]. Арганізацыя незаконнай міграцыі
Артыкул 371[2]. Парушэнне тэрміну забароны ўезду ў Рэспубліку Беларусь
Артыкул 372. Парушэнне правіл аховы ліній сувязі
Артыкул 373. Наўмыснае выдаванне дзяржаўнай тайны
Артыкул 374. Выдаванне дзяржаўнай тайны з-за неасцярожнасці
Артыкул 375. Наўмыснае выдаванне службовай тайны
Артыкул 375[1]. Незаконныя збіранне або атрыманне звестак, якія з'яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі
Артыкул 376. Незаконныя выраб, набыццё або збыт сродкаў для тайнага атрымання інфармацыі
Артыкул 377. Раскраданне, знішчэнне, пашкоджанне або скрыванне дакументаў, штампаў, пячатак, раскраданне бланкаў
Артыкул 378. Крадзеж або знішчэнне асабістых дакументаў
Артыкул 379. Незаконныя набыццё або збыт афіцыйных дакументаў
Артыкул 380. Падробка, выраб, выкарыстанне або збыт падробленых дакументаў, штампаў, пячатак, бланкаў
Артыкул 381. Падробка або знішчэнне ідэнтыфікацыйнага нумара транспартнага сродку
Артыкул 382. Самавольнае прысваенне звання або ўлады службовай асобы
Артыкул 383. Выключаны
Артыкул 384. Прымус да выканання абавязацельстваў
Артыкул 385. Выключаны
Артыкул 386. Выключаны
Артыкул 387. Незаконныя дзеянні ў дачыненні да дзяржаўных узнагарод
ГЛАВА 34. Злачынствы супраць правасуддзя
Артыкул 388. Насілле ў дачыненні да суддзі або народнага засядацеля
Артыкул 389. Пагроза ў дачыненні да суддзі або народнага засядацеля
Артыкул 390. Умяшанне ў вырашэнне судовых спраў або правядзенне папярэдняга расследавання
Артыкул 391. Знявага суддзі або народнага засядацеля
Артыкул 392. Вынясенне заведама неправасудных прыгавору, рашэння або іншага судовага акта
Артыкул 393. Прыцягненне ў якасці абвінавачанага заведама невінаватага
Артыкул 394. Прымус да дачы паказанняў
Артыкул 395. Фальсіфікацыя доказаў
Артыкул 396. Інсцэніроўка атрымання хабару, незаконнага ўзнагароджання або камерцыйнага подкупу
Артыкул 397. Заведама незаконныя затрыманне або ўзяцце пад варту

Артыкул 398. Правядзенне заведама незаконнага вобыску
Артыкул 399. Незаконнае вызваленне ад крымінальнай адказнасці
Артыкул 400. Заведама лжывы данос
Артыкул 401. Заведама лжывае паказанне
Артыкул 402. Адмова або ўхіленне сведкі ці пацярпелага ад дачы паказанняў або эксперта ці перакладчыка ад выканання ўскладзеных на іх абавязкаў
Артыкул 403. Перашкаджэнне яўцы сведкі, пацярпелага або дачы імі паказанняў
Артыкул 404. Прымус сведкі, пацярпелага або эксперта да адмовы ад дачы паказанняў ці заключэння або да дачы лжывых паказанняў ці заключэння
Артыкул 405. Укрывальніцтва злачынстваў
Артыкул 406. Неданясенне аб злачынстве
Артыкул 407. Выдаванне даных дазнання, папярэдняга следства або закрытага судовага пасяджэння
Артыкул 408. Наўмыснае выдаванне звестак аб мерах бяспекі, якія прымяняюцца ў дачыненні да асобы, якая абараняецца
Артыкул 409. Незаконныя дзеянні ў дачыненні да апісанай ці арыштаванай маёмасці
Артыкул 410. Дзеянні, якія дэзарганізуюць працу папраўчай установы, якая выконвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, або арыштнага дома
Артыкул 411. Злоснае непадпарадкаванне патрабаванням адміністрацыі папраўчай установы, якая выконвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі
Артыкул 412. Выключаны
Артыкул 413. Уцёкі з папраўчай установы, якая выконвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, арыштнага дома або з-пад варты
Артыкул 414. Ухіленне ад адбывання пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі або арышту
Артыкул 415. Ухіленне ад адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі
Артыкул 416. Ухіленне ад адбывання пакарання ў выглядзе папраўчых прац
Артыкул 417. Невыкананне прыгавору суда аб пазбаўленні права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю
Артыкул 418. Ухіленне ад выплаты штрафу
Артыкул 419. Ухіленне ад адбывання пакарання ў выглядзе грамадскіх прац
Артыкул 420. Перашкаджэнне канфіскацыі маёмасці
Артыкул 421. Незахаванне патрабаванняў прэвентыўнага нагляду
Артыкул 422. Ухіленне ад прэвентыўнага нагляду
Артыкул 423. Невыкананне прыгавору, рашэння або іншага судовага акта
Артыкул 423[1]. Невыкананне рашэння аб прызнанні арганізацыі, дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка экстрэмісцкімі, аб спыненні дзейнасці прадстаўніцтва замежнай або міжнароднай арганізацыі і (або) прыпыненні іх дзейнасці
ГЛАВА 35. Злачынствы супраць інтарэсаў службы
Артыкул 424. Злоўжыванне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі
Артыкул 425. Бяздзейнасць службовай асобы
Артыкул 426. Перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў
Артыкул 427. Службовы падлог
Артыкул 428. Службовая халатнасць
Артыкул 429. Незаконны ўдзел у прадпрымальніцкай дзейнасці
Артыкул 430. Атрыманне хабару
Артыкул 431. Дача хабару
Артыкул 432. Пасрэдніцтва ў хабарніцтве
Артыкул 433. Незаконнае ўзнагароджанне
РАЗДЗЕЛ XIV. ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ПАРАДКУ ВЫКАНАННЯ ВОІНСКАГА АБАВЯЗКУ, НАКІРАВАННЯ І ПРАХОДЖАННЯ АЛЬТЭРНАТЫЎНАЙ СЛУЖБЫ
ГЛАВА 36. Злачынствы прызыўнікоў, рэзервістаў і ваеннаабавязаных
Артыкул 434. Ухіленне ад мерапрыемстваў па прызыве на ваенную службу па мабілізацыі

Артыкул 435. Ухіленне ад мерапрыемстваў па прызыве на воінскую службу
Артыкул 436. Ухіленне рэзервіста або ваеннаабавязанага ад яўкі на зборы (заняткі)
Артыкул 437. Ухіленне прызыўніка або ваеннаабавязанага ад воінскага ўліку
ГЛАВА 37. Злачынствы супраць воінскай службы
Артыкул 438. Непадпарадкаванне
Артыкул 439. Невыкананне загаду
Артыкул 440. Супраціўленне начальніку або прымус яго да парушэння службовых абавязкаў
Артыкул 441. Гвалтоўныя дзеянні ў дачыненні да начальніка
Артыкул 442. Пагроза начальніку
Артыкул 443. Парушэнне статутных правіл узаемаадносін паміж асобамі, на якіх распаўсюджваецца статус ваеннаслужачага, пры адсутнасці адносін падпарадкаванасці
Артыкул 444. Знявага падначаленым начальніка або начальнікам падначаленага
Артыкул 445. Самавольнае пакіданне часці або месца службы
Артыкул 446. Дэзерцірства
Артыкул 447. Ухіленне ад воінскай службы шляхам самакалецтва або іншым спосабам
Артыкул 448. Самавольнае пакіданне месца службы ў баявым становішчы
Артыкул 449. Самавольнае пакіданне поля бою або адмова дзейнічаць зброяй
Артыкул 450. Парушэнне правіл нясення баявога дзяжурства
Артыкул 451. Парушэнне правіл нясення вартавой службы
Артыкул 452. Выключаны
Артыкул 453. Парушэнне правіл нясення памежнай службы або ажыццяўлення памежнага кантролю
Артыкул 454. Парушэнне правіл нясення ўнутранай службы
Артыкул 455. Злоўжыванне ўладай, бяздзейнасць улады або перавышэнне ўлады
Артыкул 456. Халатныя адносіны да службы
Артыкул 457. Выключаны
Артыкул 458. Выключаны
Артыкул 459. Наўмысныя знішчэнне або пашкоджанне ваеннай маёмасці
Артыкул 460. Выключаны
Артыкул 461. Знішчэнне або пашкоджанне ваеннай маёмасці з-за неасцярожнасці
Артыкул 462. Страта ваеннай маёмасці
Артыкул 463. Парушэнне правіл абыходжання са зброяй, матэрыяламі, рэчывамі і прадметамі, якія ўяўляюць павышаную небяспеку для навакольных
Артыкул 464. Парушэнне правіл ваджэння або эксплуатацыі машын
Артыкул 465. Парушэнне правіл палётаў або падрыхтоўкі да іх
ГЛАВА 38. Злачынствы супраць парадку накіравання і праходжання альтэрнатыўнай службы
Артыкул 465$^{1}$. Няяўка грамадзяніна, у дачыненні да якога прынята рашэнне аб замене воінскай службы на альтэрнатыўную службу, у орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне
Артыкул 465$^{2}$. Ухіленне грамадзяніна ад праходжання альтэрнатыўнай службы
РАЗДЗЕЛ XV. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
Артыкул 466. Увядзенне ў дзеянне гэтага Кодэкса

## АГУЛЬНАЯ ЧАСТКА

## РАЗДЗЕЛ I
## КРЫМІНАЛЬНЫ ЗАКОН

### ГЛАВА 1
### АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 1. Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь***

---

*Часткі артыкулаў і заўваг (за выключэннем тых, якія маюць адну частку) у гэтым Кодэксе нумаруюцца арабскімі лічбамі з кропкай, пункты частак артыкулаў – арабскімі лічбамі з дужкай.

1. Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь вызначае, якія грамадска небяспечныя дзеянні з'яўляюцца злачынствамі, замацоўвае падставы і ўмовы крымінальнай адказнасці, устанаўлівае пакаранні і іншыя меры крымінальнай адказнасці, што могуць быць прыменены да асоб, якія ўчынілі злачынства, а таксама прымусовыя меры бяспекі і лячэння ў дачыненні да асоб, якія ўчынілі грамадска небяспечныя дзеянні.

2. Гэты Кодэкс з'яўляецца адзіным крымінальным законам, які дзейнічае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Новыя законы, якія прадугледжваюць крымінальную адказнасць, падлягаюць уключэнню ў гэты Кодэкс.

3. Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь грунтуецца на Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і агульнапрызнаных прынцыпах і нормах міжнароднага права.

**Артыкул 2. Задачы Крымінальнага кодэкса**

Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь мае задачай ахову міру і бяспекі чалавецтва, чалавека, яго праў і свабод, уласнасці, праў юрыдычных асоб, прыроднага асяроддзя, грамадскіх і дзяржаўных інтарэсаў, канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, а таксама ўстаноўленага правапарадку ад злачынных замахаў. Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь спрыяе папярэджанню злачынных замахаў, выхаванню грамадзян у духу прытрымлівання заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 3. Прынцыпы крымінальнага закона і крымінальнай адказнасці**

1. Крымінальная адказнасць у Рэспубліцы Беларусь грунтуецца на прынцыпах законнасці, роўнасці грамадзян перад законам, непазбежнасці адказнасці, асабістай вінаватай адказнасці, справядлівасці і гуманізму.

2. Ніхто не можа быць прызнаны вінаватым ва ўчыненні злачынства і прыцягнуты да крымінальнай адказнасці інакш чым па прыгаворы суда і ў адпаведнасці з законам. Злачыннасць дзеяння, яго каральнасць і іншыя крымінальна-прававыя наступствы вызначаюцца толькі гэтым Кодэксам. Нормы Кодэкса падлягаюць строгаму тлумачэнню. Прымяненне крымінальнага закона па аналогіі не дапускаецца.

3. Асобы, якія ўчынілі злачынствы, роўныя перад законам і падлягаюць крымінальнай адказнасці незалежна ад полу, расы, нацыянальнасці, мовы, паходжання, маёмаснага і службовага становішча, месца жыхарства, дачынення да рэлігіі, перакананняў, прыналежнасці да грамадскіх аб'яднанняў, а таксама іншых абставін.

4. Кожная асоба, прызнаная вінаватай ва ўчыненні злачынства, падлягае пакаранню або іншым мерам крымінальнай адказнасці. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці або пакарання дапускаецца толькі ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

5. Асоба падлягае крымінальнай адказнасці толькі за тыя ўчыненыя ёй грамадска небяспечныя дзеянні (бяздзейнасць) і прадугледжаныя гэтым Кодэксам грамадска небяспечныя наступствы, якія адбыліся і ў дачыненні да якіх вызначана яе віна, гэта значыць намер або неасцярожнасць. Крымінальная адказнасць за невінаватае прычыненне шкоды не дапускаецца.

6. Пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці павінны быць справядлівымі, гэта значыць устанаўлівацца і прызначацца з улікам характару і ступені грамадскай небяспекі злачынства, абставін яго здзяйснення і асобы вінаватага. Ніхто не можа несці крымінальную адказнасць двойчы за адно і тое ж злачынства.

7. Крымінальны кодэкс служыць забеспячэнню фізічнай, псіхічнай, матэрыяльнай, экалагічнай і іншай бяспекі чалавека. Асобе, якая ўчыніла злачынства, павінны быць прызначаны пакаранне або іншая мера крымінальнай адказнасці, неабходныя і дастатковыя для

яе выпраўлення. Пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці не маюць сваёй мэтай прычыненне фізічных пакут або знявагу чалавечай годнасці.

**Артыкул 4. Тлумачэнне асобных тэрмінаў Крымінальнага кодэкса**

1. Для мэт аднастайнага і дакладнага прымянення тэрмінаў, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым Кодэксе, прымаюцца наступныя іх азначэнні.

2. Пад блізкімі сваякамі, членамі сям'і і блізкімі разумеюцца:

1) блізкія сваякі – бацькі, дзеці, усынавіцелі, усыноўленыя (удачароныя), родныя браты і сёстры, дзед, бабка, унукі, муж (жонка) пацярпелага або асобы, якая ўчыніла злачынства, ці тыя ж сваякі мужа (жонкі) пацярпелага або асобы, якая ўчыніла злачынства;

2) члены сям'і – блізкія сваякі, іншыя сваякі, непрацаздольныя ўтрыманцы і іншыя асобы, якія пражываюць сумесна і вядуць агульную гаспадарку з пацярпелым або асобай, якая ўчыніла злачынства;

3) блізкія – блізкія сваякі і члены сям'і пацярпелага або асобы, якая ўчыніла злачынства, або іншыя асобы, якіх пацярпелы або асоба, якая ўчыніла злачынства, абгрунтавана прызнаюць сваімі блізкімі.

3. Пад грамадзянінам, калі іншая не агаворана, разумеецца грамадзянін Рэспублікі Беларусь, замежны грамадзянін і асоба без грамадзянства.

4. Пад службовымі асобамі разумеюцца:

1) прадстаўнікі ўлады, гэта значыць дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў, а таксама дзяржаўныя служачыя, якія маюць права ў межах сваёй кампетэнцыі аддаваць распараджэнні або загады і прымаць рашэнні адносна асоб, не падначаленых ім па службе;

2) прадстаўнікі грамадскасці, гэта значыць асобы, якія не знаходзяцца на дзяржаўнай службе, але надзеленыя ва ўстаноўленым парадку паўнамоцтвамі прадстаўніка ўлады пры выкананні абавязкаў па ахове грамадскага парадку, барацьбе з правапарушэннямі, па выкананні правасуддзя;

3) асобы, якія пастаянна ці часова або па спецыяльным паўнамоцтве займаюць ва ўстановах, арганізацыях або на прадпрыемствах (незалежна ад форм уласнасці), ва Узброеных сілах Рэспублікі Беларусь, іншых войсках і воінскіх фарміраваннях Рэспублікі Беларусь пасады, звязаныя з выкананнем арганізацыйна-распарадчых або адміністрацыйна-гаспадарчых абавязкаў, або асобы, упаўнаважаныя ва ўстаноўленым парадку на здзяйсненне юрыдычна значных дзеянняў;

4) службовыя асобы замежных дзяржаў, гэта значыць асобы, надзеленыя ў замежных дзяржавах у адпаведнасці з заканадаўствам гэтых дзяржаў паўнамоцтвамі, аналагічнымі ўказаным у пунктах 1–3 гэтай часткі, уключаючы трацейскіх суддзяў і прысяжных засядацеляў, а таксама службовыя асобы міжнародных арганізацый, члены міжнародных парламенцкіх сходаў, суддзі і службовыя асобы міжнародных судоў.

5. Пад службовымі асобамі, якія займаюць адказнае становішча, разумеюцца:

1) Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Старшыня Палаты прадстаўнікоў і Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь і іх намеснікі;

2) кіраўнікі дзяржаўных органаў, непасрэдна падначаленых або падсправаздачных Прэзідэнту, Парламенту, Ураду Рэспублікі Беларусь, і іх намеснікі;

3) кіраўнікі мясцовых Саветаў дэпутатаў, выканаўчых і распарадчых органаў і іх намеснікі;

4) суддзі;

5) пракуроры абласцей, горада Мінска, раёнаў, раёнаў у гарадах, гарадоў, міжраённыя і прыраўнаваныя да іх транспартныя пракуроры і іх намеснікі;

6) начальнікі следчых падраздзяленняў, органаў дазнання і іх намеснікі, следчыя;

7) кіраўнікі органаў дзяржаўнага кантролю, унутраных спраў, дзяржаўнай бяспекі, пагранічнай службы, фінансавых расследаванняў, мытных, падатковых органаў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях і іх намеснікі;

8) іншыя службовыя асобы, пасады якіх уключаны ў кадравы рэестр Кіраўніка дзяржавы Рэспублікі Беларусь і кадравы рэестр Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

6. Пад начальнікам разумеецца асоба, на якую распаўсюджваецца статус ваеннаслужачага і якая з-за свайго службовага становішча або воінскага звання мае права аддаваць падначаленым загады і патрабаваць іх выканання.

7. Пад малалетнім разумеецца асоба, якая на дзень учынення злачынства не дасягнула ўзросту чатырнаццаці гадоў.

8. Пад непаўналетнім разумеецца асоба, якая на дзень учынення злачынства не дасягнула ўзросту васямнаццаці гадоў.

9. Пад састарэлым разумеецца асоба, якая на дзень учынення злачынства дасягнула ўзросту сямідзесяці гадоў.

10. Пад карыслівымі меркаваннямі разумеюцца матывы, якія характарызуюцца імкненнем атрымаць з учыненага злачынства для сябе або блізкіх выгаду маёмаснага характару або намерам пазбавіць сябе ці блізкіх ад матэрыяльных выдаткаў.

11. Пад хуліганскімі меркаваннямі разумеюцца матывы, якія выяўляюць імкненне вінаватай асобы праявіць яўную непавагу да грамадства і прадэманстраваць пагарду да агульнапрынятых правіл супольнага жыцця.

12. Пад групай асоб, калі іншае не агаворана ў артыкуле Асаблівай часткі гэтага Кодэкса, разумеецца прыкмета, якая характарызуе ўчыненне злачынства групай асоб без папярэдняй змовы, па папярэдняй змове або арганізаванай групай.

13. Пад агульнанебяспечным спосабам разумеецца спосаб учынення злачынства, які характарызуецца вялікай разбуральнай сілай або іншым чынам стварае небяспеку гібелі людзей, прычынення цялесных пашкоджанняў, іншых цяжкіх наступстваў (выбух, падпал, затапленне і інш.).

14. Пад тэрмінам «заведама» разумеецца прыкмета, якая ўказвае, што асобе, якая ўчыняе злачынства, вядомыя юрыдычна значныя абставіны, прадугледжаныя гэтым Кодэксам.

$14^1$. Пад злачынствам, учыненым паўторна, разумеецца злачынства, учыненае асобай, якая раней учыніла якое-небудзь са злачынстваў, прадугледжаных адным і тым жа артыкулам або артыкуламі, спецыяльна агаворанымі (указанымі) у Асаблівай частцы гэтага Кодэкса. Злачынства не прызнаецца паўторным, калі за раней учыненае злачынства асоба была вызвалена ад крымінальнай адказнасці або судзімасць за гэта злачынства была пагашана ці знята ва ўстаноўленым законам парадку.

15. Пад сістэматычнасцю разумеецца прыкмета, якая ўказвае на ўчыненне асобай больш чым двух тоесных або аднародных правапарушэнняў.

16. Пад крымінальна-прававой кампенсацыяй разумеецца мера матэрыяльнага характару, якую асоба, што ўчыніла злачынства, згодна прыняць і абавязана выканаць у якасці адной з умоў вызвалення ад крымінальнай адказнасці або абавязана выканаць пры прымяненні іншых мер крымінальнай адказнасці. Крымінальна-прававая кампенсацыя з'яўляецца формай загладжвання віны перад грамадствам, заклікана садзейнічаць выпраўленню асобы, якая ўчыніла злачынства, аднаўленню сацыяльнай справядлівасці і прымяняецца толькі ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

17. Пад выкананнем грамадска карысных прац у артыкулах 77 і 78 гэтага Кодэкса разумеецца мера папраўчага ўздзеяння, выкананне якой суд можа ўскласці на асобу, якая асуджаецца з адтэрміноўкай выканання пакарання, умоўным непрымяненнем пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі на пэўны тэрмін (далей, калі не прадугледжана іншае, – пазбаўленне волі), у мэтах забеспячэння і (або) пацвярджэння яе выпраўлення.

18. Пад камп’ютарнай інфармацыяй разумеецца інфармацыя, якая захоўваецца ў камп’ютарнай сістэме, сетцы або на машынных носьбітах, апрацоўваецца камп’ютарнай сістэмай або перадаецца ў прасторы з дапамогай любых праграмна-тэхнічных сродкаў.

## ГЛАВА 2
## ДЗЕЯННЕ КРЫМІНАЛЬНАГА ЗАКОНА Ў ПРАСТОРЫ І Ў ЧАСЕ

### Артыкул 5. Дзеянне гэтага Кодэкса ў дачыненні да асоб, якія ўчынілі злачынства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь

1. Асоба, якая ўчыніла злачынства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, падлягае адказнасці паводле гэтага Кодэкса.

2. Злачынства прызнаецца ўчыненым на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, калі яно пачата, або працягвалася, або было скончана на яе тэрыторыі, або ўчынена ў межах Рэспублікі Беларусь у саўдзеле з асобай, якая ўчыніла злачынства на тэрыторыі замежнай дзяржавы.

3. Асоба, якая ўчыніла злачынства на судне, прыпісаным да порта Рэспублікі Беларусь, якое знаходзіцца ў адкрытай воднай або паветранай прасторы па-за межамі Рэспублікі Беларусь, падлягае крымінальнай адказнасці паводле гэтага Кодэкса, калі іншае не прадугледжана міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь. Паводле гэтага Кодэкса крымінальную адказнасць нясе таксама асоба, якая ўчыніла злачынства на ваенным караблі або ваенным паветраным судне Рэспублікі Беларусь незалежна ад месца іх знаходжання.

4. Пытанне аб крымінальнай адказнасці дыпламатычных прадстаўнікоў замежных дзяржаў і іншых грамадзян, якія, згодна з дзейнымі законамі і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, непадсудныя па крымінальных справах судам Рэспублікі Беларусь, у выпадку ўчынення гэтымі асобамі злачынстваў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь вырашаецца дыпламатычным шляхам на аснове міжнародных дагавораў і норм міжнароднага права.

### Артыкул 6. Дзеянне гэтага Кодэкса ў дачыненні да асоб, якія ўчынілі злачынства па-за межамі Рэспублікі Беларусь

1. Грамадзянін Рэспублікі Беларусь або асоба без грамадзянства, якая пастаянна пражывае ў рэспубліцы, якія ўчынілі злачынствы па-за межамі Рэспублікі Беларусь, падлягаюць адказнасці паводле гэтага Кодэкса, калі здзейсненыя імі дзеянні прызнаны злачынствамі ў дзяржаве, на тэрыторыі якой яны былі здзейснены, і калі яны не панеслі крымінальную адказнасць у гэтай дзяржаве, акрамя выпадкаў, прадугледжаных часткай $1^1$ гэтага артыкула. Пры асуджэнні ўказаных асоб пакаранне прызначаецца ў межах санкцыі артыкула гэтага Кодэкса, але не павінна перавышаць верхняй мяжы санкцыі, прадугледжанай законам дзяржавы, на тэрыторыі якой было ўчынена злачынства.

$1^1$. Грамадзянін Рэспублікі Беларусь або асоба без грамадзянства, якая пастаянна пражывае ў рэспубліцы, якія ўчынілі па-за межамі Рэспублікі Беларусь злачынствы, прадугледжаныя главой 32, артыкуламі 373–375 гэтага Кодэкса, падлягаюць адказнасці паводле гэтага Кодэкса, калі яны не панеслі крымінальную адказнасць у замежнай дзяржаве.

2. Замежны грамадзянін або асоба без грамадзянства, якая не пражывае пастаянна ў Рэспубліцы Беларусь, якія ўчынілі злачынствы па-за межамі Рэспублікі Беларусь, падлягаюць адказнасці паводле гэтага Кодэкса ў выпадках учынення цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў, накіраваных супраць інтарэсаў Рэспублікі Беларусь.

3. Гэты Кодэкс прымяняецца незалежна ад крымінальнага права месца здзяйснення дзеяння ў дачыненні да наступных злачынстваў:

1) генацыд (артыкул 127);

2) злачынствы супраць бяспекі чалавецтва (артыкул 128);

3) вытворчасць, назапашванне або распаўсюджванне забароненых сродкаў вядзення вайны (артыкул 129);

4) экацыд (артыкул 131);

5) прымяненне зброі масавага паражэння (артыкул 134);

6) парушэнне законаў і звычаяў вайны (артыкул 135);

7) злачынныя парушэнні норм міжнароднага гуманітарнага права падчас узброеных канфліктаў (артыкул 136);

8) бяздзейнасць або адданне злачыннага загаду падчас узброенага канфлікту (артыкул 137);

8[1]) гандаль людзьмі (артыкул 181);

9) іншых злачынстваў, учыненых па-за межамі Рэспублікі Беларусь, якія падлягаюць пераследаванню на падставе абавязковага для Рэспублікі Беларусь міжнароднага дагавора.

4. У выпадках, прадугледжаных часткамі 2 або 3 гэтага артыкула, асобы падлягаюць адказнасці паводле гэтага Кодэкса, калі яны не былі асуджаны ў замежнай дзяржаве і прыцягваюцца да крымінальнай адказнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 7. Выдача асобы, якая ўчыніла злачынства**

1. Грамадзянін Рэспублікі Беларусь не можа быць выдадзены замежнай дзяржаве, калі іншае не прадугледжана міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

2. Замежны грамадзянін або асоба без грамадзянства, якія ўчынілі злачынствы па-за межамі Рэспублікі Беларусь і знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, могуць быць выдадзены замежнай дзяржаве для прыцягнення да крымінальнай адказнасці або адбывання пакарання ў адпаведнасці з міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь.

3. Пры адсутнасці такога міжнароднага дагавора асобы, указаныя ў частцы другой гэтага артыкула, могуць быць выдадзены замежнай дзяржаве на аснове прынцыпу ўзаемнасці пры ўмове захавання патрабаванняў заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 8. Прэюдыцыяльнае значэнне ўчынення злачынства на тэрыторыі замежнай дзяржавы**

Судзімасць і іншыя крымінальна-прававыя наступствы ўчынення асобай злачынства на тэрыторыі замежнай дзяржавы маюць крымінальна-прававое значэнне для вырашэння пытання аб крымінальнай адказнасці гэтай асобы за злачынства, учыненае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, у адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 9. Дзеянне крымінальнага закона ў часе**

1. Злачыннасць і каральнасць дзеяння вызначаюцца законам, які дзейнічаў падчас здзяйснення гэтага дзеяння. Часам здзяйснення дзеяння прызнаецца час ажыццяўлення грамадска небяспечнага дзеяння (бяздзейнасці) незалежна ад часу надыходу наступстваў.

2. Закон, які ўстараняе злачыннасць дзеяння, змякчае пакаранне або іншым чынам паляпшае становішча асобы, якая ўчыніла злачынства, мае адваротную сілу, гэта значыць распаўсюджваецца на асоб, якія здзейснілі адпаведнае дзеянне да ўступлення такога закона ў сілу, у тым ліку на асоб, якія адбываюць пакаранне або адбылі пакаранне, але маюць судзімасць. З дня ўступлення ў сілу закона, які ўстараняе злачыннасць дзеяння, адпаведнае дзеянне, здзейсненае да яго ўступлення ў сілу, не лічыцца злачынным. Калі новы крымінальны закон змякчае каральнасць дзеяння, за якое асоба адбывае пакаранне, суд прызначае пакаранне ў адпаведнасці з санкцыяй новага крымінальнага закона, кіруючыся артыкулам 62 гэтага Кодэкса.

3. Закон, які вызначае злачыннасць дзеяння, узмацняе пакаранне або іншым чынам пагаршае становішча асобы, якая здзейсніла гэта дзеянне, адваротнай сілы не мае.

4. Калі крымінальны закон, які дзейнічаў падчас учынення злачынства, быў адменены або зменены крымінальным законам, які ўстараняе злачыннасць дзеяння, змякчае пакаранне або іншым чынам паляпшае становішча асобы, якая ўчыніла злачынства, але да часу расследавання крымінальнай справы або разгляду справы ў судзе ўступіў у сілу іншы больш строгі крымінальны закон, прымяненню падлягае найбольш мяккі прамежкавы закон.

5. Правілы гэтага артыкула прымяняюцца таксама ў выпадках, калі з прычыны адмены або змянення нарматыўнага прававога акта, за парушэнне патрабаванняў якога вызначана крымінальная адказнасць, адпаведнае дзеянне страціла прыкметы злачынства, прадугледжанага гэтым Кодэксам.

## РАЗДЗЕЛ II
## ПАДСТАВЫ І ЎМОВЫ КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ

## ГЛАВА 3
## ЗЛАЧЫННАЕ ДЗЕЯННЕ

### Артыкул 10. Злачынства як падстава крымінальнай адказнасці

Падставай крымінальнай адказнасці з'яўляецца здзяйсненне вінавата забароненага гэтым Кодэксам дзеяння ў выглядзе:

1) скончанага злачынства;

2) прыгатавання да ўчынення злачынства;

3) замаху на ўчыненне злачынства;

4) саўдзелу ва ўчыненні злачынства.

### Артыкул 11. Паняцце злачынства

1. Злачынствам прызнаецца здзейснены вінавата грамадска небяспечны ўчынак (дзеянне або бяздзейнасць), які характарызуецца прыкметамі, прадугледжанымі гэтым Кодэксам, і забаронены ім пад пагрозай пакарання.

2. Злачынства прызнаецца скончаным з моманту здзяйснення ўчынку.

3. Злачынства, звязанае з надыходам наступстваў, указаных у артыкулах Асаблівай часткі гэтага Кодэкса, прызнаецца скончаным пры фактычным надыходзе гэтых наступстваў.

4. Не з'яўляюцца злачынствам дзеянне або бяздзейнасць, якія фармальна змяшчаюць прыкметы якога-небудзь учынку, прадугледжанага гэтым Кодэксам, але з прычыны малазначнасці не маюць грамадскай небяспекі, уласцівай злачынству. Малазначным прызнаецца ўчынак, які не прычыніў і па сваім змесце і накіраванасці не мог прычыніць істотнай шкоды інтарэсам, якія ахоўваюцца крымінальным законам. Такі ўчынак у выпадках, прадугледжаных законам, можа пацягнуць за сабой прымяненне мер адміністрацыйнага або дысцыплінарнага спагнання.

### Артыкул 12. Катэгорыі злачынстваў

1. Злачынствы ў залежнасці ад характару і ступені грамадскай небяспекі падраздзяляюцца на злачынствы, якія не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі, менш цяжкія, цяжкія і асабліва цяжкія.

2. Да злачынстваў, што не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі, адносяцца наўмысныя злачынствы і злачынствы, учыненыя з-за неасцярожнасці, за якія законам прадугледжана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін не большы за два гады або іншае больш мяккае пакаранне.

3. Да менш цяжкіх злачынстваў адносяцца наўмысныя злачынствы, за якія законам прадугледжана максімальнае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін, не большы за шэсць гадоў, а таксама злачынствы, учыненыя з-за неасцярожнасці, за якія законам прадугледжана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін большы за два гады.

4. Да цяжкіх злачынстваў адносяцца наўмысныя злачынствы, за якія законам прадугледжана максімальнае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін не большы за дванаццаць гадоў.

5. Да асабліва цяжкіх злачынстваў адносяцца наўмысныя злачынствы, за якія законам прадугледжана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін большы за дванаццаць гадоў, пажыццёвага пазбаўлення волі або пакарання смерцю.

**Артыкул 13. Прыгатаванне да злачынства**

1. Прыгатаваннем да злачынства прызнаецца падшукванне або прыстасаванне сродкаў ці прылад або іншае наўмыснае стварэнне ўмоў для ўчынення канкрэтнага злачынства.

2. Прыгатаванне да злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, крымінальную адказнасць не цягне за сабой.

3. Адказнасць за прыгатаванне да злачынства надыходзіць па тым жа артыкуле Асаблівай часткі гэтага Кодэкса, што і за скончанае злачынства, са спасылкай на гэты артыкул.

**Артыкул 14. Замах на злачынства**

1. Замахам на злачынства прызнаюцца наўмыснае дзеянне або бяздзейнасць асобы, непасрэдна накіраваныя на ўчыненне злачынства, калі пры гэтым злачынства не было даведзена да канца з-за абставін, якія не залежаць ад гэтай асобы.

2. Адказнасць за замах на злачынства надыходзіць па тым жа артыкуле Асаблівай часткі гэтага Кодэкса, што і за скончанае злачынства, са спасылкай на той артыкул.

**Артыкул 15. Добраахвотная адмова ад злачынства**

1. Добраахвотнай адмовай ад злачынства прызнаецца спыненне асобай падрыхтоўчых дзеянняў або спыненне дзеяння ці бяздзейнасці, непасрэдна накіраваных на ўчыненне злачынства, калі асоба ўсведамляла магчымасць давядзення злачынства да канца.

2. Дзеянне, у дачыненні да якога ажыццёўлена добраахвотная адмова, не цягне за сабой крымінальнай адказнасці. Асоба, якая добраахвотна адмовілася ад давядзення злачынства да канца, падлягае крымінальнай адказнасці толькі ў тым выпадку, калі фактычна ўчыненае ёй дзеянне змяшчае прыкметы іншага злачынства.

3. Добраахвотная адмова арганізатара (кіраўніка) злачынства або падбухоршчыка выключае крымінальную адказнасць, калі гэтыя асобы прадухілілі ўчыненне злачынства. Калі іх дзеянні не прывялі да прадухілення злачынства, то прынятыя імі меры могуць быць прызнаны змякчальнымі акалічнасцямі.

4. Добраахвотная адмова саўдзельніка выключае крымінальную адказнасць, калі асоба да заканчэння выканаўцам злачынства адмовіцца яму ў загадзя абяцаным садзейнічанні або ліквідуе вынікі ўжо аказанай дапамогі.

**Артыкул 16. Саўдзел у злачынстве**

1. Саўдзелам у злачынстве прызнаецца наўмысны сумесны ўдзел дзвюх або больш асоб ва ўчыненні наўмыснага злачынства.

2. Саўдзельнікамі злачынства нароўні з выканаўцамі прызнаюцца арганізатары, падбухоршчыкі і саўдзельнікі.

3. Выканаўцам прызнаецца асоба, якая непасрэдна ўчыніла злачынства, або якая непасрэдна ўдзельнічала ў яго ўчыненні сумесна з іншымі асобамі, або ўчыніла злачынства пры дапамозе выкарыстання іншых асоб, якія не падлягаюць паводле закона крымінальнай адказнасці або ўчынілі злачынства з-за неасцярожнасці.

4. Арганізатарам (кіраўніком) прызнаецца асоба, якая арганізавала ўчыненне злачынства або кіравала яго здзяйсненнем, ці асоба, якая стварыла арганізаваную групу ці злачынную арганізацыю або кіравала імі.

5. Падбухоршчыкам прызнаецца асоба, якая схіліла іншую асобу да ўчынення злачынства.

6. Саўдзельнікам прызнаецца асоба, якая садзейнічала ўчыненню злачынства парадамі, указаннямі, даваннем інфармацыі або прылад і сродкаў учынення злачынства, ліквідацыяй перашкод або аказаннем іншай дапамогі, ці асоба, якая загадзя абяцала схаваць злачынцу, прылады або сродкі ўчынення злачынства, сляды злачынства або прадметы, здабытыя злачынным шляхам, або асоба, якая загадзя абяцала набыць або збыць такія прадметы.

7. Адказнасць арганізатара, падбухторшчыка і саўдзельніка надыходзіць па тым жа артыкуле Асаблівай часткі гэтага Кодэкса, што і выканаўцы, са спасылкай на дадзены артыкул. За дзеянні, якія былі ўчынены выканаўцам і не ахапляліся намерам саўдзельнікаў, іншыя саўдзельнікі крымінальнай адказнасці не нясуць.

8. У выпадку, калі дзеянні арганізатара, падбухторшчыка або саўдзельніка з-за абставін, якія не залежаць ад іх, акажуцца няздзейсненымі, адказнасць гэтых асоб наступае за прыгатаванне да адпаведнага злачынства.

9. Саўдзельнікі нясуць павышаную адказнасць, калі злачынства ўчынена групай асоб, якія непасрэдна прынялі ўдзел у яго ўчыненні (сувыканальніцтва), або арганізаванай групай, або злачыннай арганізацыяй. Удзельнікі арганізаванай групы і злачыннай арганізацыі прызнаюцца выканаўцамі незалежна ад іх ролі ва ўчыненых злачынствах.

**Артыкул 17. Учыненне злачынства групай**

1. Злачынства прызнаецца ўчыненым групай асоб, калі хаця б дзве асобы сумесна ўдзельнічалі ва ўчыненні дадзенага злачынства ў якасці яго выканаўцаў (сувыканальніцтва).

2. Злачынства прызнаецца ўчыненым групай асоб па папярэдняй змове, калі выканаўцы загадзя дамовіліся аб сумесным учыненні дадзенага злачынства.

**Артыкул 18. Арганізаваная група**

1. Злачынства прызнаецца ўчыненым арганізаванай групай, калі яно ўчынена дзвюма або больш асобамі, якія спачатку аб'ядналіся ў кіраваную ўстойлівую групу для сумеснай злачыннай дзейнасці.

2. Арганізатары (кіраўнікі) арганізаванай групы нясуць адказнасць за ўсе ўчыненыя групай злачынствы, калі гэтыя злачынствы ахопліваліся іх намерам. Іншыя ўдзельнікі арганізаванай групы нясуць адказнасць толькі за злачынствы, у падрыхтоўцы або ўчыненні якіх яны ўдзельнічалі.

**Артыкул 19. Злачынная арганізацыя**

1. Злачыннай арганізацыяй прызнаецца аб'яднанне арганізаваных груп або іх арганізатараў (кіраўнікоў), іншых удзельнікаў для распрацоўкі ці рэалізацыі мер для ажыццяўлення злачыннай дзейнасці або стварэння ўмоў для яе падтрымання і развіцця.

2. Удзельнікам злачыннай арганізацыі прызнаецца асоба, якая наўмысна прымае ўдзел у дзейнасці злачыннай арганізацыі або аказвае садзейнічанне ў распрацоўцы ці рэалізацыі мер для ажыццяўлення такой дзейнасці або стварэнні ўмоў для яе падтрымання і развіцця.

3. Злачынства прызнаецца ўчыненым злачыннай арганізацыяй, калі яно ўчынена ўдзельнікам такой арганізацыі дзеля выканання яе злачынных мэт або па заданні злачыннай арганізацыі асобай, якая не з'яўляецца ўдзельнікам дадзенай арганізацыі.

4. Арганізатары (кіраўнікі) злачыннай арганізацыі нясуць адказнасць за ўсе злачынствы, учыненыя дзеля выканання злачынных мэт дадзенай арганізацыі, калі гэтыя злачынствы ахопліваліся іх намерам. Іншыя ўдзельнікі злачыннай арганізацыі нясуць адказнасць толькі за злачынствы, у падрыхтоўцы або ўчыненні якіх яны ўдзельнічалі.

**Артыкул 20. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці ўдзельніка злачыннай арганізацыі або банды**

Удзельнік злачыннай арганізацыі або банды (акрамя арганізатара ці кіраўніка), які добраахвотна заявіў аб існаванні злачыннай арганізацыі або банды і садзейнічаў іх выкрыццю, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці за ўдзел у злачыннай арганізацыі або бандзе і ўчыненыя ім у складзе злачыннай арганізацыі або банды злачынствы, за выключэннем асабліва цяжкіх або цяжкіх злачынстваў, звязаных з замахам на жыццё ці здароўе чалавека.

## ГЛАВА 4
## ВІНА

### Артыкул 21. Віна і яе формы

1. Віна – гэта псіхічныя адносіны асобы да ўчыненага грамадска небяспечнага дзеяння, выражанае ў форме намеру ці неасцярожнасці.

2. Вінаватай у злачынстве можа прызнана толькі асоба ў стане свядомасці, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне наўмысна ці з-за неасцярожнасці.

### Артыкул 22. Учыненне злачынства наўмысна

1. Злачынствам, учыненым наўмысна, прызнаецца грамадска небяспечнае дзеянне, учыненае з прамым або ўскосным намерам.

2. Злачынства прызнаецца ўчыненым з прамым намерам, калі асоба, якая яго ўчыніла, усведамляла грамадскую небяспеку свайго дзеяння або бяздзейнасці, прадбачыла іх грамадска небяспечныя наступствы і жадала іх надыходу.

3. Злачынства прызнаецца ўчыненым з ускосным намерам, калі асоба, якая яго ўчыніла, усведамляла грамадскую небяспеку свайго дзеяння або бяздзейнасці, прадбачыла іх грамадска небяспечныя наступствы, не жадала, але свядома дапускала надыход гэтых наступстваў або ставіліся да іх абыякава.

### Артыкул 23. Учыненне злачынства з-за неасцярожнасці

1. Злачынствам, учыненым з-за неасцярожнасці, прызнаецца калектыўна небяспечнае дзеянне, учыненае з-за легкадумнасці або нядбайнасці.

2. Злачынства прызнаецца ўчыненым з-за легкадумнасці, калі асоба, якая яго ўчыніла, прадбачыла магчымасць надыходу грамадска небяспечных наступстваў свайго дзеяння або бяздзейнасці, але без дастатковых падстаў разлічвала на іх прадухіленне.

3. Злачынства прызнаецца ўчыненым з-за нядбайнасці, калі асоба, якая яго ўчыніла, не прадбачыла магчымасці надыходу грамадска небяспечных наступстваў свайго дзеяння або бяздзейнасці, хаця пры неабходнай уважлівасці і прадбачлівасці павінна была і магла іх прадбачыць.

### Артыкул 24. Віна ў злачынстве, не звязаным з надыходам наступстваў

1. У злачынстве, для наяўнасці якога не патрабуецца надыходу грамадска небяспечных наступстваў, форма віны выяўляецца па дачыненні асобы да грамадска небяспечнага дзеяння.

2. Злачынства прызнаецца ўчыненым наўмысна, калі асоба, якая яго ўчыніла, усведамляла грамадска небяспечны характар свайго дзеяння або бяздзейнасці і жадала яго ўчыніць.

3. Злачынства прызнаецца ўчыненым з-за неасцярожнасці, калі асоба, якая яго ўчыніла, не ўсведамляла грамадска небяспечны характар свайго дзеяння або бяздзейнасці, хаця павінна была і магла гэта ўсведамляць.

### Артыкул 25. Спалучэнне намеру і неасцярожнасці пры ўчыненні злачынства (складаная віна)

Складаная віна характарызуецца наўмысным учыненнем злачынства і неасцярожнасцю ў адносінах да наступстваў, якія надышлі ў выніку гэтага злачынства, з якімі закон звязвае павышаную крымінальную адказнасць. У цэлым такое злачынства прызнаецца ўчыненым наўмысна.

**Артыкул 26. Невінаватае прычыненне шкоды (выпадак)**

Дзеянне прызнаецца ўчыненым невінавата, калі асоба, якая яго ўчыніла, не ўсведамляла і з-за абставін справы не павінна была або не магла ўсведамляць грамадскую небяспеку свайго дзеяння ці бяздзейнасці або не прадбачыла магчымасці надыходу грамадска небяспечных наступстваў і з-за абставін справы не павінна была або не магла іх прадбачыць.

## ГЛАВА 5
## УМОВЫ КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ

**Артыкул 27. Узрост, з якога надыходзіць крымінальная адказнасць**

1. Крымінальнай адказнасці падлягае асоба, якая дасягнула да часу ўчынення злачынства шаснаццацігадовага ўзросту, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных гэтым Кодэксам.

2. Асобы, якія ўчынілі забароненыя гэтым Кодэксам дзеянні ва ўзросце ад чатырнаццаці да шаснаццаці гадоў, падлягаюць крымінальнай адказнасці толькі за:

1) забойства (артыкул 139);
2) прычыненне смерці з-за неасцярожнасці (артыкул 144);
3) наўмыснае прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання (артыкул 147);
4) наўмыснае прычыненне менш цяжкага цялеснага пашкоджання (артыкул 149);
5) згвалтаванне (артыкул 166);
6) насільныя дзеянні сексуальнага характару (артыкул 167);
7) выкраданне чалавека (артыкул 182);
8) крадзеж (артыкул 205);
9) рабаванне (артыкул 206);
10) разбой (артыкул 207);
11) вымаганне (артыкул 208);
11[1]) раскраданне маёмасці шляхам мадыфікацыі камп’ютарнай інфармацыі (артыкул 212);
12) угон транспартнага сродку або маламернага судна (артыкул 214);
13) наўмысныя знішчэнне або пашкоджанне чужой маёмасці (часткі 2 і 3 артыкула 218);
14) захоп заложніка (артыкул 291);
15) раскраданне агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў або выбуховых рэчываў (артыкул 294);
16) наўмыснае прывядзенне ў нягоднасць транспартнага сродку або шляхоў зносін (артыкул 309);
17) раскраданне наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсараў і аналагаў (артыкул 327);
17[1]) незаконнае абарачэнне наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсараў або аналагаў (часткі 2–5 артыкула 328);
18) хуліганства (артыкул 339);
19) заведама ілжывае паведамленне аб небяспецы (артыкул 340);
20) апаганенне збудаванняў і пашкоджанне маёмасці (артыкул 341);
21) уцёкі з папраўчай установы, якая выконвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, арыштнага дома або з-пад варты (артыкул 413).

3. Не падлягае крымінальнай адказнасці непаўналетняя асоба, якая дасягнула прадугледжанага часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула ўзросту, калі будзе выяўлена, што з прычыны адставання ў псіхічным развіцці, не звязанага з псіхічным расстройствам (захворваннем), яна падчас учынення грамадска небяспечнага дзеяння была не здольная ўсведамляць фактычны характар або грамадскую небяспеку свайго дзеяння.

**Артыкул 28. Стан поўнай адсутнасці свядомасці**

1. Не падлягае крымінальнай адказнасці асоба, якая падчас учынення грамадска небяспечнага дзеяння знаходзілася ў стане поўнай адсутнасці свядомасці, гэта значыць не магла ўсведамляць фактычны характар і грамадскую небяспеку свайго дзеяння (бяздзейнасці) або кіраваць ім з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання).

2. Да асобы, прызнанай асобай у стане поўнай адсутнасці свядомасці, судом могуць быць прыменены прымусовыя меры бяспекі і лячэння.

**Артыкул 29. Паменшаная наяўнасць свядомасці**

1. Асоба, якая падчас учынення грамадска небяспечнага дзеяння знаходзілася ў стане паменшанай наяўнасці свядомасці, гэта значыць не магла ў поўнай меры ўсведамляць значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі з прычыны псіхічнага расстройства (захворвання), не вызваляецца ад крымінальнай адказнасці.

2. Стан паменшанай наяўнасці свядомасці можа ўлічвацца пры прызначэнні пакарання або іншых мер крымінальнай адказнасці, а таксама служыць падставай для прымянення да асобы прымусовых мер бяспекі і лячэння.

**Артыкул 30. Крымінальная адказнасць асобы, якая ўчыніла злачынства ў стане ап'янення**

1. Асоба, якая ўчыніла злачынства ў стане алкагольнага ап'янення або ў стане, выкліканым спажываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьвальных рэчываў, падлягае крымінальнай адказнасці.

2. У выпадку ўчынення злачынства асобай, якая хварэе на хранічны алкагалізм, наркаманію або таксікаманію, суд нароўні з прымяненнем пакарання або іншых мер крымінальнай адказнасці можа прызначыць прымусовыя меры бяспекі і лячэння.

**Артыкул 31. Учыненне дзеяння ў стане афекту**

Крымінальная адказнасць за дзеянне, учыненае ў стане раптоўна ўзніклага моцнага душэўнага хвалявання (афекту), выкліканага насіллем, здзекам, цяжкай знявагай або іншымі процізаконнымі ці грубымі амаральнымі дзеяннямі пацярпелага або працяглай псіхатраўматычнай сітуацыяй, якая ўзнікла ў сувязі з сістэматычнымі проціпраўнымі або амаральнымі паводзінамі пацярпелага, калі асоба не магла ў поўнай меры ўсведамляць значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі, надыходзіць толькі ў выпадку наўмыснага прычынення смерці, цяжкага або менш цяжкага цялеснага пашкоджання.

**Артыкул 32. Адміністрацыйная або дысцыплінарная прэюдыцыя**

У выпадках, прадугледжаных Асаблівай часткай гэтага Кодэкса, крымінальная адказнасць за злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, надыходзіць, калі дзеянне ўчынена на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага або дысцыплінарнага спагнання за такое ж парушэнне.

**Артыкул 33. Дзеянні, якія цягнуць за сабой крымінальную адказнасць па патрабаванні**

1. Дзеянні, якія змяшчаюць прыкметы злачынстваў:

1) наўмыснае прычыненне менш цяжкага цялеснага пашкоджання (частка 1 артыкула 149);

2) наўмыснае прычыненне цяжкага або менш цяжкага цялеснага пашкоджання ў стане афекту (артыкул 150);

3) наўмыснае прычыненне цяжкага або менш цяжкага цялеснага пашкоджання пры перавышэнні мер, неабходных для затрымання асобы, якая ўчыніла злачынства (артыкул 151);

4) наўмыснае прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання пры перавышэнні межаў неабходнай абароны (артыкул 152);

5) наўмыснае прычыненне лёгкага цялеснага пашкоджання (артыкул 153);

6) катаванне (частка 1 артыкула 154);

7) прычыненне цяжкага або менш цяжкага цялеснага пашкоджання з-за неасцярожнасці (артыкул 155);

8) згвалтаванне (частка 1 артыкула 166);

9) насільныя дзеянні сексуальнага характару (частка 1 артыкула 167);

10) прымус да дзеянняў сексуальнага характару (частка 1 артыкула 170);

11) выдаванне тайны ўсынаўлення (удачарэння) (артыкул 177);

12) выдаванне ўрачэбнай тайны (часткі 1 і 2 артыкула 178);

13) прымус (артыкул 185);

14) пагроза забойствам, прычыненнем цяжкіх цялесных пашкоджанняў або знішчэннем маёмасці (артыкул 186);

15) паклёп (артыкул 188);

16) парушэнне аўтарскага права, сумежных праў і права прамысловай уласнасці (артыкул 201);

17) парушэнне недатыкальнасці жылля і іншых законных валоданняў грамадзян (частка 1 артыкула 202);

18) парушэнне тайны перапіскі, тэлефонных перагавораў, тэлеграфных або іншых паведамленняў (частка 1 артыкула 203);

19) незаконныя дзеянні ў дачыненні да інфармацыі аб прыватным жыцці і персанальных даных (частка 1 артыкула $203^1$);

20) адмова ў даванні грамадзяніну інфармацыі (артыкул 204);

21) прычыненне маёмаснага ўрону без прыкмет раскрадання (частка 1 артыкула 216);

22) незаконнае адчужэнне даверанай маёмасці (артыкул 217);

23) наўмысныя знішчэнне або пашкоджанне чужой маёмасці (частка 1 артыкула 218);

24) знішчэнне або пашкоджанне чужой маёмасці з-за неасцярожнасці (артыкул 219);

25) ухіленне ад пагашэння крэдыторскай запазычанасці (артыкул 242);

26) прымус да здзяйснення здзелкі або да адмовы ад яе здзяйснення (частка 1 артыкула 246);

27) выдаванне камерцыйнай тайны (артыкул 255);

28) парушэнне правіл бяспекі руху або эксплуатацыі маламерных суднаў (частка 1 артыкула 316);

29) парушэнне правіл дарожнага руху або эксплуатацыі транспартных сродкаў (частка 1 артыкула 317);

30) парушэнне правіл, якія забяспечваюць бяспечную работу транспарту (частка 1 артыкула 321);

31) раскраданне або знішчэнне асабістых дакументаў (артыкул 378);

32) прымус да выканання абавязацельстваў (частка 1 артыкула 384), –

цягнуць за сабой крымінальную адказнасць толькі пры наяўнасці выказанага ва ўстаноўленым крымінальна-працэсуальным законам парадку патрабавання асобы, якая пацярпела ад злачынства, любога з яе дарослых блізкіх сваякоў або членаў сям'і ў выпадках, прадугледжаных крымінальна-працэсуальным законам, або яе законнага прадстаўніка ці прадстаўніка юрыдычнай асобы прыцягнуць вінаватага да крымінальнай адказнасці.

2. Пракурор мае права распачаць крымінальную справу па прыкметах учынення злачынстваў, указаных у гэтым артыкуле, толькі ў выпадках, прадугледжаных крымінальна-працэсуальным законам.

3. Палажэнні частак 1 і 2 гэтага артыкула прымяняюцца і ў выпадках, прадугледжаных часткай 6 заўваг да главы 24 і заўвагай да главы 31 гэтага Кодэкса.

## ГЛАВА 6
## АБСТАВІНЫ, ЯКІЯ ВЫКЛЮЧАЮЦЬ ЗЛАЧЫННАСЦЬ ДЗЕЯННЯ

### Артыкул 34. Неабходная абарона

1. Кожны грамадзянін мае права на абарону ад грамадска небяспечнага замаху. Гэта права належыць асобе незалежна ад магчымасці пазбегнуць замаху або звярнуцца па дапамогу да іншых асоб ці органаў улады.

2. Не з'яўляецца злачынствам дзеянне, учыненае ў стане неабходнай абароны, гэта значыць пры абароне жыцця, здароўя, уласнасці, жылля, праў асобы, якая абараняецца, або іншай асобы, інтарэсаў грамадства ці дзяржавы ад грамадска небяспечнага замаху шляхам прычынення асобе, якая робіць замах, шкоды, калі пры гэтым не было дапушчана перавышэння межаў неабходнай абароны.

3. Перавышэннем межаў неабходнай абароны прызнаецца яўная для асобы, якая абараняецца, неадпаведнасць абароны характару і небяспецы замаху, калі асобе, якая замахваецца, без неабходнасці наўмысна прычыняецца смерць або цяжкае цялеснае пашкоджанне.

4. Не з'яўляюцца перавышэннем межаў неабходнай абароны дзеянні асобы, якая абараняецца, калі гэта асоба з прычыны нечаканасці замаху не магла аб'ектыўна ацаніць характар і небяспеку замаху.

### Артыкул 35. Прычыненне шкоды пры затрыманні асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне

1. Не з'яўляецца злачынствам прычыненне шкоды асобе, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, прадугледжанае гэтым Кодэксам, пры яе затрыманні для перадачы органам улады і стрымання магчымасці ўчынення ёй новых грамадска небяспечных дзеянняў, калі яна спрабуе або можа ўцячы ад следства і суда, калі іншымі сродкамі затрымаць такую асобу не ўяўлялася магчымым і пры гэтым не было дапушчана перавышэння неабходных для гэтага мер.

2. Перавышэннем мер, неабходных для затрымання асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, прадугледжанае гэтым Кодэксам, прызнаецца іх яўная неадпаведнасць характару і ступені грамадскай небяспекі ўчыненага асобай, якая затрымліваецца, грамадска небяспечнага дзеяння і абставінам затрымання, калі асобе без неабходнасці прычыняецца яўна празмерная шкода, якая не выклікаецца становішчам. Такое перавышэнне цягне за сабой крымінальную адказнасць толькі ў выпадках наўмыснага пазбаўлення жыцця або прычынення цяжкага ці менш цяжкага цялеснага пашкоджання.

3. Права на затрыманне асобы, якая ўчыніла грамадска небяспечнае дзеянне, прадугледжанае гэтым Кодэксам, нароўні са спецыяльна ўпаўнаважанымі асобамі маюць таксама пацярпелыя і іншыя грамадзяне.

### Артыкул 36. Крайняя неабходнасць

1. Не з'яўляецца злачынствам дзеянне, учыненае ў стане крайняй неабходнасці, гэта значыць для прадухілення або ліквідацыі небяспекі, якая непасрэдна пагражае асобе, правам і законным інтарэсам дадзенай асобы або іншых асоб, інтарэсам грамадства або дзяржавы, калі гэта небяспека пры дадзеных абставінах не магла быць ліквідавана іншымі сродкамі і калі прычыненая шкода з'яўляецца менш значнай, чым прадухіленая.

2. Стан крайняй неабходнасці прызнаецца таксама ў выпадку, калі дзеянні, учыненыя з мэтай прадухілення небяспекі, не дасягнулі сваёй мэты і шкода надышла, нягледзячы на намаганні асобы, якая добрасумленна разлічвала яе прадухіліць.

**Артыкул 37. Памылка ў наяўнасці абставін, якія выключаюць злачыннасць дзеяння**

1. Калі асоба з прычыны памылкі лічыла, што знаходзіцца ў стане неабходнай абароны ці крайняй неабходнасці або ажыццяўляе затрыманне асобы, якая ўчыніла злачынства, але з-за абставін справы не павінна была або не магла ўсведамляць адсутнасць абставін, якія выключаюць злачыннасць дзеяння, яго дзеянні ацэньваюцца адпаведна па правілах артыкулаў 34, 35 і 36 гэтага Кодэкса.

2. Калі ў становішчы, якое склалася, асоба павінна была і магла прадбачыць адсутнасць абставін, якія выключаюць злачыннасць дзеяння, яна падлягае адказнасці за прычыненне шкоды з-за неасцярожнасці.

**Артыкул 38. Знаходжанне сярод саўдзельнікаў злачынства па спецыяльным заданні**

1. Не падлягае крымінальнай адказнасці асоба, якая, выконваючы ў адпаведнасці з дзейным заканадаўствам спецыяльнае заданне па папярэджанні, выяўленні ці стрыманні злачынства і дзейнічаючы з іншымі яго ўдзельнікамі, вымушана ўчыніць злачынства.

2. Правілы часткі першай гэтага артыкула не прымяняюцца да асобы, якая ўчыніла асабліва цяжкае або цяжкае злачынства, звязанае з замахам на жыццё ці здароўе чалавека.

**Артыкул 39. Дзеянне, звязанае з рызыкай**

1. Не з'яўляецца злачынствам дзеянне (дзеянне або бяздзейнасць), якое прычыніла шкоду праваахоўным інтарэсам, калі гэта дзеянне было здзейснена ва ўмовах абгрунтаванай рызыкі для дасягнення грамадска карыснай мэты.

2. Рызыка прызнаецца абгрунтаванай, калі ўчыненае дзеянне адпавядае сучасным навукова-тэхнічным ведам і вопыту, а пастаўленая мэта не магла быць дасягнута не звязанымі з рызыкай дзеяннямі і асоба, якая дапусціла рызыку, абгрунтавана разлічвала, што прыняла ўсе магчымыя меры для прадухілення шкоды праваахоўным інтарэсам.

$2^1$. Эканамічная (дзелавая) рызыка можа прызнавацца абгрунтаванай, калі пастаўленая мэта магла быць дасягнута і не рызыкоўнымі дзеяннямі (рашэннямі), але з меншым эканамічным вынікам.

3. Рызыка не прызнаецца абгрунтаванай, калі яна заведама была звязана з пагрозай экалагічнай катастрофы, грамадскага бедства, надыходу смерці або прычынення цяжкага цялеснага пашкоджання асобе, якая не выказала згоды на тое, каб яе жыццё ці здароўе былі пастаўлены ў небяспеку.

**Артыкул 40. Выкананне загада або распараджэння**

1. Не з'яўляецца злачынствам прычыненне шкоды інтарэсам, якія ахоўваюцца гэтым Кодэксам, асобай, якая дзейнічае дзеля выканання абавязковага для яе загаду або распараджэння, аддадзеных ва ўстаноўленым парадку. Крымінальную адказнасць за прычыненне такой шкоды нясе асоба, якая аддала незаконны загад або распараджэнне.

2. Асоба, якая ўчыніла наўмыснае злачынства па заведама злачынным загадзе або распараджэнні, нясе крымінальную адказнасць на агульных падставах.

3. Асоба, якая не выканала заведама незаконны загад або распараджэнне, не падлягае крымінальнай адказнасці.

## ГЛАВА 7
## МНОЖНАСЦЬ ЗЛАЧЫНСТВАЎ

**Артыкул 41. Выключаны**

**Артыкул 42. Сукупнасць злачынстваў**

1. Сукупнасцю злачынстваў прызнаюцца ўчыненне двух або больш злачынстваў, прадугледжаных рознымі артыкуламі Асаблівай часткі гэтага Кодэкса або рознымі часткамі аднаго і таго ж артыкула, а таксама ўчыненне злачынстваў, прадугледжаных адным і тым жа артыкулам Асаблівай часткі гэтага Кодэкса, з якіх адны кваліфікуюцца як скончанае злачынства, а іншыя – як прыгатаванне, замах або саўдзел у злачынстве, ні за адно з якіх асоба не была асуджана. Пры гэтым асоба нясе крымінальную адказнасць за кожнае ўчыненае злачынства па адпаведным артыкуле гэтага Кодэкса.

2. Калі злачынства прадугледжана рознымі артыкуламі Асаблівай часткі гэтага Кодэкса, з якіх адна норма з'яўляецца агульнай, а іншая спецыяльнай, сукупнасць злачынстваў адсутнічае і крымінальная адказнасць надыходзіць па спецыяльнай норме.

**Артыкул 43. Рэцыдыў злачынстваў**

1. Рэцыдывам злачынстваў прызнаецца ўчыненне наўмыснага злачынства асобай, якая мае судзімасць за наўмыснае злачынства.

2. Рэцыдыў злачынстваў прызнаецца небяспечным:

1) пры ўчыненні асобай наўмыснага злачынства, за якое яна асуджаецца да пазбаўлення волі, калі раней гэта асоба была не менш чым тры разы асуджана і адбывала пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі за наўмысныя злачынствы;

2) пры ўчыненні асобай цяжкага злачынства, калі раней яна не менш чым два разы была асуджана і адбывала пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі за цяжкія злачынствы або была асуджана і адбывала пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі за асабліва цяжкае злачынства;

3) пры ўчыненні асобай асабліва цяжкага злачынства, калі раней яна не менш чым два разы была асуджана і адбывала пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі за цяжкія злачынствы.

3. Рэцыдыў злачынстваў прызнаецца асабліва небяспечным:

1) пры ўчыненні асобай цяжкага злачынства, калі раней яна не менш чым два разы была асуджана і адбывала пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі за асабліва цяжкія злачынствы;

2) пры ўчыненні асобай асабліва цяжкага злачынства, калі раней яна была асуджана і адбывала пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі за асабліва цяжкае злачынства.

4. Судзімасці за злачынствы, учыненыя асобай ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, або судзімасці, знятыя ці пагашаныя ва ўстаноўленым законам парадку, не ўлічваюцца пры прызнанні рэцыдыву злачынстваў.

5. Рэцыдыў злачынстваў цягне за сабой больш строгае пакаранне на падставе і ў межах, устаноўленых гэтым Кодэксам.

# РАЗДЗЕЛ III
# КРЫМІНАЛЬНАЯ АДКАЗНАСЦЬ

## ГЛАВА 8
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ АБ КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ

**Артыкул 44. Крымінальная адказнасць і яе мэты**

1. Крымінальная адказнасць выяўляецца ў асуджэнні ад імя Рэспублікі Беларусь па прыгаворы суда асобы, якая ўчыніла злачынства, і прымяненні на аснове асуджэння пакарання або іншых мер крымінальнай адказнасці ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам.

2. Крымінальная адказнасць мае мэтай выпраўленне асобы, якая ўчыніла злачынства, і папярэджанне ўчынення новых злачынстваў як асуджаным, так і іншымі асобамі.

3. Крымінальная адказнасць заклікана садзейнічаць аднаўленню сацыяльнай справядлівасці. Асуджэнне асобы, якая ўчыніла злачынства, з'яўляецца падставай для спагнання з яе як маёмаснага ўрону, даходу, атрыманага злачынным шляхам, так і матэрыяльнага пакрыцця маральнай шкоды.

**Артыкул 45. Судзімасць**

1. Асуджэнне асобы за ўчыненае ёй злачынства стварае прававы стан судзімасці, які заключаецца ў магчымасці прымянення да асуджанага пакарання або іншых мер крымінальнай адказнасці ў адпаведнасці з прыгаворам суда і гэтым Кодэксам.

2. Асоба лічыцца судзімай з дня ўступлення ў законную сілу прыгавору суда аж да пагашэння або зняцця судзімасці, калі прыгавор не быў адменены ва ўстаноўленым законам парадку.

3. У выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам, на працягу тэрміну судзімасці за асуджаным можа ажыццяўляцца прафілактычнае назіранне або прэвентыўны нагляд. Парадак і ўмовы ажыццяўлення прафілактычнага назірання і прэвентыўнага нагляду вызначаюцца Крымінальна-выканаўчым кодэксам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 46. Рэалізацыя крымінальнай адказнасці**

1. Крымінальная адказнасць рэалізуецца ў асуджэнні:
1) з прымяненнем прызначанага пакарання;
2) з адтэрміноўкай выканання прызначанага пакарання;
3) з умоўным непрымяненнем прызначанага пакарання;
4) без прызначэння пакарання;
5) з прымяненнем у дачыненні да непаўналетніх прымусовых мер выхаваўчага характару.

2. Пры ўчыненні злачынства нароўні з крымінальнай адказнасцю, а таксама пры вызваленні асобы ад крымінальнай адказнасці на падставах, прадугледжаных гэтым Кодэксам, прымяняецца спецыяльная канфіскацыя.

**Артыкул 46[1]. Спецыяльная канфіскацыя**

1. Пры ўчыненні злачынства падлягаюць спецыяльнай канфіскацыі, гэта значыць прымусоваму бязвыплатнаму адабранню ва ўласнасць дзяржавы: маёмасць, здабытая злачынным шляхам або набытая на сродкі, здабытыя злачынным шляхам; даход, атрыманы ад выкарыстання гэтай маёмасці, а таксама прадметы злачынства, калі яны не падлягаюць вяртанню пацярпеламу або іншай асобе; прылады і сродкі ўчынення злачынства, якія належаць асобе, што ўчыніла злачынства; рэчы, забраныя з абарачэння. Незалежна ад права ўласнасці падлягае спецыяльнай канфіскацыі транспартны сродак, якім кіравала асоба, што ўчыніла злачынства, прадугледжанае артыкулам 317[1] гэтага Кодэкса (за выключэннем транспартных сродкаў, якія выбылі з законнага валодання ўласніка (карыстальніка) без яго волі або ў выніку проціпраўных дзеянняў іншых асоб).

2. Калі спецыяльная канфіскацыя маёмасці, здабытай злачынным шляхам або набытай на сродкі, здабытыя злачынным шляхам, даходу, атрыманага ад выкарыстання гэтай маёмасці, на момант прыняцця рашэння аб спецыяльнай канфіскацыі немагчымая з прычыны страты, зрасходавання, знішчэння, рэалізацыі або з-за іншых прычын, з асуджанага, асобы, вызваленай ад крымінальнай адказнасці, у даход дзяржавы спаганяецца грашовая сума, якая адпавядае

кошту маёмасці, здабытай злачынным шляхам або набытай на сродкі, здабытыя злачынным шляхам, і (або) памеру даходу, атрыманага ад выкарыстання гэтай маёмасці. Памер грашовай сумы, якая падлягае спагнанню, вызначаецца судом на дзень вынясення прыгавору, пастановы, прысуду.

## ГЛАВА 9
## ПАКАРАННЕ І ЯГО ВІДЫ

### Артыкул 47. Паняцце пакарання

Пакаранне з'яўляецца прымусовай мерай крымінальна-прававога ўздзеяння, якая прымяняецца паводле прыгавору суда да асобы, асуджанай за злачынства, і заключаецца ў прадугледжаных законам пазбаўленні або абмежаванні праў і свабод асуджанага.

### Артыкул 48. Віды пакаранняў

1. Да асоб, якія ўчынілі злачынства, прымяняюцца наступныя асноўныя пакаранні:
1) грамадскія працы;
2) штраф;
3) пазбаўленне права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю;
4) папраўчыя працы;
5) абмежаванне па ваеннай службе;
6) арышт;
7) абмежаванне волі;
8) пазбаўленне волі на пэўны тэрмін;
9) пажыццёвае пазбаўленне волі;
10) пакаранне смерцю (да яго адмены).
2. Акрамя асноўных пакаранняў, да асоб, якія ўчынілі злачынства, у якасці дадатковага пакарання можа прымяняцца пазбаўленне воінскага або спецыяльнага звання.
3. Штраф і пазбаўленне права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю могуць прымяняцца ў якасці не толькі асноўнага, але і дадатковага пакарання.
4. Штраф і (або) пазбаўленне права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, якія прымяняюцца ў якасці дадатковага пакарання, указваюцца ў Асаблівай частцы гэтага Кодэкса пасля найбольш строгага з асноўных відаў пакарання і могуць быць прызначаны да любога з асноўных пакаранняў, прадугледжаных санкцыяй адпаведнага артыкула Асаблівай часткі гэтага Кодэкса, калі іншае не прадугледжана Агульнай часткай гэтага Кодэкса, а таксама не ўказана ў санкцыі артыкула Асаблівай часткі гэтага Кодэкса.

### Артыкул 49. Грамадскія працы

1. Грамадскія працы заключаюцца ў выкананні асуджаным бясплатнай працы на карысць грамадства, від якой вызначаюць органы, што кіруюць прымяненнем грамадскіх прац.
2. Грамадскія працы ўстанаўліваюцца на тэрмін ад шасцідзесяці да двухсот сарока гадзін. Асуджаныя, якія атрымліваюць адукацыю або маюць пастаяннае месца працы, грамадскія працы адбываюць не больш за чатыры гадзіны ў дзень у вольны ад навучання або асноўнай працы час. Асуджаныя, якія не атрымліваюць адукацыю і не маюць пастаяннага месца працы, грамадскія працы з іх згоды могуць адбываць больш за чатыры, але не больш за восем гадзін у дзень.
3. Па меркаванні суда грамадскія працы могуць прызначацца і ў якасці дадатковага пакарання да штрафу або пазбаўлення права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.
4. Грамадскія працы не могуць быць прызначаны:
1) асобам, якія не дасягнулі шаснаццацігадовага ўзросту;

2) асобам, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту;
3) цяжарным жанчынам;
4) асобам, якія знаходзяцца ў водпуску для догляду за дзіцём;
5) інвалідам I і II групы;
6) ваеннаслужачым;
7) замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства, якія не пражываюць пастаянна ў Рэспубліцы Беларусь;
8) асобам, хворым на актыўную форму туберкулёзу.

5. У выпадку ўзнікнення ў перыяд адбывання асобай грамадскіх прац абставін, прадугледжаных часткай 4 гэтага артыкула, суд па прадстаўленні органа, на які ўскладзена выкананне прыгавору, вызваляе асобу ад далейшага адбывання пакарання.

**Артыкул 50. Штраф**

1. Штраф ёсць грашовае спагнанне, якое прызначаецца судом у выпадках, устаноўленых гэтым Кодэксам.

2. Памер штрафу вызначаецца з улікам памеру базавай велічыні, устаноўленага на дзень пастановы прыгавору, у залежнасці ад характару і ступені грамадскай небяспекі ўчыненага злачынства і матэрыяльнага становішча асуджанага і ўстанаўліваецца ў межах ад трыццаці да адной тысячы базавых велічынь. За злачынствы супраць парадку ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці і супраць інтарэсаў службы штраф устанаўліваецца ў памеры ад трохсот да пяці тысяч базавых велічынь. Пры гэтым памер штрафу, які прызначаецца асобе за ўчыненае ёй злачынства, прадугледжанае артыкулам Асаблівай часткі гэтага Кодэкса, які ўтрымлівае адміністрацыйную прэюдыцыю, не можа быць меншы за максімальны памер штрафу, які накладаецца ў адміністрацыйным парадку.

3. У выпадку немагчымасці спагнання штрафу пры адсутнасці прыкмет ухілення ад яго выплаты суд па прадстаўленні органа, на які ўскладзена выкананне прыгавору, замяняе штраф грамадскімі працамі ў адпаведнасці з артыкулам 49 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 51. Пазбаўленне права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю**

1. Пазбаўленне права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю можа быць прызначана судом у залежнасці ад характару і цяжару ўчыненага злачынства на тэрмін ад аднаго года да пяці гадоў, а ў выпадках, прадугледжаных часткамі 4 і 5 артыкула 317 і артыкулам 317[1] гэтага Кодэкса, – на тэрмін ад аднаго года да васьмі гадоў.

2. Пазбаўленне права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю ў якасці дадатковага пакарання можа прызначацца судом і ў выпадку, калі гэты від пакарання не прадугледжаны ў артыкуле Асаблівай часткі гэтага Кодэкса, калі, зыходзячы з характару ўчыненага асобай злачынства, звязанага з займанай пасадай ці з займаннем пэўнай дзейнасцю, суд прызнае немагчымым захаванне за ёй права займаць пэўную пасаду ці займацца пэўнай дзейнасцю.

3. Пазбаўленне права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю не можа прызначацца ў якасці дадатковага пакарання да грамадскіх прац і штрафу.

4. Пры прызначэнні пакарання ў выглядзе пазбаўлення права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю ў якасці асноўнага пакарання, дадатковага пакарання да папраўчых прац, абмежавання па ваеннай службе, абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, пры адтэрміноўцы выканання пакарання і ўмоўным непрымяненні пакарання, калі выкананне дадатковага пакарання не адтэрмінавана, тэрмін выканання пакарання ў выглядзе пазбаўлення права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю лічыцца з дня ўступлення прыгавору суда ў законную сілу. Пры прызначэнні гэтага пакарання ў якасці дадатковага да арышту, абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага

тыпу або пазбаўлення волі яно распаўсюджваецца на ўвесь час адбывання асуджаным асноўнага пакарання і звыш таго – на тэрмін, устаноўлены прыгаворам.

**Артыкул 52. Папраўчыя працы**

1. Папраўчыя працы ўстанаўліваюцца на тэрмін ад шасці месяцаў да двух гадоў і адбываюцца на падставе прыгавору суда па месцы працы асуджанага.

2. З заробку па асноўным месцы працы асуджанага да папраўчых прац праводзіцца вылічэнне ў даход дзяржавы ў памеры, устаноўленым прыгаворам суда, у межах ад дзесяці да дваццаці пяці працэнтаў, але не менш чым адной базавай велічыні штомесяц.

3. Папраўчыя працы не могуць быць прызначаны:

1) асобам, якія не дасягнулі шаснаццацігадовага ўзросту;

2) асобам, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту;

3) цяжарным жанчынам;

4) асобам, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе за дзіцём;

5) інвалідам I і II групы;

6) ваеннаслужачым і рэзервістам;

7) замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства, якія не пражываюць пастаянна ў Рэспубліцы Беларусь;

8) асобам, хворым на актыўную форму туберкулёзу, якія не маюць пастаяннага месца працы.

4. Замест папраўчых прац прызначаецца абмежаванне па ваеннай службе:

1) афіцэрам;

2) іншым ваеннаслужачым, якія праходзяць ваенную службу па кантракце.

5. Ваеннаслужачым тэрміновай ваеннай службы, а таксама рэзервістам замест папраўчых прац прызначаецца арышт на тэрмін да трох месяцаў.

6. У выпадку ўзнікнення ў перыяд адбывання асобай папраўчых прац абставін, прадугледжаных часткай 3 гэтага артыкула, суд па прадстаўленні органа, на які ўскладзена выкананне прыгавору, вызваляе асобу ад далейшага адбывання пакарання або замяняе неадбытую частку пакарання на больш мяккае пакаранне.

**Артыкул 53. Абмежаванне па ваеннай службе**

1. Абмежаванне па ваеннай службе прызначаецца афіцэрам і іншым ваеннаслужачым, якія праходзяць ваенную службу па кантракце, на тэрмін ад трох месяцаў да двух гадоў у выпадках, прадугледжаных адпаведнымі артыкуламі Асаблівай часткі гэтага Кодэкса за ўчыненне злачынстваў супраць воінскай службы, а таксама замест папраўчых прац, прадугледжаных за іншыя злачынствы.

2. З грашовага забеспячэння асуджанага да абмежавання па ваеннай службе праводзіцца вылічэнне ў даход дзяржавы ў памеры, устаноўленым прыгаворам суда, у межах ад дзесяці да дваццаці пяці працэнтаў. Падчас адбывання гэтага пакарання асуджаны не можа быць павышаны ў пасадзе, воінскім званні, а тэрмін пакарання не залічваецца ў тэрмін выслугі гадоў для прысваення чарговага воінскага звання.

3. Абмежаванне па ваеннай службе не можа быць прызначана:

1) асобам, якія маюць выслугу гадоў для прызначэння пенсіі, або дасягнулі гранічнага ўзросту знаходжання на ваеннай службе, або маюць права на звальненне па стане здароўя;

2) цяжарным жанчынам;

3) асобам, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе за дзіцём.

4. У выпадку ўзнікнення ў перыяд адбывання асобай пакарання ў выглядзе абмежавання па ваеннай службе абставін, прадугледжаных часткай трэцяй гэтага артыкула, а таксама іншых абставін, якія з'яўляюцца падставай для звальнення з ваеннай службы ў адпаведнасці з заканадаўствам, суд па прадстаўленні органа, на які ўскладзена выкананне прыгавору, вызваляе

асобу ад далейшага адбывання пакарання або замяняе неадбытую частку пакарання на больш мяккае пакаранне.

**Артыкул 54. Арышт**

1. Арышт заключаецца ва ўтрыманні асуджанага ва ўмовах строгай ізаляцыі і ўстанаўліваецца на тэрмін ад аднаго да трох месяцаў.

2. Арышт не можа быць прызначаны:

1) выключаны;

2) цяжарным жанчынам;

3) жанчынам і адзінокім мужчынам, якія маюць дзяцей ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў або дзяцей-інвалідаў;

4) інвалідам I і II групы.

3. Ваеннаслужачыя адбываюць арышт на гаўптвахце ваеннай камендатуры.

**Артыкул 55. Абмежаванне волі**

1. Абмежаванне волі заключаецца ў накладанні на асуджанага абавязкаў, якія абмяжоўваюць яго волю, і знаходжанні яго ва ўмовах ажыццяўлення за ім нагляду органамі і ўстановамі, якія кіруюць выкананнем пакарання.

2. Абмежаванне волі ўстанаўліваецца на тэрмін ад шасці месяцаў да пяці гадоў.

3. Пакаранне ў выглядзе абмежавання волі прызначаецца з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. З улікам асобы вінаватага, характару і ступені грамадскай небяспекі ўчыненага злачынства, наяўнасці ў яго пастаяннага месца жыхарства суд можа прызначыць пакаранне ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

4. Абмежаванне волі не можа быць прызначана:

1) ваеннаслужачым тэрміновай ваеннай службы;

2) замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства, якія не пражываюць пастаянна ў Рэспубліцы Беларусь.

5. Абмежаванне волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу не можа быць прызначана:

1) асобам, якія не дасягнулі васямнаццацігадовага ўзросту да дня пастановы прыгавору;

2) асобам, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту;

3) цяжарным жанчынам;

4) жанчынам і адзінокім мужчынам, якія выхоўваюць дзяцей ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў або дзяцей-інвалідаў;

5) інвалідам;

6) асобам, якім прызначаны прымусовыя меры бяспекі і лячэння, асобам, хворым на актыўную форму туберкулёзу, ВІЧ-інфікаваным, хворым на СНІД або не тым, хто не прайшоў поўнага курса лячэння венерычнага захворвання.

6. Асуджаныя да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, асуджаныя да абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, за выключэннем асоб, пералічаных у частцы 5 гэтага артыкула і асоб, якія атрымліваюць адукацыю ў дзённай форме атрымання адукацыі, прыцягваюцца да працы ў абавязковым парадку органамі і ўстановамі, якія кіруюць выкананнем пакарання.

7. У выпадку ўзнікнення абставін, прадугледжаных часткай 5 гэтага артыкула, у перыяд адбывання асуджаным пакарання ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу суд па прадстаўленні ўстановы, на якую ўскладзена выкананне пакарання, прымае рашэнне аб пераводзе асуджанага для далейшага адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу або вызваляе асуджанага ад далейшага адбывання пакарання.

**Артыкул 56. Выключаны**

**Артыкул 57. Пазбаўленне волі на пэўны тэрмін**

1. Пазбаўленне волі ўстанаўліваецца на тэрмін ад шасці месяцаў да дванаццаці гадоў, за асабліва цяжкія злачынствы – на тэрмін, большы за дванаццаць гадоў, але не большы за пятнаццаць гадоў, а за асабліва цяжкія злачынствы, звязаныя з наўмысным замахам на жыццё чалавека або з незаконным абарачэннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсараў ці аналагаў, або злачынствы супраць дзяржавы – на тэрмін, не большы за дваццаць пяць гадоў.

2. Тэрмін пазбаўлення волі за злачынствы, учыненыя з-за неасцярожнасці, не можа перавышаць дзесяць гадоў.

3. Дарослым асобам адбыванне пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі прызначаецца ў папраўчых калоніях ва ўмовах пасялення, папраўчых калоніях ва ўмовах агульнага, узмоцненага, строгага ці асаблівага рэжымаў або ў турме.

4. Мужчынам адбыванне пакарання прызначаецца:

1) асуджаным да пазбаўлення волі за злачынствы, учыненыя з-за неасцярожнасці, – у папраўчых калоніях ва ўмовах пасялення;

2) асуджаным упершыню да пазбаўлення волі за наўмысныя злачынствы, якія не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі, або менш цяжкія злачынствы – у папраўчых калоніях ва ўмовах агульнага рэжыму;

3) асуджаным упершыню да пазбаўлення волі за цяжкія або асабліва цяжкія злачынствы – у папраўчых калоніях ва ўмовах узмоцненага рэжыму;

4) пры рэцыдыве злачынстваў, калі асуджаны раней адбываў пазбаўленне волі, – у папраўчых калоніях ва ўмовах строгага рэжыму;

5) асуджаным да пазбаўлення волі пры асабліва небяспечным рэцыдыве – у папраўчых калоніях ва ўмовах асаблівага рэжыму.

5. Жанчынам адбыванне пакарання прызначаецца:

1) асуджаным да пазбаўлення волі за злачынствы, учыненыя з-за неасцярожнасці, – у папраўчых калоніях ва ўмовах пасялення;

2) іншым асуджаным да пазбаўлення волі за наўмысныя злачынствы – у папраўчых калоніях ва ўмовах агульнага рэжыму;

3) пры асабліва небяспечным рэцыдыве – у папраўчых калоніях ва ўмовах строгага рэжыму.

6. У залежнасці ад характару і ступені грамадскай небяспекі ўчыненага злачынства, асобы вінаватага і іншых абставін справы суд з указаннем матываў прынятага рашэння можа прызначыць адбыванне пазбаўлення волі:

1) асуджаным за злачынствы, учыненыя з-за неасцярожнасці, – у папраўчых калоніях ва ўмовах агульнага рэжыму;

2) іншым асуджаным да пазбаўлення волі, але пры адсутнасці асабліва небяспечнага рэцыдыву – у папраўчых калоніях ва ўмовах агульнага, узмоцненага або строгага рэжыму.

7. Пазбаўленне волі ў выглядзе зняволення ў турме можа быць прызначана на частку тэрміну пакарання, але не больш чым на пяць год:

1) пры асабліва небяспечным рэцыдыве;

2) дарослым асобам, якія ўчынілі асабліва цяжкія злачынствы, асуджаным за іх да пазбаўлення волі на тэрмін большы за пяць гадоў.

8. Пасля адбыцця асобай, асуджанай да пазбаўлення волі на тэрмін большы за дваццаць пяць гадоў, дваццаці гадоў пазбаўлення волі суд, улічваючы паводзіны асуджанага, стан яго здароўя або ўзрост, можа вызваліць асуджанага ад адбывання часткі пакарання, якая перавышае дваццаць пяць гадоў пазбаўлення волі.

**Артыкул 58. Пажыццёвае пазбаўленне волі**

1. У якасці выключнай меры пакарання як альтэрнатыва пакарання смерцю дапускаецца прымяненне пажыццёвага пазбаўлення волі за злачынствы, звязаныя з наўмысным пазбаўленнем жыцця чалавека пры абцяжваючых абставінах.

2. Пажыццёвае пазбаўленне волі не можа быць прызначана:

1) асобам, якія ўчынілі злачынства ва ўзросце да васямнаццаці гадоў;

2) жанчынам;

3) мужчынам, якія дасягнулі да дня пастановы прыгавору шасцідзесяці пяці гадоў.

3. Асуджаныя да пажыццёвага пазбаўлення волі адбываюць пакаранне ў папраўчай калоніі асаблівага рэжыму або ў турме.

4. Пасля адбыцця дваццаці гадоў асобай, асуджанай да пажыццёвага пазбаўлення волі, або асобай, якой пакаранне смерцю ў парадку памілавання заменена пажыццёвым пазбаўленнем волі, суд, улічваючы паводзіны асуджанага, стан яго здароўя або ўзрост, можа замяніць далейшае адбыванне пажыццёвага пазбаўлення волі пазбаўленнем волі на пэўны тэрмін, але не больш за пяць гадоў.

**Артыкул 59. Пакаранне смерцю**

1. У якасці выключнай меры пакарання дапускаецца прымяненне пакарання смерцю – расстрэлу за некаторыя асабліва цяжкія злачынствы, звязаныя з наўмысным пазбаўленнем жыцця чалавека пры абцяжваючых абставінах (да адмены пакарання смерцю).

2. Пакаранне смерцю не можа прызначана:

1) асобам, якія ўчынілі злачынства ва ўзросце да васямнаццаці гадоў;

2) жанчынам;

3) мужчынам, якія дасягнулі да дня пастановы прыгавору шасцідзесяці пяці гадоў.

3. Пакаранне смерцю ў парадку памілавання можа быць заменена пажыццёвым пазбаўленнем волі.

**Артыкул 60. Пазбаўленне воінскага або спецыяльнага звання**

Пры асуджэнні за цяжкае або асабліва цяжкае злачынства асоба, якая мае воінскае або спецыяльнае званне, можа быць па прыгаворы суда пазбаўлена гэтага звання.

**Артыкул 61. Выключаны**

## ГЛАВА 10
## ПРЫЗНАЧЭННЕ ПАКАРАННЯ

**Артыкул 62. Агульныя прынцыпы прызначэння пакарання**

1. Суд прызначае пакаранне з улікам палажэнняў Агульнай часткі гэтага Кодэкса ў межах, устаноўленых артыкулам Асаблівай часткі, які прадугледжвае адказнасць за ўчыненае злачынства. Прызначаючы пакаранне ў выглядзе грамадскіх прац, штрафу, пазбаўлення права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, суд кіруецца межамі, устаноўленымі ў артыкулах 49, 50 і 51 гэтага Кодэкса. Пры прызначэнні пакарання суд зыходзіць з прынцыпу індывідуалізацыі пакарання, гэта значыць улічвае характар і ступень грамадскай небяспекі ўчыненага злачынства, матывы і мэты ўчыненага, асобу вінаватага, характар нанесенай шкоды і памер прычыненага ўрону, даходу, атрыманага злачынным шляхам, абставіны, якія змякчаюць і абцяжваюць адказнасць, меркаванне пацярпелага аб справах прыватнага абвінавачання, матывуючы выбраную меру пакарання ў прыгаворы.

2. Пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі можа быць прызначана толькі пры ўмове, што мэты крымінальнай адказнасці не могуць быць дасягнуты прымяненнем больш мяккага пакарання, прадугледжанага адпаведным артыкулам Асаблівай часткі гэтага Кодэкса.

### Артыкул 63. Абставіны, якія змякчаюць адказнасць

1. Абставінамі, якія змякчаюць адказнасць, прызнаюцца:
1) яўка з пакаяннем;
2) шчырае раскаянне ва ўчыненым злачынстве;
3) актыўнае садзейнічанне выяўленню злачынства, выкрыццю іншых удзельнікаў злачынства, вышуку маёмасці, набытай злачынным шляхам;
4) аказанне медыцынскай або іншай дапамогі пацярпеламу непасрэдна пасля злачынства; добраахвотныя пакрыццё ўрону, выплата даходу, атрыманага злачынным шляхам, ліквідацыя шкоды, прычыненай злачынствам; іншыя дзеянні, накіраваныя на загладжванне такой шкоды;
5) наяўнасць на ўтрыманні ў вінаватага малалетняга дзіцяці;
6) учыненне злачынства з прычыны збегу цяжкіх асабістых, сямейных або іншых абставін;
7) учыненне злачынства пад уплывам пагрозы ці прымусу або з прычыны матэрыяльнай, службовай ці іншай залежнасці;
8) учыненне злачынства пад уплывам проціпраўных або амаральных дзеянняў пацярпелага;
9) учыненне злачынства пры парушэнні ўмоў правамернасці крайняй неабходнасці, знаходжання сярод саўдзельнікаў злачынства па спецыяльным заданні, абгрунтаванай рызыкі, выканання загаду або распараджэння;
10) учыненне злачынства цяжарнай жанчынай;
11) учыненне злачынства састарэлай асобай.
2. Суд можа прызнаць абставінамі, якія змякчаюць адказнасць, і іншыя абставіны, не ўказаныя ў гэтым артыкуле.
3. Змякчальныя абставіны, прадугледжаныя артыкулам Асаблівай часткі гэтага Кодэкса ў якасці прыкметы злачынства, не могуць улічвацца пры вызначэнні меры адказнасці вінаватага.

### Артыкул 64. Абставіны, якія абцяжваюць адказнасць

1. Абставінамі, якія абцяжваюць адказнасць, прызнаюцца:
1) учыненне злачынства асобай, якая раней учыніла якое-небудзь злачынства, калі не скончыліся тэрміны даўнасці або не пагашана ці не знята судзімасць за папярэдняе злачынства. Суд мае права ў залежнасці ад характару злачынстваў не прызнаць гэтыя абставіны абцяжваючымі;
2) учыненне злачынства ў дачыненні да заведама малалетняй, састарэлай асобы або асобы, якая знаходзіцца ў бездапаможным стане;
3) учыненне злачынства ў дачыненні да заведама для вінаватага цяжарнай жанчыны;
4) учыненне злачынства агульнанебяспечным спосабам;
5) учыненне злачынства з асаблівай жорсткасцю або здзекам;
6) учыненне злачынства ў дачыненні да асобы, якая знаходзіцца ў матэрыяльнай, службовай або іншай залежнасці ад вінаватага;
7) учыненне злачынства ў дачыненні да асобы або яе блізкіх у сувязі з ажыццяўленнем ёй службовай дзейнасці або выкананнем грамадскага абавязку;
8) учыненне злачынства з карыслівых ці іншых нізкіх меркаванняў;
9) учыненне злачынства з-за расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці ці звады, палітычнай ці ідэалагічнай варожасці, а таксама з-за варожасці ці звады ў дачыненні да якой-небудзь сацыяльнай групы;
10) учыненне злачынства з мэтай схаваць іншае злачынства ці аблягчыць яго ўчыненне;
11) учыненне злачынства групай асоб па папярэдняй змове, арганізаванай групай ці злачыннай арганізацыяй;
12) учыненне злачынства асобай, якая парушыла тым самым прынятую ёй прысягу або прафесійную клятву;
13) учыненне злачынства, якое выклікала цяжкія наступствы;

14) учыненне злачынства з выкарыстаннем заведама малалетняй асобы або асобы, якая заведама для вінаватага хварэе на псіхічнае расстройства (захворванне);

15) учыненне злачынства з выкарыстаннем умоў грамадскага бедства або надзвычайнага становішча;

16) учыненне злачынства з-за неасцярожнасці з прычыны свядомага парушэння ўстаноўленых правіл бяспекі;

17) учыненне злачынства асобай, якая знаходзіцца ў стане алкагольнага ап'янення або ў стане, выкліканым спажываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьвальных рэчываў. Суд мае права ў залежнасці ад характару злачынства не прызнаць гэтыя абставіны абцяжваючымі.

2. Суд не можа прызнаць абцяжваючымі абставіны, не ўказаныя ў гэтым артыкуле.

3. Абцяжваючыя абставіны, прадугледжаныя артыкулам Асаблівай часткі гэтага Кодэкса ў якасці прыкметы злачынства, не могуць улічвацца пры вызначэнні меры адказнасці вінаватага.

**Артыкул 65. Прызначэнне пакарання пры рэцыдыве злачынстваў**

1. Пры прызначэнні пакарання за рэцыдыў, небяспечны рэцыдыў або асабліва небяспечны рэцыдыў злачынстваў улічваюцца колькасць, характар і ступень грамадскай небяспекі раней учыненых злачынстваў, абставіны, з прычыны якіх папраўчае ўздзеянне папярэдняга пакарання аказалася недастатковым, а таксама характар і ступень грамадскай небяспекі ізноў учыненага злачынства.

2. Тэрмін пакарання пры небяспечным рэцыдыве не можа быць меншы за палову, а пры асабліва небяспечным рэцыдыве – меншы за дзве трэці максімальнага тэрміну найбольш строгага віду пакарання, прадугледжанага за ўчыненае злачынства.

3. Пры наяўнасці выключных абставін, прадугледжаных артыкулам 70 гэтага Кодэкса, а таксама пры выкананні абавязацельстваў, прадугледжаных дасудовым пагадненнем аб супрацоўніцтве, пакаранне за небяспечны рэцыдыў або асабліва небяспечны рэцыдыў прызначаецца без уліку абмежаванняў, прадугледжаных часткай 2 гэтага артыкула.

**Артыкул 66. Прызначэнне пакарання за злачынства, учыненае ў саўдзеле**

1. Пры прызначэнні пакарання за злачынства, учыненае ў саўдзеле, улічваюцца характар і ступень удзелу ў ім кожным з саўдзельнікаў.

2. Тэрмін пакарання арганізатару (кіраўніку) арганізаванай групы не можа быць меншы за тры чвэрці тэрміну найбольш строгага віду пакарання, прадугледжанага адпаведным артыкулам Асаблівай часткі гэтага Кодэкса.

3. Пакаранне арганізатару (кіраўніку) арганізаванай групы можа быць прызначана без уліку абмежаванняў, прадугледжаных часткай 2 гэтага артыкула, у выпадку поўнага пакрыцця ім урону, прычыненага дзяржаве, юрыдычным або фізічным асобам, або шкоды дзяржаўным ці грамадскім інтарэсам або выплаты даходу, атрыманага злачынным шляхам, калі ўчыненае злачынства не было звязана з замахам на жыццё ці здароўе чалавека.

4. Пры выкананні арганізатарам (кіраўніком) арганізаванай групы абавязацельстваў, прадугледжаных дасудовым пагадненнем аб супрацоўніцтве, пакаранне прызначаецца без уліку абмежаванняў, прадугледжаных часткай 2 гэтага артыкула.

**Артыкул 67. Прызначэнне пакарання за няскончанае злачынства**

1. Пры прызначэнні пакарання за няскончанае злачынства ўлічваюцца характар і ступень грамадскай небяспекі дзеянняў, учыненых вінаватым, ступень ажыццяўлення злачыннага намеру і абставін, з прычыны якіх злачынства не было даведзена да канца.

2. Пакаранне смерцю за прыгатаванне да злачынства і замах на злачынства не прызначаецца.

**Артыкул 68. Выключаны**

**Артыкул 69. Прызначэнне пакарання пры наяўнасці змякчальных абставін**

1. Пры наяўнасці хаця б адной са змякчальных акалічнасцей, указаных у пунктах 1, 3 і 4 часткі 1 артыкула 63 гэтага Кодэкса, і адсутнасці абцяжваючых абставін, названых у артыкуле 64 гэтага Кодэкса, тэрмін або памер пакарання не можа перавышаць палову максімальнага тэрміну або памеру выбранага судом віду асноўнага пакарання, прадугледжанага адпаведным артыкулам Асаблівай часткі гэтага Кодэкса.

2. Правілы, прадугледжаныя часткай першай гэтага артыкула, не прымяняюцца ў дачыненні да асобы, якая ўчыніла асабліва цяжкае злачынства, звязанае з наўмысным пазбаўленнем жыцця чалавека пры абцяжваючых абставінах.

**Артыкул 69[1]. Прызначэнне пакарання ў выпадку заключэння дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве**

1. Пры выкананні асобай, якая ўчыніла злачынства, абавязацельстваў, прадугледжаных дасудовым пагадненнем аб супрацоўніцтве, тэрмін або памер пакарання не можа перавышаць палову максімальнага тэрміну або памеру выбранага судом віду асноўнага пакарання, прадугледжанага адпаведным артыкулам Асаблівай часткі гэтага Кодэкса, а ў выпадку ўчынення асобай цяжкага або асабліва цяжкага злачынства, звязанага з замахам на жыццё або здароўе чалавека, – дзве трэці максімальнага тэрміну або памеру выбранага судом віду асноўнага пакарання, прадугледжанага адпаведным артыкулам Асаблівай часткі гэтага Кодэкса.

2. Правілы, прадугледжаныя часткай 1 гэтага артыкула, не прымяняюцца ў дачыненні да асобы, што ўчыніла злачынства, за якое адпаведным артыкулам Асаблівай часткі гэтага Кодэкса прадугледжаны пажыццёвае пазбаўленне волі або пакаранне смерцю. У гэтым выпадку пры выкананні асобай, якая ўчыніла злачынства, абавязацельстваў, прадугледжаных дасудовым пагадненнем аб супрацоўніцтве, пажыццёвае пазбаўленне волі і пакаранне смерцю не прымяняюцца. Такой асобе прызначаецца пазбаўленне волі на тэрмін, вызначаны адпаведным артыкулам Асаблівай часткі гэтага Кодэкса.

**Артыкул 70. Прызначэнне больш мяккага пакарання, чым прадугледжана за дадзенае злачынства**

1. Суд з улікам асобы вінаватага пры наяўнасці выключных абставін, звязаных з мэтамі, матывамі, роляй асобы і яе паводзінамі падчас або пасля ўчынення злачынства, якія істотна змяншаюць ступень грамадскай небяспекі дзеяння, можа прызначыць пакаранне, ніжэйшае за ніжэйшую мяжу, прадугледжаную адпаведным артыкулам Асаблівай часткі гэтага Кодэкса, або прызначыць больш мяккі від пакарання, чым прадугледжана гэтым артыкулам, або не прымяніць дадатковае пакаранне, прадугледжанае ў якасці абавязковага.

2. Выключнымі могуць быць прызнаны як асобныя змякчальныя абставіны, так і сукупнасць такіх абставін.

**Артыкул 71. Выключаны**

**Артыкул 72. Прызначэнне пакарання па сукупнасці злачынстваў**

1. Пры сукупнасці злачынстваў суд, прызначыўшы асноўнае і дадатковае пакаранні асобна за кожнае злачынства, канчаткова вызначае пакаранне па іх сукупнасці шляхам паглынання менш строгага пакарання больш строгім або шляхам поўнага ці частковага складання прызначаных пакаранняў.

2. Калі сукупнасць злачынстваў утвараюць злачынствы, якія не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі, і менш цяжкія або цяжкія злачынствы ў любым спалучэнні, то канчатковае пакаранне прызначаецца шляхам паглынання менш строгага пакарання больш строгім або шляхам частковага ці поўнага складання пакаранняў. Пры гэтым канчатковае пакаранне не можа перавышаць максімальнага тэрміну або памеру пакарання, прадугледжанага за найбольш цяжкае з учыненых злачынстваў.

3. Калі ў сукупнасць злачынстваў уваходзіць хаця б адно асабліва цяжкае злачынства, то канчатковае пакаранне прызначаецца шляхам частковага ці поўнага складання пакаранняў. Пры гэтым канчатковае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі не можа быць большым за дваццаць гадоў. Калі ў сукупнасць злачынстваў уваходзіць асабліва цяжкае злачынства, за якое гэтым Кодэксам прадугледжана пазбаўленне волі на тэрмін, большы за пятнаццаць гадоў, то канчатковае пакаранне не можа перавышаць дваццаць пяць гадоў. Канчатковае пакаранне іншага віду не можа перавышаць максімальнага тэрміну або памеру, устаноўленых для дадзенага віду пакарання.

4. Калі за злачынства, якое ўваходзіць у сукупнасць, прызначана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін дваццаць пяць гадоў або пажыццёвага пазбаўлення волі, то канчатковае пакаранне прызначаецца шляхам паглынання менш строгага пакарання больш строгім.

5. Па тых жа правілах прызначаецца пакаранне, калі пасля вынясення прыгавору па справе будзе выяўлена, што асуджаны вінаваты яшчэ і ў іншым злачынстве, учыненым ім да вынясення прыгавору. У гэтым выпадку ў тэрмін канчаткова прызначанага пакарання залічваецца пакаранне, адбытае поўнасцю або часткова па першым прыгаворы.

6. Да канчатковага асноўнага пакарання суд далучае дадатковыя пакаранні, прызначаныя за злачынствы, ва ўчыненні якіх асоба прызнана вінаватай.

### Артыкул 73. Прызначэнне пакарання па сукупнасці прыгавораў

1. Калі асуджаны пасля абвяшчэння прыгавору, але да поўнага адбыцця пакарання ўчыніў новае злачынства, суд да пакарання, прызначанага па новым прыгаворы, поўнасцю або часткова далучае неадбытую частку пакарання па папярэднім прыгаворы.

2. Канчатковае пакаранне па сукупнасці прыгавораў у выпадку, калі яно не звязана з пазбаўленнем волі, не можа перавышаць максімальных тэрмінаў або памераў, устаноўленых для дадзеных відаў пакаранняў Агульнай часткай гэтага Кодэкса.

3. Канчатковае пакаранне па сукупнасці прыгавораў у выглядзе пазбаўлення волі можа быць вышэйшае за максімальны тэрмін пакарання, прадугледжаны гэтым Кодэксам для гэтага віду пакарання, але не больш за трыццаць гадоў.

4. Канчатковае пакаранне па сукупнасці прыгавораў павінна быць большым як за пакаранне, прызначанае за ізноў учыненае злачынства, так і за неадбытую частку пакарання па папярэднім прыгаворы.

5. Пры ўчыненні асобай, якой па прыгаворы суда або ў парадку памілавання прызначана пажыццёвае пазбаўленне волі, новага наўмыснага злачынства, за якое прызначана пазбаўленне волі або іншае больш мяккае пакаранне, новае прызначанае пакаранне паглынаецца пажыццёвым пазбаўленнем волі. Пры гэтым цячэнне тэрміну, прадугледжанага часткай чацвёртай артыкула 58 гэтага Кодэкса, перапыняецца. Падлік новага дваццацігадовага тэрміну ў гэтым выпадку пачынаецца з дня ўступлення ў сілу прыгавору суда за новае злачынства.

6. Да канчатковага асноўнага пакарання суд далучае дадатковыя пакаранні, прызначаныя за злачынствы, ва ўчыненні якіх асоба прызнана вінаватай.

### Артыкул 74. Правілы складання пакаранняў

1. Пры складанні пакаранняў па сукупнасці злачынстваў і сукупнасці прыгавораў:

1) адзін дзень пазбаўлення волі адпавядае:

аднаму дню арышту;

двум дням абмежавання волі;

тром дням папраўчых прац або абмежавання па ваеннай службе;

дваццаці чатыром гадзінам грамадскіх прац;

2) адзін дзень абмежавання волі адпавядае:

паўтара дням папраўчых прац;

дванаццаці гадзінам грамадскіх прац;

3) адзін дзень папраўчых прац адпавядае васьмі гадзінам грамадскіх прац.

2. Пакаранні ў выглядзе штрафу, пазбаўлення права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю пры прызначэнні іх з грамадскімі працамі, папраўчымі працамі, абмежаваннем па ваеннай службе, арыштам, абмежаваннем волі або пазбаўленнем волі прыводзяцца ў выкананне самастойна.

### Артыкул 75. Правілы заліку тэрмінаў утрымання пад вартай і дамашняга арышту

1. Тэрмін утрымання пад вартай і тэрмін дамашняга арышту або тэрмін знаходжання ў прыёмніку-размеркавальніку для непаўналетніх залічваюцца судом у тэрмін пакарання або тэрмін прымянення прымусовай меры выхаваўчага характару. Пры гэтым:

1) адзін дзень знаходжання ў прыёмніку-размеркавальніку для непаўналетніх або два дні дамашняга арышту адпавядаюць:

аднаму дню арышту або пазбаўлення волі, аднаму дню знаходжання непаўналетняга ў спецыяльнай навучальна-выхаваўчай ці спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установе;

двум дням абмежавання волі;

тром дням папраўчых прац або абмежавання па ваеннай службе;

дваццаці чатыром гадзінам грамадскіх прац;

2) адзін дзень утрымання пад вартай адпавядае:

двум дням пазбаўлення волі асобе, якая ўчыніла злачынства ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, а таксама з адбываннем у папраўчай калоніі ва ўмовах пасялення;

паўтара дням пазбаўлення волі з адбываннем у папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага і ўзмоцненага рэжыму;

аднаму дню пазбаўлення волі з адбываннем у папраўчай калоніі ва ўмовах строгага і асаблівага рэжыму або ў турме;

аднаму дню арышту;

двум дням абмежавання волі або знаходжання непаўналетняга ў спецыяльнай навучальна-выхаваўчай або спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установе;

тром дням папраўчых прац або абмежавання па ваеннай службе;

дваццаці чатыром гадзінам грамадскіх прац.

2. Пры прызначэнні пакаранняў, не ўказаных у частцы 1 гэтага артыкула, суд, улічваючы тэрмін утрымання пад вартай і тэрмін дамашняга арышту, можа адпаведна змякчыць пакаранне або поўнасцю вызваліць вінаватага ад яго адбывання.

### Артыкул 76. Падлік тэрмінаў пакарання

Тэрміны пазбаўлення права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, папраўчых прац, абмежавання па ваеннай службе, арышту, абмежавання волі, пазбаўлення волі лічацца ў месяцах і гадах, а грамадскіх прац – у гадзінах. Пры замене або складанні пакаранняў тэрміны могуць лічыцца таксама і ў днях.

## ГЛАВА 11
## ІНШЫЯ МЕРЫ КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ

### Артыкул 77. Асуджэнне з адтэрміноўкай выканання пакарання

1. Калі пры прызначэнні пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да пяці гадоў асобе, якая ўпершыню асуджаецца да пазбаўлення волі, за злачынства, якое не з'яўляецца цяжкім, суд, улічваючы характар і ступень грамадскай небяспекі ўчыненага злачынства, асобу вінаватага і іншыя абставіны справы, прыйдзе да пераканання, што мэты крымінальнай адказнасці могуць быць дасягнуты без адбывання прызначанага пакарання пры дапамозе ўскладання на асуджанага пэўных абавязкаў і кантролю за яго паводзінамі, ён можа прымяніць адтэрміноўку выканання прызначанага пакарання на тэрмін ад аднаго года да двух гадоў. Суд можа ў гэтых выпадках адтэрмінаваць і выкананне дадатковых пакаранняў.

2. Адтэрміноўка выканання пакарання можа быць прызначана на тэрмін ад двух да трох гадоў асобе, якая асуджаецца за ўчыненне цяжкага злачынства, калі такое злачынства ўчынена асобай ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, або асобам, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, інвалідам I і II групы, а таксама асобе, якая ўпершыню асуджаецца за ўчыненне цяжкага злачынства, не звязанага з замахам на жыццё ці здароўе чалавека, пры поўным пакрыцці абвінавачаным да заканчэння судовага следства прычыненага злачынствам урону (шкоды), вяртанні беспадстаўнага абагачэння, выплаце даходу, атрыманага злачынным шляхам.

2[1]. Адтэрміноўка выканання пакарання не можа быць прызначана асобе, якая асуджаецца за асабліва цяжкае злачынства, а таксама замежнаму грамадзяніну і асобе без грамадзянства, якая не пражывае пастаянна ў Рэспубліцы Беларусь.

3. На працягу тэрміну адтэрміноўкі выканання пакарання за асуджаным ажыццяўляецца прафілактычнае назіранне і на яго ўскладаюцца абавязкі, прадугледжаныя часткай 2 артыкула 81 гэтага Кодэкса, калі суд для асуджанага не ўстанавіў больш строгія абавязкі, прадугледжаныя часткай 4 гэтага артыкула.

4. Пры адтэрміноўцы выканання пакарання суд можа абавязаць асуджанага прынесці прабачэнне пацярпеламу, у пэўны тэрмін ліквідаваць прычыненую шкоду, паступіць на працу ці навучанне, прайсці курс лячэння ад хранічнага алкагалізму, наркаманіі, таксікаманіі або венерычнага захворвання, не мяняць месца жыхарства без згоды органа, які ажыццяўляе кантроль за паводзінамі асуджанага, не выязджаць па асабістых справах на тэрмін, большы за адзін месяц, за межы раёна (горада) месца жыхарства, перыядычна з'яўляцца ў гэты орган для рэгістрацыі, знаходзіцца пасля надыходу пэўнага часу па месцы жыхарства, не наведваць пэўныя месцы, у вольны ад працы і (або) навучання час выканаць грамадска карысныя працы ў аб'ёме ад трыццаці да ста дваццаці гадзін.

5. Кантроль за паводзінамі асуджанага, у дачыненні да якога выкананне пакарання адтэрмінавана, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Крымінальна-выканаўчым кодэксам Рэспублікі Беларусь. Суд можа таксама адначасова даручыць назіранне за непаўналетнім асуджаным і правядзенне з ім выхаваўчай працы пэўнай асобе з яе згоды.

6. Калі асуджаны, у дачыненні да якога выкананне пакарання адтэрмінавана, нягледзячы на афіцыйнае папярэджанне, не выконвае ўскладзеныя на яго судом абавязкі або неаднаразова парушыў грамадскі парадак, за што да яго двойчы былі прыменены меры адміністрацыйнага спагнання, або ўчыніў іншае адміністрацыйнае правапарушэнне, за якое законам прадугледжана адміністрацыйнае спагнанне ў выглядзе адміністрацыйнага арышту, то па прадстаўленні органа, які ажыццяўляе кантроль за паводзінамі асуджанага, а таксама па хадайніцтве асобы, якой было даручана назіранне за асуджаным, суд можа адмяніць адтэрміноўку выканання пакарання і накіраваць асуджанага для адбывання пакарання, прызначанага прыгаворам.

7. Пасля сканчэння тэрміну адтэрміноўкі выканання пакарання суд па прадстаўленні органа, які ажыццяўляе кантроль за паводзінамі асуджанага, або па заяве асуджанага ў залежнасці ад яго паводзін на працягу ўстаноўленага судом тэрміну адтэрміноўкі выканання пакарання можа прыняць наступныя рашэнні:

1) вызваліць асуджанага ад прызначанага па прыгаворы суда пакарання, калі ў перыяд адтэрміноўкі асуджаны законапаслухмянымі паводзінамі даказаў сваё выпраўленне. У гэтым выпадку асуджаны вызваляецца ад адбывання дадатковых пакаранняў;

2) прадоўжыць адтэрміноўку выканання пакарання не больш за адзін раз у межах ад шасці месяцаў да аднаго года або замяніць пазбаўленне волі больш мяккім пакараннем, калі асуджаны ў перыяд адтэрміноўкі праявіў імкненне да законапаслухмяных паводзін, але не ў поўнай меры даказаў сваё выпраўленне;

3) накіраваць асуджанага для адбывання прызначанага па прыгаворы суда пакарання, калі асуджаны ў перыяд адтэрміноўкі не праявіў імкнення да законапаслухмяных паводзін.

8. У выпадку ўчынення асуджаным у перыяд адтэрміноўкі выканання пакарання новага наўмыснага злачынства, а таксама злачынства з-за неасцярожнасці, за якое ён асуджаецца да пазбаўлення волі, суд прызначае яму пакаранне па правілах, прадугледжаных артыкулам 73 сапраўднага Кодэкса.

### Артыкул 78. Асуджэнне з умоўным непрымяненнем пакарання

1. Калі пры прызначэнні пакарання асобе, якая ўпершыню асуджаецца да пазбаўлення волі за ўчыненне злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, або менш цяжкага злачынства, суд, улічваючы характар і ступень грамадскай небяспекі ўчыненага злачынства, асобу вінаватага і іншыя абставіны справы, прыйдзе да пераканання, што мэты крымінальнай адказнасці могуць быць дасягнуты без адбывання прызначанага пакарання пры дапамозе ажыццяўлення кантролю за паводзінамі асуджанага, ён можа пастанавіць аб умоўным непрымяненні прызначанага пакарання з абавязковым указаннем у прыгаворы матываў прынятага рашэння. У гэтым выпадку суд пастанаўляе не прыводзіць у выкананне прызначанае пакаранне, калі на працягу вызначанага судом выпрабавальнага тэрміну асуджаны не ўчыніць новае злачынства і будзе выконваць ускладзеныя на яго судом абавязкі.

2. Выпрабавальны тэрмін прызначаецца працягласцю ад аднаго года да трох гадоў.

3. Умоўнае непрымяненне пакарання не можа быць прызначана асобе, якая асуджаецца за цяжкае злачынства, за выключэннем асобы, якая ўчыніла такое злачынства ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, а таксама асоб, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, інвалідаў I і II групы, або за асабліва цяжкае злачынства, а таксама замежнаму грамадзяніну і асобе без грамадзянства, якая не пражывае пастаянна ў Рэспубліцы Беларусь.

4. Пры ўмоўным непрымяненні пакарання могуць быць прызначаны дадатковыя пакаранні. Адбыванне дадатковага пакарання, прызначанага на пэўны тэрмін, спыняецца са сканчэннем выпрабавальнага тэрміну.

5. На працягу выпрабавальнага тэрміну за асуджаным ажыццяўляецца прафілактычнае назіранне і на яго ўскладаюцца абавязкі, прадугледжаныя часткай 2 артыкула 81 гэтага Кодэкса. Пры неабходнасці суд можа таксама ўскласці на асуджанага абавязкі прынесці прабачэнне пацярпеламу, у пэўны тэрмін ліквідаваць прычынены злачынствам урон (шкоду), паступіць на працу або навучанне, у вольны ад працы і (або) навучання час выканаць грамадска карысныя працы ў аб'ёме ад трыццаці да ста дваццаці гадзін, прайсці курс лячэння ад хранічнага алкагалізму, наркаманіі, таксікаманіі або венерычнага захворвання. Пры асуджэнні з умоўным непрымяненнем пакарання суд можа абавязаць асуджанага заплаціць у даход дзяржавы крымінальна-прававую кампенсацыю ў памеры ад трыццаці да ста базавых велічынь на працягу шасці месяцаў пасля ўступлення прыгавору ў законную сілу.

6. Кантроль за паводзінамі асуджанага з умоўным непрымяненнем пакарання ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Крымінальна-выканаўчым кодэксам Рэспублікі Беларусь. Суд можа таксама адначасова даручыць назіранне за непаўналетнім асуджаным і правядзенне з ім выхаваўчай працы пэўнай асобе з яе згоды.

7. Калі асуджаны з умоўным непрымяненнем пакарання, нягледзячы на афіцыйнае папярэджанне, не выконвае ўскладзеныя на яго абавязкі або неаднаразова парушыў грамадскі парадак, за што да яго двойчы былі прыменены меры адміністрацыйнага спагнання, або ўчыніў іншае адміністрацыйнае правапарушэнне, за якое законам прадугледжана адміністрацыйнае спагнанне ў выглядзе адміністрацыйнага арышту, то па прадстаўленні органа, які ажыццяўляе кантроль за паводзінамі асуджанага, а таксама па хадайніцтве асобы, якой было даручана

назіранне за асуджаным, суд можа адмяніць умоўнае непрымяненне пакарання і накіраваць асуджанага для адбывання прызначанага пакарання.

8. У выпадку ўчынення асуджаным з умоўным непрымяненнем пакарання на працягу выпрабавальнага тэрміну новага наўмыснага злачынства, а таксама злачынства з-за неасцярожнасці, за якое ён асуджаецца да пазбаўлення волі, суд прызначае яму пакаранне па правілах, прадугледжаных артыкулам 73 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 79. Асуджэнне без прызначэння пакарання**

Калі ў працэсе судовага разгляду крымінальнай справы ў дачыненні да асобы, якая ўчыніла ўпершыню злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, або менш цяжкае злачынства, будзе прызнана, што з прычыны працяглых беззаганных паводзін пасля ўчынення злачынства гэта асоба даказала сваё імкненне да законапаслухмяных паводзін і з улікам характару і ступені грамадскай небяспекі ўчыненага злачынства, асобы вінаватага яго далейшае выпраўленне магчымае без прымянення пакарання, але пры ажыццяўленні за ім прафілактычнага назірання, суд можа вынесці такой асобе абвінаваўчы прыгавор без прызначэння пакарання.

**Артыкул 80. Прэвентыўны нагляд**

1. Прэвентыўны нагляд устанаўліваецца за асобамі, указанымі ў частках 3 і 4 гэтага артыкула, для назірання за іх паводзінамі, папярэджання з іх боку злачынстваў і аказання на іх неабходнага прафілактычнага ўздзеяння.

1[1]. Прэвентыўны нагляд не ўстанаўліваецца за замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якія пастаянна не пражываюць у Рэспубліцы Беларусь.

2. Устанаўленне, прадаўжэнне і ў выпадках, указаных у пунктах 1–3 часткі 11 гэтага артыкула, спыненне прэвентыўнага нагляду, а таксама змяненне патрабаванняў прэвентыўнага нагляду ажыццяўляюцца судом у адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

3. Прэвентыўны нагляд пасля вызвалення з папраўчай установы ўстанаўліваецца:

1) за асобай, якая дапусціла асабліва небяспечны рэцыдыў злачынстваў;

2) за асобай, якая дасягнула васямнаццацігадовага ўзросту, судзімай за злачынства, учыненае ў складзе арганізаванай групы або злачыннай арганізацыі;

3) за асобай, асуджанай да пажыццёвага пазбаўлення волі, або асобай, якой пакаранне смерцю ў парадку памілавання заменена пажыццёвым пазбаўленнем волі, якім у адпаведнасці з гэтым Кодэксам далейшае адбыванне пажыццёвага пазбаўлення волі заменена пазбаўленнем волі.

4. Прэвентыўны нагляд пасля вызвалення з папраўчай установы можа быць установлены:

1) за асобай, якая дасягнула васямнаццацігадовага ўзросту, судзімай за ўчыненне цяжкага ці асабліва цяжкага злачынства або судзімай два ці больш разы да пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі за любыя наўмысныя злачынствы, калі ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь на момант вызвалення з папраўчай установы яна прызнана асобай, якая злосна парушае ўстаноўлены парадак адбывання пакарання;

2) за асобай, якая дасягнула васямнаццацігадовага ўзросту, судзімай за ўчыненне цяжкага ці асабліва цяжкага злачынства або судзімай два ці больш разы да пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі за любыя наўмысныя злачынствы, калі яна ў межах тэрміну судзімасці больш чым два разы на працягу года прыцягвалася да адміністрацыйнай адказнасці за ўчыненне адміністрацыйных правапарушэнняў, за якія законам прадугледжана адміністрацыйнае спагнанне ў выглядзе адміністрацыйнага арышту.

4[1]. За асобамі, указанымі ў частцы 3, пункце 2 часткі 4 гэтага артыкула, умоўна-датэрмінова вызваленымі ад адбывання пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі або якім неадбытая частка пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі заменена больш мяккім пакараннем,

прэвентыўны нагляд устанаўліваецца пасля поўнага адбыцця асноўнага пакарання па прыгаворы суда.

5. За асобай, указанай у пункце 1 часткі 3 гэтага артыкула, прэвентыўны нагляд устанаўліваецца да зняцця судзімасці.

6. За асобамі, указанымі ў пунктах 2 і 3 часткі 3 і частцы 4 гэтага артыкула, прэвентыўны нагляд устанаўліваецца на тэрмін ад шасці месяцаў да двух гадоў, але ў межах тэрміну судзімасці.

7. Суд абавязвае асобу, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд, выконваць наступныя патрабаванні прэвентыўнага нагляду:

1) прыбыць ва ўстаноўлены тэрмін да выбранага месца жыхарства і з’явіцца ў орган унутраных спраў для пастаноўкі на ўлік;

2) паведамляць органу ўнутраных спраў аб перамене месца жыхарства;

3) з'яўляцца ў орган унутраных спраў для рэгістрацыі ад аднаго да чатырох разоў на месяц.

8. Суд пры ўстанаўленні прэвентыўнага нагляду або пры яго ажыццяўленні можа абавязаць асобу, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд, выконваць наступныя патрабаванні прэвентыўнага нагляду:

1) не наведваць пэўныя месцы;

2) не пакідаць сваё жыллё ў пэўны час сутак;

3) не выязджаць за межы раёна (горада) па службовых і асабістых справах без згоды органа ўнутраных спраў;

4) не выязджаць за межы Рэспублікі Беларусь.

9. Пры асуджэнні асобы, за якой быў устаноўлены прэвентыўны нагляд, да пакарання ў выглядзе абмежавання волі, арышту або накіравання яе ў лячэбна-працоўны прафілакторый прэвентыўны нагляд прыпыняецца з дня пачатку тэрміну адбывання гэтай асобай пакарання або яе знаходжання ў лячэбна-працоўным прафілакторыі і лічыцца адноўленым з дня заканчэння тэрміну адбывання прызначанага яму пакарання або яе знаходжання ў лячэбна-працоўным прафілакторыі адпаведна.

10. Выключана.

11. Прэвентыўны нагляд спыняецца:

1) пасля сканчэння тэрміну, на які ён быў устаноўлены, калі прэвентыўны нагляд не быў прадоўжаны судом у адпаведнасці з гэтым Кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь;

2) у выпадку пагашэння або зняцця судзімасці;

3) датэрмінова па прадстаўленні органа ўнутраных спраў, калі асоба, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд, выконвала патрабаванні прэвентыўнага нагляду і не ўчыняла злачынстваў і адміністрацыйных правапарушэнняў. Пры гэтым у дачыненні да асобы, указанай у пункце 1 часткі 3 гэтага артыкула, прэвентыўны нагляд спыняецца не раней чым пасля сканчэння трох гадоў пасля адбыцця ёй пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі;

4) у выпадку асуджэння асобы, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд, да пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі;

5) у выпадку смерці асобы, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд;

6) у выпадку высылкі (дэпартацыі) з Рэспублікі Беларусь замежнага грамадзяніна або асобы без грамадзянства, за якімі ўстаноўлены прэвентыўны нагляд.

12. Прэвентыўны нагляд за асобамі, указанымі ў пунктах 2 і 3 часткі 3 і частцы 4 гэтага артыкула, можа быць прадоўжаны судом у межах тэрміну судзімасці ў выпадку невыканання гэтымі асобамі патрабаванняў прэвентыўнага нагляду або іх прыцягнення больш чым два разы на працягу года да адміністрацыйнай адказнасці за ўчыненне адміністрацыйных правапарушэнняў, за якія законам прадугледжана адміністрацыйнае спагнанне ў выглядзе адміністрацыйнага арышту.

**Артыкул 81. Прафілактычнае назіранне за асуджаным**

1. На працягу тэрміну судзімасці за асобай, асуджанай за цяжкае або асабліва цяжкае злачынства або судзімай два ці больш разы да пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі за любыя наўмысныя злачынствы, а таксама за асобай, асуджанай у парадку, прадугледжаным артыкуламі 77, 78, 79 або 117 гэтага Кодэкса, а таксама за асобамі, умоўна-датэрмінова вызваленымі ад адбывання пакарання, на працягу неадбытай часткі пакарання ажыццяўляецца прафілактычнае назіранне.

2. На працягу тэрміну судзімасці асоба знаходзіцца пад прафілактычным назіраннем і ў сувязі з гэтым абавязана спачатку паведамляць органу ўнутраных спраў аб змяненні месца жыхарства, аб выездзе па асабістых справах у іншую мясцовасць на тэрмін, большы за адзін месяц, з'яўляцца ва ўказаны орган па яго выкліку і пры неабходнасці даваць тлумачэнні адносна сваіх паводзін і ладу жыцця.

## ГЛАВА 12
## ВЫЗВАЛЕННЕ АД КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ І ПАКАРАННЯ

### Артыкул 82. Агульныя палажэнні аб вызваленні ад крымінальнай адказнасці і пакарання

1. Асоба, якая ўчыніла злачынства, можа быць вызвалена ад крымінальнай адказнасці ці пакарання або датэрмінова вызвалена ад адбывання прызначанага судом пакарання толькі ў выпадках, прадугледжаных гэтым Кодэксам. Калі ў якасці ўмовы вызвалення ад крымінальнай адказнасці прадугледжана выплата крымінальна-прававой кампенсацыі, рашэнне аб вызваленні асобы ад крымінальнай адказнасці прымаецца пасля яе ўнясення на дэпазітны рахунак органа, які вядзе крымінальны працэс. Выплата крымінальна-прававой кампенсацыі не вызваляе асобу ад абавязку кампенсаваць прычынены злачынствам урон (шкоду) і (або) выплаціць даход, атрыманы злачынным шляхам, калі ўказаныя ўмовы прадугледжаны ў якасці гэтакіх для прыняцця рашэння аб вызваленні ад крымінальнай адказнасці.

2. У выпадку вызвалення асобы ад крымінальнай адказнасці грашовыя сродкі, унесеныя на дэпазітны рахунак органа, які вядзе крымінальны працэс, накіроўваюцца ў даход дзяржавы. У выпадку адхілення хадайніцтва аб вызваленні асобы ад крымінальнай адказнасці грашовыя сродкі, унесеныя на дэпазітны рахунак органа, які вядзе крымінальны працэс, вяртаюцца асобе, якая іх унесла.

### Артыкул 83. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці ў сувязі са сканчэннем тэрмінаў даўнасці

1. Асоба вызваляецца ад крымінальнай адказнасці, калі з дня ўчынення злачынства скончыліся наступныя тэрміны:

1) два гады – пры ўчыненні злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі;

2) пяць гадоў – пры ўчыненні менш цяжкага злачынства;

3) дзесяць гадоў – пры ўчыненні цяжкага злачынства;

4) пятнаццаць гадоў – пры ўчыненні асабліва цяжкага злачынства, акрамя выпадку, прадугледжанага часткай 5 гэтага артыкула.

2. Тэрмін даўнасці лічыцца з дня ўчынення злачынства да дня ўступлення ў законную сілу прыгавору суда і не перапыняецца распачынаннем крымінальнай справы.

3. Цячэнне тэрмінаў даўнасці перапыняецца, калі да сканчэння ўказаных у частцы 1 гэтага артыкула тэрмінаў асоба ўчыніць новае наўмыснае злачынства. Падлік тэрмінаў даўнасці ў гэтым выпадку пачынаецца з дня ўчынення новага злачынства па кожным злачынстве асобна.

4. Цячэнне тэрмінаў даўнасці прыпыняецца, калі асоба, якая ўчыніла злачынства, уцячэ ад органа крымінальнага пераследавання або суда. У гэтых выпадках цячэнне тэрмінаў даўнасці аднаўляецца з дня затрымання асобы або яе яўкі з пакаяннем. Пры гэтым асоба не можа быць прыцягнута да крымінальнай адказнасці, калі з часу ўчынення злачынства прайшло пятнаццаць

год і цячэнне тэрмінаў даўнасці не было перапынена ўчыненнем новага наўмыснага злачынства, за выключэннем выпадку, прадугледжанага часткай 5 гэтага артыкула.

5. Пытанне аб прымяненні тэрмінаў даўнасці да асобы, што ўчыніла злачынства, за якое ёй можа быць прызначана пакаранне ў выглядзе пажыццёвага пазбаўлення волі або пакарання смерцю, вырашаецца судом. Калі суд не знойдзе магчымым вызваліць указаную асобу ад крымінальнай адказнасці ў сувязі са сканчэннем тэрмінаў даўнасці, пажыццёвае пазбаўленне волі або пакаранне смерцю не могуць быць прыменены, а прызначаецца пазбаўленне волі.

**Артыкул 84. Вызваленне ад пакарання ў сувязі са сканчэннем тэрмінаў даўнасці выканання абвінаваўчага прыгавору**

1. Асоба вызваляецца ад асноўнага і дадатковага пакаранняў, калі абвінаваўчы прыгавор не быў прыведзены ў выкананне ў наступныя тэрміны, лічачы з дня ўступлення яго ў законную сілу:

1) адзін год – пры асуджэнні да пакарання, не звязанага з пазбаўленнем волі;

2) два гады – пры асуджэнні да арышту або пазбаўлення волі на тэрмін, не большы за два гады;

3) пяць гадоў – пры асуджэнні да пазбаўлення волі на тэрмін, не большы за пяць гадоў;

4) дзесяць гадоў – пры асуджэнні да пазбаўлення волі на тэрмін, не большы за дзесяць гадоў;

5) пятнаццаць гадоў – пры асуджэнні да больш строгага пакарання, чым пазбаўленне волі тэрмінам на дзесяць гадоў, акрамя выпадку, прадугледжанага часткай чацвёртай гэтага артыкула.

2. Цячэнне тэрмінаў даўнасці прыпыняецца, калі асуджаны ўхіляецца ад адбывання пакарання. У гэтым выпадку цячэнне тэрмінаў даўнасці аднаўляецца з дня затрымання асобы або яе яўкі з пакаяннем. Пры гэтым абвінаваўчы прыгавор не можа быць прыведзены ў выкананне, калі з часу ўступлення яго ў законную сілу прайшло пятнаццаць гадоў і даўнасць не была перапынена.

3. Цячэнне тэрмінаў даўнасці перапыняецца, калі да сканчэння ўказаных у гэтым артыкуле тэрмінаў асоба ўчыніць новае наўмыснае злачынства. Падлік тэрмінаў даўнасці ў гэтым выпадку пачынаецца нанава з дня ўчынення новага злачынства.

4. Пытанне аб прымяненні тэрмінаў даўнасці да асобы, асуджанай да пакарання ў выглядзе пажыццёвага пазбаўлення волі або пакарання смерцю, вырашаецца судом. Калі суд не знойдзе магчымым вызваліць асобу ад пакарання ў сувязі са сканчэннем тэрмінаў даўнасці выканання абвінаваўчага прыгавору, пажыццёвае пазбаўленне волі або пакаранне смерцю замяняюцца пазбаўленнем волі.

**Артыкул 85. Непрымяненне тэрмінаў даўнасці**

Вызваленне ад крымінальнай адказнасці або пакарання, згодна з артыкуламі 83 і 84 гэтага Кодэкса, у сувязі са сканчэннем тэрмінаў даўнасці не прымяняецца пры ўчыненні злачынстваў супраць міру, бяспекі чалавецтва і ваенных злачынстваў:

1) падрыхтоўка або вядзенне агрэсіўнай вайны (артыкул 122);

2) акт міжнароднага тэрарызму (артыкул 126);

3) генацыд (артыкул 127);

4) злачынствы супраць бяспекі чалавецтва (артыкул 128);

5) вытворчасць, назапашванне або распаўсюджванне забароненых сродкаў вядзення вайны (артыкул 129);

6) экацыд (артыкул 131);

7) прымяненне зброі масавага паражэння (артыкул 134);

8) парушэнне законаў і звычаяў вайны (артыкул 135);

9) злачынныя парушэнні норм міжнароднага гуманітарнага права падчас узброеных канфліктаў (артыкул 136);

10) бяздзейнасць або адданне злачыннага загаду падчас узброенага канфлікту (артыкул 137).

**Артыкул 86. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці з прыцягненнем асобы да адміністрацыйнай адказнасці**

1. Асоба, што ўпершыню ўчыніла злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, або менш цяжкае злачынства і кампенсавала ўрон, або выплаціла даход, атрыманы злачынным шляхам, або іншым чынам загладзіла нанесеную злачынствам шкоду, можа быць вызвалена ад крымінальнай адказнасці з прыцягненнем да адміністрацыйнай адказнасці, калі будзе прызнана, што для яе выпраўлення дастаткова прымянення мер адміністрацыйнага спагнання.

2. Да асоб, якія вызваляюцца ад крымінальнай адказнасці ў адпаведнасці з часткай 1 гэтага артыкула, могуць быць прыменены наступныя меры адміністрацыйнага спагнання:

1) штраф у межах ад пяці да трыццаці базавых велічынь;

2) выключаны;

3) адміністрацыйны арышт на тэрмін да пятнаццаці сутак;

4) пазбаўленне спецыяльнага права на тэрмін ад трох месяцаў да трох гадоў.

3. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці па гэтым артыкуле не прымяняецца да асобы, якая ўчыніла злачынства, прадугледжанае артыкулам Асаблівай часткі гэтага Кодэкса, які змяшчае адміністрацыйную прэюдыцыю.

**Артыкул 86[1]. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці з прымяненнем правіл Дысцыплінарнага статута Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь**

Асоба, на якую распаўсюджваецца статус ваеннаслужачага, што ўчыніла злачынства супраць устаноўленага парадку праходжання воінскай службы, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, пры наяўнасці абставін, якія змякчаюць адказнасць, можа быць вызвалена ад крымінальнай адказнасці з прымяненнем правіл Дысцыплінарнага статута Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 87. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці ў выніку страты дзеяннем або асобай грамадскай небяспекі**

Асоба, што ўчыніла злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, або менш цяжкае злачынства, можа быць вызвалена ад крымінальнай адказнасці, калі будзе прызнана, што з прычыны змянення становішча ўчыненае ёй дзеянне страціла характар грамадска небяспечнага або гэта асоба перастала быць грамадска небяспечнай.

**Артыкул 88. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці ў сувязі з дзейным раскаяннем**

1. Асоба, што ўпершыню ўчыніла злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, або менш цяжкае злачынства, можа быць вызвалена ад крымінальнай адказнасці, калі яна пасля ўчынення злачынства добраахвотна з’явілася з пакаяннем або актыўна дапамагала выяўленню і (або) раскрыццю злачынства, кампенсавала прычынены злачынствам урон (шкоду), вярнула беспадстаўнае абагачэнне і (або) выплаціла даход, атрыманы злачынным шляхам, і ўнесла на дэпазітны рахунак органа, які вядзе крымінальны працэс, крымінальна-прававую кампенсацыю ў памеры пяцідзесяці працэнтаў прычыненага злачынствам урону (шкоды), але не менш чым пятнаццаць базавых велічынь.

2. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці асобы, якая ўчыніла злачынства іншай катэгорыі, дапускаецца ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 88[1], а таксама ў выпадках, спецыяльна прадугледжаных Асаблівай часткай гэтага Кодэкса.

**Артыкул 88[1]. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці ў сувязі з добраахвотнымі пакрыццём прычыненага ўрону (шкоды), выплатай даходу, атрыманага злачынным шляхам**

1. Асоба, што ўчыніла цяжкае або асабліва цяжкае злачынства, якое выклікала прычыненне ўрону дзяржаўнай уласнасці або маёмасці юрыдычнай асобы, доля ў статутным фондзе якой належыць дзяржаве, або істотнай шкоды дзяржаўным ці грамадскім інтарэсам і не звязанае з замахам на жыццё ці здароўе чалавека, можа быць вызвалена ад крымінальнай адказнасці ў парадку, устаноўленым заканадаўчым актам, калі яна добраахвотна кампенсавала прычынены ўрон (шкоду), выплаціла даход, атрыманы злачынным шляхам, унесла на дэпазітны рахунак органа, які вядзе крымінальны працэс, крымінальна-прававую кампенсацыю ў памеры, устаноўленым часткай 2 гэтага артыкула, а таксама выканала іншыя ўмовы вызвалення ад крымінальнай адказнасці, прадугледжаныя заканадаўчым актам.

2. Памер крымінальна-прававой кампенсацыі складае:

1) у выпадку ўчынення злачынства супраць парадку ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці – сто працэнтаў сумы прычыненага ўрону (шкоды), даходу, атрыманага злачынным шляхам;

2) у выпадку ўчынення іншых злачынстваў, прадугледжаных часткай 1 гэтага артыкула, – дзвесце працэнтаў сумы прычыненага ўрону (шкоды), даходу, атрыманага злачынным шляхам.

3. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці, прадугледжанае часткай 1 гэтага артыкула, можа быць прыменена таксама да асобы, якая ўчыніла некалькі злачынстваў з ліку ўказаных у частцы 1 гэтага артыкула, калі ўмовы вызвалення ад крымінальнай адказнасці выкананы гэтай асобай у адносінах да кожнага са злачынстваў.

Заўвагі:

1. Пры вызваленні ад крымінальнай адказнасці ў адпаведнасці з гэтым артыкулам асоба таксама можа быць вызвалена ад крымінальнай адказнасці за ўчыненне злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 380 і 427 гэтага Кодэкса, калі яны ўчынены з мэтай скрывання злачынства, указанага ў частцы 1 гэтага артыкула.

2. Не падлягаюць вызваленню ад крымінальнай адказнасці на падставе гэтага артыкула асобы, раней судзімыя за ўчыненне злачынстваў, якія выклікалі прычыненне ўрону дзяржаўнай уласнасці або маёмасці юрыдычнай асобы, доля ў статутным фондзе якой належыць дзяржаве, або істотнай шкоды дзяржаўным ці грамадскім інтарэсам, а таксама асобы, раней вызваленыя ад крымінальнай адказнасці за ўчыненне такіх злачынстваў.

**Артыкул 89. Вызваленне ад крымінальнай адказнасці ў сувязі з прымірэннем з пацярпелым**

Асоба, што ўчыніла злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, або ўпершыню ўчыніла менш цяжкае злачынства, можа быць вызвалена ад крымінальнай адказнасці, калі яна памірылася з пацярпелым і загладзіла прычыненую злачынствам шкоду.

**Артыкул 90. Умоўна-датэрміновае вызваленне ад пакарання**

1. Да асоб, якія адбываюць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, папраўчых прац, абмежавання па ваеннай службе, абмежавання волі або пазбаўлення волі, можа быць прыменена ўмоўна-датэрміновае вызваленне ад пакарання. Пры гэтым асоба можа быць вызвалена і ад дадатковага пакарання.

2. Умоўна-датэрміновае вызваленне ад пакарання можа быць прыменена да асуджанага толькі пры яго прыкладных паводзінах, якія даказваюць выпраўленне асобы.

3. Умоўна-датэрміновае вызваленне ад пакарання можа быць прыменена пасля фактычнага адбыцця асуджаным:

1) не менш за палову тэрміну пакарання, прызначанага судом за злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, або менш цяжкае злачынства;

2) не менш за дзве трэці тэрміну пакарання, прызначанага судом за цяжкае злачынства, а таксама калі раней асоба асуджалася да пазбаўлення волі за наўмыснае злачынства ці раней умоўна-датэрмінова вызвалялася ад пакарання;

3) не менш за тры чвэрці тэрміну пакарання, прызначанага судом за асабліва цяжкае злачынства, а таксама пакарання, прызначанага асобе, якая раней умоўна-датэрмінова вызвалялася ад пакарання ці раней вызвалялася ад пакарання з заменай неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем і ўчыніла новае злачынства на працягу неадбытай часткі пакарання.

3[1]. Умоўна-датэрміновае вызваленне ад пакарання можа быць прыменена да інвалідаў, жанчын і адзінокіх мужчын, якія маюць дзяцей ва ўзросце да чатырнаццаці гадоў, а таксама асобам, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, пасля фактычнага адбыцця імі:

1) не менш за адну трэць тэрміну пакарання, прызначанага судом за злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, або менш цяжкае злачынства;

2) не менш за палову тэрміну пакарання, прызначанага судом за цяжкае злачынства, а таксама калі раней асоба асуджалася да пазбаўлення волі за наўмыснае злачынства;

3) не менш за дзве трэці тэрміну пакарання, прызначанага судом за асабліва цяжкае злачынства, а таксама пакарання, прызначанага асобе, якая раней умоўна-датэрмінова вызвалялася ад пакарання і ўчыніла злачынства на працягу неадбытай часткі пакарання.

4. Тэрмін фактычна адбытага асобай пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі не можа быць меншым за шэсць месяцаў.

5. Прымяняючы ўмоўна-датэрміновае вызваленне ад пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі, суд можа ўскласці на асуджанага выкананне на працягу неадбытай часткі пакарання наступных абавязкаў:

1) не мяняць месца жыхарства без згоды органа, які ажыццяўляе кантроль за паводзінамі асуджанага;

2) не выязджаць па асабістых справах на тэрмін, большы за адзін месяц, за межы раёна (горада) месца жыхарства без згоды гэтага органа;

3) перыядычна з'яўляцца ў гэты орган для рэгістрацыі;

4) знаходзіцца пасля надыходу пэўнага часу па месцы жыхарства;

5) не наведваць пэўныя месцы;

6) у пэўны тэрмін паступіць на працу;

7) прадоўжыць курс лячэння ад хранічнага алкагалізму, наркаманіі, таксікаманіі;

8) кампенсаваць поўнасцю або часткова з улікам матэрыяльнага становішча асуджанага прычыненыя злачынствам урон (шкоду) у выпадку непакрыцця яго на дзень прыняцця рашэння аб умоўна-датэрміновым вызваленні.

5[1]. На працягу неадбытай часткі пакарання за асуджаным ажыццяўляецца прафілактычнае назіранне і на яго ўскладаюцца абавязкі, прадугледжаныя часткай 2 артыкула 81 гэтага Кодэкса.

6. Калі на працягу неадбытага тэрміну пакарання:

1) асуджаны, нягледзячы на афіцыйнае папярэджанне, не выконвае ўскладзеныя на яго абавязкі або неаднаразова парушыў грамадскі парадак, за што да яго двойчы былі прыменены меры адміністрацыйнага спагнання, або ўчыніў іншае адміністрацыйнае правапарушэнне, за якое законам прадугледжана адміністрацыйнае спагнанне ў выглядзе адміністрацыйнага арышту, то па прадстаўленні органа, які ажыццяўляе кантроль за паводзінамі асуджанага, суд можа адмяніць умоўна-датэрміновае вызваленне;

2) асуджаны ўчыняе наўмыснае злачынства або злачынства з-за неасцярожнасці, за якое ён асуджаецца да пазбаўлення волі, суд прызначае яму пакаранне па правілах, прадугледжаных артыкулам 73 гэтага Кодэкса.

7. Асобы, абавязаныя кампенсаваць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, асуджаныя за злачынствы, прадугледжаныя артыкулам 174 гэтага Кодэкса, і за іншыя злачынствы, учыненыя ў перыяд працы ў арганізацыях на падставе судовай пастановы, не падлягаюць умоўна-датэрміноваму вызваленню ад пакарання.

8. Службовыя асобы, якія займаюць дзяржаўныя пасады, асуджаныя за ўчыненне карупцыйных злачынстваў, не падлягаюць умоўна-датэрміноваму вызваленню ад пакарання.

Заўвагі:

1. Пад карупцыйнымі злачынствамі ў гэтым артыкуле і артыкуле 91 гэтага Кодэкса разумеюцца злачынствы, прадугледжаныя артыкулам 210, часткамі 2 і 3 артыкула 235 (пры ўчыненні ўказаных злачынстваў службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў), артыкуламі 424, 425, часткамі 2 і 3 артыкула 426 (пры ўчыненні ўказаных злачынстваў з карыслівай або іншай асабістай зацікаўленасці), артыкуламі 429, 430, часткамі 2 і 3 артыкула 431 (пры ўчыненні ўказанага злачынства з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў), часткамі 2 і 3 артыкула 432 (пры ўчыненні ўказанага злачынства з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў), а таксама артыкулам 455 (пры ўчыненні ўказаных злачынстваў з карыслівай або іншай асабістай зацікаўленасці) гэтага Кодэкса.

2. Пад службовымі асобамі, якія займаюць дзяржаўныя пасады, у гэтым артыкуле і артыкуле 91 гэтага Кодэкса разумеюцца:

1) Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў;

2) іншыя дзяржаўныя служачыя, супрацоўнікі Следчага камітэта, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, асобы, якія займаюць пасады ва Узброеных сілах Рэспублікі Беларусь, іншых войсках і воінскіх фарміраваннях, органах унутраных спраў, органах і падраздзяленнях па надзвычайных сітуацыях, органах фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю, пастаянна ці часова або па спецыяльным паўнамоцтве займаюць у дзяржаўным органе (дзяржаўнай арганізацыі) пасады, прадугледжаныя Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, іншымі заканадаўчымі актамі, ажыццяўляюць функцыі прадстаўніка ўлады або арганізацыйна-распарадчыя ці адміністрацыйна-гаспадарчыя абавязкі ў мэтах выканання або непасрэднага забеспячэння выканання паўнамоцтваў дзяржаўнага органа (дзяржаўнай арганізацыі) і адносяцца ў адпаведнасці з гэтым Кодэксам да службовых асоб.

### Артыкул 91. Замена неадбытай часткі пакарання больш мяккім

1. Асобам, асуджаным да папраўчых прац, абмежавання па ваеннай службе, абмежавання волі або пазбаўлення волі, неадбытая частка пакарання можа быць заменена больш мяккім пакараннем.

2. Замена неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем можа быць прыменена да асуджанага, які цвёрда стаў на шлях выпраўлення пасля фактычнага адбыцця ім:

1) не менш за адну трэць тэрміну пакарання, прызначанага судом за злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, або менш цяжкае злачынства;

2) не менш за палову тэрміну пакарання, прызначанага судом за цяжкае злачынства, а таксама калі раней асоба асуджалася да пазбаўлення волі за наўмыснае злачынства або раней асуджалася за злачынства, учыненае ў перыяд адбывання пакарання;

3) не менш за дзве трэці тэрміну пакарання, прызначанага судом за асабліва цяжкае злачынства, а таксама пакарання, прызначанага асобе, якая раней умоўна-датэрмінова вызвалялася ад пакарання або раней вызвалялася ад пакарання з заменай неадбытай часткі

пакарання больш мяккім пакараннем і ўчыніла новае злачынства на працягу неадбытай часткі пакарання.

3. Пры замене неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем яно прызначаецца ў межах тэрмінаў, устаноўленых законам для гэтага віду пакарання, і не павінна перавышаць неадбыты тэрмін заменнага пакарання. Пры замене неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем аднаму дню заменнага пакарання адпавядае адзін дзень больш мяккага пакарання, а пры прызначэнні ў якасці больш мяккага пакарання грамадскіх прац сямі дням заменнага пакарання адпавядаюць дванаццаць гадзін грамадскіх прац.

4. Пры замене пакарання больш мяккім пакараннем асуджаны можа быць вызвалены ад дадатковага пакарання.

5. Да асоб, якім пакаранне было заменена больш мяккім, умоўна-датэрміновае вызваленне ад пакарання прымяняецца па правілах, прадугледжаных артыкулам 90 гэтага Кодэкса, зыходзячы з прызначанага прыгаворам суда тэрміну пакарання з улікам яго скарачэння ў адпаведнасці з актамі амністыі, памілавання.

6. У выпадку ўчынення асуджаным у перыяд адбывання больш мяккага пакарання наўмыснага злачынства або злачынства з-за неасцярожнасці, за якое ён асуджаецца да пазбаўлення волі, суд прызначае яму пакаранне па правілах, прадугледжаных артыкулам 73 гэтага Кодэкса.

7. Да службовых асоб, якія займаюць дзяржаўныя пасады, асуджаных за ўчыненне карупцыйных злачынстваў, не прымяняецца замена неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем.

**Артыкул 92. Вызваленне ад пакарання або замена пакарання больш мяккім з-за захворвання**

1. Асоба, якая захварэла пасля вынясення прыгавору на псіхічнае расстройства (захворванне), якое пазбаўляе яе магчымасці ўсведамляць фактычны характар і значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі, вызваляецца судом ад адбывання пакарання. Такой асобе суд можа прызначыць прымусовую меру бяспекі і лячэння.

2. Асоба, якая хварэе на іншае цяжкае захворванне, якое перашкаджае адбыванню пакарання, можа быць судом вызвалена ад адбывання пакарання, або гэта пакаранне можа быць заменена больш мяккім. Пры гэтым улічваюцца цяжар учыненага злачынства, асоба асуджанага, характар захворвання і іншыя абставіны.

3. Ваеннаслужачы, асуджаны да абмежавання па ваеннай службе, у выпадку захворвання, якое робіць яго нягодным да ваеннай службы, вызваляецца ад пакарання, ці яго далейшага адбывання, або пакаранне можа быць заменена на іншае больш мяккае.

4. Асоба, указаная ў частцы 1 гэтага артыкула, у выпадку яе папраўкі падлягае пакаранню, калі не скончыліся тэрміны даўнасці выканання абвінаваўчага прыгавору. Пры гэтым час, на працягу якога да яе прымяняліся прымусовыя меры бяспекі і лячэння, залічваецца ў тэрмін пакарання.

**Артыкул 93. Адтэрміноўка адбывання пакарання цяжарным жанчынам і жанчынам, якія маюць дзяцей ва ўзросце да трох гадоў**

1. Пры прызначэнні пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі цяжарнай жанчыне або жанчыне, якая мае дзяцей ва ўзросце да трох гадоў, акрамя асуджанай да пазбаўлення волі на тэрмін, большы за пяць гадоў, за цяжкае або асабліва цяжкае злачынства, суд можа адтэрмінаваць адбыванне пакарання ў межах тэрміну, на які заканадаўствам жанчына можа быць вызвалена ад працы ў сувязі з цяжарнасцю, родамі і да дасягнення дзіцём трохгадовага ўзросту.

2. Адтэрміноўка адбывання пакарання таксама можа быць прыменена судом да асуджанай, якая зацяжарала або нарадзіла дзіця падчас адбывання пакарання, акрамя асуджанай

да пазбаўлення волі на тэрмін больш за пяць гадоў, за цяжкае або асабліва цяжкае злачынства, і мае сям'ю або сваякоў, якія далі згоду на сумеснае з ёй пражыванне, або мае магчымасць самастойна забяспечыць належныя ўмовы для выхавання дзіцяці.

3. Калі асуджаная, у дачыненні да якой адбыванне пакарання адтэрмінавана, адмовілася ад дзіцяці або перадала яго ў дзіцячы дом, уцякла з месца пражывання або працягвае ўхіляцца ад выхавання дзіцяці і догляду за ім пасля пісьмовага папярэджання, аб'яўленага органам, які ажыццяўляе кантроль за яе паводзінамі, суд можа накіраваць асуджаную для адбывання пакарання, прызначанага прыгаворам.

4. Пасля дасягнення дзіцём трохгадовага ўзросту або ў выпадку яго смерці суд у залежнасці ад паводзін асуджанай можа вызваліць яе ад адбывання пакарання, або замяніць яго больш мяккім пакараннем, або накіраваць асуджаную для адбывання пакарання, прызначанага прыгаворам. У гэтым выпадку суд можа поўнасцю або часткова залічыць час, на працягу якога асуджаная не адбывала пакаранне, у тэрмін адбывання пакарання.

5. Калі ў перыяд адтэрміноўкі адбывання пакарання асуджаная ўчыніць наўмыснае злачынства або злачынства з-за неасцярожнасці, за якое яна асуджаецца да пазбаўлення волі, суд прызначае ёй пакаранне па правілах, прадугледжаных артыкулам 73 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 94. Вызваленне ад пакарання з прычыны надзвычайных абставін

Асоба, асуджаная за злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, можа быць вызвалена ад пакарання, калі з прычыны пажару ці стыхійнага бедства, цяжкага захворвання ці смерці адзінага працаздольнага члена сям'і ці іншых надзвычайных абставін яе адбыванне пакарання можа пацягнуць за сабой асабліва цяжкія наступствы для асуджанага або яго сям'і.

### Артыкул 95. Амністыя

1. Амністыя прымяняецца на падставе закона Рэспублікі Беларусь у дачыненні да індывідуальна-нявызначанага кола асоб.

2. На падставе акта амністыі асоба, якая ўчыніла злачынства, можа быць вызвалена ад крымінальнай адказнасці, а асоба, асуджаная за злачынства, можа быць поўнасцю або часткова вызвалена ад пакарання як асноўнага, так і дадатковага, або вызвалена ад пакарання ўмоўна, або такой асобе неадбытая частка пакарання можа быць заменена больш мяккім пакараннем, або ёй можа быць знята судзімасць.

3. Калі асоба, умоўна вызваленая актам амністыі ад пакарання, на працягу неадбытага тэрміну ўчыніць наўмыснае злачынства або злачынства з-за неасцярожнасці, за якое яна асуджаецца да пазбаўлення волі, суд прызначае ёй пакаранне па правілах, прадугледжаных артыкулам 73 гэтага Кодэкса.

### Артыкул 96. Памілаванне

1. Памілаванне ажыццяўляецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь у дачыненні да індывідуальна-вызначанай асобы.

2. На падставе акта памілавання асоба, асуджаная за злачынства, можа быць поўнасцю або часткова вызвалена ад пакарання як асноўнага, так і дадатковага, або вызвалена ад пакарання ўмоўна, або такой асобе неадбытая частка пакарання можа быць заменена больш мяккім пакараннем, або ёй можа быць знята судзімасць.

3. Калі асоба, умоўна вызваленая актам памілавання, на працягу неадбытага тэрміну ўчыніць наўмыснае злачынства або злачынства з-за неасцярожнасці, за якое яна асуджаецца да пазбаўлення волі, суд прызначае ёй пакаранне па правілах, прадугледжаных артыкулам 73 гэтага Кодэкса.

# ГЛАВА 13
# ПАГАШЭННЕ І ЗНЯЦЦЕ СУДЗІМАСЦІ

## Артыкул 97. Пагашэнне судзімасці

1. Судзімасць пагашаецца:

1) у дачыненні да асуджанага за злачынства, учыненае з-за неасцярожнасці, – пасля адбыцця (выканання) асноўнага і дадатковага пакаранняў;

2) у дачыненні да асуджанага за наўмыснае злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, – пасля сканчэння аднаго года пасля адбыцця асноўнага і дадатковага пакаранняў;

3) у дачыненні да асуджанага за наўмыснае менш цяжкае злачынства – пасля сканчэння двух гадоў пасля адбыцця асноўнага і дадатковага пакаранняў;

4) у дачыненні да асуджанага за цяжкае злачынства – пасля сканчэння пяці гадоў пасля адбыцця асноўнага і дадатковага пакаранняў;

5) у дачыненні да асуджанага за асабліва цяжкае злачынства – пасля сканчэння васьмі гадоў пасля адбыцця асноўнага і дадатковага пакаранняў;

6) у дачыненні да асуджанага з адтэрміноўкай выканання пакарання – з дня ўступлення ў законную сілу рашэння суда аб вызваленні асуджанага ад пакарання;

7) у дачыненні да асуджанага з умоўным непрымяненнем пакарання – пасля сканчэння выпрабавальнага тэрміну, калі прызначанае пакаранне не было прыведзена ў выкананне;

8) у дачыненні да асуджанага без прызначэння пакарання за злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, або менш цяжкае злачынства – пасля сканчэння адпаведна аднаго года або двух гадоў з дня ўступлення ў законную сілу прыгавору суда;

9) у дачыненні да асуджанай жанчыны, якая ў адпаведнасці з часткай чацвёртай артыкула 93 гэтага Кодэкса вызвалена ад адбывання пакарання, – з дня ўступлення ў законную сілу рашэння суда аб вызваленні асуджанай ад адбывання пакарання;

10) у дачыненні да асуджанага за дзеянне, злачыннасць якога ліквідавана новым законам, – з дня ўступлення такога закона ў сілу.

2. Калі прыгавор не быў прыведзены ў выкананне, судзімасць пагашаецца пасля сканчэння тэрмінаў даўнасці выканання прыгавору.

3. Судзімасць асобы, якая дапусціла асабліва небяспечны рэцыдыў, не пагашаецца.

4. Калі асоба, асуджаная за неасцярожнае злачынства, ва ўстаноўленым законам парадку была ўмоўна-датэрмінова вызвалена ад пакарання або пакаранне было заменена больш мяккім, судзімасць пагашаецца адпаведна пасля сканчэння тэрміну неадбытай часткі пакарання або адбыцця больш мяккага пакарання. Пры ўмоўна-датэрміновым вызваленні ад пакарання або замене пакарання больш мяккім у дачыненні да асуджанага за наўмыснае злачынства тэрміны пагашэння судзімасці, устаноўленыя пунктамі 2–5 часткі першай гэтага артыкула, лічацца адпаведна з дня сканчэння неадбытай часткі пакарання або адбыцця больш мяккага пакарання.

5. Калі асоба, асуджаная за неасцярожнае злачынства, была вызвалена ад адбывання пакарання ў сувязі з цяжкім захворваннем, то дадзеная асоба прызнаецца не маючай судзімасці адпаведна з дня прыняцця судом рашэння аб вызваленні ад адбывання пакарання. Пры вызваленні ад адбывання пакарання ў сувязі з цяжкім захворваннем асобы, асуджанай за наўмыснае злачынства, устаноўленыя пунктамі 2–5 часткі 1 гэтага артыкула, тэрміны пагашэння судзімасці лічацца з дня прыняцця судом рашэння аб вызваленні ад адбывання пакарання. Гэтыя правілы пагашэння судзімасці распаўсюджваюцца і на выпадкі вызвалення ваеннаслужачага ад пакарання ў выглядзе абмежавання па ваеннай службе ў сувязі з захворваннем, якое робіць яго нягодным да ваеннай службы.

6. Калі асоба, якая адбыла пакаранне за ўчыненне наўмыснага злачынства, да сканчэння тэрміну судзімасці ўчыніць новае злачынства, цячэнне тэрміну, які пагашае судзімасць, перапыняецца і тэрмін судзімасці за папярэдняе злачынства пачынае лічыцца нанава пасля адбыцця пакарання за новае злачынства. Пры гэтым асоба лічыцца судзімай за абодва

злачынствы на працягу тэрміну, які вызначаецца больш цяжкім злачынствам, калі новае злачынства таксама было наўмысным.

**Артыкул 98. Зняцце судзімасці**

1. Калі асоба, якая мае судзімасць, пасля адбыцця пакарання сваімі паводзінамі даказала, што вядзе законапаслухмяны лад жыцця, то па заяве гэтай асобы суд можа зняць з яе судзімасць да сканчэння тэрмінаў, указаных у артыкулах 97 і 121 гэтага Кодэкса, але не раней за сканчэнне паловы тэрміну судзімасці.

2. Судзімасць асобы, якая дапусціла асабліва небяспечны рэцыдыў, можа быць знята судом пасля сканчэння пяці гадоў, а ў дачыненні да асуджанага за асабліва цяжкае злачынства – пасля сканчэння васьмі гадоў пасля адбыцця асноўнага і дадатковага пакаранняў, калі судом будзе выяўлена, што гэта асоба вядзе законапаслухмяны лад жыцця і няма неабходнасці лічыць яе маючай судзімасць.

**Артыкул 99. Прававое значэнне пагашэння і зняцця судзімасці**

Пагашэнне або зняцце судзімасці анулююць прававыя наступствы крымінальнай адказнасці.

## РАЗДЗЕЛ IV
## ПРЫМУСОВЫЯ МЕРЫ БЯСПЕКІ І ЛЯЧЭННЯ

## ГЛАВА 14
## ПРЫМУСОВЫЯ МЕРЫ БЯСПЕКІ І ЛЯЧЭННЯ

**Артыкул 100. Мэты прымянення прымусовых мер бяспекі і лячэння**

1. Прымусовыя меры бяспекі і лячэння могуць быць прызначаны судом у дачыненні да асоб, якія хварэюць на псіхічныя расстройствы (захворванні) і ўчынілі грамадска небяспечныя дзеянні, прадугледжаныя гэтым Кодэксам, з мэтай папярэджання з боку гэтых асоб новых грамадска небяспечных дзеянняў, аховы і лячэння такіх асоб.

2. Прымусовыя меры бяспекі і лячэння могуць быць прызначаны судом нароўні з пакараннем у дачыненні да асоб, якія ўчынілі злачынства і прызнаны асобамі ў стане паменшанай наяўнасці свядомасці, з мэтай стварэння ўмоў для лячэння і дасягнення мэт крымінальнай адказнасці.

3. Прымусовыя меры бяспекі і лячэння могуць быць прызначаны судом нароўні з пакараннем у дачыненні да асоб, якія ўчынілі злачынства і хварэюць на хранічны алкагалізм, наркаманію або таксікаманію, з мэтай лячэння і стварэння ўмоў, якія спрыяюць дасягненню мэт крымінальнай адказнасці.

**Артыкул 101. Прымусовыя меры бяспекі і лячэння, што прымяняюцца да асоб, якія хварэюць на псіхічныя расстройствы (захворванні)**

Асобам, якія ўчынілі прадугледжаныя гэтым Кодэксам небяспечныя дзеянні ў стане поўнай адсутнасці свядомасці або ўчынілі злачынствы, але захварэлі да пастановы прыгавору або падчас адбывання пакарання на псіхічнае расстройства (захворванне), якое пазбаўляе іх магчымасці ўсведамляць значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі, калі гэтыя асобы з-за свайго псіхічнага стану і з улікам характару ўчыненага імі дзеяння ўяўляюць небяспеку для грамадства, суд прызначае наступныя прымусовыя меры бяспекі і лячэння:

1) прымусовае амбулаторнае назіранне і лячэнне ва ўрача-спецыяліста ў галіне аказання псіхіятрычнай дапамогі;

2) прымусовае лячэнне ў псіхіятрычным стацыянары са звычайнымназіраннем;
3) прымусовае лячэнне ў псіхіятрычным стацыянары з узмоцненым назіраннем;
4) прымусовае лячэнне ў псіхіятрычным стацыянары са строгім назіраннем.

**Артыкул 102. Падставы прызначэння прымусовых мер бяспекі і лячэння**

1. Прымусовае амбулаторнае назіранне і лячэнне ва ўрача-спецыяліста ў галіне аказання псіхіятрычнай дапамогі можа быць прызначана судом у дачыненні да асобы, якая хварэе на псіхічнае расстройства (захворванне), але з-за псіхічнага стану не мае патрэбы ў змяшчэнні ў псіхіятрычны стацыянар.

2. Прымусовае лячэнне ў псіхіятрычным стацыянары са звычайным назіраннем можа быць прызначана судом у дачыненні да асобы, якая хварэе на псіхічнае расстройства (захворванне) і з-за псіхічнага стану і характару ўчыненага грамадска небяспечнага дзеяння мае патрэбу ў бальнічным утрыманні і лячэнні ў прымусовым парадку.

3. Прымусовае лячэнне ў псіхіятрычным стацыянары з узмоцненым назіраннем можа быць прызначана судом у дачыненні да асобы, якая хварэе на псіхічнае расстройства (захворванне), учыніла грамадска небяспечнае дзеянне, не звязанае з замахам на жыццё і здароўе грамадзян, і з-за псіхічнага стану не ўяўляе пагрозы для навакольных, але мае патрэбу ў бальнічным утрыманні і лячэнні ва ўмовах узмоцненага назірання.

4. Прымусовае лячэнне ў псіхіятрычным стацыянары са строгім назіраннем можа быць прызначана судом у дачыненні да асобы, якая хварэе на псіхічнае расстройства (захворванне), па псіхічным стане і характары ўчыненага грамадска небяспечнага дзеяння ўяўляе асаблівую небяспеку для грамадства і мае патрэбу ў бальнічным утрыманні і лячэнні ва ўмовах строгага назірання.

5. Асобы, змешчаныя ў псіхіятрычныя стацыянары з узмоцненым або строгім назіраннем, утрымліваюцца ва ўмовах, якія выключаюць магчымасць учынення імі новага грамадска небяспечнага дзеяння.

**Артыкул 103. Змяненне і спыненне прымянення прымусовых мер бяспекі і лячэння**

1. Змяненне і спыненне прымянення да асоб, якія хварэюць на псіхічныя расстройствы (захворванні), прымусовых мер бяспекі і лячэння ажыццяўляюцца судом на падставе заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі ўрачоў-спецыялістаў у галіне аказання псіхіятрычнай дапамогі.

2. Асобы, якія хварэюць на псіхічныя расстройствы (захворванні), да якіх па рашэнні суда прымяняюцца прымусовыя меры бяспекі і лячэння, павінны не радзей за адзін раз у шэсць месяцаў аглядацца ўрачэбна-кансультацыйнай камісіяй урачоў-спецыялістаў у галіне аказання псіхіятрычнай дапамогі для рашэння пытання адносна магчымасці спынення судом прымянення прымусовых мер бяспекі і лячэння або змянення іх віду. Заключэнне ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі ўрачоў-спецыялістаў у галіне аказання псіхіятрычнай дапамогі можа быць абскарджана ў суд у адпаведнасці з законам.

3. Спыненне прымянення прымусовых мер бяспекі і лячэння праводзіцца судом у выпадку папраўкі асобы або такога змянення характару захворвання, пры якім адпадае неабходнасць у прымяненні гэтых мер.

4. У выпадках, калі асоба, якая хварэе на псіхічнае расстройства (захворванне), не мае патрэбы ў прымяненні прымусовых мер бяспекі і лячэння, а таксама пры іх адмене суд можа перадаць неабходныя матэрыялы ў кіраўніцтвы аховы здароўя абласных выканаўчых камітэтаў, камітэт па ахове здароўя Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта для рашэння пытання аб абавязковым урачэбным назіранні за гэтай асобай па месцы жыхарства.

**Артыкул 104. Прыцягненне да крымінальнай адказнасці або да адбывання пакарання пасля прымянення прымусовых мер бяспекі і лячэння**

Асоба, якая пасля ўчынення злачынства або падчас адбывання пакарання захварэла на псіхічнае расстройства (захворванне), што пазбаўляе яе магчымасці ўсведамляць значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі, пасля папраўкі можа быць прыцягнута да крымінальнай адказнасці, або ўжо прызначанае ёй пакаранне можа быць прыведзена ў выкананне, калі не скончыліся адпаведна тэрміны даўнасці, устаноўленыя артыкуламі 83 і 84 гэтага Кодэкса, і няма іншых падстаў для вызвалення яе ад крымінальнай адказнасці або пакарання.

**Артыкул 105. Залік часу прымянення прымусовых мер бяспекі і лячэння**

Пры заліку прымусовых мер бяспекі і лячэння ў тэрмін пакарання прымяняюцца правілы артыкула 74 гэтага Кодэкса. Пры гэтым адзін дзень прымусовых мер адпавядае аднаму дню пазбаўлення волі.

**Артыкул 106. Прымяненне прымусовых мер бяспекі і лячэння ў дачыненні да асоб з паменшанай наяўнасцю свядомасці**

1. Да асоб, якія ўчынілі злачынства ў стане паменшанай наяўнасці свядомасці, а таксама захварэлі пасля пастановы прыгавору або падчас адбывання пакарання на псіхічнае расстройства (захворванне), але не страцілі поўнасцю магчымасць усведамляць значэнне сваіх дзеянняў або кіраваць імі, пры неабходнасці судом могуць быць прыменены прымусовыя меры бяспекі і лячэння.

2. Да асоб, указаных у частцы 1 гэтага артыкула, асуджаных да арышту, пазбаўлення волі або пажыццёвага пазбаўлення волі, прымусовыя меры бяспекі і лячэння прымяняюцца па месцы адбывання пакарання, а ў дачыненні да асуджаных да іншых відаў пакарання або іншых мер крымінальнай адказнасці – па месцы жыхарства шляхам прымусовага амбулаторнага назірання і лячэння ва ўрача-спецыяліста ў галіне аказання псіхіятрычнай дапамогі.

**Артыкул 107. Прымяненне прымусовых мер бяспекі і лячэння да асоб, якія хварэюць на хранічны алкагалізм, наркаманію або таксікаманію**

1. У выпадку ўчынення злачынства асобамі, якія хварэюць на хранічны алкагалізм, наркаманію або таксікаманію, суд пры наяўнасці медыцынскага заключэння нароўні з пакараннем за ўчыненае злачынства можа прымяніць да іх прымусовае лячэнне.

2. Лячэнне ад хранічнага алкагалізму, наркаманіі або таксікаманіі асуджаных да арышту, пазбаўлення волі або пажыццёвага пазбаўлення волі праводзіцца па месцы адбывання пакарання. Асобам, якія маюць патрэбу ў працягу лячэння пасля адбыцця пакарання ў выглядзе арышту, пазбаўлення волі, а таксама асуджаны да іншых відаў пакарання або іншых мер крымінальнай адказнасці, лячэнне ад хранічнага алкагалізму, наркаманіі або таксікаманіі праводзіцца па месцы жыхарства шляхам прымусовага амбулаторнага назірання і лячэння.

3. Прымусовае лячэнне, прадугледжанае гэтым артыкулам, спыняе суд на падставе заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі ўстановы, у якой асобы знаходзяцца на лячэнні.

## РАЗДЗЕЛ V
## АСАБЛІВАСЦІ КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ АСОБ, ЯКІЯ ЎЧЫНІЛІ ЗЛАЧЫНСТВЫ ВА ЎЗРОСЦЕ ДА ВАСЯМНАЦЦАЦІ ГАДОЎ

## ГЛАВА 15
## ПАКАРАННЕ І ЯГО ПРЫЗНАЧЭННЕ АСОБАМ, ЯКІЯ ЎЧЫНІЛІ ЗЛАЧЫНСТВЫ ВА ЎЗРОСЦЕ ДА ВАСЯМНАЦЦАЦІ ГАДОЎ

**Артыкул 108. Крымінальная адказнасць непаўналетніх**

Крымінальная адказнасць асобы, якая ўчыніла злачынства ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, надыходзіць у адпаведнасці з палажэннямі гэтага Кодэкса з улікам правіл, прадугледжаных гэтым раздзелам.

**Артыкул 109. Віды пакаранняў**

Да асобы, якая ўчыніла злачынства ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, могуць быць прыменены наступныя пакаранні:

1) грамадскія працы;
2) штраф;
3) пазбаўленне права займацца пэўнай дзейнасцю;
4) папраўчыя працы;
5) арышт;
$5^1$) абмежаванне волі;
6) пазбаўленне волі.

**Артыкул 110. Грамадскія працы**

Грамадскія працы прызначаюцца асуджанаму, які дасягнуў шаснаццацігадовага ўзросту да дня пастановы прыгавору, на тэрмін ад трыццаці да ста васьмідзесяці гадзін і заключаюцца ў выкананні прац, пасільных для такой асобы. Працягласць выканання дадзенага віду пакарання не можа перавышаць тры гадзіны ў дзень і тры дні ў тыдзень. Асуджаныя, якія атрымліваюць адукацыю або маюць пастаяннае месца працы, грамадскія працы адбываюць у вольны ад навучання або асноўнай працы час.

**Артыкул 111. Штраф**

1. Штраф прызначаецца асобе, якая ўчыніла злачынства ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, калі яна мае самастойны заробак (даход) або маёмасць, у памеры ад пяці да пяцідзесяці базавых велічынь.

2. У выпадку немагчымасці спагнання штрафу пры адсутнасці прыкмет ухілення ад яго выплаты суд па прадстаўленні органа, на які ўскладзена выкананне прыгавору, можа замяніць штраф грамадскімі працамі або прымусовымі мерамі выхаваўчага характару.

**Артыкул 112. Пазбаўленне права займацца пэўнай дзейнасцю**

Пазбаўленне права займацца пэўнай дзейнасцю прызначаецца асобе, якая дасягнула шаснаццацігадовага ўзросту да дня пастановы прыгавору, на тэрмін ад аднаго года да трох гадоў.

**Артыкул 113. Папраўчыя працы**

1. Папраўчыя працы прызначаюцца асобе, якая дасягнула шаснаццацігадовага ўзросту да дня пастановы прыгавору, на тэрмін ад двух месяцаў да аднаго года па месцы працы.

2. З заробку асуджанага да папраўчых прац праводзіцца вылічэнне ў даход дзяржавы ў памеры, устаноўленым прыгаворам суда, у межах ад пяці да пятнаццаці працэнтаў.

**Артыкул 114. Арышт**

Арышт прызначаецца непаўналетняму, які дасягнуў шаснаццацігадовага ўзросту да дня пастановы прыгавору, і ўстанаўліваецца на тэрмін ад аднаго да двух месяцаў.

**Артыкул 114[1]. Абмежаванне волі**

Абмежаванне волі прызначаецца асобе, якая ўчыніла злачынства ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, на тэрмін ад шасці месяцаў да трох гадоў. Асобе, якая не дасягнула васямнаццацігадовага ўзросту да дня пастановы прыгавору, абмежаванне волі прызначаецца без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, а асобе, якая дасягнула васямнаццацігадовага ўзросту да дня пастановы прыгавору, – з накіраваннем або без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

**Артыкул 115. Пазбаўленне волі**

1. Асобе, якая ўпершыню ўчыніла ва ўзросце да васямнаццаці гадоў злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі не прызначаецца.

2. Асобе, якая ўчыніла злачынства ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, тэрмін пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі не можа перавышаць:

1) за менш цяжкае злачынства – тры гады;

2) за цяжкае злачынства – сем гадоў;

3) за асабліва цяжкае злачынства – дзесяць гадоў;

4) за асабліва цяжкае злачынства, звязанае з наўмысным замахам на жыццё чалавека або з незаконным абарачэннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсараў ці аналагаў, – дванаццаць гадоў.

3. Асобе, якая не дасягнула васямнаццацігадовага ўзросту да дня пастановы прыгавору, адбыванне пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі прызначаецца ў выхаваўчай калоніі.

4. Асобе, якая ўчыніла злачынства ва ўзросце да васямнаццаці гадоў і дасягнула васямнаццацігадовага ўзросту да дня пастановы прыгавору, адбыванне пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі прызначаецца ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму.

**Артыкул 116. Прызначэнне пакарання**

1. Пры прызначэнні пакарання непаўналетняму ўлічваюцца, акрамя абставін, указаных у артыкулах 62, 66, 67 і 69 гэтага Кодэкса, умовы яго жыцця і выхавання, ступень псіхічнага развіцця, стан здароўя, іншыя асаблівасці асобы, а таксама ўплыў іншых асоб.

2. Асобе, якая ўчыніла ва ўзросце да васямнаццаці гадоў некалькі злачынстваў, якія ўключаюць злачынствы, што не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі, менш цяжкія або цяжкія злачынствы ў любым спалучэнні, канчатковае пакаранне прызначаецца шляхам паглынання менш строгага пакарання больш строгім або шляхам частковага ці поўнага складання пакаранняў. Пры гэтым канчатковае пакаранне не можа перавышаць максімальны тэрмін або памер пакарання, прадугледжаны за найбольш цяжкае з учыненых злачынстваў, з улікам абмежаванняў, прадугледжаных артыкулам 115 гэтага Кодэкса.

3. Асобе, якая ўчыніла ва ўзросце ад чатырнаццаці да шаснаццаці гадоў некалькі злачынстваў, якія ўключаюць хаця б адно асабліва цяжкае злачынства, канчатковае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі не можа быць прызначана на тэрмін больш за трынаццаць гадоў.

4. Асобе, якая ўчыніла ва ўзросце ад шаснаццаці да васямнаццаці гадоў некалькі злачынстваў, якія ўключаюць хаця б адно асабліва цяжкае злачынства, канчатковае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі не можа быць прызначана на тэрмін больш за пятнаццаць гадоў.

5. Канчатковае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі па сукупнасці прыгавораў непаўналетняму не можа быць прызначана на тэрмін больш за сямнаццаць гадоў.

**Артыкул 117. Асуджэнне непаўналетняга з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару**

1. Калі ў працэсе судовага разгляду будзе выяўлена, што выпраўленне непаўналетняга, які асуджаецца за ўчыненне злачынства, што не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, або ўпершыню асуджаецца за ўчыненне менш цяжкага злачынства, магчымае без прымянення крымінальнага пакарання, суд можа пастанавіць абвінавальны прыгавор і прымяніць да такой асобы замест пакарання прымусовыя меры выхаваўчага характару.

$1^1$. Прымусовыя меры выхаваўчага характару таксама могуць быць прыменены да непаўналетняга ў выпадку, прадугледжаным часткай 2 артыкула 111 гэтага Кодэкса.

2. У адпаведнасці з часткай 1 гэтага артыкула суд можа прымяніць наступныя прымусовыя меры выхаваўчага характару:

1) перасцярога, якая заключаецца ў растлумачэнні непаўналетняму наступстваў паўторнага ўчынення злачынстваў, прадугледжаных гэтым Кодэксам;

2) ускладанне абавязку публічна або ў іншай форме, якая вызначаецца судом, прынесці прабачэнне пацярпеламу;

3) ускладанне на непаўналетняга, які дасягнуў пятнаццацігадовага ўзросту да дня пастановы прыгавору, абавязку кампенсаваць сваімі сродкамі або ліквідаваць сваёй працай прычынены ўрон пры ўмове, што непаўналетні мае самастойны заробак і памер урону не перавышае яго сярэднямесячнага заробку (даходу). У іншым выпадку пакрыццё ўрону праводзіцца ў парадку грамадзянскага судаводства;

4) абмежаванне свабоды вольнага часу непаўналетняга на тэрмін ад аднаго да шасці месяцаў, якое заключаецца ва ўскладанні на яго абавязку прытрымлівання пэўнага парадку выкарыстання вольнага ад навучання і працы часу. Суд можа прадугледзець забарону наведвання пэўных месцаў, выкарыстання пэўных форм вольнага часу, у тым ліку звязаных з кіраваннем механічным транспартным сродкам, абмежаванне знаходжання па-за домам у пэўны час сутак, абавязак з'яўляцца для рэгістрацыі ў орган, які кантралюе паводзіны непаўналетняга;

5) змяшчэнне непаўналетняга на тэрмін да двух гадоў, але не больш чым да дасягнення ім васямнаццацігадовага ўзросту ў спецыяльную навучальна-выхаваўчую або спецыяльную лячэбна-выхаваўчую ўстанову. Знаходжанне асуджанага ў спецыяльнай навучальна-выхаваўчай або спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установе можа быць спынена датэрмінова судом, калі непаўналетні выправіўся і няма неабходнасці ў далейшым прымяненні ўказанай прымусовай меры выхаваўчага характару, а таксама ў выпадках узнікнення абставін, якія перашкаджаюць знаходжанню асуджанага ў гэтых установах.

3. Умовы ўтрымання непаўналетняга ў спецыяльнай навучальна-выхаваўчай або спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установе ўстанаўліваюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

4. На працягу тэрміну судзімасці пры прымяненні прымусовых мер выхаваўчага характару, прадугледжаных пунктамі 1–4 часткі 2 гэтага артыкула, за непаўналетнім ажыццяўляецца прафілактычнае назіранне і на яго ўскладаюцца абавязкі, прадугледжаныя часткай 2 артыкула 81 гэтага Кодэкса.

5. У выпадку злоснага ўхілення непаўналетняга на працягу тэрміну судзімасці ад выканання прымусовай меры выхаваўчага характару суд па прадстаўленні органа, які кіруе яе выкананнем, можа замяніць дадзеную меру на больш строгую, прадугледжаную часткай 2 гэтага артыкула.

## ГЛАВА 16
## ВЫЗВАЛЕННЕ АД КРЫМІНАЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ І ПАКАРАННЯ АСОБ, ЯКІЯ ЎЧЫНІЛІ ЗЛАЧЫНСТВА ВА ЎЗРОСЦЕ ДА ВАСЯМНАЦЦАЦІ ГАДОЎ

### Артыкул 118. Вызваленне непаўналетняга ад крымінальнай адказнасці

1. Асоба, якая ўпершыню ўчыніла ва ўзросце да васямнаццаці гадоў злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, або менш цяжкае злачынства, можа быць вызвалена ад крымінальнай адказнасці з перадачай яе пад назіранне бацькоў ці асоб, якія іх замяняюць,

па іх просьбе, калі па характары ўчыненага злачынства, даных аб асобе і іншых абставінах справы выпраўленне непаўналетняга магчымае без прыцягнення яго да крымінальнай адказнасці.

2. Перадача непаўналетняга, які ўчыніў злачынства, пад назіранне бацькоў ці асоб, якія іх замяняюць, дапускаецца пры ўмове ўнясення імі закладу. Сума закладу вызначаецца з улікам матэрыяльнага становішча бацькоў ці асоб, якія іх замяняюць, у межах ад дзесяці- да дваццацікратнага памеру базавай велічыні, устаноўленага на дзень унясення закладу, за злачынствы, якія не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі, і ў межах ад дваццаці- да пяцідзесяцікратнага памеру базавай велічыні за менш цяжкія злачынствы. У выпадку ўчынення асобай, перададзенай пад назіранне, на працягу года новага наўмыснага злачынства сума ўнесенага закладу накіроўваецца ў даход дзяржавы.

**Артыкул 119. Умоўна-датэрміновае вызваленне ад пакарання**

1. Да асобы, асуджанай да пазбаўлення права займацца пэўнай дзейнасцю, папраўчых прац, абмежавання волі або пазбаўлення волі за злачынства, учыненае ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, можа быць прыменена ўмоўна-датэрміновае вызваленне ад адбывання пакарання.

2. Умоўна-датэрміновае вызваленне ад пакарання можа быць прыменена да асуджанага толькі пры яго прыкладных паводзінах і добрасумленных адносінах да працы, навучання, якія даказваюць выпраўленне.

3. Умоўна-датэрміновае вызваленне ад пакарання прымяняецца пасля фактычнага адбыцця:

1) не менш за адну трэць тэрміну пакарання, прызначанага судом за злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, і за менш цяжкае злачынства;

2) не менш за палову тэрміну пакарання, прызначанага судом за цяжкае злачынства;

3) не менш за дзве трэці тэрміну пакарання, прызначанага судом за асабліва цяжкае злачынства, а таксама калі асоба раней асуджалася да пазбаўлення волі за наўмыснае злачынства.

4. Прымяняючы ўмоўна-датэрміновае вызваленне ад пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі, суд можа ўскласці на асуджанага на працягу неадбытай часткі пакарання выкананне наступных абавязкаў:

1) не мяняць месца жыхарства без згоды органа, які ажыццяўляе кантроль за паводзінамі асуджанага;

2) не выязджаць з-за асабістых спраў на тэрмін, большы за адзін месяц за межы раёна (горада) месца жыхарства без згоды гэтага органа;

3) перыядычна з'яўляцца ў гэты орган для рэгістрацыі;

4) знаходзіцца пасля надыходу пэўнага часу па месцы жыхарства;

5) не наведваць пэўныя месцы;

6) у пэўны тэрмін паступіць на працу або навучанне;

7) прадоўжыць курс лячэння ад хранічнага алкагалізму, наркаманіі, таксікаманіі;

8) кампенсаваць поўнасцю або часткова з улікам матэрыяльнага становішча асуджанага прычыненыя злачынствам урон (шкоду) у выпадку непакрыцця яго на дзень прыняцця рашэння аб умоўна-датэрміновым вызваленні.

4[1]. На працягу неадбытай часткі пакарання за асуджаным ажыццяўляецца прафілактычнае назіранне і на яго ўскладаюцца абавязкі, прадугледжаныя часткай 2 артыкула 81 гэтага Кодэкса.

5. Калі на працягу неадбытага тэрміну пакарання:

1) асуджаны, нягледзячы на афіцыйнае папярэджанне, не выконвае ўскладзеныя на яго абавязкі або неаднаразова парушаў грамадскі парадак, за што да яго двойчы былі прыменены меры адміністрацыйнага спагнання, то па прадстаўленні органа, які кантралюе паводзіны асуджанага, суд можа адмяніць умоўна-датэрміновае вызваленне;

2) асуджаны ўчыняе наўмыснае злачынства або злачынства з-за неасцярожнасці, за якое ён асуджаецца да пазбаўлення волі, суд прызначае яму пакаранне па правілах, прадугледжаных артыкулам 73 гэтага Кодэкса.

6. Асобы, абавязаныя кампенсаваць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, асуджаныя за злачынствы, прадугледжаныя артыкулам 174 гэтага Кодэкса, і за іншыя злачынствы, учыненыя ў перыяд працы ў арганізацыях на падставе судовай пастановы, не падлягаюць умоўна-датэрміноваму вызваленню ад пакарання.

**Артыкул 120. Замена неадбытай часткі пакарання больш мяккім**

1. Асобе, асуджанай да папраўчых прац, абмежавання волі або пазбаўлення волі за злачынства, учыненае ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, неадбытая частка пакарання можа быць заменена больш мяккім пакараннем у межах тэрмінаў (памераў), установленых для гэтага віду пакарання ў адпаведнасці з артыкуламі 110–114[1] гэтага Кодэкса (без перавышэння неадбытага тэрміну заменнага пакарання).

2. Замена неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем можа быць прыменена да асуджанага, які цвёрда стаў на шлях выпраўлення пры яго прыкладных паводзінах і добрасумленных адносінах да працы, навучання.

3. Замена неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем прымяняецца пасля фактычнага адбыцця:

1) не менш за адну чвэрць тэрміну пакарання, прызначанага судом за злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, або за менш цяжкае злачынства;

2) не менш за адну трэць тэрміну пакарання, прызначанага судом за цяжкае злачынства;

3) не менш за палову тэрміну пакарання, прызначанага судом за асабліва цяжкае злачынства, а таксама калі раней асоба асуджалася да пазбаўлення волі за наўмыснае злачынства.

3[1]. Пры замене неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем яно прызначаецца ў межах тэрмінаў, установленых законам для гэтага віду пакарання, і не павінна перавышаць неадбытага тэрміну заменнага пакарання. Пры замене неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем аднаму дню заменнага пакарання адпавядае адзін дзень больш мяккага пакарання, а пры прызначэнні ў якасці больш мяккага пакарання грамадскіх прац сямі дням заменнага пакарання адпавядаюць шэсць гадзін грамадскіх прац.

4. Да асобы, якой пакаранне было заменена больш мяккім, умоўна-датэрміновае вызваленне ад пакарання прымяняецца па правілах, прадугледжаных артыкулам 119 гэтага Кодэкса, зыходзячы з прызначанага прыгаворам суда тэрміну пакарання з улікам яго скарачэння ў адпаведнасці з актамі амністыі, памілавання.

**Артыкул 121. Пагашэнне судзімасці**

1. Асоба, якая ўчыніла злачынства ва ўзросце да васямнаццаці гадоў і адбыла пакаранне ў выглядзе грамадскіх прац, штрафу, пазбаўлення права займацца пэўнай дзейнасцю, папраўчых прац, арышту, абмежавання волі або ў выглядзе пазбаўлення волі за злачынства, учыненае з-за неасцярожнасці, лічыцца не маючай судзімасці.

2. Судзімасць асобы, асуджанай без прызначэння пакарання за злачынства, учыненае ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, пагашаецца:

1) пасля сканчэння трох месяцаў з дня ўступлення ў законную сілу прыгавору суда за злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі;

2) пасля сканчэння шасці месяцаў – за менш цяжкае злачынства.

3. Судзімасць асобы, асуджанай з прымяненнем прымусовых мер выхаваўчага характару, пагашаецца:

1) пасля сканчэння трох месяцаў з дня ўступлення ў законную сілу прыгавору суда за злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі;

2) пасля сканчэння шасці месяцаў – за менш цяжкае злачынства;

3) пасля сканчэння тэрміну знаходжання непаўналетняга ў спецыяльнай навучальна-выхаваўчай або спецыяльнай лячэбна-выхаваўчай установе незалежна ад катэгорыі злачынства.

4. Судзімасць асобы, асуджанай да пазбаўлення волі за наўмыснае злачынства, учыненае ва ўзросце да васямнаццаці гадоў, пагашаецца пасля адбыцця асноўнага і дадатковага пакарання:

1) пасля сканчэння шасці месяцаў – за злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі;

2) пасля сканчэння аднаго года – за менш цяжкае злачынства;

3) пасля сканчэння двух гадоў – за цяжкае злачынства;

4) пасля сканчэння чатырох гадоў – за асабліва цяжкае злачынства.

5. У дачыненні да асобы, якая адбыла пазбаўленне волі, дапускаецца датэрміновае зняцце судзімасці па правілах артыкула 98 гэтага Кодэкса.

# АСАБЛІВАЯ ЧАСТКА

## РАЗДЗЕЛ VI
## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ МІРУ, БЯСПЕКІ ЧАЛАВЕЦТВА І ВАЕННЫЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ

### ГЛАВА 17
### ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ МІРУ І БЯСПЕКІ ЧАЛАВЕЦТВА

#### Артыкул 122. Падрыхтоўка або вядзенне агрэсіўнай вайны

1. Планаванне або падрыхтоўка агрэсіўнай вайны –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да пятнаццаці гадоў.

2. Развязванне або вядзенне агрэсіўнай вайны –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да дваццаці пяці гадоў, або пажыццёвым пазбаўленнем волі, або пакараннем смерцю.

#### Артыкул 123. Прапаганда вайны

1. Распаўсюджванне ў любой форме поглядаў, ідэй або заклікаў з мэтай выклікаць агрэсію адной краіны супраць іншай (прапаганда вайны) –

караецца штрафам або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

2. Прапаганда вайны, учыненая асобамі, якія займаюць вышэйшыя дзяржаўныя пасады, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

#### Артыкул 124. Акт тэрарызму ў дачыненні да прадстаўніка замежнай дзяржавы або міжнароднай арганізацыі

1. Насілле ў дачыненні да прадстаўніка замежнай дзяржавы або міжнароднай арганізацыі, захоп і (або) утрыманне яго ў якасці заложніка, выкраданне і (або) пазбаўленне яго волі ў мэтах правакацыі міжнародных ускладненняў ці вайны або дэстабілізацыі грамадскага парадку ў замежнай дзяржаве –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да пятнаццаці гадоў.

2. Забойства прадстаўніка замежнай дзяржавы ці міжнароднай арганізацыі ў мэтах правакацыі міжнародных ускладненняў ці вайны або дэстабілізацыі грамадскага парадку ў замежнай дзяржаве –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да дваццаці пяці гадоў, або пажыццёвым пазбаўленнем волі, або пакараннем смерцю.

Заўвага. Асоба, якая ўдзельнічала ў прыгатаванні да дзеянняў, прадугледжаных гэтым артыкулам, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці за гэтыя дзеянні, калі яна своечасовым папярэджаннем дзяржаўных органаў ці іншым чынам прадухіліла акт тэрарызму ў дачыненні да прадстаўніка замежнай дзяржавы або міжнароднай арганізацыі.

**Артыкул 125. Напад на ўстановы, якія карыстаюцца міжнароднай абаронай**

1. Напад на службовыя або жылыя памяшканні ўстаноў, якія карыстаюцца міжнароднай абаронай, або на транспартныя сродкі гэтых устаноў з мэтай правакацыі міжнародных ускладненняў ці вайны –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін ад трох да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека, або прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання, або звязанае з наўмысным знішчэннем маёмасці ці важных дакументаў, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да трынаццаці гадоў.

**Артыкул 126. Акт міжнароднага тэрарызму**

1. Учыненне на тэрыторыі замежнай дзяржавы або на тэрыторыі дыпламатычнага прадстаўніцтва, консульскай установы замежнай дзяржавы, якія знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, выбуху, падпалу, затаплення, іншых дзеянняў агульнанебяспечным спосабам або дзеянняў, якія ствараюць небяспеку гібелі людзей, прычынення ім цялесных пашкоджанняў або надыходу іншых цяжкіх наступстваў у мэтах правакацыі міжнародных ускладненняў ці вайны або дэстабілізацыі грамадскага парадку ў замежнай дзяржаве (акт міжнароднага тэрарызму) –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да пятнаццаці гадоў.

2. Акт міжнароднага тэрарызму, учынены паўторна, або групай асоб па папярэдняй змове, або асобай, якая раней учыніла злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 124, 289, 290[1] або 359 гэтага Кодэкса, або звязаны з прычыненнем цяжкіх цялесных пашкоджанняў, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да дваццаці гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 або 2 гэтага артыкула, учыненыя арганізаванай групай, або з прымяненнем аб'ектаў выкарыстання атамнай энергіі, або з выкарыстаннем радыеактыўных рэчываў ці ядзерных матэрыялаў, моцнадзейных, таксічных хімічных ці біялагічных рэчываў або звязаныя з забойствам чалавека, а таксама забойства дзяржаўнага ці грамадскага дзеяча замежнай дзяржавы ў мэтах правакацыі міжнародных ускладненняў ці вайны або дэстабілізацыі грамадскага парадку ў замежнай дзяржаве –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да дваццаці пяці гадоў, або пажыццёвым пазбаўленнем волі, або пакараннем смерцю.

Заўвагі:

1. Асоба, якая ўдзельнічала ў прыгатаванні да дзеянняў, прадугледжаных гэтым артыкулам, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці за гэтыя дзеянні, калі яна своечасовым папярэджаннем дзяржаўных органаў ці іншым чынам прадухіліла акт міжнароднага тэрарызму.

2. Пад тэрыторыяй дыпламатычнага прадстаўніцтва, консульскай установы замежнай дзяржавы, якія знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, у гэтым артыкуле разумеюцца памяшканне, будынак (частка будынка), зямельны ўчастак, якія выкарыстоўваюцца дыпламатычным прадстаўніцтвам, консульскай установай замежнай дзяржавы для іх размяшчэння на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 127. Генацыд**

Дзеянні, якія ўчыняюцца з мэтай планамернага знішчэння поўнасцю або часткова якой-небудзь расавай, нацыянальнай, этнічнай, рэлігійнай групы ці групы, вызначанай на аснове любога іншага адвольнага крытэрыю, шляхам забойства членаў такой групы або прычынення ім цяжкіх цялесных пашкоджанняў, або наўмыснага стварэння жыццёвых умоў, разлічаных на поўнае ці частковае фізічнае знішчэнне такой групы, або гвалтоўнай перадачы дзяцей з адной этнічнай групы ў іншую, або прыняцця мер для перашкаджэння дзетараджэння ў асяроддзі такой групы (генацыд), –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дванаццаці да дваццаці пяці гадоў, або пажыццёвым пазбаўленнем волі, або пакараннем смерцю.

**Артыкул 128. Злачынствы супраць бяспекі чалавецтва**

Дэпартацыя, незаконнае ўтрыманне ў зняволенні, зварот у рабства, масавае ці сістэматычнае ажыццяўленне пакарання смерцю без суда, выкраданне людзей, за якім ідзе іх знікненне, катаванні або акты жорсткасці, якія ўчыняюцца ў сувязі з расавай, нацыянальнай, этнічнай прыналежнасцю, палітычнымі перакананнямі і веравызнаннем грамадзянскага насельніцтва, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да дваццаці пяці гадоў, або пажыццёвым пазбаўленнем волі, або пакараннем смерцю.

Заўвага. Пад катаваннем разумеецца любое дзеянне, якім якой-небудзь асобе наўмысна прычыняюцца моцны боль, фізічная або псіхічная пакута ў мэтах прымусу гэтай асобы або трэцяй асобы да дзеянняў, якія супярэчаць іх волі, у тым ліку каб атрымаць ад іх звесткі або прызнанні, а таксама ў мэтах пакарання ці ў іншых мэтах або па любой прычыне, заснаванай на дыскрымінацыі любога характару, калі такі боль або пакута прычыняюцца дзяржаўнай службовай асобай, якая выступае ў афіцыйнай якасці, з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, або па яе падбухторванні, або з яе ведама ці маўклівай згоды. У гэта азначэнне не ўключаюцца боль або пакуты, якія ўзнікаюць з прычыны прымянення мер працэсуальнага ці іншага законнага прымусу.

**Артыкул 129. Вытворчасць,назапашванне або распаўсюджванне забароненых сродкаў вядзення вайны**

Вытворчасць, набыццё, захоўванне, перавозка, перасылка або збыт забароненых міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь сродкаў масавага паражэння, іншых забароненых сродкаў вядзення вайны ці іх складальнікаў або правядзенне даследаванняў, накіраваных на выраб ці прымяненне такіх сродкаў або іх складальнікаў, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін ад трох да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў.

**Артыкул 130. Распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай або іншай сацыяльнай варожасці ці звады**

1. Наўмысныя дзеянні, накіраваныя на распачынанне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай або іншай сацыяльнай варожасці ці звады з-за прыкметы расавай, нацыянальнай, рэлігійнай, моўнай або іншай сацыяльнай прыналежнасці, –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тыя ж дзеянні, злучаныя з насіллем або ўчыненыя службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 або 2 гэтага артыкула, учыненыя групай асоб або дзеянні, якія выклікалі з-за неасцярожнасці смерць чалавека ці іншыя цяжкія наступствы, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дванаццаці гадоў.

Заўвага. Пад іншай сацыяльнай прыналежнасцю ў гэтым артыкуле разумеецца прыналежнасць асобы да пэўнай сацыяльнай групы па прыкмеце полу, узросту, прафесіі, роду заняткаў, месца жыхарства і іншай сацыяльна-групавой ідэнтыфікацыі.

**Артыкул 130$^{1}$. Рэабілітацыя нацызму**

1. Наўмысныя дзеянні па рэабілітацыі нацызму –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Дзеянні, прадугледжаныя часткай 1 гэтага артыкула, злучаныя з насіллем або ўчыненыя службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 або 2 гэтага артыкула, учыненыя групай асоб або дзеянні, якія выклікалі з-за неасцярожнасці смерць чалавека ці іншыя цяжкія наступствы, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дванаццаці гадоў.

**Артыкул 131. Экацыд**

Наўмыснае масавае знішчэнне расліннага ці жывёльнага свету, або атручэнне атмасфернага паветра ці водных рэсурсаў, або ўчыненне іншых наўмысных дзеянняў, здольных выклікаць экалагічную катастрофу (экацыд), –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да пятнаццаці гадоў.

## ГЛАВА 18
## ВАЕННЫЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ І ІНШЫЯ ПАРУШЭННІ ЗАКОНАЎ І ЗВЫЧАЯЎ ВЯДЗЕННЯ ВАЙНЫ

**Артыкул 132. Вярбоўка, навучанне, фінансаванне і выкарыстанне наёмнікаў**

Вярбоўка, навучанне, фінансаванне, іншае матэрыяльнае забеспячэнне і выкарыстанне наёмнікаў для ўдзелу ва ўзброеных канфліктах ці ваенных дзеяннях –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да пятнаццаці гадоў.

**Артыкул 133. Наёмніцтва**

Удзел на тэрыторыі замежнай дзяржавы ва ўзброеных канфліктах, ваенных дзеяннях асобы, што не ўваходзіць у склад узброеных сіл бакоў, якія ваююць, і які дзейнічае ў мэтах атрымання матэрыяльнага ўзнагароджання без упаўнаважання дзяржавы, грамадзянінам якой яна з'яўляецца або на тэрыторыі якой пастаянна пражывае (наёмніцтва), –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў са штрафам або без штрафу.

**Артыкул 134. Прымяненне зброі масавага паражэння**

Прымяненне зброі масавага паражэння, забароненай міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да дваццаці пяці гадоў, або пажыццёвым пазбаўленнем волі, або пакараннем смерцю.

**Артыкул 135. Парушэнне законаў і звычаяў вайны**

1. Прымус асоб, якія пацярпелі караблекрушэнне, здалі зброю або не маюць сродкаў абароны, параненых, хворых, , медыцынскіх работнікаў, санітарнага і духоўнага персаналу, ваеннапалонных, грамадзянскага насельніцтва на акупаванай тэрыторыі або ў раёне ваенных дзеянняў, іншых асоб, якія карыстаюцца падчас ваенных дзеянняў міжнароднай абаронай, да службы ва ўзброеных сілах праціўніка або да перасялення, або пазбаўленне іх права на незалежны і бесстаронні суд, або абмежаванне права гэтых асоб на абарону ў крымінальным судаводстве –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін ад трох да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў.

2. Прычыненне цяжкіх цялесных пашкоджанняў асобам, названым у частцы першай гэтага артыкула, або катаванне, або правядзенне над імі, нават з іх згоды, медыцынскіх, біялагічных і іншых эксперыментаў, або выкарыстанне іх для прыкрыцця сваіх войск ці аб'ектаў ад ваенных дзеянняў, або захоп і ўтрыманне такіх асоб у якасці заложнікаў, або выкраданне грамадзянскага насельніцтва для прымусовых прац –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да пятнаццаці гадоў.

3. Наўмыснае забойства асоб, названых у частцы першай гэтага артыкула, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да дваццаці пяці гадоў, або пажыццёвым пазбаўленнем волі, або пакараннем смерцю.

**Артыкул 136. Злачынныя парушэнні норм міжнароднага гуманітарнага права падчас узброеных канфліктаў**

Парушэнні норм міжнароднага гуманітарнага права падчас узброенага канфлікту:

1) прымяненне сродкаў і метадаў вядзення вайны, якія могуць лічыцца сродкамі і метадамі, што наносяць празмерныя пашкоджанні або маюць невыбіральнае дзеянне;

2) наўмыснае прычыненне шырокага, доўгачасовага і сур'ёзнага ўрону прыроднаму асяроддзю;

3) напад на персанал, збудаванні, абсталяванне, транспартныя фарміраванні і транспартныя сродкі, якія маюць з абароннай мэтай распазнавальныя эмблемы Чырвонага Крыжа, Чырвонага Паўмесяца, Чырвонага Крышталя;

4) выкарыстанне голаду сярод грамадзянскага насельніцтва ў якасці метаду вядзення ваенных дзеянняў;

5) вярбоўка асоб, якія не дасягнулі пятнаццацігадовага ўзросту, ва ўзброеныя сілы або дазвол ім прымаць удзел у ваенных дзеяннях;

$5^1$) вярбоўка асоб, якія не дасягнулі васямнаццацігадовага ўзросту, ва ўзброеныя групы, адрозныя ад узброеных сіл дзяржавы, або выкарыстанне іх у ваенных дзеяннях у складзе гэтых узброеных груп;

6) адвольнае і праведзенае ў вялікім маштабе разбурэнне або прысваенне маёмасці, не выкліканыя ваеннай неабходнасцю;

7) ператварэнне неабароненых мясцовасцей і дэмілітарызаваных зон у аб'ект нападу;

8) ператварэнне ў аб'ект нападу або знішчэнне культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца пад абаронай, пры адсутнасці ваеннай неабходнасці, а таксама раскраданне такіх каштоўнасцей у буйных маштабах або ўчыненне ў адносінах да іх актаў вандалізму;

8[1]) выкарыстанне культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца пад узмоцненай абаронай, або месцаў, якія непасрэдна прылягаюць да іх, для падтрымання ваенных дзеянняў, а таксама ператварэнне гэтых каштоўнасцей або месцаў, якія непасрэдна прылягаюць да іх, у аб'ект нападу;

9) парушэнне пагадненняў аб перамір'і, прыпыненні ваенных дзеянняў або мясцовых пагадненняў, заключаных з мэтай вывазу, абмену ці перавозкі параненых і памерлых, пакінутых на полі бітвы;

10) учыненне нападу на грамадзянскае насельніцтва або на асобных грамадзянскіх асоб;

11) учыненне нападу невыбіральнага характару, які закранае грамадзянскае насельніцтва або грамадзянскія аб'екты, калі заведама вядома, што такі напад пацягне за сабой празмерныя страты сярод грамадзянскіх асоб або прычыніць празмерны ўрон грамадзянскім аб'ектам;

12) учыненне нападу на ўстаноўкі ці збудаванні, якія змяшчаюць небяспечныя сілы, калі заведама вядома, што такі напад пацягне за сабой празмерныя страты сярод грамадзянскіх асоб або прычыніць празмерны ўрон грамадзянскім аб'ектам;

13) учыненне нападу на асобу, якая заведама для вінаватага спыніла непасрэдны ўдзел у ваенных дзеяннях;

14) перамяшчэнне часткі ўласнага грамадзянскага насельніцтва на тэрыторыю, якая акупіруецца;

15) неапраўданая затрымка рэпатрыяцыі ваеннапалонных і грамадзянскіх асоб;

16) прымяненне ва ўзброеным канфлікце іншых сродкаў і метадаў вядзення вайны, забароненых міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дваццаці гадоў.

**Артыкул 137. Бяздзейнасць або адданне злачыннага загаду падчас узброенага канфлікту**

1. Наўмыснае непрыняцце падчас узброенага канфлікту начальнікам або службовай асобай у межах сваіх паўнамоцтваў усіх магчымых мер для папярэджання злачынстваў, якія падрыхтоўваюцца падначаленым, або спынення злачынстваў, якія ўчыняюцца падначаленым, прадугледжаных артыкуламі 134, 135 і 136 гэтага Кодэкса, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да пятнаццаці гадоў.

2. Адданне падчас узброенага канфлікту начальнікам або службовай асобай падначаленаму загаду не пакідаць нікога ў жывых або іншага заведама злачыннага загаду ці распараджэння, накіраваных на ўчыненне злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 134, 135 і 136 гэтага Кодэкса, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дваццаці гадоў.

**Артыкул 138. Незаконнае карыстанне знакамі, якія ахоўваюцца міжнароднымі дагаворамі**

Наўмыснае выкарыстанне насуперак міжнародным дагаворам падчас ваенных дзеянняў эмблем Чырвонага Крыжа, Чырвонага Паўмесяца, Чырвонага Крышталя, або ахоўных знакаў для культурных каштоўнасцей, або іншых знакаў, якія ахоўваюцца міжнародным правам, або карыстанне дзяржаўным сцягам ці дзяржаўнымі адрозненнямі непрыяцеля, нейтральнай дзяржавы, сцягам або знакам міжнароднай арганізацыі –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да чатырох гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

## РАЗДЗЕЛ VII
## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ЧАЛАВЕКА

# ГЛАВА 19
# ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ЖЫЦЦЯ І ЗДАРОЎЯ

## Артыкул 139. Забойства

1. Наўмыснае проціпраўнае пазбаўленне жыцця іншага чалавека (забойства) –
караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад шасці да пятнаццаці гадоў.
2. Забойства:
1) двух ці больш асоб;
2) заведама малалетняга, састарэлага ці асобы, якая знаходзіцца ў бездапаможным стане;
3) заведама для вінаватага цяжарнай жанчыны;
4) звязанае з выкраданнем чалавека ці захопам заложніка;
5) учыненае агульнанебяспечным спосабам;
6) учыненае з асаблівай жорсткасцю;
7) звязанае са згвалтаваннем або насільнымі дзеяннямі сексуальнага характару;
8) з мэтай схаваць іншае злачынства або палегчыць яго ўчыненне;
9) з мэтай атрымання трансплантата ці выкарыстання частак трупа;
10) асобы ці яе блізкіх у сувязі з ажыццяўленнем ёй службовай дзейнасці або выкананнем грамадскага абавязку;
11) асобы ці яе блізкіх за адмову гэтай асобы ад удзелу ва ўчыненні злачынства;
12) з карыслівых меркаванняў, або па найме, або звязанае з разбоем, вымаганнем ці бандытызмам;
13) з хуліганскіх меркаванняў;
14) з-за матываў расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці ці звады, палітычнай ці ідэалагічнай варожасці, а таксама з-за матываў варожасці ці звады ў дачыненні да якой-небудзь сацыяльнай групы;
15) учыненае групай асоб;
16) учыненае асобай, якая раней учыніла забойства, за выключэннем забойства, прадугледжанага артыкуламі 140–143 гэтага Кодэкса, –
караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да дваццаці пяці гадоў, або пажыццёвым пазбаўленнем волі, або пакараннем смерцю.

## Артыкул 140. Забойства маці нованароджанага дзіцяці

Забойства маці свайго дзіцяці падчас родаў або непасрэдна пасля іх, учыненае ва ўмовах псіхатраўміруючай сітуацыі, выкліканай родамі, –
караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

## Артыкул 141. Забойства, учыненае ў стане афекту

Забойства, учыненае ў стане раптоўна ўзнікшага моцнага душэўнага хвалявання, выкліканага насіллем, здзекам, цяжкай знявагай або іншымі процізаконнымі ці грубымі амаральнымі дзеяннямі пацярпелага або працяглай псіхатраўміруючай сітуацыяй, якая ўзнікла ў сувязі з сістэматычнымі проціпраўнымі або амаральнымі паводзінамі пацярпелага, –
караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох гадоў.

## Артыкул 142. Забойства пры перавышэнні мер, неабходных для затрымання асобы, якая ўчыніла злачынства

Забойства, учыненае пры перавышэнні мер, неабходных для затрымання асобы, якая ўчыніла злачынства, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 143. Забойства пры перавышэнні межаў неабходнай абароны**

Забойства, учыненае пры перавышэнні межаў неабходнай абароны, –

караецца папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на той жа тэрмін, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 144. Прычыненне смерці з-за неасцярожнасці**

1. Прычыненне смерці з-за неасцярожнасці –

караецца папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Прычыненне смерці з-за неасцярожнасці дзвюм ці больш асобам –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 145. Давядзенне да самагубства**

1. Давядзенне асобы да самагубства ці замаху на самагубства шляхам пагрозы прымянення насілля да яе або яе блізкіх, знішчэння, пашкоджання або адабрання іх маёмасці, распаўсюджвання паклёпніцкіх ці выдавання іншых звестак, якія яны жадаюць захаваць у тайне, жорсткага абыходжання з пацярпелым або сістэматычнай знявагі яе асабістай годнасці –

караецца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, учыненае ў адносінах да асобы, якая знаходзілася ў матэрыяльнай ці іншай залежнасці ад вінаватага, або дзвюх ці больш асоб, або заведама непаўналетняга, або групай асоб па папярэдняй змове, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго года да пяці гадоў.

**Артыкул 146. Схіленне да самагубства**

1. Наўмыснае ўзбуджэнне ў іншай асобы рашучасці ўчыніць самагубства, калі асоба скончыла жыццё самагубствам або рабіла замах на яго (схіленне да самагубства), –

караецца папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Схіленне да самагубства дзвюх ці больш асоб або заведама непаўналетняга –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў.

**Артыкул 147. Наўмыснае прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання**

1. Наўмыснае прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання, гэта значыць пашкоджання, небяспечнага для жыцця, або пашкоджання, якое пацягнула за сабой страту зроку, маўлення, слыху, якога-небудзь органа або страту органам яго функцый, перарыванне цяжарнасці, псіхічнае расстройства (захворванне), іншае расстройства здароўя, злучанае з трывалай стратай агульнай працаздольнасці не менш чым на адну трэць, або прычыненне цяжкага цялеснага

пашкоджання, якое выклікала расстройства здароўя, звязанае з траўмай касцей шкілета, на тэрмін, большы за чатыры месяцы, або выявілася ў глыбокім знявечанні твару ці шыі, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін ад трох да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да васьмі гадоў.

2. Тое ж дзеянне, учыненае:

1) у дачыненні да асобы, заведама малалетняй, састарэлай або асобы, якая знаходзіцца ў бездапаможным стане;

1[1]) у дачыненні да заведама для вінаватага цяжарнай жанчыны;

2) у дачыненні да выкрадзенага чалавека або заложніка;

3) спосабам, які носіць характар мучэння або катавання;

4) з мэтай атрымання трансплантата;

5) у дачыненні да асобы або яе блізкіх у сувязі з ажыццяўленнем ёй службовай дзейнасці ці выкананнем грамадскага абавязку;

6) з карыслівых меркаванняў або па найме;

7) з хуліганскіх меркаванняў;

8) з-за расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці або звады, палітычнай або ідэалагічнай варожасці, а таксама з-за варожасці або звады ў дачыненні да якой-небудзь сацыяльнай групы;

9) групай асоб;

10) агульнанебяспечным спосабам, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя паўторна, або асобай, якая раней учыніла іншае злачынства, звязанае з наўмысным прычыненнем цяжкага цялеснага пашкоджання, або раней учыніла забойства (за выключэннем злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 140–143 гэтага Кодэкса), а таксама ў дачыненні да дзвюх ці больш асоб, або дзеянні, якія выклікалі з-за неасцярожнасці смерць пацярпелага, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да пятнаццаці гадоў.

**Артыкул 148. Наўмыснае пазбаўленне прафесійнай працаздольнасці**

Наўмыснае прычыненне цялеснага пашкоджання, якое не небяспечнае для жыцця і не выклікала наступстваў, прадугледжаных артыкулам 147 гэтага Кодэкса, але злучанага з заведама для вінаватага поўнай стратай прафесійнай працаздольнасці, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго года да шасці гадоў.

**Артыкул 149. Наўмыснае прычыненне менш цяжкага цялеснага пашкоджання**

1. Наўмыснае прычыненне менш цяжкага цялеснага пашкоджання, гэта значыць пашкоджання, якое не з’яўляецца небяспечным для жыцця і не выклікала наступстваў, прадугледжаных артыкулам 147 гэтага Кодэкса, але выклікала працяглае расстройства здароўя на тэрмін да чатырох месяцаў або значную трывалую страту працаздольнасці менш чым на адну трэць, –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам са штрафам ці без штрафу, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў са штрафам ці без штрафу, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін са штрафам ці без штрафу.

2. Тое ж дзеянне, учыненае групай асоб, або спосабам, які мае характар мучэння ці катавання, або агульнанебяспечным спосабам, або ў дачыненні да заведама для вінаватага цяжарнай жанчыны, састарэлага ці асобы, якая знаходзіцца ў бездапаможным стане, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго года да пяці гадоў.

**Артыкул 150. Наўмыснае прычыненне цяжкага або менш цяжкага цялеснага пашкоджання ў стане афекту**

Наўмыснае прычыненне цяжкага або менш цяжкага цялеснага пашкоджання ў стане раптоўна ўзніклага моцнага душэўнага хвалявання, выкліканага насіллем, здзекам, цяжкай знявагай ці іншымі процізаконнымі ці грубымі амаральнымі дзеяннямі пацярпелага або працяглай псіхатраўміруючай сітуацыяй, якая ўзнікла ў сувязі з сістэматычнымі проціпраўнымі або амаральнымі паводзінамі пацярпелага, –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 151. Наўмыснае прычыненне цяжкага або менш цяжкага цялеснага пашкоджання пры перавышэнні мер, неабходных для затрымання асобы, якая ўчыніла злачынства**

Наўмыснае прычыненне цяжкага або менш цяжкага цялеснага пашкоджання пры перавышэнні мер, неабходных для затрымання асобы, якая ўчыніла злачынства, –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў.

**Артыкул 152. Наўмыснае прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання пры перавышэнні межаў неабходнай абароны**

Наўмыснае прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання пры перавышэнні межаў неабходнай абароны –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да аднаго года, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 153. Наўмыснае прычыненне лёгкага цялеснага пашкоджання**

Наўмыснае прычыненне лёгкага цялеснага пашкоджання, гэта значыць пашкоджання, якое выклікала за сабой кароткачасовае расстройства здароўя або нязначную трывалую страту працаздольнасці, –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да аднаго года, або арыштам.

**Артыкул 154. Катаванне**

1. Наўмыснае прычыненне працяглага болю або мучэнняў спосабамі, якія выклікаюць асаблівыя фізічныя і псіхічныя пакуты пацярпелага, або сістэматычнае нанясенне пабояў, якія не выклікалі наступстваў, прадугледжаных артыкуламі 147 і 149 гэтага Кодэкса, (катаванне) –

караюцца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін са штрафам або без штрафу.

2. Катаванне, учыненае ў дачыненні да заведама для вінаватага цяжарнай жанчыны, або састарэлага, або непаўналетняга, або асобы, якая знаходзіцца ў бездапаможным стане ці ў залежным становішчы, або асобай, раней судзімай за катаванне, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін ад аднаго года да трох гадоў са штрафам ці без штрафу або пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго года да пяці гадоў са штрафам ці без штрафу.

**Артыкул 155. Прычыненне цяжкага або менш цяжкага цялеснага пашкоджання з-за неасцярожнасці**

Прычыненне цяжкага або менш цяжкага цялеснага пашкоджання з-за неасцярожнасці –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да аднаго года, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 156. Незаконнае правядзенне аборту**

1. Незаконнае правядзенне аборту асобай, якая мае вышэйшую адукацыю па профілі адукацыі «Ахова здароўя», –

караецца штрафам або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю са штрафам.

2. Правядзенне аборту асобай, якая не мае вышэйшай адукацыі па профілі адукацыі «Ахова здароўя», –

караецца арыштам або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення са штрафам ці без штрафу.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, якія выклікалі з-за неасцярожнасці смерць жанчыны або прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення са штрафам ці без штрафу.

**Артыкул 157. Заражэнне вірусам імунадэфіцыту чалавека**

1. Заведамае пастаўленне іншай асобы ў небяспеку заражэння вірусам імунадэфіцыту чалавека (ВІЧ) –

караецца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Заражэнне іншай асобы з-за легкадумнасці або з ускосным намерам ВІЧ асобай, якая ведала аб наяўнасці ў яе гэтага захворвання, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

3. Дзеянне, прадугледжанае часткай 2 гэтага артыкула, учыненае ў дачыненні да дзвюх ці больш асоб, або яўна непаўналетняга, або з прамым намерам, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці гадоў.

Заўвага. Асоба, якая ўчыніла дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці ў выпадку, калі іншая асоба, пастаўленая ў небяспеку заражэння або заражаная ВІЧ, была своечасова папярэджана аб наяўнасці ў першай асобы гэтага захворвання і добраахвотна пагадзілася ўчыніць дзеянні, якія стварылі небяспеку заражэння.

**Артыкул 158. Заражэнне венерычным захворваннем**

1. Заведамае пастаўленне іншай асобы праз палавыя зносіны ці іншымі дзеяннямі ў небяспеку заражэння венерычным захворваннем асобай, якая ведала аб наяўнасці ў яе гэтага захворвання, –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да аднаго года, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў.

2. Заражэнне венерычным захворваннем асобай, якая ведала аб наяўнасці ў яе гэтага захворвання, –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

3. Дзеянне, прадугледжанае часткай 2 гэтага артыкула, учыненае ў дачыненні да дзвюх ці больш асоб або яўна непаўналетняга, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін са штрафам.

**Артыкул 159. Пакіданне ў небяспецы**

1. Неаказанне асобе, якая знаходзіцца ў небяспечным для жыцця стане, неабходнай і яўна не безадкладнай дапамогі, калі яна заведама магла быць аказана вінаватым без небяспекі для яго жыцця ці здароўя або жыцця ці здароўя іншых асоб, або непаведамленне належным установам ці асобам аб неабходнасці аказання дапамогі –

караюцца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да аднаго года.

2. Заведамае пакіданне без дапамогі асобы, якая знаходзіцца ў небяспечным для жыцця ці здароўя стане і пазбаўлена магчымасці прыняць меры да самазахавання з-за малалецтва, старасці, захворвання або з прычыны сваёй бездапаможнасці, у выпадках, калі вінаваты меў магчымасць аказаць пацярпеламу дапамогу і быў абавязаны аб ім клапаціцца, –

караецца арыштам або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў са штрафам ці без штрафу.

3. Заведамае пакіданне ў небяспецы, учыненае асобай, якая сама з-за неасцярожнасці ці з ускосным намерам паставіла пацярпелага ў небяспечны для жыцця або здароўя стан, –

караецца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін са штрафам.

**Артыкул 160. Неаказанне капітанам судна дапамогі асобам, якія церпяць бедства**

Неаказанне капітанам судна дапамогі людзям, якія церпяць бедства на водным шляху, калі гэта дапамога магла быць аказана без сур'ёзнай небяспекі для свайго судна, яго экіпажа і пасажыраў, –

караецца пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 161. Неаказанне медыцынскай дапамогі хворай асобе**

1. Неаказанне медыцынскай дапамогі хворай асобе без уважлівых прычын медыцынскім работнікам або іншай асобай, абавязанай аказваць яе ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю са штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў са штрафам.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць хворай асобы ці прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 162. Неналежнае выкананне прафесійных абавязкаў медыцынскім работнікам**

1. Неналежнае выкананне прафесійных абавязкаў медыцынскім работнікам, якое выклікала прычыненне пацыенту з-за неасцярожнасці цяжкага або менш цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю са штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на той жа тэрмін са штрафам.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць пацыента або заражэнне ВІЧ, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 163. Прымус да дачы органаў або тканак для трансплантацыі**

1. Прымус асобы да дачы яе органаў або тканак для трансплантацыі, учынены з пагрозай прымянення насілля да яе або яе блізкіх, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

2. Прымус асобы да дачы яе органаў або тканак для трансплантацыі, учынены з прымяненнем насілля або ў дачыненні да асобы, якая знаходзіцца ў матэрыяльнай ці іншай залежнасці ад вінаватага, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 164. Парушэнне ўмоў і парадку забору або трансплантацыі органаў ці тканак чалавека**

1. Парушэнне медыцынскім работнікам умоў і парадку забору органаў ці тканак чалавека або ўмоў і парадку трансплантацыі, прадугледжаных заканадаўствам, якое выклікала з-за неасцярожнасці прычыненне цяжкага або менш цяжкага цялеснага пашкоджання донару ці рэцыпіенту, –

караецца пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

2. Дзеянне, прадугледжанае часткай 1 гэтага артыкула, учыненае паўторна, або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, або якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць донара ці рэцыпіента, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 165. Невыкананне або неналежнае выкананне абавязкаў для загарантавання бяспекі жыцця і здароўя малалетняга**

1. Невыкананне або неналежнае выкананне абавязкаў для загарантавання бяспекі жыцця і здароўя малалетняга асобай, на якую такія абавязкі ўскладзены па службе, або асобай, якая выконвае гэтыя абавязкі па спецыяльным даручэнні або добраахвотна прыняла на сябе такія абавязкі, якое выклікала прычыненне малалетняму з-за неасцярожнасці менш цяжкага цялеснага пашкоджання, пры адсутнасці прыкмет службовага злачынства –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю са штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць малалетняга ці прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Дзеянне, прадугледжанае часткай 1 гэтага артыкула, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць двух ці больш малалетніх, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да шасці гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

## ГЛАВА 20
## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ПАЛАВОЙ НЕДАТЫКАЛЬНАСЦІ АБО ПАЛАВОЙ СВАБОДЫ

### Артыкул 166. Згвалтаванне

1. Палавыя зносіны насуперак волі пацярпелай з прымяненнем насілля або з пагрозай яго прымянення да жанчыны ці яе блізкіх або з выкарыстаннем бездапаможнага стану пацярпелай (згвалтаванне) –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў.

2. Згвалтаванне, учыненае паўторна, або групай асоб, або асобай, якая раней учыніла дзеянні, прадугледжаныя артыкулам 167 гэтага Кодэкса, або згвалтаванне заведама непаўналетняй –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да трынаццаці гадоў.

3. Згвалтаванне заведама малалетняй або згвалтаванне, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць пацярпелай, або прычыненне цяжкіх цялесных пашкоджанняў, або заражэнне ВІЧ, або іншыя цяжкія наступствы, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да пятнаццаці гадоў.

Заўвага. Для мэт прымянення гэтага артыкула і артыкула 167 гэтага Кодэкса малалетні, які не дасягнуў дванаццацігадовага ўзросту на момант учынення ў дачыненні да яго злачынства, прызнаецца асобай, якая знаходзіцца ў бездапаможным стане, паколькі з прычыны ўзросту не можа разумець характар і значэнне дзеянняў, якія ўчыняюцца з ім.

### Артыкул 167. Гвалтоўныя дзеянні сексуальнага характару

1. Педэрастыя, лесбіянства ці іншыя дзеянні сексуальнага характару, учыненыя насуперак волі пацярпелага (пацярпелай) з прымяненнем насілля ці з пагрозай яго прымянення або з выкарыстаннем бездапаможнага стану пацярпелага (пацярпелай), –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна, або асобай, якая раней учыніла згвалтаванне, або групай асоб, або ў дачыненні да заведама непаўналетняга (непаўналетняй), –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да трынаццаці гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, якія ўчынены ў дачыненні да заведама малалетняга (малалетняй), або выклікалі з-за неасцярожнасці смерць пацярпелага (пацярпелай), або прычыненне цяжкіх цялесных пашкоджанняў, або заражэнне ВІЧ, або іншыя цяжкія наступствы, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да пятнаццаці гадоў.

### Артыкул 168. Палавыя зносіны і іншыя дзеянні сексуальнага характару з асобай, якая не дасягнула шаснаццацігадовага ўзросту

1. Палавыя зносіны, педэрастыя, лесбіянства ці іншыя дзеянні сексуальнага характару, учыненыя асобай, якая дасягнула васямнаццацігадовага ўзросту, з асобай, якая заведама не дасягнула шаснаццацігадовага ўзросту, пры адсутнасці прыкмет злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 166 і 167 гэтага Кодэкса, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін са штрафам.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя асобай, якая раней учыніла злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 166 або 167 гэтага Кодэкса, або ў дачыненні да дзвюх і больш асоб, або асобай, на якую ўскладзены абавязкі па выхаванні, утрыманні, забеспячэнні бяспекі жыцця і здароўя непаўналетняга, або групай асоб, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў.

Заўвага. Асоба, якая ўчыніла дзеянні, прадугледжаныя часткай 1 гэтага артыкула, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці, калі будзе выяўлена, што гэта асоба і ўчыненае ёй злачынства перасталі быць грамадска небяспечнымі ў сувязі з уступленнем у шлюб з пацярпелай (пацярпелым).

**Артыкул 169. Распусныя дзеянні**

1. Распусныя дзеянні, учыненыя асобай, якая дасягнула васямнаццацігадовага ўзросту, у дачыненні да асобы, якая заведама не дасягнула шаснаццацігадовага ўзросту, пры адсутнасці прыкмет злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 166, 167 і 168 гэтага Кодэкса, –

караюцца арыштам або пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго года да трох гадоў.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя з прымяненнем насілля або з пагрозай яго прымянення, або ў дачыненні да заведама малалетняга (малалетняй), або бацькамі, педагагічнымі работнікамі ці іншымі асобамі, на якіх ускладзены абавязкі па выхаванні непаўналетняга, або асобай, якая раней учыніла злачынствы, прадугледжаныя гэтым артыкулам або артыкуламі 166–168 гэтага Кодэкса, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да шасці гадоў.

**Артыкул 170. Прымус да дзеянняў сексуальнага характару**

1. Прымус асобы да палавых зносін, педэрастыі, лесбіянства або ўчынення іншых дзеянняў сексуальнага характару шляхам шантажу, пагрозы знішчэннем, пашкоджаннем ці адабраннем маёмасці або з выкарыстаннем службовай, матэрыяльнай ці іншай залежнасці пацярпелага (пацярпелай) –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

2. Тое ж дзеянне, учыненае ў дачыненні да заведама непаўналетняга (непаўналетняй), –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да шасці гадоў.

**Артыкул 171. Арганізацыя і (або) выкарыстанне займання прастытуцыяй або стварэнне ўмоў для займання прастытуцыяй**

1. Арганізацыя і (або) выкарыстанне займання прастытуцыяй іншай асобай або даванне з карыслівай мэтай памяшкання (месца) асобай, якая заведама ведала, што гэта памяшканне (месца) будзе выкарыстана для займання прастытуцыяй, або арганізацыя і (ці) утрыманне прытона для займання прастытуцыяй пры адсутнасці прыкмет больш цяжкага злачынства –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да пяці гадоў са штрафам.

2. Тыя ж дзеянні, звязаныя з вывазам за межы дзяржавы асобы для займання прастытуцыяй, або ўчыненыя службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, або асобай,

якая раней учыніла злачынствы, прадугледжаныя гэтым артыкулам, артыкуламі 171[1], 181 або 181[1] гэтага Кодэкса, або з выкарыстаннем для займання прастытуцыяй заведама непаўналетняга, або ўчыненыя арганізаванай групай, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці гадоў са штрафам.

Заўвага. Пад выкарыстаннем займання прастытуцыяй разумеецца атрыманне асобай матэрыяльнай ці іншай выгады ад добраахвотнага аказання іншай асобай за ўзнагароджанне паслуг сексуальнага характару (палавыя зносіны, педэрастыя, лесбіянства і іншыя дзеянні сексуальнага характару).

**Артыкул 171[1]. Уцягненне ў займанне прастытуцыяй або прымус да працягу займання прастытуцыяй**

1. Уцягненне ў займанне прастытуцыяй або прымус да працягу займання прастытуцыяй –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго года да трох гадоў са штрафам.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна, або з прымяненнем насілля ці з пагрозай яго прымянення, або асобай, якая раней учыніла злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 171, 181 або 181[1] гэтага Кодэкса, або асобай, якая дасягнула васямнаццацігадовага ўзросту, у дачыненні да заведама непаўналетняга, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да пяці гадоў са штрафам.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя бацькам ці маці, педагагічным работнікам ці іншай асобай, на якую ўскладзены абавязкі па выхаванні непаўналетняга, у дачыненні да заведама непаўналетняга або арганізаванай групай, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да дзесяці гадоў са штрафам.

## ГЛАВА 21
## ЗЛАЧЫНСТВА СУПРАЦЬ УКЛАДУ СЯМЕЙНЫХ АДНОСІН І ІНТАРЭСАЎ НЕПАЎНАЛЕТНІХ

**Артыкул 172. Уцягненне непаўналетняга ва ўчыненне злачынства**

1. Уцягненне асобай, якая дасягнула васямнаццацігадовага ўзросту, заведама непаўналетняга ва ўчыненне злачынства шляхам абяцанняў, падману ці іншым спосабам –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, учыненае з прымяненнем насілля або з пагрозай яго прымянення або ўчыненае бацькам ці маці, педагагічным работнікам ці іншай асобай, на якую ўскладзены абавязкі па выхаванні непаўналетняга, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, звязаныя з уцягненнем непаўналетняга ў арганізаваную групу або ва ўчыненне цяжкага ці асабліва цяжкага злачынства, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да васьмі гадоў.

**Артыкул 173. Уцягненне непаўналетняга ў антыграмадскія паводзіны**

1. Уцягненне асобай, якая дасягнула васямнаццацігадовага ўзросту, заведама непаўналетняга ў сістэматычнае спажыванне спіртных напояў, або ў сістэматычнае немедыцынскае спажыванне моцнадзейных ці іншых адурманьвальных рэчываў або ў бадзяжніцтва ці папрашайніцтва –

караецца арыштам або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

2. Тое ж дзеянне, учыненае з прымяненнем насілля або з пагрозай яго прымянення або ўчыненае бацькам ці маці, педагагічным работнікам ці іншай асобай, на якую ўскладзены абавязкі па выхаванні непаўналетняга, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго года да пяці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 174. Ухіленне бацькоў ад утрымання дзяцей або ад пакрыцця выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца або знаходзіліся на дзяржаўным забеспячэнні**

1. Ухіленне бацькоў больш за тры месяцы на працягу года ад выплаты па судовай пастанове сродкаў на ўтрыманне непаўналетніх ці паўналетніх, але непрацаздольных дзяцей і дзяцей, якія маюць патрэбу ў матэрыяльнай дапамозе –

караецца грамадскімі працамі, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года.

2. Ухіленне бацькоў ад пакрыцця выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца або знаходзіліся на дзяржаўным забеспячэнні, якое выявілася ў няяўцы на працу дзесяць і больш працоўных дзён на працягу трох месяцаў або ў скрыванні ці заніжэнні імі памеру заработнай платы і прыраўнаваных да яе даходаў, а таксама ва ўхіленні ад працаўладкавання па судовай пастанове, учыненым на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такое ж парушэнне, якое пацягнула за сабой невыкананне або няпоўнае выкананне абавязацельстваў па пакрыцці выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца або знаходзіліся на дзяржаўным забеспячэнні, –

караецца грамадскімі працамі, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя асобай, раней судзімай за ўхіленне ад утрымання дзяцей або ад пакрыцця выдаткаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца або знаходзіліся на дзяржаўным забеспячэнні, –

караюцца папраўчымі працамі на тэрмін ад аднаго года да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін ад аднаго года да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

Заўвага. Пад ухіленнем ад працаўладкавання па судовай пастанове ў гэтым артыкуле разумеюцца ўхіленне ад яўкі ў органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, арганізацыі для працаўладкавання, ад праходжання медыцынскага агляду, атрымання неабходных для працаўладкавання дакументаў, а таксама іншыя вінаватыя дзеянні (бяздзейнасць), якія выклікалі невыкананне судовай пастановы аб працаўладкаванні.

**Артыкул 175. Ухіленне дзяцей ад утрымання бацькоў**

1. Ухіленне дарослых працаздольных дзяцей больш за тры месяцы на працягу года ад выплаты паводле рашэння суда (суддзі) сродкаў на ўтрыманне непрацаздольных бацькоў і бацькоў, якія маюць патрэбу ў матэрыяльнай дапамозе –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў.

2. Тое ж дзеянне, учыненае асобай, раней судзімай за ўхіленне ад утрымання бацькоў, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў са штрафам.

**Артыкул 176. Злоўжыванне правамі апекуна або папячыцеля**

Выкарыстанне апекі ці папячыцельства ў карыслівых мэтах, або жорсткае абыходжанне з падапечнымі, або наўмыснае пакіданне іх без нагляду ці неабходнай дапамогі, якія выклікалі істотнае ўшчамленне праў і законных інтарэсаў падапечных, –

караюцца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў.

**Артыкул 177. Выдаванне тайны ўсынаўлення (удачарэння)**

Наўмыснае выдаванне тайны ўсынаўлення (удачарэння) супраць волі ўсынавіцеля або ўсыноўленага (удачаронай) –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да аднаго года.

**Артыкул 177[1]. Незаконныя дзеянні па ўсынаўленні (удачарэнні) дзяцей**

Дзеянні па падборы і перадачы дзяцей на ўсынаўленне (удачарэнне) ад імя або ў інтарэсах асоб, якія жадаюць іх усынавіць (удачарыць), што ажыццяўляюцца асобай, не ўпаўнаважанай на гэта заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, учыненыя на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такое ж парушэнне, а таксама схіленне гэтай асобай да згоды на ўсынаўленне (удачарэнне) дзяцей з карыслівых меркаванняў –

караюцца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін са штрафам ці без штрафу.

**Артыкул 178. Выдаванне ўрачэбнай тайны**

1. Наўмыснае выдаванне медыцынскім, фармацэўтычным або іншым работнікам без прафесійнай ці службовай неабходнасці звестак аб наяўнасці захворвання, дыягназе ці выніках медыцынскага агляду пацыента (выдаванне ўрачэбнай тайны) –

караецца штрафам або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

2. Выдаванне ўрачэбнай тайны, якое выявілася ў паведамленні звестак аб наяўнасці ў асобы ВІЧ ці захворвання СНІД, –

караецца пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю са штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў са штрафам.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, , якія выклікалі цяжкія наступствы, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 179. Выключаны**

**Артыкул 180. Наўмысная падмена дзіцяці**

1. Наўмысная падмена дзіцяці –

караецца папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, учыненае з карыслівых ці іншых нізкіх меркаванняў, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да шасці гадоў са штрафам.

## ГЛАВА 22
## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ АСАБІСТАЙ СВАБОДЫ, ГОНАРУ І ГОДНАСЦІ

**Артыкул 181. Гандаль людзьмі**

1. Вярбоўка, перавозка, перадача, укрывальніцтва або атрыманне чалавека ў мэтах эксплуатацыі, учыненыя шляхам падману, або злоўжывання даверам, або прымянення насілля, бяспечнага для жыцця ці здароўя пацярпелага, або з пагрозай прымянення такога насілля (гандаль людзьмі), –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў са штрафам.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя:

1) у дачыненні да дзвюх ці больш асоб;

2) з прымяненнем насілля, небяспечнага для жыцця ці здароўя пацярпелага, або з пагрозай прымянення такога насілля;

3) выключаны;

4) групай асоб па папярэдняй змове;

5) асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў;

6) асобай, якая раней учыніла злачынствы, прадугледжаныя гэтым артыкулам, артыкуламі 171, 171[1], 181[1], 187, часткамі 2 і 3 артыкула 343[1] гэтага Кодэкса;

7) у дачыненні да заведама для вінаватага цяжарнай жанчыны;

8) з вывазам асобы за межы дзяржавы;

9) у дачыненні да заведама непаўналетняга незалежна ад прымянення якога-небудзь са сродкаў уздзеяння, указаных у частцы 1 гэтага артыкула, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да дванаццаці гадоў са штрафам.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, якія ўчынены арганізаванай групай, або ў дачыненні да заведама малалетняга, або выклікалі з-за неасцярожнасці смерць пацярпелага, або прычыненне цяжкіх цялесных пашкоджанняў, або заражэнне ВІЧ, або іншыя цяжкія наступствы, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дванаццаці да пятнаццаці гадоў са штрафам.

Заўвага. Пад эксплуатацыяй у гэтым артыкуле, артыкулах 181[1], 182 і 187 гэтага Кодэкса разумеецца незаконны прымус чалавека да працы або аказання паслуг (у тым ліку да дзеянняў сексуальнага характару, сурагатнага мацярынства, забору ў чалавека органаў і (або) тканак) у выпадку, калі ён па незалежных ад яго прычынах не можа адмовіцца ад выканання прац (паслуг), уключаючы рабства або звычаі, падобныя да рабства.

**Артыкул 181[1]. Выкарыстанне рабскай працы**

1. Выкарыстанне рабскай працы ці іншая форма эксплуатацыі чалавека пры адсутнасці прыкмет злачынства, прадугледжанага артыкулам 181 гэтага Кодэкса, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў са штрафам.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя:

1) у дачыненні да заведама непаўналетняга;

2) у дачыненні да дзвюх ці больш асоб;

3) групай асоб па папярэдняй змове;

4) службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў;

5) у дачыненні да заведама для вінаватага цяжарнай жанчыны;

6) асобай, якая раней учыніла злачынствы, прадугледжаныя гэтым артыкулам, артыкуламі 171, 171[1], 181 або 187 гэтага Кодэкса, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў са штрафам або без штрафу.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, якія выклікалі з-за неасцярожнасці смерць пацярпелага, або прычыненне яму цяжкіх цялесных пашкоджанняў, або іншыя цяжкія наступствы або ўчыненыя арганізаванай групай, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да дванаццаці гадоў са штрафам.

**Артыкул 182. Выкраданне чалавека**

1. Тайнае, адкрытае, шляхам падману ці злоўжывання даверам або спалучанае з насіллем, бяспечным для жыцця ці здароўя пацярпелага, або з пагрозай прымянення такога насілля, або з іншымі формамі прымусу проціпраўнае завалоданне чалавекам, звязанае з яго перамяшчэннем у іншае месца, пры адсутнасці прыкмет злачынства, прадугледжанага артыкулам 291 гэтага Кодэкса (выкраданне чалавека), –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да сямі гадоў са штрафам або без штрафу.

2. Тое ж дзеянне, учыненае:

1) у дачыненні да заведама непаўналетняга;

2) у дачыненні да дзвюх ці больш асоб;

3) з карыслівых меркаванняў;

4) у мэтах эксплуатацыі;

5) з мэтай адабрання ў пацярпелага органаў ці тканак для трансплантацыі;

6) групай асоб па папярэдняй змове;

7) з прымяненнем насілля, небяспечнага для жыцця ці здароўя, або дзеянне, якое суправаджалася мучэннямі ці катаваннем, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да пятнаццаці гадоў са штрафам.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, якія выклікалі з-за неасцярожнасці смерць пацярпелага, або прычыненне цяжкіх цялесных пашкоджанняў, або іншыя цяжкія наступствы або ўчыненыя арганізаванай групай, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да пятнаццаці гадоў са штрафам.

**Артыкул 183. Незаконнае пазбаўленне волі**

1. Незаконныя змяшчэнне чалавека ў якое-небудзь памяшканне (іншае месца) або ўтрыманне ў ім, звязванне чалавека ці іншае перашкаджэнне магчымасці пакінуць месца знаходжання пры адсутнасці прыкмет службовага або іншага больш цяжкага злачынства (незаконнае пазбаўленне волі) –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў са штрафам.

2. Незаконнае пазбаўленне волі, учыненае спосабам, небяспечным для жыцця ці здароўя пацярпелага, або незаконнае пазбаўленне волі, якое суправаджалася мучэннямі, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да васьмі гадоў.

**Артыкул 184. Незаконнае змяшчэнне ў псіхіятрычны стацыянар**

1. Змяшчэнне ў псіхіятрычны стацыянар заведама псіхічна здаровай асобы або незаконнае ўтрыманне такой асобы ў псіхіятрычным стацыянары –

караюцца штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

2. Тыя ж дзеянні, якія выклікалі з-за неасцярожнасці цяжкія наступствы, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 185. Прымус**

Прымус асобы да выканання або невыканання якога-небудзь дзеяння, учынены пад пагрозай прымянення насілля да яе або яе блізкіх, знішчэння ці пашкоджання іх маёмасці, распаўсюджвання паклёпніцкіх або выдавання іншых звестак, якія яны жадаюць захаваць у тайне, або пад пагрозай ушчамлення праў, свабод і законных інтарэсаў гэтых асоб, пры адсутнасці прыкмет больш цяжкага злачынства –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 186. Пагроза забойствам, прычыненнем цяжкіх цялесных пашкоджанняў або знішчэннем маёмасці**

Пагроза забойствам, прычыненнем цяжкіх цялесных пашкоджанняў або знішчэннем маёмасці агульнанебяспечным спосабам, калі меліся падставы апасацца яе ажыццяўлення, –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да аднаго года, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 187. Незаконныя дзеянні, накіраваныя на працаўладкаванне грамадзян за мяжой**

1. Незаконныя дзеянні, накіраваныя на працаўладкаванне грамадзян за мяжой, калі ў выніку такіх дзеянняў асобы, працаўладкаваныя за мяжой, падвергліся эксплуатацыі, пры адсутнасці прыкмет злачынства, прадугледжанага артыкулам 181 гэтага Кодэкса (незаконныя дзеянні, накіраваныя на працаўладкаванне грамадзян за мяжой), –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да пяці гадоў са штрафам або без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

2. Незаконныя дзеянні, накіраваныя на працаўладкаванне грамадзян за мяжой, учыненыя паўторна або асобай, якая раней учыніла злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 171, 171[1], 181 або 181[1] гэтага Кодэкса, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад чатырох да шасці гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

3. Незаконныя дзеянні, накіраваныя на працаўладкаванне грамадзян за мяжой, учыненыя арганізаванай групай, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад шасці да васьмі гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

**Артыкул 188. Паклёп**

Распаўсюджванне заведама лжывых звестак, якія няславяць іншую асобу, (паклёп) у публічным выступленні, або ў друкаваным творы ці творы, які дэманструецца публічна, або ў сродках масавай інфармацыі, або ў інфармацыі, размешчанай у глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт, іншай сетцы электрасувязі агульнага карыстання ці выдзеленай сетцы электрасувязі, або паклёп, які змяшчае абвінавачанне ва ўчыненні цяжкага ці асабліва цяжкага злачынства, –

караюцца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 189. Выключаны**

## ГЛАВА 23
## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ КАНСТЫТУЦЫЙНЫХ ПРАЎ І СВАБОД ЧАЛАВЕКА І ГРАМАДЗЯНІНА

**Артыкул 190. Парушэнне раўнапраўя грамадзян**

Наўмыснае прамое ці ўскоснае парушэнне ці абмежаванне праў і свабод або ўстанаўленне прамых ці ўскосных пераваг грамадзян у залежнасці ад полу, расы, нацыянальнасці, мовы, паходжання, маёмаснага ці службовага становішча, месца жыхарства, адносін да рэлігіі,

перакананняў, прыналежнасці да грамадскіх аб'яднанняў, якія прычынілі істотную шкоду правам, свабодам і законным інтарэсам грамадзяніна, а таксама яго блізкіх, –

караюцца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на той жа тэрмін, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 191. Перашкаджэнне ажыццяўленню выбарчых праў, права на ўдзел у рэферэндуме, або рэалізацыі права заканадаўчай ініцыятывы грамадзян, або працы Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, выбарчых камісій, камісій па рэферэндуме, камісій па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата**

1. Перашкаджэнне ажыццяўленню грамадзянінам Рэспублікі Беларусь права свабодна выбіраць і быць выбраным, удзельнічаць у рэферэндуме, галасаванні аб адкліканні дэпутата, весці передвыбарную агітацыю, агітацыю па рэферэндуме ці адкліканні дэпутата, або перашкаджэнне свабоднай рэалізацыі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь права заканадаўчай ініцыятывы, правядзенню агітацыі за ці супраць прапановы аб унясенні праекта закона ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, або перашкаджэнне працы Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, выбарчых камісій, камісій па рэферэндуме ці камісій па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата, учыненае з прымяненнем насілля, пагрозы, падману, подкупу ці іншым спосабам, –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, учыненае групай асоб па папярэдняй змове або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў.

**Артыкул 192. Парушэнне заканадаўства аб выбарах, рэферэндуме, аб адкліканні дэпутата і аб рэалізацыі права заканадаўчай ініцыятывы грамадзян**

Падлог дакументаў аб выбарах, рэферэндуме або адкліканні дэпутата, або парушэнне тайны галасавання, або заведама няправільны падлік галасоў ці іншае скажэнне вынікаў галасавання, учыненыя асобай, якая ўваходзіць у склад Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, выбарчай камісіі, камісіі па рэферэндуме, камісіі па правядзенні галасавання аб адкліканні дэпутата, або іншай асобай, якая прымае ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні выбараў, рэферэндуму або адклікання дэпутата, або падлог дакументаў пры падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемстваў, накіраваных на рэалізацыю права заканадаўчай ініцыятывы грамадзян, учынены службовымі асобамі дзяржаўных органаў, грамадскіх аб'яднанняў, іншых арганізацый і іншымі асобамі, –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 193. Арганізацыя або кіраўніцтва грамадскім аб'яднаннем, рэлігійнай арганізацыяй, якія замахваюцца на асобу, правы і абавязкі грамадзян**

1. Арганізацыя або кіраўніцтва палітычнай партыяй, іншым грамадскім аб'яднаннем, рэлігійнай арганізацыяй, дзейнасць якіх звязана з насіллем над грамадзянамі, або з прычыненнем ім цялесных пашкоджанняў, або з іншымі замахамі на правы, свабоды і законныя інтарэсы грамадзян, або з перашкаджэннем выкананню грамадзянамі іх дзяржаўных, грамадскіх, сямейных абавязкаў,–

караюцца арыштам ці пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

2. Тыя ж дзеянні, звязаныя з арганізацыяй або кіраўніцтвам палітычнай партыяй, іншым грамадскім аб'яднаннем, рэлігійнай арганізацыяй, указанымі ў частцы 1 гэтага артыкула, якія не прайшлі ва ўстаноўленым парадку дзяржаўную рэгістрацыю, –

караюцца арыштам або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

**Артыкул 194. Перашкаджэнне законнай дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў**

Перашкаджэнне законнай дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў або ўмяшанне ў іх законную дзейнасць, якія выклікалі істотнае парушэнне іх праў і законных інтарэсаў, –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 195. Перашкаджэнне законнай дзейнасці рэлігійных арганізацый**

Перашкаджэнне законнай дзейнасці рэлігійных арганізацый або здзяйсненню рэлігійных абрадаў, калі яны не парушаюць грамадскі парадак і не суправаджаюцца замахам на правы, свабоды і законныя інтарэсы грамадзян, –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 196. Перашкаджэнне правядзенню сходу, мітынгу, дэманстрацыі, шэсця, пікетавання або ўдзелу ў іх**

Незаконнае перашкаджэнне правядзенню сходу, мітынгу, дэманстрацыі, шэсця, пікетавання або ўдзелу ў іх або прымус да ўдзелу ў іх, учыненыя з прымяненнем насілля або з пагрозай яго прымянення, –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў.

**Артыкул 197. Праследаванне грамадзян за крытыку**

1. Ушчамленне службовай асобай праў, свабод і законных інтарэсаў грамадзяніна за накіраванне ім у дзяржаўныя органы ці грамадскія аб'яднанні прапаноў, заяў або скарг, або за крытыку, якая змяшчаецца ў іх, або за выступленні з крытыкай у іншай форме (праследаванне грамадзян за крытыку) –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала прычыненне істотнай шкоды правам, свабодам і законным інтарэсам грамадзяніна, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 198. Перашкаджэнне законнай прафесійнай дзейнасці журналіста**

Перашкаджэнне ў любой форме законнай прафесійнай дзейнасці журналіста або прымус яго да распаўсюджвання ці адмовы ад распаўсюджвання інфармацыі, учыненыя з прымяненнем насілля або з пагрозай яго прымянення, са знішчэннем або пашкоджаннем маёмасці, ушчамленнем праў і законных інтарэсаў журналіста, –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 198[1]. Парушэнне заканадаўства аб сродках масавай інфармацыі**

Распаўсюджванне ўладальнікам інтэрнэт-рэсурсу, не зарэгістраванага ў якасці сеткавага выдання, інфармацыі, распаўсюджванне якой забаронена на інтэрнэт-рэсурсах у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі, учыненае на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такое ж парушэнне, –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

Заўвага. Пад уладальнікам інтэрнэт-рэсурсу ў гэтым артыкуле разумеюцца фізічная асоба, у тым ліку індывідуальны прадпрымальнік, або службовая асоба юрыдычнай асобы, якія рэалізуюць права валодання, карыстання і (або) распараджэння інтэрнэт-рэсурсам.

**Артыкул 199. Парушэнне заканадаўства аб працы**

Неабгрунтаваная адмова ў прыёме на працу або звальненне жанчыны з-за яе цяжарнасці або заведама незаконнае звальненне асобы з працы –

караюцца пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

**Артыкул 200. Прымус да забастоўкі або да адмовы ад удзелу ў ёй**

Прымус да ўдзелу ў забастоўцы або да адмовы ад удзелу ў законнай забастоўцы, учынены з прымяненнем насілля або з пагрозай яго прымянення, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў.

**Артыкул 201. Парушэнне аўтарскага права, сумежных праў і права прамысловай уласнасці**

1. Выдаванне без згоды аўтара або заяўніка сутнасці вынаходкі, карыснай мадэлі, прамысловага ўзору або іншага аб'екта права прамысловай уласнасці да афіцыйнай публікацыі звестак аб іх, учыненае на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такое ж парушэнне, –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў.

2. Незаконнае распаўсюджванне або іншае незаконнае выкарыстанне аб'ектаў аўтарскага права, сумежных праў або аб'ектаў права прамысловай уласнасці, учыненыя на працягу года

пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такое ж парушэнне або звязаныя з атрыманнем даходу ў буйным памеры, –

караюцца грамадскімі працамі, або штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, якія ўчынены паўторна, або групай асоб па папярэдняй змове, або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, або выклікалі прычыненне ўрону ў буйным памеры, –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

Заўвагі:

1. Буйным памерам даходу (урону) у гэтым артыкуле прызнаецца памер даходу (урону) на суму, якая ў пяцьсот і больш разоў перавышае памер базавай велічыні, устаноўлены на дзень учынення злачынства.

2. Пад даходам належыць разумець сукупную суму выручкі ад рэалізацыі тавараў, прац, паслуг з незаконным выкарыстаннем праў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці. Даход, атрыманы ў натуральнай форме, падлягае вызначэнню ў грашовым выражэнні.

**Артыкул 202. Парушэнне недатыкальнасці жылля і іншых законных валоданняў грамадзян**

1. Незаконнае ўварванне ў жыллё насуперак волі асоб, якія пражываюць у ім, або іншае парушэнне недатыкальнасці законных валоданняў грамадзян –

караюцца грамадскімі працамі, або штрафам, або арыштам.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам.

**Артыкул 203. Парушэнне тайны перапіскі, тэлефонных перагавораў, тэлеграфных або іншых паведамленняў**

1. Наўмыснае незаконнае парушэнне тайны перапіскі, тэлефонных або іншых перагавораў, паштовых, тэлеграфных або іншых паведамленняў грамадзян –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да аднаго года, або арыштам.

2. Тое ж дзеянне, учыненае з выкарыстаннем спецыяльных тэхнічных сродкаў, прызначаных для сакрэтнага атрымання інфармацыі, або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 203$^{1}$. Незаконныя дзеянні ў дачыненні да інфармацыі аб прыватным жыцці і персанальных даных**

1. Наўмысныя незаконныя збор, даванне інфармацыі аб прыватным жыцці і (або) персанальных даных іншай асобы без яе згоды, якія выклікалі прычыненне істотнай шкоды правам, свабодам і законным інтарэсам грамадзяніна, –

караюцца грамадскімі працамі, або штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Наўмыснае незаконнае распаўсюджванне інфармацыі аб прыватным жыцці і (або) персанальных даных іншай асобы без яе згоды, якое выклікала прычыненне істотнай шкоды правам, свабодам і законным інтарэсам грамадзяніна, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін са штрафам.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя ў дачыненні да асобы або яе блізкіх у сувязі з ажыццяўленнем ёй службовай дзейнасці або выкананнем грамадскага абавязку, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін са штрафам.

**Артыкул 203$^{2}$. Невыкананне мер забеспячэння абароны персанальных даных**

Невыкананне мер забеспячэння абароны персанальных даных асобай, якая ажыццяўляе апрацоўку персанальных даных, якое выклікала з-за неасцярожнасці іх распаўсюджванне і прычыненне цяжкіх наступстваў, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да аднаго года, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года.

**Артыкул 204. Адмова ў забеспячэнні грамадзяніна інфармацыяй**

Незаконная адмова службовай асобы ў забеспячэнні грамадзяніна сабранымі ва ўстаноўленым парадку дакументамі і матэрыяламі, якія непасрэдна закранаюць яго правы, свабоды і законныя інтарэсы, або даванне яму няпоўнай ці наўмысна скажонай такой інфармацыі, якія выклікалі прычыненне істотнай шкоды правам, свабодам і законным інтарэсам грамадзяніна, –

караюцца штрафам або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

## РАЗДЗЕЛ VIII
## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ УЛАСНАСЦІ І ПАРАДКУ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ ЭКАНАМІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

### ГЛАВА 24
### ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ УЛАСНАСЦІ

Заўвагі:

1. Пад раскраданнем у гэтай главе разумеецца наўмыснае проціпраўнае бязвыплатнае завалоданне чужой маёмасцю або правам на маёмасць з карыслівай мэтай шляхам крадзяжу, рабавання, разбою, вымагання, махлярства, злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, прысваення, растраты або мадыфікацыі камп’ютарнай інфармацыі.

2. Раскраданне прызнаецца ўчыненым паўторна, калі яму папярэднічала іншае раскраданне або якое-небудзь з наступных злачынстваў: раскраданне агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў ці выбуховых рэчываў (артыкул 294), раскраданне радыеактыўных матэрыялаў (артыкул 323), раскраданне наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсараў і аналагаў (артыкул 327), раскраданне моцнадзейных ці ядавітых рэчываў (артыкул 333).

3. Значным памерам (уронам у значным памеры) у артыкулах гэтай главы прызнаецца памер (урон) на суму, якая ў сорак і больш разоў перавышае памер базавай велічыні, устаноўлены на дзень учынення злачынства, буйным памерам (уронам у буйным памеры) – у дзвесце пяцьдзесят і больш разоў, асабліва буйным памерам (уронам у асабліва буйным памеры) – якая ў тысячу і больш разоў перавышае памер такой базавай велічыні.

4. Не падлягае крымінальнай адказнасці асоба, якая ўчыніла раскраданне маёмасці юрыдычнай асобы шляхам крадзяжу, махлярства, злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, прысваення або растраты, раскрадання маёмасці шляхам мадыфікацыі камп’ютарнай інфармацыі ў суме, якая не перавышае дзесяцікратнага памеру базавай велічыні, устаноўленага на дзень учынення дзеяння, за выключэннем раскрадання ордэна, медаля Рэспублікі Беларусь, СССР ці БССР, нагруднага знака да ганаровага звання Рэспублікі Беларусь, СССР ці БССР, або раскраданне маёмасці фізічнай асобы шляхам крадзяжу, махлярства, злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, прысваення або растраты, раскрадання маёмасці шляхам мадыфікацыі камп’ютарнай інфармацыі ў суме, якая не перавышае двухкратнага памеру базавай велічыні, устаноўленага на дзень учынення дзеяння, за выключэннем крадзяжу ордэна, медаля Рэспублікі Беларусь, СССР ці БССР, нагруднага знака да ганаровага звання Рэспублікі Беларусь, СССР ці БССР або крадзяжу, учыненага групай асоб, або шляхам крадзяжу, учыненага з адзення або ручной паклажы, якія знаходзіліся пры ёй, або з пранікненнем у жыллё.

5. Асоба, якая ўчыніла злачынства, прадугледжанае часткай 1 артыкула 205, або часткай 1 артыкула 209, або часткай 1 артыкула 210, або часткай 1 артыкула 211, або часткай 1 артыкула 212, або часткай 1 артыкула 214, калі яна з’явілася з пакаяннем, актыўна дапамагала выяўленню злачынства і поўнасцю кампенсавала прычынены ўрон, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці.

6. Крымінальнае пераследаванне блізкіх асобы, пацярпелай ад злачынства, якія ўчынілі крадзеж (частка 1 артыкула 205), або махлярства (частка 1 артыкула 209), або прысваенне ці растрату (частка 1 артыкула 211), або раскраданне маёмасці шляхам мадыфікацыі камп’ютарнай інфармацыі (частка 1 артыкула 212), або выкраданне транспартнага сродку ці маламернага судна (частка 1 артыкула 214), распачынаецца толькі па заяве асобы, якая пацярпела ад злачынства, а ў выпадку яе няздольнасці паводле ўзросту ці стану здароўя выказваць сваю волю ў крымінальным працэсе або ў выпадку яе смерці – любога з яе дарослых блізкіх сваякоў або членаў сям'і, яго законнага прадстаўніка.

**Артыкул 205. Крадзеж**

1. Тайнае выкраданне маёмасці (крадзеж) –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Крадзеж, учынены паўторна, або групай асоб, або з пранікненнем у жыллё, –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

3. Крадзеж, учынены ў буйным памеры, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў са штрафам ці без штрафу.

4. Крадзеж, учынены арганізаванай групай або ў асабліва буйным памеры, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дванаццаці гадоў са штрафам.

**Артыкул 206. Рабаванне**

1. Адкрытае выкраданне маёмасці (рабаванне) –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Рабаванне, злучанае з насіллем, бяспечным для жыцця ці здароўя пацярпелага, або з пагрозай прымянення такога насілля, або ўчыненае паўторна ці групай асоб, або з пранікненнем у жыллё, –

караецца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да шасці гадоў.

3. Рабаванне, учыненае ў буйным памеры, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да васьмі гадоў са штрафам ці без штрафу.

4. Рабаванне, учыненае арганізаванай групай або ў асабліва буйным памеры, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да трынаццаці гадоў са штрафам.

**Артыкул 207. Разбой**

1. Прымяненне насілля, небяспечнага для жыцця ці здароўя пацярпелага, або пагроза прымянення такога насілля з мэтай непасрэднага завалодання маёмасцю (разбой) –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў са штрафам ці без штрафу.

2. Разбой, учынены з пранікненнем у жыллё, або паўторна, або групай асоб, або з мэтай завалодання маёмасцю ў буйным памеры, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад шасці да пятнаццаці гадоў са штрафам.

3. Разбой, учынены арганізаванай групай, або з прычыненнем цяжкага цялеснага пашкоджання, або з мэтай завалодання маёмасцю ў асабліва буйным памеры, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да пятнаццаці гадоў са штрафам.

**Артыкул 208. Вымаганне**

1. Патрабаванне перадачы маёмасці ці права на маёмасць або здзяйснення якіх-небудзь дзеянняў маёмаснага характару пад пагрозай прымянення насілля да пацярпелага або яго блізкіх, знішчэння ці пашкоджання іх маёмасці, знішчэння, завалодання, блакавання, мадыфікацыі камп’ютарнай інфармацыі, распаўсюджвання паклёпніцкіх або выдавання іншых звестак, якія яны жадаюць захаваць у тайне (вымаганне), –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Вымаганне, учыненае паўторна, або групай асоб па папярэдняй змове, або з прымяненнем насілля, бяспечнага для жыцця ці здароўя пацярпелага, або пад пагрозай забойства ці прычынення цяжкага цялеснага пашкоджання, або злучанае са знішчэннем ці пашкоджаннем маёмасці, або з мэтай атрымання маёмаснай выгады ў буйным памеры –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў са штрафам ці без штрафу.

3. Вымаганне, якое ўчынена арганізаванай групай, або з прымяненнем насілля, небяспечнага для жыцця ці здароўя пацярпелага, або выклікала іншыя цяжкія наступствы, або з мэтай атрымання маёмаснай выгады ў асабліва буйным памеры –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да пятнаццаці гадоў са штрафам.

Заўвага. Пад мадыфікацыяй камп’ютарнай інфармацыі ў гэтым артыкуле, артыкулах 212, 216, 350 і 354 гэтага Кодэкса разумеюцца проціпраўнае змяненне камп’ютарнай інфармацыі або ўнясенне ў камп’ютарную сістэму заведама лжывай камп’ютарнай інфармацыі.

**Артыкул 209. Махлярства**

1. Завалоданне маёмасцю або набыццё права на маёмасць шляхам падману ці злоўжывання даверам (махлярства) –

караюцца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Махлярства, учыненае паўторна або групай асоб, –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

3. Махлярства, учыненае ў буйным памеры, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў са штрафам ці без штрафу.

4. Махлярства, учыненае арганізаванай групай або ў асабліва буйным памеры, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў са штрафам.

**Артыкул 210. Раскраданне шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі**

1. Завалоданне маёмасцю або набыццё права на маёмасць, учыненыя службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў (раскраданне шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі), –

караюцца пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох гадоў са штрафам ці без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

2. Раскраданне шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, учыненае паўторна або групай асоб па папярэдняй змове, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя ў буйным памеры, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

4. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1, 2 ці 3 гэтага артыкула, учыненыя арганізаванай групай або ў асабліва буйным памеры, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дванаццаці гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

**Артыкул 211. Прысваенне або растрата**

1. Прысваенне або растрата маёмасці асобай, якой яна даверана, –

караюцца пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю са штрафам, або арыштам са штрафам ці без штрафу, або абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў са штрафам ці без штрафу, або пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох гадоў са штрафам ці без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна або групай асоб па папярэдняй змове, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў са штрафам ці без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 або 2 гэтага артыкула, учыненыя ў буйным памеры, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў са штрафам ці без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

4. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1, 2 або 3 гэтага артыкула, учыненыя арганізаванай групай або ў асабліва буйным памеры, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дванаццаці гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

**Артыкул 212. Раскраданне маёмасці шляхам мадыфікацыі камп’ютарнай інфармацыі**

1. Раскраданне маёмасці шляхам мадыфікацыі камп’ютарнай інфармацыі –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, учыненае паўторна або групай асоб па папярэдняй змове, –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя ў буйным памеры, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў са штрафам ці без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

4. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1, 2 ці 3 гэтага артыкула, учыненыя арганізаванай групай або ў асабліва буйным памеры, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дванаццаці гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 213. Выключаны**

**Артыкул 214. Угон транспартнага сродку або маламернага судна**

1. Неправамернае завалоданне транспартным сродкам або маламерным суднам і паездка на ім без мэты выкрадання (угон) –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, якое ўчынена паўторна, або з прымяненнем насілля, бяспечнага для жыцця ці здароўя, або з пагрозай яго прымянення, або групай асоб па папярэдняй змове, або выклікала з-за неасцярожнасці прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да шасці гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя з прымяненнем насілля, небяспечнага для жыцця або здароўя, або з пагрозай яго прымянення, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў.

Заўвага. Прыкметы транспартнага сродку ўказаны ў заўвазе да артыкула 317 гэтага Кодэкса.

**Артыкул 215. Прысваенне знойдзенай маёмасці**

Прысваенне ў асабліва буйным памеры знойдзенай заведама чужой маёмасці або скарбу –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або арыштам.

**Артыкул 216. Прычыненне маёмаснага ўрону без прыкмет выкрадання**

1. Прычыненне ўрону ў значным памеры праз атрыманне маёмасных выгад у выніку падману, злоўжывання даверам ці шляхам мадыфікацыі камп’ютарнай інфармацыі пры адсутнасці прыкмет выкрадання –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

2. Прычыненне маёмаснага ўрону без прыкмет выкрадання, учыненае групай асоб па папярэдняй змове або ў буйным памеры, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 217. Незаконнае адчужэнне даверанай маёмасці**

Незаконнае бязвыплатнае адчужэнне ў значным памеры чужой маёмасці, даверанай вінаватаму, пры адсутнасці карыслівай мэты –

караецца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў.

**Артыкул 218. Наўмысныя знішчэнне або пашкоджанне чужой маёмасці**

1. Наўмысныя знішчэнне або пашкоджанне чужой маёмасці, якія выклікалі прычыненне ўрону ў значным памеры, –

караюцца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў.

2. Наўмысныя знішчэнне або пашкоджанне чужой маёмасці, якія ўчынены агульнанебяспечным спосабам або выклікалі прычыненне ўрону ў буйным памеры, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, якія ўчынены арганізаванай групай, або выклікалі  з-за неасцярожнасці смерць чалавека ці іншыя цяжкія наступствы, або выклікалі прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да дванаццаці гадоў.

**Артыкул 219. Знішчэнне або пашкоджанне чужой маёмасці з-за неасцярожнасці**

Знішчэнне або пашкоджанне чужой маёмасці з-за неасцярожнасці, якія выклікалі прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караюцца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 220. Выключаны**

## ГЛАВА 25
## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ПАРАДКУ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ ЭКАНАМІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Заўвагі:

1. Буйным памерам (здзелкай, уронам, даходам (нажывай) у буйным памеры) у артыкулах гэтай главы прызнаецца памер (здзелка, урон, даход (нажыва)) на суму, якая ў тысячу і больш разоў перавышае памер базавай велічыні, устаноўлены на дзень учынення злачынства, асабліва буйным памерам (здзелкай, уронам, даходам (нажывай) у асабліва буйным памеры) – якая ў дзве тысячы і больш разоў перавышае памер такой базавай велічыні, калі іншае не агаворана ў заўвагах да артыкулаў гэтай главы.

2. Пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі не можа быць прызначана асобе, якая асуджаецца ўпершыню і ўчыніла злачынства, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі або менш цяжкае злачынства супраць парадку ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці (за выключэннем кантрабанды, незаконнага экспарту ці перадачы ў мэтах экспарту аб'ектаў экспартнага кантролю, легалізацыі («адмывання») сродкаў, атрыманых злачынным шляхам).

**Артыкул 221. Выраб, захоўванне або збыт падробленых грошай ці каштоўных папер**

1. Выраб ці захоўванне з мэтай збыту або збыт падробленых банкнотаў ці манет, дзяржаўных ці іншых каштоўных папер у афіцыйнай грашовай адзінцы Рэспублікі Беларусь, грашовых знакаў ці каштоўных папер у замежнай валюце –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў са штрафам ці без штрафу або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна, або арганізаванай групай, або ў асабліва буйным памеры, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да пятнаццаці гадоў са штрафам.

**Артыкул 222. Незаконнае абарачэнне сродкаў плацяжу і (або) інструментаў**

1. Выраб у мэтах збыту або збыт падробленых банкаўскіх плацежных картак, іншых плацежных інструментаў і сродкаў плацяжу, а таксама ўчыненае з карыслівых меркаванняў незаконнае распаўсюджванне рэквізітаў банкаўскіх плацежных картак або аўтэнтыфікацыйных даных, пры дапамозе якіх магчымае атрыманне доступу да рахункаў або электронных кашалькоў, –

караюцца штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да шасці гадоў.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна, або арганізаванай групай, або ў асабліва буйным памеры, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін ад трох да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў са штрафам ці без штрафу.

**Артыкул 223. Парушэнне правіл аб здзелках з каштоўнымі металамі і (або) каштоўнымі камянямі**

1. Здзелка з каштоўнымі металамі і (або) каштоўнымі камянямі, здзейсненая ў парушэнне ўстаноўленых правіл у буйным памеры, –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, учыненае паўторна, або арганізаванай групай, або ў асабліва буйным памеры, –

караецца штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да васьмі гадоў.

**Артыкул 224. Выключаны**

**Артыкул 225. Невяртанне з-за мяжы грашовых сродкаў**

Невяртанне з-за мяжы індывідуальным прадпрымальнікам або службовай асобай юрыдычнай асобы грашовых сродкаў у асабліва буйным памеры, якія падлягаюць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь абавязковаму пералічэнню на рахункі ва ўпаўнаважаны банк Рэспублікі Беларусь, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

Заўвага. Невяртанне з-за мяжы грашовых сродкаў прызнаецца ўчыненым у асабліва буйным памеры, калі сума нявернутых грашовых сродкаў перавышае ў чатыры тысячы разоў памер базавай велічыні, устаноўлены на дзень учынення злачынства.

**Артыкул 226. Незаконны выпуск (эмісія) каштоўных папер**

Выпуск (эмісія) каштоўных папер без рэгістрацыі ва ўстаноўленым парадку, або публічнае размяшчэнне каштоўных папер з парушэннем устаноўленага парадку, або выкарыстанне заведама падложных дакументаў для рэгістрацыі каштоўных папер, якія выклікалі прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 226$^{1}$. Незаконныя выкарыстанне або выдаванне звестак, унесеных у рэестр уладальнікаў каштоўных папер, або інфармацыі аб выніках фінансава-гаспадарчай дзейнасці эмітэнта каштоўных папер**

Незаконныя выкарыстанне або выдаванне звестак, унесеных у рэестр уладальнікаў каштоўных папер, або інфармацыі аб выніках фінансава-гаспадарчай дзейнасці эмітэнта каштоўных папер да яе апублікавання ў сродках масавай інфармацыі або давядзення іншым чынам да ведама неабмежаванага кола асоб, якія ўчынены асобай, якой такія звесткі або інфармацыя вядомыя ў сувязі з яе прафесійнай ці службовай дзейнасцю, з карыслівай зацікаўленасці і выклікалі прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 226$^{2}$. Незаконныя дзеянні з простымі і (ці) пераводнымі вэксалямі**

1. Выдача, індасаванне, аваляванне простых і (ці) пераводных вэксаляў у буйным памеры, заведама не забяспечаных патрэбнай у адпаведнасці з заканадаўствам маёмасцю, у тым ліку маёмаснымі правамі, або іншымі адчужальнымі правамі, якія маюць кошт, або падпісаных асобамі, не здольнымі абавязвацца па іх, або ад імя такіх асоб, пры адсутнасці прыкмет службовага ці іншага больш цяжкага злачынства –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

2. Падробка подпісу на простым і (ці) пераводным вэксалі або на далучаным да яго дадатковым аркушы (алонжы), падпісанне простага і (або) пераводнага вэксаля, у тым ліку пры індасаменце, авалі, акцэпце, або дадатковага аркуша (алонжа) ад імя выдуманай асобы або такое іх падпісанне, пры якім пастаўлены подпіс па любой іншай падставе не можа абавязваць асобу, якая паставіла яго, або асобу, ад імя якой дадзены подпіс пастаўлены, –

караюцца штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да шасці гадоў.

3. Прымус да авалявання, індасавання або выдачы простага і (ці) пераводнага вэксаля, акцэпту пераводнага вэксаля пад пагрозай прымянення насілля над пацярпелым або яго блізкімі або знішчэння ці пашкоджання іх маёмасці або заведамае ўказанне плацельшчыкам у пераводным вэксалі асобы, якая не мае сродкаў для яго аплаты, –

караюцца штрафам або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў.

4. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 2 ці 3 гэтага артыкула, учыненыя паўторна, або арганізаванай групай, або з прымяненнем насілля, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці гадоў са штрафам або без штрафу.

**Артыкул 226$^{3}$. Маніпуляванне рынкам каштоўных папер**

Учыненне дзеянняў (бяздзейнасць), якія аказваюць істотны ўплыў на попыт на каштоўную паперу і (ці) прапанову каштоўнай паперы, рыначны кошт каштоўнай паперы ці аб'ём таргоў каштоўнай паперай, якія прызнаюцца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі маніпуляваннем рынкам каштоўных папер, якое выклікала прычыненне ўрону ў буйным памеры, –

караецца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 227. Падлог рашэння аб выпуску або праспекта эмісіі каштоўных папер**

Унясенне службовай асобай у рашэнне аб выпуску або праспект эмісіі каштоўных папер заведама недакладных звестак або засведчанне праспекта эмісіі, які змяшчае заведама недакладныя звесткі, што выклікалі прычыненне ўрону інвестарам у асабліва буйным памеры, –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

**Артыкул 228. Кантрабанда**

1. Незаконнае перамяшчэнне праз мытную мяжу Еўразійскага эканамічнага саюза ў буйным памеры тавараў, забароненых або абмежаваных да такога перамяшчэння, пры адсутнасці прыкмет злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 328[1] і 333[1] гэтага Кодэкса, –

караецца штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Незаконнае перамяшчэнне праз мытную мяжу Еўразійскага эканамічнага саюза ў буйным памеры наяўных грашовых сродкаў ці грашовых інструментаў –

караецца штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя групай асоб па папярэдняй змове, або паўторна, або асобай, якая раней учыніла злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 328[1] і 333[1] гэтага Кодэкса, або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў або ўчыненыя з прымяненнем насілля да асобы, якая праводзіць мытны або ажыццяўляе пагранічны кантроль, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці гадоў са штрафам або без штрафу.

4. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1, 2 ці 3 гэтага артыкула, учыненыя арганізаванай групай, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да дванаццаці гадоў са штрафам або без штрафу.

Заўвагі:

1. У гэтым артыкуле, артыкулах 328[1] і 333[1] гэтага Кодэкса пад незаконным перамяшчэннем праз мытную мяжу Еўразійскага эканамічнага саюза разумеецца перамяшчэнне тавараў праз мытную мяжу Еўразійскага эканамічнага саюза па-за ўстаноўленымі месцамі або ў неўстаноўлены час працы мытных органаў у гэтых месцах, або са скрываннем ад мытнага кантролю, або з заведама недакладным дэклараваннем ці недэклараваннем тавараў, або з выкарыстаннем дакументаў, якія змяшчаюць заведама недакладныя звесткі аб таварах, або з выкарыстаннем падробленых сродкаў ідэнтыфікацыі ці сродкаў ідэнтыфікацыі, якія адносяцца да іншых тавараў.

2. Дзеянне, прадугледжанае часткай 1 гэтага артыкула, прызнаецца ўчыненым у буйным памеры, калі кошт тавараў, якія перамяшчаюцца адной асобай або групай асоб, перавышае ў дзве тысячы і больш разоў памер базавай велічыні, устаноўлены на дзень учынення злачынства.

3. Дзеянне, прадугледжанае часткай 2 гэтага артыкула, прызнаецца ўчыненым у буйным памеры, калі сума наяўных грашовых сродкаў, якія перамяшчаюцца, у тым ліку ў міжнародных паштовых адпраўленнях, і (ці) кошт грашовых інструментаў, якія перамяшчаюцца, у тым ліку ў міжнародных паштовых адпраўленнях, перавышаюць двухкратны памер сумы наяўных грашовых сродкаў і (ці) кошту дарожных чэкаў, дазволеных Мытным кодэксам Еўразійскага эканамічнага саюза да перамяшчэння без мытнага дэкларавання ў пісьмовай форме.

Пры разліку памеру сумы наяўных грашовых сродкаў, якія перамяшчаюцца незаконна, і (ці) кошту грашовых інструментаў, якія перамяшчаюцца незаконна, з усёй сумы наяўных грашовых сродкаў, якія перамяшчаюцца, і (ці) кошту грашовых інструментаў, якія перамяшчаюцца, падлягае выключэнню тая частка, якая Мытным кодэксам Еўразійскага эканамічнага саюза дазволена да перамяшчэння без мытнага дэкларавання ў пісьмовай форме або была задэклараравана.

4. Пад грашовымі інструментамі, указанымі ў частцы 2 гэтага артыкула, разумеюцца дарожныя чэкі, вэксалі, чэкі (банкаўскія чэкі), а таксама каштоўныя паперы ў дакументарнай

форме, якія сведчаць абавязацельства эмітэнта (даўжніка) аб выплаце грашовых сродкаў, у якіх не ўказана асоба, якой ажыццяўляецца такая выплата.

5. Асоба, якая добраахвотна здала наяўныя грашовыя сродкі і (ці) грашовыя інструменты, указаныя ў гэтым артыкуле, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці, калі ў яе дзеяннях не змяшчаецца іншага складу злачынства. Не могуць прызнавацца добраахвотнай здачай наяўных грашовых сродкаў або грашовых інструментаў, указаных у гэтым артыкуле, іх выяўленне пры вусным апытанні ў якасці меры, якая забяспечвае правядзенне мытнага кантролю, пры прымяненні форм мытнага кантролю, іх адабранне пры затрыманні асобы, а таксама пры правядзенні следчых дзеянняў для іх выяўлення і адабрання.

**Артыкул 228[1]. Незаконнае перамяшчэнне тавараў праз мытную мяжу**

1. Перамяшчэнне тавараў праз мытную мяжу Еўразійскага эканамічнага саюза па-за вызначанымі заканадаўствам месцамі або ў неўстаноўлены час працы мытных органаў у гэтых месцах пры адсутнасці прыкмет злачынства, прадугледжанага артыкулам 228 гэтага Кодэкса (незаконнае перамяшчэнне тавараў праз мытную мяжу), учыненае на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такое ж парушэнне, –

караецца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Незаконнае перамяшчэнне тавараў праз мытную мяжу, учыненае асобай, раней судзімай за злачынствы, прадугледжаныя гэтым артыкулам або артыкулам 228 гэтага Кодэкса, –

караецца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

3. Незаконнае перамяшчэнне тавараў праз мытную мяжу, учыненае арганізаванай групай, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў.

**Артыкул 229. Незаконныя экспарт або перадача ў мэтах экспарту аб'ектаў экспартнага кантролю**

1. Незаконныя экспарт або перадача ў мэтах экспарту аб'ектаў экспартнага кантролю, якія заведама могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы (стварэнні), вытворчасці, эксплуатацыі, мадэрнізацыі, мадыфікацыі, рамонце, мантажы, тэхнічным абслугоўванні ўзбраення і ваеннай тэхнікі (пры адсутнасці прыкмет злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 129, 333[1] і 356 гэтага Кодэкса), –

караюцца штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна, або групай асоб па папярэдняй змове, або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да шасці гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткай 1 гэтага артыкула, учыненыя арганізаванай групай або ў дачыненні да аб'ектаў экспартнага кантролю, якія заведама могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы (стварэнні), вытворчасці, эксплуатацыі, мадэрнізацыі, мадыфікацыі, рамонце, мантажы, тэхнічным абслугоўванні зброі масавага паражэння, сродкаў яго дастаўкі, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў са штрафам або без штрафу.

**Артыкул 230. Невяртанне на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь гісторыка-культурных каштоўнасцей**

Наўмыснае невяртанне ва ўстаноўлены тэрмін на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь гісторыка-культурных каштоўнасцей, вывезеных за яе межы, калі такое вяртанне з'яўляецца абавязковым у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі гадоў са штрафам або без штрафу.

**Артыкул 231. Ухіленне ад выплаты плацяжоў, якія збіраюцца мытнымі органамі**

1. Ухіленне ад выплаты плацяжоў, якія збіраюцца мытнымі органамі, у буйным памеры –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

2. Тое ж дзеянне, учыненае паўторна або групай асоб па папярэдняй змове, –

караецца штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да шасці гадоў.

Заўвага. Ухіленнем ад выплаты плацяжоў, якія збіраюцца мытнымі органамі, у буйным памеры прызнаецца ўхіленне ад выканання абавязку па выплаце плацяжоў, якія збіраюцца мытнымі органамі пры надыходзе тэрміну іх выплаты, пры якім сума такіх незаплачаных плацяжоў перавышае ў тры тысячы і больш разоў памер базавай велічыні, устаноўлены на дзень учынення злачынства.

**Артыкул 232. Выключаны**

**Артыкул 233. Прадпрымальніцкая дзейнасць, якая ажыццяўляецца без спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі)**

1. Прадпрымальніцкая дзейнасць, якая ажыццяўляецца без спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), калі такі спецыяльны дазвол (ліцэнзія) абавязковы (прадпрымальніцкая дзейнасць, якая ажыццяўляецца без спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі)), звязаная з атрыманнем даходу ў буйным памеры, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін са штрафам ці без штрафу.

2. Дзеянне, прадугледжанае часткай 1 гэтага артыкула, учыненае асобай, раней судзімай за злачынства, прадугледжанае гэтым артыкулам, або звязанае з прыцягненнем грашовых сродкаў, электронных грошай ці іншай маёмасці грамадзян, калі выплата даходу або зварот грашовых сродкаў, электронных грошай ці іншай маёмасці ажыццяўляюцца поўнасцю ці часткова за кошт прыцягнутых грашовых сродкаў, электронных грошай ці іншай маёмасці іншых грамадзян, а таксама прадпрымальніцкая дзейнасць, якая ажыццяўляецца без спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), звязаная з атрыманнем даходу ў асабліва буйным памеры, –

караюцца штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў са штрафам ці без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя арганізаванай групай, –

караюцца штрафам або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

Заўвагі:

1. Пад даходам ад прадпрымальніцкай дзейнасці, якая ажыццяўляецца без спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), належыць разумець суму выручкі (даходу – для індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выкарыстоўваюць агульны парадак падаткаабкладання) ад рэалізацыі тавараў (прац, паслуг), маёмасных праў, атрыманай (атрыманага) па гэтай дзейнасці, за вылікам ускосных падаткаў, а таксама панесеных пры ажыццяўленні ўказанай дзейнасці дакументальна пацверджаных выдаткаў на вытворчасць і рэалізацыю тавараў (прац, паслуг), маёмасных праў, якія ўлічваюцца пры прымяненні агульнага парадку падаткаабкладання (у тым ліку такіх выдаткаў, панесеных у перыяд прымянення асаблівага рэжыму падаткаабкладання). Даход, атрыманы ў натуральнай форме, падлягае вызначэнню ў грашовым выражэнні.

Пад даходам ад прадпрымальніцкай дзейнасці, якая ажыццяўляецца без спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), звязанай з прыцягненнем грашовых сродкаў, электронных грошай ці іншай маёмасці грамадзян, належыць разумець усю суму (кошт) прыцягнутых грашовых сродкаў, электронных грошай ці іншай маёмасці. Даход, атрыманы ў натуральнай форме, падлягае вызначэнню ў грашовым выражэнні.

2. Даход ад прадпрымальніцкай дзейнасці, якая ажыццяўляецца без спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), прызнаецца атрыманым у буйным памеры, калі ён у тысячу і больш разоў перавышае памер базавай велічыні, устаноўлены на дзень учынення злачынства, у асабліва буйным памеры – у дзве тысячы і больш разоў перавышае памер такой базавай велічыні.

Даход ад прадпрымальніцкай дзейнасці, якая ажыццяўляецца без спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі), звязанай з прыцягненнем грашовых сродкаў, электронных грошай ці іншай маёмасці грамадзян, прызнаецца атрыманым у буйным памеры, калі ён у тысячу і больш разоў перавышае памер базавай велічыні, устаноўлены на дзень учынення злачынства.

**Артыкул 234. Выключаны**

**Артыкул 235. Легалізацыя («адмыванне») сродкаў, атрыманых злачынным шляхам**

1. Здзяйсненне фінансавых аперацый са сродкамі, атрыманымі заведама злачынным шляхам, для надання правамернага віду валоданню, карыстанню і (або) распараджэнню ўказанымі сродкамі ў мэтах утойвання ці скажэння паходжання, месцазнаходжання, размяшчэння, руху ці сапраўднай прыналежнасці ўказаных сродкаў –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю са штрафам, або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да чатырох гадоў са штрафам ці без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна, або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, або ў асабліва буйным памеры, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад чатырох да сямі гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя арганізаванай групай, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

Заўвагі:

1. Пад фінансавай аперацыяй у гэтым артыкуле разумеецца здзелка са сродкамі незалежна ад формы і спосабу яе ажыццяўлення.

2. Пад сродкамі ў гэтым артыкуле і артыкуле 290[1] гэтага Кодэкса разумеюцца грашовыя сродкі, каштоўныя паперы, электронныя грошы, іншая маёмасць, у тым ліку маёмасныя правы, а таксама выключныя правы на вынікі інтэлектуальнай дзейнасці.

3. Асоба, якая ўдзельнічала ў легалізацыі сродкаў, атрыманых злачынным шляхам, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці за гэтыя дзеянні, калі яна добраахвотна заявіла аб учыненым і дапамагала выяўленню злачынства.

**Артыкул 236. Набыццё або збыт матэрыяльных каштоўнасцей, заведама здабытых злачынным шляхам**

1. Загадзя не абяцаныя набыццё, захоўванне ці збыт матэрыяльных каштоўнасцей, заведама здабытых злачынным шляхам, пры адсутнасці прыкмет легалізацыі («адмывання») матэрыяльных каштоўнасцей, набытых злачынным шляхам, –

караюцца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна або ў буйным памеры, –

караюцца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў са штрафам.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя групай асоб па папярэдняй змове або ў асабліва буйным памеры, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да шасці гадоў са штрафам.

**Артыкул 237. Незаконнае атрыманне крэдыту або субсідыі**

1. Атрыманне індывідуальным прадпрымальнікам ці службовай асобай юрыдычнай асобы крэдыту або субсідыі, здзейсненае з выкарыстаннем заведама несапраўдных дакументаў і звестак аб абставінах, якія маюць істотнае значэнне для атрымання крэдыту або субсідыі, а таксама непаведамленне індывідуальным прадпрымальнікам ці службовай асобай юрыдычнай асобы інфармацыі аб узнікненні абставін, якія цягнуць за сабой прыпыненне ці спыненне крэдытавання або субсідзіравання, што выклікалі прычыненне ўрону ў буйным памеры, –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Дзеянні, прадугледжаныя часткай 1 гэтага артыкула, якія выклікалі прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 238. Фальшывая эканамічная неплацежаздольнасць (банкруцтва)**

1. Падача індывідуальным прадпрымальнікам ці службовай асобай юрыдычнай асобы ў суд, які разглядае эканамічныя справы, заявы даўжніка аб сваёй эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве), іншых дакументаў, якія змяшчаюць заведама недакладныя звесткі аб неплацежаздольнасці даўжніка, якая мае або набывае ўстойлівы характар, у мэтах прызнання гэтага даўжніка эканамічна неплацежаздольным (банкрутам) (фальшывая эканамічная неплацежаздольнасць (банкруцтва)), якая выклікала прычыненне ўрону ў буйным памеры, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Фальшывая эканамічная неплацежаздольнасць (банкруцтва), якая выклікала прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караецца штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 239. Скрыванне эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтва)**

Скрыванне неплацежаздольнасці індывідуальнага прадпрымальніка ці юрыдычнай асобы, якая мае або набывае ўстойлівы характар, учыненае гэтым індывідуальным прадпрымальнікам ці службовай асобай, заснавальнікам (удзельнікам) або ўласнікам маёмасці гэтай юрыдычнай асобы шляхам прадстаўлення звестак, не адпаведных рэчаіснасці, падробкі дакументаў, скажэння бухгалтарскай справаздачнасці ці іншым спосабам, якое выклікала прычыненне ўрону крэдытору (крэдыторам) у буйным памеры, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 240. Наўмысная эканамічная неплацежаздольнасць (банкруцтва)**

1. Наўмысныя стварэнне ці павелічэнне неплацежаздольнасці індывідуальнага прадпрымальніка ці юрыдычнай асобы, якія ўчыненыя гэтым індывідуальным прадпрымальнікам ці службовай асобай, заснавальнікам (удзельнікам) або ўласнікам маёмасці гэтай юрыдычнай асобы ў асабістых інтарэсах або ў інтарэсах іншых асоб і выклікалі прычыненне ўрону ў буйным памеры, –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тыя ж дзеянні, якія ўчыненыя паўторна або выклікалі прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караюцца штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 241. Перашкаджэнне пакрыццю страт крэдытору (крэдыторам)**

Скрыванне, адчужэнне, пашкоджанне ці знішчэнне маёмасці індывідуальнага прадпрымальніка ці юрыдычнай асобы, неплацежаздольнасць якіх мае або набывае ўстойлівы характар, з мэтай сарваць або зменшыць пакрыццё страт крэдытору (крэдыторам), учыненыя гэтым індывідуальным прадпрымальнікам ці службовай асобай, заснавальнікам (удзельнікам) або ўласнікам маёмасці гэтай юрыдычнай асобы, якія выклікалі прычыненне ўрону крэдытору (крэдыторам) у буйным памеры, –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 242. Ухіленне ад пагашэння крэдыторскай запазычанасці**

Ухіленне індывідуальнага прадпрымальніка ці службовай асобы юрыдычнай асобы ад пагашэння крэдыторскай запазычанасці па судовай пастанове, якая ўступіла ў законную сілу, у буйным памеры пры наяўнасці магчымасці выканаць абавязак –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 243. Ухіленне ад выплаты падаткаў, збораў**

1. Ухіленне ад выплаты падаткаў, збораў шляхам скрывання, наўмыснага заніжэння падатковай базы, ухілення ад падачы падатковай дэкларацыі (разліку) або ўнясення ў яе заведама лжывых звестак, якое выклікала прычыненне ўрону ў значным памеры, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да аднаго года, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў са штрафам.

2. Тое ж дзеянне, якая выклікала прычыненне ўрону ў буйным памеры, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Тое ж дзеянне, якая выклікала прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дванаццаці гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

Заўвага. Значным памерам урону ў гэтым артыкуле прызнаецца памер урону на суму, якая ў дзве тысячы разоў і больш перавышае памер базавай велічыні, устаноўлены на дзень учынення злачынства, буйным памерам – у тры тысячы пяцьсот і больш разоў, асабліва буйным памерам –у трыццаць тысяч і больш разоў перавышае такі памер базавай велічыні.

**Артыкул 243[1]. Ухіленне ад выканання абавязкаў падатковага агента па пералічэнні падаткаў, збораў**

1. Ухіленне ад выканання абавязкаў падатковага агента па пералічэнні падаткаў, збораў, якія падлягаюць падліку, вылічэнню ў плацельшчыка і пералічэнню ў бюджэт, якое выклікала прычыненне ўрону ў буйным памеры, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін са штрафам.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 243[2]. Падатковае махлярства**

1. Прадстаўленне ўпаўнаважанаму органу дакументаў, якія змяшчаюць заведама лжывыя звесткі, або заведама лжывых звестак іншым спосабам у мэтах неабгрунтаванага звароту падаткаў, збораў пры адсутнасці прыкмет больш цяжкага злачынства (падатковае махлярства), якое выклікала прычыненне ўрону ў буйным памеры, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін са штрафам ці без штрафу.

2. Падатковае махлярства, якое выклікала прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 243$^{3}$. Ухіленне ад выплаты страхавых узносаў**

1. Наўмысныя неналічэнне і нявыплата абавязковых страхавых узносаў, узносаў на прафесійнае пенсійнае страхаванне ў бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь (ухіленне ад выплаты страхавых узносаў), якія выклікалі прычыненне ўрону ў буйным памеры, –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў са штрафам.

2. Ухіленне ад выплаты страхавых узносаў, якое выклікала прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

Заўвага. Буйным памерам урону ў гэтым артыкуле прызнаецца памер урону на суму, якая ў дзве тысячы пяцьсот і больш разоў перавышае памер базавай велічыні, устаноўлены на дзень учынення злачынства, асабліва буйным памерам – якая ў пяць тысяч і больш разоў перавышае такі памер базавай велічыні.

**Артыкул 244. Выключаны**

**Артыкул 245. Устанаўленне або падтрыманне манапольных цэн**

1. Устанаўленне або падтрыманне манапольных цэн шляхам змовы індывідуальных прадпрымальнікаў ці службовых асоб юрыдычных асоб аб дзейнасці на сумесным рынку –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў.

2. Устанаўленне або падтрыманне манапольных цэн, звязаныя з прымусам або прымяненнем насілля ў дачыненні да канкурэнтаў, –

караюцца штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін ад трох да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў са штрафам ці без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 246. Прымус да здзяйснення здзелкі або да адмовы ад яе здзяйснення**

1. Прымус да здзяйснення здзелкі або да адмовы ад яе здзяйснення пад пагрозай прымянення насілля над пацярпелым ці яго блізкімі або знішчэння ці пашкоджання іх маёмасці пры адсутнасці прыкмет вымагання –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, учыненае паўторна або групай асоб па папярэдняй змове, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі першай ці другой гэтага артыкула, учыненыя арганізаванай групай або з прымяненнем насілля, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці гадоў.

**Артыкул 247. Выключаны**

**Артыкул 248. Выключаны**

**Артыкул 249. Выключаны**

**Артыкул 250. Распаўсюджванне лжывай інфармацыі аб таварах і паслугах**

1. Распаўсюджванне заведама лжывай інфармацыі або прымяненне рэкламы, якія ўводзяць у зман спажыўцоў адносна якасці, колькасці, складу, спосабу вырабу і іншых характарыстык прадукцыі (тавараў, прац, паслуг), –

караюцца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў.

2. Тыя ж дзеянні ў дачыненні да прадукцыі (тавараў, прац, паслуг), якая можа зрабіць шкоду здароўю спажыўцоў, –

караюцца штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 251. Зрыў публічных таргоў**

Здзяйсненне з карыслівай мэтай дзеянняў, якія прывялі да зрыву публічных таргоў ва ўрон уласніку маёмасці або іншай асобе, –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 252. Камерцыйны подкуп**

1. Атрыманне работнікам індывідуальнага прадпрымальніка ці юрыдычнай асобы, які не з'яўляецца службовай асобай, або асобай, якая выконвае працы ці аказвае паслугі індывідуальнаму прадпрымальніку ці юрыдычнай асобе па грамадзянска-прававым дагаворы, матэрыяльных каштоўнасцей або набыццё выгад маёмаснага характару за дзеянне (бяздзейнасць) у інтарэсах асобы, якая падкупляе, звязанае з працай, якая выконваецца гэтай асобай, або з паслугай, якая аказваецца гэтай асобай, і заведама здольнае прычыніць шкоду інтарэсам уласніка або яго кліентаў, або даванне такога ўзнагароджання (камерцыйны подкуп) –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Камерцыйны подкуп, учынены паўторна, –

караецца штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

Заўвага. Асоба, якая дала ўзнагароджанне, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці, калі ў дачыненні да яе мела месца вымаганне такога ўзнагароджання або калі гэта асоба пасля давання ўзнагароджання добраахвотна заявіла аб учыненым і актыўна дапамагала раскрыццю і (або) расследаванню злачынства.

**Артыкул 253. Подкуп удзельнікаў і арганізатараў спартыўных спаборніцтваў або відовішчных камерцыйных конкурсаў**

1. Атрыманне грошай, каштоўных папер, іншай маёмасці або паслуг маёмаснага характару спартсменам, трэнерам, медыцынскім работнікам, якія ўдзельнічаюць у спартыўнай падрыхтоўцы спартсмена (каманды спартсменаў), суддзёй па спорце, спартыўным агентам, іншай асобай, уключанай у склад удзельнікаў спартыўнага спаборніцтва, арганізатарам спартыўнага спаборніцтва, арганізатарам ці членам журы відовішчнага камерцыйнага конкурсу за аказанне ўплыву на вынікі спартыўнага спаборніцтва ці відовішчнага камерцыйнага конкурсу або за здзяйсненне загадзя вызначанага дзеяння (бяздзейнасці) пры правядзенні спартыўнага спаборніцтва ці відовішчнага камерцыйнага конкурсу або даванне такога ўзнагароджання –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна, –

караюцца штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

Заўвага. Асоба, якая дала ўзнагароджанне, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці, калі ў дачыненні да яе мела месца вымаганне такога ўзнагароджання або калі гэтая асоба пасля давання ўзнагароджання добраахвотна заявіла аб учыненым і актыўна дапамагала раскрыццю і (або) расследаванню злачынства.

**Артыкул 254. Камерцыйны шпіянаж**

1. Крадзеж або збіранне незаконным спосабам звестак, якія з’яўляюцца камерцыйнай ці банкаўскай тайнай, з мэтай іх выдавання ці незаконнага выкарыстання (камерцыйны шпіянаж) –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Камерцыйны шпіянаж, які выклікаў прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караецца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго года да пяці гадоў.

**Артыкул 255. Выдаванне камерцыйнай тайны**

Наўмыснае выдаванне камерцыйнай ці банкаўскай тайны без згоды яе ўладальніка пры адсутнасці прыкмет злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 226[1] і 254 гэтага Кодэкса,

учыненае асобай, якой такая камерцыйная ці банкаўская тайна вядомая ў сувязі з яе прафесійнай ці службовай дзейнасцю, з карыслівай зацікаўленасці, якое выклікала ўрон у буйным памеры, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 256. Выключаны**

**Артыкул 257. Выключаны**

**Артыкул 258. Незаконныя выраб, выкарыстанне або збыт дзяржаўных прабірных клеймаў**

1. Незаконныя выраб, выкарыстанне, збыт або падробка дзяржаўнага прабірнага кляйма Рэспублікі Беларусь або замежных дзяржаў, учыненыя з карыслівай зацікаўленасці, –

караюцца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна або групай асоб па папярэдняй змове, –

караюцца штрафам або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў.

**Артыкул 259. Выключаны**

**Артыкул 260. Выключаны**

**Артыкул 261. Выключаны**

**Артыкул 261$^{1}$. Выраб, збыт або выкарыстанне падробленых акцызных марак Рэспублікі Беларусь**

1. Выраб у мэтах збыту або збыт падробленых акцызных марак Рэспублікі Беларусь –

караюцца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Выкарыстанне заведама падробленых акцызных марак Рэспублікі Беларусь –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі першай і другой гэтага артыкула, учыненыя паўторна або арганізаванай групай, –

караюцца штрафам або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да пяці гадоў.

**Артыкул 262. Выключаны**

## РАЗДЗЕЛ IX
## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ЭКАЛАГІЧНАЙ БЯСПЕКІ, НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ І ПАРАДКУ ПРЫРОДАКАРЫСТАННЯ

### ГЛАВА 26
### ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ЭКАЛАГІЧНАЙ БЯСПЕКІ, НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ І ПАРАДКУ ПРЫРОДАКАРЫСТАННЯ

Заўвагі:

1. Злачынствамі супраць экалагічнай бяспекі, навакольнага асяроддзя і парадку прыродакарыстання прызнаюцца ўчыненыя наўмысна або з-за неасцярожнасці грамадска небяспечныя дзеянні, якія прычынілі або могуць прычыніць шкоду зямлі, водам, нетрам, лясам, жывёльнаму і раслiннаму свету, атмасфернаму паветру і іншым прыродным аб'ектам, аднесеным да гэтакіх заканадаўствам аб ахове навакольнага асяроддзя, незалежна ад форм уласнасці.

2. Буйным памерам урону ў артыкулах гэтай главы прызнаецца памер урону на суму, якая ў дзвесце пяцьдзясят і больш разоў перавышае памер базавай велічыні, устаноўлены на дзень учынення злачынства, асабліва буйным – якая ў тысячу і больш разоў перавышае памер такой базавай велічыні, калі іншае не агаворана ў артыкулах гэтай главы.

**Артыкул 263. Наўмысныя знішчэнне або пашкоджанне каштоўных прыродных комплексаў або аб'ектаў прыродных тэрыторый, якія асабліва ахоўваюцца**

Наўмысныя знішчэнне або пашкоджанне каштоўных прыродных комплексаў або аб'ектаў прыродных тэрыторый, якія асабліва ахоўваюцца, пры адсутнасці прыкмет больш цяжкага злачынства –

караюцца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 264. Парушэнне рэжыму аховы і выкарыстання прыродных тэрыторый, якія асабліва ахоўваюцца**

Парушэнне рэжыму аховы і выкарыстання прыродных тэрыторый, якія асабліва ахоўваюцца, што выклікала наўмыснае або з-за неасцярожнасці прычыненне ўрону ў буйным памеры, –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 265. Парушэнне патрабаванняў экалагічнай бяспекі**

Парушэнне патрабаванняў экалагічнай бяспекі пры праектаванні, размяшчэнні, будаўніцтве, уводзе ў эксплуатацыю, кансервацыі, дэмантажы, зносе або эксплуатацыі будынкаў, збудаванняў і іншых аб'ектаў асобай, адказнай за іх прытрымліванне, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека, або захворванні людзей, або прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 266. Прыёмка ў эксплуатацыю аб'ектаў, пры будаўніцтве якіх заведама не захаваны патрабаванні экалагічнай бяспекі**

Прыёмка ў эксплуатацыю членамі прыёмачных камісій аб'ектаў, пры будаўніцтве якіх заведама не захаваны патрабаванні экалагічнай бяспекі, калі гэта выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека, або захворванні людзей, або прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 267. Непрыняцце мер для ліквідацыі наступстваў парушэнняў заканадаўства аб ахове навакольнага асяроддзя і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў**

1. Непрыняцце з-за легкадумнасці або нядбайнасці мер для ліквідацыі наступстваў парушэнняў заканадаўства аб ахове навакольнага асяроддзя і рацыянальным выкарыстанні прыродных рэсурсаў або неналежнае правядзенне ў мясцовасцях, якія падвергліся забруджванню навакольнага асяроддзя, мерапрыемстваў для аднаўлення навакольнага асяроддзя асобай, адказнай за іх правядзенне, якія выклікалі з-за неасцярожнасці смерць чалавека, або захворванні людзей, або прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

2. Ухіленне ад правядзення мерапрыемстваў для аднаўлення навакольнага асяроддзя асобы, адказнай за іх выкананне, якое выклікала з-за неасцярожнасці наступствы, названыя ў частцы першай гэтага артыкула, –

караецца пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 268. Скрыванне або наўмыснае скажэнне звестак аб забруджванні навакольнага асяроддзя**

1. Скрыванне або наўмыснае скажэнне службовай асобай звестак аб радыяцыйным, хімічным, бактэрыялагічным або іншым небяспечным для жыцця і здароўя людзей забруджванні навакольнага асяроддзя або аб стане здароўя насельніцтва, якое падверглася шкоднаму ўздзеянню, –

караюцца грамадскімі працамі, або штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

2. Тыя ж дзеянні, якія выклікалі з-за неасцярожнасці смерць чалавека, або захворванні людзей, або прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 269. Пашкоджанне зямель**

Знішчэнне ўрадлівага слоя глебы, або невыкананне правіл рэкультывацыі зямель, або забруджванне іх хімічнымі ці іншымі рэчывамі, адходамі, сцёкавымі водамі, бактэрыяльна-паразітычнымі шкоднымі арганізмамі, або іншае незаконнае пашкоджанне зямель (псута

зямель), якія ўчынены на экалагічна небяспечнай тэрыторыі або выклікалі наўмыснае ці з-за неасцярожнасці прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 270. Знішчэнне або пашкоджанне тарфянікаў**

Знішчэнне або пашкоджанне тарфянікаў у выніку неасцярожнага абыходжання з агнём ці іншымі крыніцамі павышанай небяспекі, якія выклікалі прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 271. Парушэнне правіл аховы нетраў**

Парушэнне правіл аховы нетраў, якое выклікала наўмыснае або з-за неасцярожнасці прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 272. Забруджванне або засмечванне вод**

1. Выключана.
2. Забруджванне або засмечванне вод, якое выклікала наўмыснае або з-за неасцярожнасці прычыненне ўрону ў буйным памеры, або наўмысныя забруджванне ці засмечванне крыніц пітнога водазабеспячэння –

караюцца папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Забруджванне або засмечванне вод, якія выклікалі з-за неасцярожнасці смерць чалавека або захворванні людзей, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго года да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 273. Выключаны**

**Артыкул 274. Забруджванне атмасфернага паветра**

1. Выключана.
2. Забруджванне атмасфернага паветра праз паступленне забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра ад крыніц выкідаў з перавышэннем устаноўленых нарматываў дапушчальных выкідаў і (або) часовых нарматываў дапушчальных выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра (забруджванне атмасфернага паветра), якое выклікала наўмыснае або з-за неасцярожнасці прычыненне ўрону ў буйным памеры, –

караецца папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Забруджванне атмасфернага паветра, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека або захворванні людзей, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго года да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 275. Забруджванне лесу, асяроддзя вырастання драўнінна-хмызняковай раслiннасцi**

1. Забруджванне лесу, асяроддзя вырастання драўнінна-хмызняковай раслiннасцi, якая не ўваходзіць у склад ляснога фонду, адходамі ці сцёкавымі водамі або іншым спосабам, якое выклікала наўмыснае або з-за неасцярожнасці прычыненне ўрону ў буйным памеры, –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала наўмыснае або з-за неасцярожнасці прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караецца папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

Заўвага. Асабліва буйным памерам урону ў гэтым артыкуле, артыкулах 276 і 277 гэтага Кодэкса прызнаецца памер урону на суму, якая ў пяцьсот і больш разоў перавышае памер базавай велічыні, устаноўлены на дзень учынення злачынства.

**Артыкул 276. Знішчэнне або пашкоджанне лесу, драўнінна-хмызняковай расліннасці з-за неасцярожнасці**

Знішчэнне або пашкоджанне лесу ці драўнінна-хмызняковай расліннасці, якая не ўваходзіць у склад ляснога фонду, у выніку неасцярожнага абыходжання з агнём, невыканання правіл вытворчасці выбуховых прац, парушэння правіл эксплуатацыі іншых крыніц павышанай небяспекі, парушэння парадку нарыхтоўкі і вывазкі драўніны, правіл высечак лесу, іншых правіл лесакарыстання, якія выклікалі прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караюцца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 277. Незаконная высечка, незаконныя знішчэнне, выдаленне, адабранне або пашкоджанне драўнінна-хмызняковай расліннасці**

1. Незаконная высечка або пашкоджанне да ступені спынення росту драўнінна-хмызняковай расліннасці ў прыродаахоўных, рэкрэацыйна-аздараўленчых, абаронных лясах або незаконныя знішчэнне, выдаленне, адабранне або пашкоджанне да ступені спынення росту драўнінна-хмызняковай расліннасці, што не ўваходзіць у склад ляснога фонду, якія выклікалі прычыненне ўрону ў буйным памеры, –

караюцца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да аднаго года, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў.

2. Незаконная высечка або пашкоджанне да ступені спынення росту драўнінна-хмызняковай расліннасці ў эксплуатацыйных лясах, якія выклікалі прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караюцца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткай 1 гэтага артыкула, якія выклікалі прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да шасці гадоў.

**Артыкул 278. Парушэнне правіл бяспекі пры абыходжанні з генна-інжынернымі арганізмамі, біялагічнымі або хімічнымі рэчывамі**

1. Выключана.

2. Парушэнне правіл бяспекі вытворчасці, захоўвання, выкарыстання, транспарціроўкі, захавання або іншага абыходжання з генна-інжынернымі арганізмамі, біялагічнымі або хімічнымі рэчывамі, якое ўчынена на экалагічна небяспечнай тэрыторыі або выклікала наўмыснае ці з-за неасцярожнасці прычыненне ўрону ў буйным памеры або з-за неасцярожнасці захворванні людзей, –

караецца папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Парушэнне тых жа правіл, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго года да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 279. Парушэнне правіл бяспекі пры абыходжанні з мікрабіялагічнымі, іншымі біялагічнымі агентамі або таксінамі**

1. Парушэнне правіл бяспекі пры абыходжанні з мікрабіялагічнымі, іншымі біялагічнымі агентамі або таксінамі, якое выклікала з-за неасцярожнасці захворванні людзей, –

караецца папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

2. Тое ж дзеянне, якая выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека, або ўзнікненне эпідэмій ці эпізаотый, або іншыя цяжкія наступствы, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго года да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 280. Парушэнне правіл, устаноўленых для барацьбы з пустазеллем, хваробамі і шкоднікамі раслін**

1. Парушэнне правіл, устаноўленых для барацьбы з пустазеллем, хваробамі і шкоднікамі раслін, якое выклікала з-за неасцярожнасці гібель расліннасці ці жывёл з прычыненнем урону ў буйным памеры, –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або арыштам.

2. Парушэнне тых жа правіл, якое выклікала з-за неасцярожнасці гібель расліннасці ці жывёл з прычыненнем урону ў асабліва буйным памеры або гібель дзікарослых раслін ці дзікіх жывёл, віды якіх заведама для вінаватага ўключаны ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 281. Незаконная здабыча рыбы ці іншых водных жывёл**

1. Выключана.

2. Здабыча рыбы ці іншых водных жывёл без належнага на тое дазволу, або ў забароненыя час ці тэрміны, або ў забароненых месцах, або забароненымі прыладамі, або забароненымі спосабамі (незаконная здабыча рыбы ці іншых водных жывёл), якая выклікала прычыненне ўрону ў буйным памеры, або здабыча рыбы ці іншых водных жывёл з выкарыстаннем прылад лоўлі, прынцыпы працы якіх заснаваныя на выкарыстанні электрамагнітнага поля, ультрагуку, або шляхам выбуху, або незаконная здабыча рыбы ці іншых водных жывёл, віды якіх заведама для вінаватага ўключаны ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

3. Незаконная здабыча рыбы ці іншых водных жывёл, у тым ліку з выкарыстаннем прылад лоўлі, прынцыпы працы якіх заснаваныя на выкарыстанні электрамагнітнага поля, ультрагуку, або шляхам выбуху, учыненая асобай, раней судзімай за злачынства, прадугледжанае гэтым артыкулам, або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, –

караецца пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю са штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення, або пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

4. Незаконная здабыча рыбы ці іншых водных жывёл, у тым ліку з выкарыстаннем прылад лоўлі, прынцыпы працы якіх заснаваны на выкарыстанні электрамагнітнага поля, ультрагуку, або шляхам выбуху, якая выклікала прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да шасці гадоў са штрафам.

Заўвага. Буйным памерам урону ў артыкулах 281 і 282 гэтага Кодэкса прызнаецца памер урону на суму, якая ў сто і больш разоў перавышае памер базавай велічыні, устаноўлены на дзень учынення злачынства, асабліва буйным – на суму, якая ў дзвесце пяцьдзясят і больш разоў перавышае памер такой базавай велічыні.

**Артыкул 282. Незаконнае паляванне**

1. Выключана.

2. Паляванне без належнага на тое дазволу, або ў забароненых месцах, або ў забаронены час, або забароненымі прыладамі, або забароненымі спосабамі, або ў забароненыя тэрміны (незаконнае паляванне) на тэрыторыі запаведніка, нацыянальнага парка, заказніка, на тэрыторыях, якія падвергліся радыеактыўнаму забруджванню, дзе ўстаноўлены кантрольна-прапускны рэжым, або незаконная здабыча дзікіх жывёл, віды якіх заведама для вінаватага

ўключаны ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, або незаконнае паляванне, якое выклікала прычыненне ўрону ў буйным памеры, –

караюцца пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю са штрафам, або арыштам з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

3. Незаконнае паляванне, учыненае асобай, раней судзімай за злачынствы, прадугледжаныя гэтым артыкулам або артыкулам 282[1] гэтага Кодэкса, або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, –

караецца пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю са штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

4. Незаконнае паляванне, якое ўчынена з выкарыстаннем механічнага наземнага, воднага або паветранага транспартнага сродку або выклікала прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да шасці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю са штрафам.

**Артыкул 282[1]. Незаконныя перамяшчэнне (транспарціроўка) або разбіранне дзікіх жывёл**

1. Выключана.

2. Незаконныя перамяшчэнне (транспарціроўка) або разбіранне дзікіх жывёл, якія адносяцца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі да аб'ектаў палявання, у тым ліку загінулых, або іх частак у буйным памеры, або на тэрыторыі запаведніка, нацыянальнага парка, заказніка, на тэрыторыях, якія падвергліся радыеактыўнаму забруджванню, дзе ўстаноўлены кантрольна-прапускны рэжым, або дзікіх жывёл, віды якіх заведама для вінаватага ўключаны ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткай 2 гэтага артыкула, учыненыя службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў або асобай, раней судзімай за злачынствы, прадугледжаныя гэтым артыкулам або артыкулам 282 гэтага Кодэкса, або ўчыненыя ў асабліва буйным памеры, –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю са штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення, або пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

Заўвагі:

1. Пад незаконнымі перамяшчэннем (транспарціроўкай) або разбіраннем дзікіх жывёл, у тым ліку загінуўшых, або іх частак у гэтым артыкуле разумеюцца іх перамяшчэнне (транспарціроўка) або разбіранне ў выпадках, забароненых заканадаўчымі актамі аб ахове і выкарыстанні жывёльнага свету.

2. Незаконныя перамяшчэнне (транспарціроўка) або разбіранне ў гэтым артыкуле прызнаюцца ўчыненымі ў буйным памеры, калі кошт дзікай жывёлы ў сто і больш разоў перавышае памер базавай велічыні, устаноўлены на дзень учынення злачынства, у асабліва буйным памеры – у дзвесце пяцьдзясят і больш разоў перавышае памер такой базавай велічыні. Кошт незаконна перамешчаных (транспартаваных) або разабраных дзікіх жывёл, у тым ліку загінуўшых, або іх частак вызначаецца ў парадку, устаноўленым для вызначэння памеру пакрыцця шкоды, прычыненай у выніку іх незаконнага адабрання.

**Артыкул 283. Выключаны**

**Артыкул 284. Парушэнне патрабаванняў у галіне ветэрынарнай дзейнасці**

Парушэнне ветэрынарных (ветэрынарна-санітарных) патрабаванняў і працэдур, устаноўленых міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза, агульных патрабаванняў у галіне ветэрынарыі, устаноўленых Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, ветэрынарна-санітарных, заатэхнічных, зоагігіенічных правіл або ўвоз у Рэспубліку Беларусь падкантрольных ветэрынарнаму кантролю (нагляду) тавараў без дазволу на іх увоз у выпадку, калі ў адпаведнасці з заканадаўствам патрабуецца такі дазвол, якія выклікалі з-за неасцярожнасці распаўсюджванне заразных хвароб жывёл або прычыненне ўрону ў буйным памеры, –

караюцца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

## РАЗДЗЕЛ X
## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ГРАМАДСКАЙ БЯСПЕКІ І ЗДАРОЎЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

Заўвагі:

1. Буйным памерам урону ў артыкулах глаў гэтага раздзела, якія прадугледжваюць адказнасць за злачынствы супраць грамадскай бяспекі і бяспекі руху і эксплуатацыі транспарту, прызнаецца памер урону на суму, якая ў дзвесце пяцьдзясят і больш разоў перавышае памер базавай велічыні, устаноўлены на дзень учынення злачынства, асабліва буйным – якая ў тысячу і больш разоў перавышае памер такой базавай велічыні.

2. Злачынствы, учыненыя ў складзе злачыннай арганізацыі ці банды, ацэньваюцца самастойна і цягнуць адказнасць па сукупнасці злачынстваў.

## ГЛАВА 27
## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ГРАМАДСКАЙ БЯСПЕКІ

**Артыкул 285. Стварэнне злачыннай арганізацыі або ўдзел у ёй**

1. Дзейнасць па стварэнні злачыннай арганізацыі або кіраўніцтва злачыннай арганізацыяй ці структурнымі падраздзяленнямі, якія ўваходзяць у яе –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да трынаццаці гадоў са штрафам або без штрафу.

2. Удзел у злачыннай арганізацыі ў любой іншай форме –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў са штрафам або без штрафу.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да пятнаццаці гадоў са штрафам або без штрафу.

**Артыкул 286. Бандытызм**

Стварэнне банды – узброенай арганізаванай групы – з мэтай нападу на прадпрыемствы, установы, арганізацыі ці на грамадзян, або кіраўніцтва бандай, або ўдзел у бандзе ці нападах, якія ўчыняюцца ёй –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да пятнаццаці гадоў са штрафам або без штрафу.

**Артыкул 287. Стварэнне незаконнага ўзброенага фарміравання**

Стварэнне незаконнага ўзброенага фарміравання пры адсутнасці прыкмет артыкула 286 гэтага Кодэкса, або кіраўніцтва такім фарміраваннем, або ўдзел у ім –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў.

Заўвага. Асоба, якая добраахвотна спыніла ўдзел у незаконным узброеным фарміраванні і здала зброю, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці па гэтым артыкуле.

**Артыкул 288. Прымус асобы да ўдзелу ў злачыннай дзейнасці**

1. Прымус асобы да ўчынення злачынства або да ўдзелу ў арганізаванай групе, бандзе ці злачыннай арганізацыі пад пагрозай прымянення насілля да яго ці яго блізкіх, знішчэння ці пашкоджання іх маёмасці, распаўсюджвання паклёпніцкіх або выдавання іншых звестак, якія яны жадаюць захаваць у тайне, –

караецца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, злучанае з насіллем або са знішчэннем ці пашкоджаннем маёмасці, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў.

**Артыкул 289. Акт тэрарызму**

1. Учыненне выбуху, падпалу, затаплення, іншых дзеянняў агульнанебяспечным спосабам або якія ствараюць небяспеку гібелі людзей, прычынення ім цялесных пашкоджанняў або надыходу іншых цяжкіх наступстваў у мэтах аказання ўздзеяння на прыняцце рашэнняў органамі ўлады, або перашкаджэння палітычнай ці іншай грамадскай дзейнасці, або запалохвання насельніцтва, або дэстабілізацыі грамадскага парадку (акт тэрарызму) –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да пятнаццаці гадоў.

2. Акт тэрарызму, учынены паўторна, або групай асоб па папярэдняй змове, або асобай, якая раней учыніла злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 124, 126, $290^1$–$290^5$, часткай 4 артыкула 309, часткай 3 артыкула 311 і артыкулам 359 гэтага Кодэкса, або звязаны з прычыненнем цяжкіх цялесных пашкоджанняў, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да дваццаці гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя арганізаванай групай, або з прымяненнем аб'ектаў выкарыстання атамнай энергіі, або з выкарыстаннем

радыеактыўных рэчываў ці ядзерных матэрыялаў, моцнадзейных, таксічных хімічных ці біялагічных рэчываў або звязаныя з забойствам чалавека, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да дваццаці пяці гадоў, або пажыццёвым пазбаўленнем волі, або пакараннем смерцю.

Заўвага. Асоба, якая ўдзельнічала ў прыгатаванні да дзеянняў, прадугледжаных гэтым артыкулам, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці за гэтыя дзеянні, калі яна своечасовым папярэджаннем дзяржаўных органаў ці іншым чынам прадухіліла акт тэрарызму.

**Артыкул 290. Пагроза ўчыненнем акта тэрарызму**

1. Пагроза ўчыненнем дзеянняў, прадугледжаных артыкуламі 124, 126, 289 або 359 гэтага Кодэкса (пагроза ўчыненнем акта тэрарызму), –

караецца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Пагроза ўчыненнем акта тэрарызму, якая ўчынена паўторна, або групай асоб па папярэдняй змове ці якая выклікала прычыненне ўрону ў буйным памеры ці іншыя цяжкія наступствы, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да васьмі гадоў.

**Артыкул $290^{1}$. Фінансаванне тэрарыстычнай дзейнасці**

1. Даванне або збор сродкаў любым спосабам у мэтах выкарыстання ў тэрарыстычнай дзейнасці, матэрыяльнага забеспячэння або іншай падтрымкі заведама для вінаватага тэрарыстаў, тэрарыстычных груп і тэрарыстычных арганізацый, у тым ліку ў мэтах праезду да месца навучання для ўдзелу ў тэрарыстычнай дзейнасці (фінансаванне тэрарыстычнай дзейнасці), –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да дванаццаці гадоў са штрафам.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна, або арганізаванай групай, або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, або асобай, якая раней учыніла злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 124–127, 131, 287, 289, 290, $290^{2}$–292, часткай 4 артыкула 294, часткай 4 артыкула 295, часткай 4 артыкула 309, часткай 3 артыкула 311, артыкуламі 359, 360, $361^{1}$–$361^{3}$ гэтага Кодэкса, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да пятнаццаці гадоў са штрафам.

Заўвага. Асоба, якая ажыццявіла фінансаванне тэрарыстычнай дзейнасці, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці па гэтым артыкуле, калі яна своечасова заявіла аб учыненым і (або) іншым чынам дапамагала прадухіленню акта тэрарызму і выяўленню гэтага злачынства.

**Артыкул $290^{2}$. Садзейнічанне тэрарыстычнай дзейнасці**

1. Вярбоўка ці іншае ўцягненне асобы ў тэрарыстычную дзейнасць, а таксама навучанне ці іншая падрыхтоўка асобы для ўдзелу ў тэрарыстычнай дзейнасці –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дванаццаці гадоў са штрафам.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да пятнаццаці гадоў са штрафам.

Заўвага. Асоба, якая ўчыніла злачынства, прадугледжанае гэтым артыкулам, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці, калі яна своечасовым паведамленнем дзяржаўным органам або

іншым чынам дапамагала прадухіленню або стрыманню злачынства, прадугледжанага гэтым артыкулам.

**Артыкул 290$^3$. Праходжанне навучання або іншай падрыхтоўкі для ўдзелу ў тэрарыстычнай дзейнасці**

Праходжанне асобай навучання або іншай падрыхтоўкі, якія заведама для навучэнца маюць мэтай яго наступны ўдзел у тэрарыстычнай дзейнасці, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад шасці да дзесяці гадоў са штрафам або без штрафу.

Заўвага. Асоба, якая ўчыніла злачынства, прадугледжанае гэтым артыкулам, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці, калі яна своечасовым паведамленнем дзяржаўным органам або іншым чынам дапамагала прадухіленню або стрыманню злачынства, прадугледжанага гэтым артыкулам.

**Артыкул 290$^4$. Стварэнне арганізацыі для ажыццяўлення тэрарыстычнай дзейнасці або ўдзел у ёй**

1. Дзейнасць па стварэнні арганізацыі для ажыццяўлення тэрарыстычнай дзейнасці або кіраўніцтва такой арганізацыяй ці яе часткай ці структурнымі падраздзяленнямі, якія ўваходзяць у яе, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да дванаццаці гадоў са штрафам.

2. Удзел у арганізацыі, створанай для ажыццяўлення тэрарыстычнай дзейнасці, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да дзесяці гадоў пазбаўлення волі са штрафам.

Заўвага. Асоба, якая добраахвотна спыніла ўдзел у арганізацыі, створанай для ажыццяўлення тэрарыстычнай дзейнасці, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці па гэтым артыкуле.

**Артыкул 290$^5$. Арганізацыя дзейнасці тэрарыстычнай арганізацыі і ўдзел у дзейнасці такой арганізацыі**

1. Арганізацыя дзейнасці арганізацыі, якая ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь прызнана тэрарыстычнай, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да пятнаццаці гадоў са штрафам.

2. Удзел у дзейнасці арганізацыі, якая ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь прызнана тэрарыстычнай, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да дванаццаці гадоў са штрафам.

Заўвага. Асоба, якая добраахвотна спыніла ўдзел у дзейнасці арганізацыі, якая ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь прызнана тэрарыстычнай, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці па гэтым артыкуле.

**Артыкул 291. Захоп заложніка**

1. Захоп або ўтрыманне асобы ў якасці заложніка, злучаныя з пагрозай яго забойства, прычынення яму цялесных пашкоджанняў або далейшага ўтрымлівання гэтай асобы, у мэтах прымусу дзяржаўнага органа, міжнароднай арганізацыі, юрыдычнай ці фізічнай асобы ці групы

асоб здзейсніць або ўстрымацца ад здзяйснення якога-небудзь дзеяння як умовы вызвалення заложніка (захоп заложніка) –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці гадоў.

2. Захоп заложніка, учынены:

1) групай асоб па папярэдняй змове;

2) паўторна;

3) з прымяненнем падчас захопу або ўтрымання асобы насілля, небяспечнага для жыцця і здароўя пацярпелага;

4) у дачыненні да заведама непаўналетняга;

5) у дачыненні да заведама для вінаватага цяжарнай жанчыны;

6) у дачыненні да дзвюх ці больш асоб;

7) з карыслівых меркаванняў або па найме, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад шасці да дванаццаці гадоў са штрафам або без штрафу.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, якія ўчынены арганізаванай групай, або выклікалі з-за неасцярожнасці смерць чалавека, або выклікалі наўмысна ці з-за неасцярожнасці іншыя цяжкія наступствы, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да пятнаццаці гадоў са штрафам або без штрафу.

Заўвага. Асоба, якая добраахвотна або па патрабаванні ўлады вызваліла заложніка, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці па гэтым артыкуле.

**Артыкул 292. Захоп будынкаў і збудаванняў**

1. Захоп будынкаў, збудаванняў, шляхоў ці сродкаў зносін і сувязі, іншых камунікацый, стацыянарных платформ, размешчаных на кантынентальным шэльфе, або іх утрыманне, злучаныя з пагрозай іх знішчэння ці пашкоджання або з пагрозай забойствам грамадзян ці прычыненнем ім цялесных пашкоджанняў, з мэтай прымусіць дзяржаўны ці іншы орган, юрыдычную ці фізічную асобу або групу асоб здзейсніць ці ўстрымацца ад здзяйснення якога-небудзь дзеяння як умовы невыканання пагрозы, а таксама фінансаванне ці іншае матэрыяльнае забеспячэнне такіх дзеянняў пры адсутнасці прыкмет злачынстваў, прадугледжаных артыкулам $361^2$ гэтага Кодэкса, –

караюцца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тыя ж дзеянні, якія ўчынены арганізаванай групай, або выклікалі з-за неасцярожнасці смерць чалавека, або выклікалі прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры ці іншыя цяжкія наступствы, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да дванаццаці гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя з прымяненнем боепрыпасаў, выбуховых рэчываў, выбуховых прылад, прадметаў, паражальнае дзеянне якіх заснавана на выкарыстанні гаручых рэчываў, а таксама ядзернага, хімічнага, біялагічнага ці іншых відаў зброі масавага паражэння ці асноўных частак такой зброі, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да пятнаццаці гадоў са штрафам.

**Артыкул 293. Масавыя беспарадкі**

1. Арганізацыя масавых беспарадкаў, якія суправаджаліся насіллем над асобай, пагромамі, падпаламі, знішчэннем маёмасці або ўзброеным супраціўленнем прадстаўнікам улады, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да пятнаццаці гадоў.

2. Удзел у масавых беспарадках, які выявіўся ў непасрэдным учыненні дзеянняў, названых у частцы 1 гэтага артыкула, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да васьмі гадоў.

3. Навучанне або іншая падрыхтоўка асоб для ўдзелу ў масавых беспарадках, якія суправаджаюцца ўчыненнем дзеянняў, прадугледжаных часткай 1 гэтага артыкула, а таксама фінансаванне ці іншае матэрыяльнае забеспячэнне такой дзейнасці пры адсутнасці прыкмет злачынстваў, прадугледжаных артыкулам $361^2$ гэтага Кодэкса, –

караюцца арыштам або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

**Артыкул 294. Раскраданне агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў або выбуховых рэчываў**

1. Раскраданне агнястрэльнай зброі, яе складаных частак ці кампанентаў, боепрыпасаў, выбуховых рэчываў ці выбуховых прылад –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі гадоў са штрафам або без штрафу.

2. Раскраданне ядзернай, хімічнай, біялагічнай ці іншых відаў зброі масавага паражэння ці асноўных частак такой зброі –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці гадоў са штрафам або без штрафу.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя з мэтай збыту, або паўторна, або групай асоб, або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, або асобай, якой зброя масавага паражэння ці яе асноўныя часткі, агнястрэльная зброя, яе складаныя часткі ці кампаненты, боепрыпасы, выбуховыя рэчывы ці выбуховыя прылады выдадзены для службовага карыстання або даверены пад ахову, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дванаццаці гадоў са штрафам або без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

4. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1, 2 ці 3 гэтага артыкула, учыненыя шляхам разбою або вымагання або арганізаванай групай, а таксама ў мэтах учынення злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 124–127, 131, 287, 289–292, 359 і 360 гэтага Кодэкса, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да пятнаццаці гадоў са штрафам або без штрафу.

Заўвага. Пад раскраданнем у гэтым артыкуле разумеецца наўмыснае проціpraўнае бязвыплатнае завалоданне ўказанымі прадметамі і рэчывамі ці правам на іх шляхам крадзяжу, рабавання, разбою, вымагання, махлярства, злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, прысваення, растраты ці выкарыстання камп’ютарнай тэхнікі незалежна ад наяўнасці або адсутнасці карыслівай мэты.

**Артыкул 295. Незаконныя дзеі ў дачыненні да агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў**

1. Выключана.

2. Незаконныя выраб, набыццё, перадача ў валоданне, збыт, захоўванне, перавозка, перасылка ці нашэнне агнястрэльнай зброі (акрамя паляўнічай агнястрэльнай гладкаствольнай зброі), боепрыпасаў (акрамя боепрыпасаў да паляўнічай агнястрэльнай гладкаствольнай зброі), выбуховых рэчываў, выбуховых прылад, або незаконныя выраб, набыццё, перадача ў валоданне, збыт, перавозка, перасылка ці нашэнне складаных частак ці кампанентаў

агнястрэльнай зброі (акрамя складаных частак і кампанентаў паляўнічай агнястрэльнай гладкаствольнай зброі), або незаконныя выраб ці збыт асноўных частак выбуховых прылад –

караюцца папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі гадоў са штрафам або без штрафу.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткай 2 гэтага артыкула, учыненыя паўторна або групай асоб па папярэдняй змове, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да дзесяці гадоў са штрафам або без штрафу.

4. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 2 ці 3 гэтага артыкула, учыненыя арганізаванай групай, а таксама ў мэтах учынення злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 124–127, 131, 287, 289–292, 359 і 360 гэтага Кодэкса, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад чатырох да дванаццаці гадоў са штрафам або без штрафу.

Заўвага. Асоба, якая добраахвотна здала прадметы, указаныя ў артыкулах 295–297 гэтага Кодэкса, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці за дзеянні, прадугледжаныя названымі артыкуламі, акрамя выпадкаў збыту.

**Артыкул 295[1]. Незаконныя дзеянні ў дачыненні да паляўнічай агнястрэльнай гладкаствольнай зброі**

1. Незаконныя набыццё, перадача ў валоданне, захоўванне, перавозка, перасылка ці нашэнне паляўнічай агнястрэльнай гладкаствольнай зброі ці боепрыпасаў да яе або незаконныя набыццё, перадача ў валоданне, перавозка, перасылка ці нашэнне складаных частак ці кампанентаў паляўнічай агнястрэльнай гладкаствольнай зброі, учыненыя на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такія ж дзеянні, –

караюцца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам.

2. Незаконныя выраб або збыт паляўнічай агнястрэльнай гладкаствольнай зброі, яе складаных частак, кампанентаў ці боепрыпасаў да яе –

караюцца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткай 2 гэтага артыкула, учыненыя паўторна або групай асоб па папярэдняй змове, –

караюцца папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў.

**Артыкул 295[2]. Падробка або наўмыснае знішчэнне маркіроўкі агнястрэльнай зброі**

Падробка або наўмыснае знішчэнне маркіроўкі агнястрэльнай зброі –

караюцца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да аднаго года, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 295[3]. Незаконныя дзеянні ў дачыненні да прадметаў, паражальнае дзеянне якіх заснавана на выкарыстанні гаручых рэчываў**

1. Незаконныя выраб, набыццё, перадача ў валоданне, збыт, захоўванне, перавозка, перасылка або нашэнне прадметаў, паражальнае дзеянне якіх заснавана на выкарыстанні гаручых рэчываў, –

караюцца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

2. Дзеянні, прадугледжаныя часткай 1 гэтага артыкула, учыненыя паўторна або групай асоб па папярэдняй змове, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў.

**Артыкул 296. Незаконныя дзеянні ў дачыненні да халоднай зброі**

1. Незаконныя нашэнне або перавозка халоднай зброі, учыненыя на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такія ж дзеянні, –

караюцца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да аднаго года, або арыштам.

2. Незаконныя выраб або збыт халоднай зброі –

караюцца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткай 2 гэтага артыкула, учыненыя паўторна, –

караюцца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін ад аднаго года да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 297. Незаконныя дзеянні ў дачыненні да газавай, пнеўматычнай ці кідальнай зброі**

1. Незаконныя нашэнне або перавозка газавай, пнеўматычнай ці кідальнай зброі, учыненыя на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такія ж дзеянні, –

караюцца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да аднаго года, або арыштам.

2. Незаконныя выраб або збыт газавай, пнеўматычнай ці кідальнай зброі –

караюцца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін ад аднаго года да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткай 2 гэтага артыкула, учыненыя паўторна, –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 298. Неналежнае выкананне абавязкаў па ахове зброі, боепрыпасаў, выбуховых рэчываў і выбуховых прылад**

Неналежнае выкананне абавязкаў асобай, якой была даручана ахова агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў, выбуховых рэчываў або выбуховых прылад, якое выклікала іх раскраданне або надыход цяжкіх наступстваў, –

караецца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 299. Парушэнне правіл абыходжання з агнястрэльнай зброяй, выбухованебяспечнымі, лёгкімі на загаранне, едкімі рэчывамі або піратэхнічнымі вырабамі**

1. Парушэнне правіл уліку, захоўвання, выкарыстання, перавозкі або перасылкі агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў, выбухованебяспечных, лёгкіх на загаранне, едкіх рэчываў або піратэхнічных вырабаў, якое выклікала з-за неасцярожнасці прычыненне цяжкага ці менш цяжкага цялеснага пашкоджання або ўрону ў буйным памеры, –

караецца папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека або прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання дзвюм ці больш асобам, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 300. Неналежнае захоўванне агнястрэльнай зброі**

Неналежнае захоўванне агнястрэльнай зброі законным уладальнікам, якое стварыла ўмовы для выкарыстання гэтай зброі іншай асобай, што выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека або прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 301. Парушэнне правіл вытворча-тэхнічнай дысцыпліны або правіл бяспекі на аб'ектах выкарыстання атамнай энергіі**

1. Парушэнне правіл вытворча-тэхнічнай дысцыпліны або правіл бяспекі на аб'ектах выкарыстання атамнай энергіі, якое стварыла пагрозу радыеактыўнага забруджвання, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў.

2. Парушэнне правіл вытворча-тэхнічнай дысцыпліны або правіл бяспекі на аб'ектах выкарыстання атамнай энергіі, якое выклікала з-за неасцярожнасці радыеактыўнае забруджванне, –

караецца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Дзеянне, указанае ў частцы 2 гэтага артыкула, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека, або прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання, або іншыя цяжкія наступствы, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 302. Парушэнне правіл вытворча-тэхнічнай дысцыпліны, правіл бяспекі на выбухованебяспечных прадпрыемствах ці ў выбухованебяспечных цэхах або правіл бяспекі выбухованебяспечных прац**

1. Парушэнне правіл вытворча-тэхнічнай дысцыпліны, правіл бяспекі на выбухованебяспечных прадпрыемствах ці ў выбухованебяспечных цэхах або правіл бяспекі выбухованебяспечных прац, якое стварыла пагрозу выбуху або выклікала выбух, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека, або прычыненне цяжкага ці менш цяжкага цялеснага пашкоджання, або прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 303. Парушэнне правіл бяспекі горных або будаўнічых прац**

1. Парушэнне правіл бяспекі горных ці будаўнічых прац або правіл эксплуатацыі машын і механізмаў пры правядзенні такіх прац, якое выклікала з-за неасцярожнасці прычыненне цяжкага ці менш цяжкага цялеснага пашкоджання або ўрону ў буйным памеры, –

караецца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 304. Парушэнне патрабаванняў пажарнай бяспекі**

1. Парушэнне патрабаванняў пажарнай бяспекі, якое выклікала з-за неасцярожнасці ўзнікненне пажару і знішчэнне або пашкоджанне чужой маёмасці, учыненае на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такое ж парушэнне, –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да аднаго года, або арыштам з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

2. Парушэнне патрабаванняў пажарнай бяспекі, якое выклікала з-за неасцярожнасці ўзнікненне пажару, які прычыніў цяжкае ці менш цяжкае цялеснае пашкоджанне або ўрон чужой маёмасці ў буйным памеры, –

караецца папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Дзеянне, прадугледжанае часткай 2 гэтага артыкула, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека ці прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання дзвюм або больш асобам, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

Заўвага. Пад патрабаваннямі пажарнай бяспекі разумеюцца патрабаванні для загарантавання пажарнай бяспекі, якія змяшчаюцца ў нарматыўных прававых актах (іх

структурных элементах), у тым ліку абавязковых для захавання тэхнічных нарматыўных прававых актах (іх структурных элементах), і міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь, тэхнічных рэгламентах Мытнага саюза, Еўразійскага эканамічнага саюза і іншых міжнародна-прававых актах, якія змяшчаюць абавязацельствы Рэспублікі Беларусь (іх структурных элементах), і якія ўтвараюць сістэму супрацьпажарнага нарміравання і стандартызацыі.

**Артыкул 305. Парушэнне праектаў, абавязковых для захавання патрабаванняў тэхнічных нарматыўных прававых актаў пры правядзенні будаўніча-мантажных прац**

1. Парушэнне праектаў, абавязковых для захавання патрабаванняў тэхнічных нарматыўных прававых актаў пры правядзенні будаўніча-мантажных прац асобай, адказнай за іх захаванне, якое выклікала з-за неасцярожнасці прычыненне цяжкага ці менш цяжкага цялеснага пашкоджання або ўрону ў буйным памеры, –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

2. Тое ж дзеянне, якая выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека або прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання дзвюм або больш асобам, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 306. Парушэнне правіл аховы працы**

1. Парушэнне правіл тэхнікі бяспекі, прамысловай санітарыі або іншых правіл аховы працы службовай асобай, адказнай за іх захаванне, або індывідуальным прадпрымальнікам (парушэнне правіл аховы працы), якое выклікала з-за неасцярожнасці прафесійнае захворванне або прычыненне цяжкага ці менш цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

2. Парушэнне правіл аховы працы, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека або прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання дзвюм або больш асобам, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Парушэнне правіл аховы працы, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць дзвюх або больш асоб, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 307. Непрыняцце мер для ратавання людзей**

Непрыняцце мер для ратавання чалавека пры пагрозе або ва ўмовах стыхійнага бедства, катастрофы, аварыі і ў іншых выпадках, калі жыццю або здароўю людзей пагражае небяспека, або несвоечасовае ці неналежнае выкананне абавязкаў па ратаванні асобай, адказнай за

ратаванне людзей, якія выклікалі з-за неасцярожнасці смерць чалавека або прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караюцца штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

### Артыкул 308. Непаведамленне інфармацыі аб небяспецы для жыцця людзей

Непаведамленне ўпаўнаважанай службовай асобай насельніцтву звестак аб небяспецы для жыцця людзей пры пагрозе або ва ўмовах стыхійнага бедства, катастрофы, аварыі і ў іншых выпадках, калі жыццю людзей пагражае небяспека, або несвоечасовае паведамленне такіх звестак, якія выклікалі з-за неасцярожнасці смерць чалавека або прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

## ГЛАВА 28
## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ БЯСПЕКІ РУХУ І ЭКСПЛУАТАЦЫІ ТРАНСПАРТУ

### Артыкул 309. Наўмыснае прывядзенне ў непрыгоднасць транспартнага сродку або шляхоў зносін

1. Наўмысныя разбурэнне, пашкоджанне або прывядзенне іншым спосабам у непрыгодны для эксплуатацыі стан сродкаў чыгуначнага, воднага, паветранага, аўтадарожнага, магістральнага трубаправоднага транспарту, шляхоў зносін, збудаванняў на іх, сродкаў сігналізацыі або сувязі ці іншага транспартнага абсталявання, калі гэтыя дзеянні маглі выклікаць смерць чалавека, крушэнне, аварыю ці іншыя цяжкія наступствы, –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тыя ж дзеянні, якія выклікалі з-за неасцярожнасці прычыненне цяжкага ці менш цяжкага цялеснага пашкоджання або ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караюцца штрафам, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, якія выклікалі з-за неасцярожнасці смерць чалавека, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў.

4. Дзеянні, прадугледжаныя часткай 1 гэтага артыкула, здзейсненыя ў мэтах учынення злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 124, 126, 289, 359 і 360 гэтага Кодэкса, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да пятнаццаці гадоў са штрафам або без штрафу.

### Артыкул 310. Наўмыснае блакаванне транспартных камунікацый

1. Наўмыснае блакаванне транспартных камунікацый шляхам стварэння перашкод, устаноўкі пастоў або іншым спосабам, якое выклікала прычыненне ўрону ў значным памеры, –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека або прычыненне цяжкага ці менш цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караецца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў.

Заўвага. Уронам у значным памеры ў гэтым артыкуле прызнаецца памер (урон) на суму, якая ў сорак і больш разоў перавышае памер базавай велічыні, устаноўлены на дзень учынення злачынства.

**Артыкул 311. Угон або захоп з мэтай угону чыгуначнага рухомага саставу, паветранага або воднага судна**

1. Угон або захоп з мэтай угону чыгуначнага рухомага саставу, паветранага або воднага судна –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тыя ж дзеянні, якія ўчынены групай асоб па папярэдняй змове, або з прымяненнем насілля ці з пагрозай яго прымянення або выклікалі прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін ад трох да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, якія ўчынены арганізаванай групай, або выклікалі з-за неасцярожнасці смерць чалавека або прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання, а таксама ў мэтах учынення злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 124, 126, 289, 359 і 360 гэтага Кодэкса, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да пятнаццаці гадоў.

**Артыкул 312. Самавольнае без неабходнасці спыненне цягніка**

Самавольнае без неабходнасці спыненне цягніка, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека, або прычыненне цяжкага ці менш цяжкага цялеснага пашкоджання, або ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караецца папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі гадоў.

**Артыкул 313. Недабраякасны рамонт транспартнага сродку або шляхоў зносін**

Недабраякасны рамонт транспартнага сродку, шляхоў зносін, сродкаў сігналізацыі і сувязі або іншага транспартнага абсталявання асобай, якая выконвае рамонтныя працы, што выклікаў з-за неасцярожнасці смерць чалавека, або прычыненне цяжкага ці менш цяжкага цялеснага пашкоджання, або прычыненне ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караецца папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 314. Парушэнне правіл бяспекі руху або эксплуатацыі чыгуначнага, паветранага, воднага транспарту ці метрапалітэна**

1. Парушэнне правіл бяспекі руху або эксплуатацыі чыгуначнага, паветранага, воднага транспарту ці метрапалітэна асобай, абавязанай выконваць гэтыя правілы паводле працы, якую яна выконвае, або займанай пасады, якое выклікала з-за неасцярожнасці прычыненне цяжкага ці менш цяжкага цялеснага пашкоджання або ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караецца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

2. Тое ж дзеянне, якая выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Дзеянне, прадугледжанае часткай 1 гэтага артыкула, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць дзвюх або больш асоб, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 315. Парушэнне правіл міжнародных палётаў**

Невыкананне ўказаных у дазволе маршрутаў, месцаў пасадкі, паветраных варот, вышыні палёту або іншае парушэнне правіл міжнародных палётаў –

караюцца штрафам або арыштам.

**Артыкул 316. Парушэнне правіл бяспекі руху або эксплуатацыі маламерных суднаў**

1. Парушэнне асобай, якая кіруе маламерным суднам, правіл бяспекі руху або эксплуатацыі маламерных суднаў, якое выклікала з-за неасцярожнасці прычыненне менш цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Дзеянне, прадугледжанае часткай 1 гэтага артыкула, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека або прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караецца папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Дзеянне, прадугледжанае часткай 1 гэтага артыкула, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць дзвюх або больш асоб, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

4. Парушэнне правіл бяспекі руху або эксплуатацыі маламерных суднаў асобай, якая кіруе маламерным суднам у стане алкагольнага ап'янення або ў стане, выкліканым спажываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьвальных рэчываў, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека або прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да васьмі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

5. Дзеянне, прадугледжанае часткай 4 гэтага артыкула, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць дзвюх або больш асоб, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад чатырох да дзесяці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

**Артыкул 317. Парушэнне правіл дарожнага руху або эксплуатацыі транспартных сродкаў**

1. Парушэнне правіл дарожнага руху або эксплуатацыі транспартных сродкаў асобай, якая кіруе транспартным сродкам, якое выклікала з-за неасцярожнасці прычыненне менш цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека або прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караецца папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Дзеянне, прадугледжанае часткай 1 гэтага артыкула, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць дзвюх або больш асоб, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

4. Парушэнне правіл дарожнага руху або эксплуатацыі транспартных сродкаў асобай, якая кіруе транспартным сродкам у стане алкагольнага ап'янення або ў стане, выкліканым спажываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьвальных рэчываў, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека або прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да васьмі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

5. Дзеянне, прадугледжанае часткай 4 гэтага артыкула, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць дзвюх або больш асоб, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад чатырох да дзесяці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

Заўвага. Пад транспартным сродкам, указаным у артыкулах 214, 317–318 гэтага Кодэкса, разумеюцца механічны транспартны сродак, прызначаны для руху па дарозе і для перавозкі пасажыраў, грузаў або ўсталяванага на ім абсталявання, а таксама шасі транспартнага сродку і самаходная машына.

**Артыкул 317$^{1}$. Кіраванне транспартным сродкам асобай, якая знаходзіцца ў стане ап'янення, перадача кіравання транспартным сродкам такой асобе або адмова ад праходжання праверкі (аглядання)**

1. Кіраванне транспартным сродкам асобай, якая знаходзіцца ў стане алкагольнага ап'янення або ў стане, выкліканым спажываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьвальных рэчываў, або перадача кіравання транспартным сродкам такой асобе, а таксама адмова ад праходжання ва ўстаноўленым парадку праверкі (аглядання) з мэтай вызначэння стану алкагольнага ап'янення або стану, выкліканага

спажываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьвальных рэчываў, учыненыя на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такія ж парушэнні, –

караюцца папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю са штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю са штрафам, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя асобай, якая раней учыніла злачынства, прадугледжанае гэтым артыкулам, –

караюцца арыштам з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю са штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін ад аднаго года да трох гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю са штрафам, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

**Артыкул 317$^{2}$. Кіраванне транспартным сродкам асобай, якая не мае права кіравання**

1. Кіраванне транспартным сродкам асобай, якая не мае права кіравання гэтым сродкам, калі гэта дзеянне ўчынена неаднаразова, –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да шасці месяцаў, або арыштам з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

2. Тое ж дзеянне, учыненае асобай, якая раней учыніла злачынства, прадугледжанае гэтым артыкулам, –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

Заўвага. Для мэт гэтага артыкула дзеянне прызнаецца ўчыненым асобай неаднаразова, калі гэтая асоба на працягу аднаго года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за кіраванне транспартным сродкам асобай, якая не мае права кіравання гэтым сродкам, прадугледжанага часткай 2 артыкула 18.14 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, ізноў кіравала транспартным сродкам, не маючы права кіравання гэтым сродкам.

**Артыкул 318. Выпуск у эксплуатацыю тэхнічна няспраўнага транспартнага сродку або незаконны допуск да кіравання ім**

1. Выпуск у эксплуатацыю заведама тэхнічна няспраўнага транспартнага сродку, або допуск да кіравання транспартным сродкам асобы, якая заведама не мае права кіравання транспартным сродкам або заведама знаходзіцца ў стане алкагольнага ап'янення або ў стане, выкліканым спажываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьвальных рэчываў, або іншае грубае парушэнне правіл эксплуатацыі транспартнага сродку, учыненыя асобай, адказнай за тэхнічны стан або эксплуатацыю транспартнага сродку, калі гэтыя парушэнні пацягнулі з-за неасцярожнасці прычыненне менш цяжкага цялеснага пашкоджання або ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караюцца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на той жа тэрмін, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

2. Тыя ж дзеянні, якія выклікалі з-за неасцярожнасці смерць чалавека або прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 319. Парушэнне правіл утрымання аўтамабільных дарог, вуліц, чыгуначных пераездаў і іншых дарожных збудаванняў**

1. Парушэнне правіл утрымання дарог, вуліц, чыгуначных пераездаў і іншых дарожных збудаванняў у бяспечным для руху стане або непрыняцце мер да своечасовай забароны або абмежавання руху асобай, адказнай за бяспеку дарогі, якія выклікалі з-за неасцярожнасці прычыненне менш цяжкага цялеснага пашкоджання або ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караюцца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

2. Тыя ж дзеянні, якія выклікалі з-за неасцярожнасці смерць чалавека або прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караюцца папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 320. Парушэнне правіл бяспекі пры будаўніцтве, эксплуатацыі або рамонце магістральных трубаправодаў**

1. Парушэнне правіл бяспекі пры будаўніцтве, эксплуатацыі або рамонце магістральных трубаправодаў, якое выклікала з-за неасцярожнасці прычыненне цяжкага ці менш цяжкага цялеснага пашкоджання або ўрону ў асабліва буйным памеры, –

караецца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

3. Дзеянне, прадугледжанае часткай 1 гэтага артыкула, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць дзвюх або больш асоб, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў.

**Артыкул 321. Парушэнне правіл, якія забяспечваюць бяспечную працу транспарту**

1. Парушэнне пасажырам, пешаходам або іншым удзельнікам руху (акрамя асоб, указаных у артыкулах 314, 318 і 319 гэтага Кодэкса) правіл бяспекі руху або эксплуатацыі ўсіх відаў

транспарту, якое выклікала з-за неасцярожнасці прычыненне цяжкага або менш цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на той жа тэрмін, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

2. Тое ж дзеянне, якая выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

## ГЛАВА 29
## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ЗДАРОЎЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

Заўвага. Пад раскраданнем у артыкулах 323, 327 і 333 гэтай главы разумеецца наўмыснае проціпраўнае бязвыплатнае завалоданне матэрыяламі, сродкамі, прэпаратамі, рэчывамі або правам на іх шляхам крадзяжу, рабавання, разбою, вымагання, махлярства, злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, прысваення, растраты або выкарыстання камп’ютарнай тэхнікі незалежна ад наяўнасці або адсутнасці карыслівай мэты.

**Артыкул 322. Незаконныя набыццё, захоўванне, выкарыстанне, збыт або разбурэнне радыеактыўных матэрыялаў**

1. Незаконныя набыццё, захоўванне, выкарыстанне, збыт або разбурэнне радыеактыўных матэрыялаў (крыніц іанізуючага выпраменьвання, радыеактыўных рэчываў і ядзерных матэрыялаў, якія знаходзяцца ў любым фізічным стане ва ўстаноўцы, вырабе або ў іншым выглядзе) –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна, або групай асоб, або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, або асобай, якая раней учыніла злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 323-325 гэтага Кодэкса, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад чатырох да дзесяці гадоў са штрафам або без штрафу.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, здзейсненыя ў мэтах учынення злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі артыкуламі 124-127, 131, 287, 289 289-292, 359 і 360 гэтага Кодэкса, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да пятнаццаці гадоў са штрафам або без штрафу.

**Артыкул 323. Раскраданне радыеактыўных матэрыялаў**

1. Раскраданне радыеактыўных матэрыялаў, а таксама фінансаванне такога раскрадання –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да васьмі гадоў са штрафам або без штрафу.

2. Тое ж дзеянне, учыненае паўторна, або групай асоб, або асобай, якой указаныя сродкі давераны ў сувязі з яе службовай ці прафесійнай дзейнасцю або пад ахову, або асобай, якая раней учыніла злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 322 або 324 гэтага Кодэкса, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці гадоў са штрафам або без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя шляхам разбою або вымагання або арганізаванай групай, а таксама з мэтай учынення злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 124-127, 131, 287, 289-292, 359 і 360 гэтага Кодэкса, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да пятнаццаці гадоў са штрафам або без штрафу.

**Артыкул 324. Пагроза небяспечным выкарыстаннем радыеактыўных матэрыялаў**

1. Пагроза небяспечным выкарыстаннем радыеактыўных матэрыялаў у мэтах прымусу дзяржаўнага органа, міжнароднай арганізацыі, фізічнай або юрыдычнай асобы да здзяйснення якога-небудзь дзеяння або ўстрымання ад яго або ў іншых мэтах, калі меліся падставы апасацца гэтай пагрозы, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў.

2. Тое ж дзеянне, учыненае паўторна або групай асоб па папярэдняй змове, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці гадоў са штрафам або без штрафу.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя асобай, якая раней учыніла злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 124, 126, 289, 290, часткай 4 артыкула 309, часткай 3 артыкула 311, артыкуламі 359 і 360 гэтага Кодэкса, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да пятнаццаці гадоў са штрафам або без штрафу.

**Артыкул 325. Парушэнне правіл абыходжання з радыеактыўнымі матэрыяламі**

1. Парушэнне правіл захоўвання, выкарыстання, уліку, перавозкі, пахавання і іншых правіл абыходжання з радыеактыўнымі матэрыяламі (парушэнне правіл абыходжання з радыеактыўнымі матэрыяламі), якое стварыла пагрозу радыеактыўнага заражэння, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам.

2. Парушэнне правіл абыходжання з радыеактыўнымі матэрыяламі, якое выклікала з-за неасцярожнасці радыеактыўнае заражэнне або прычыненне менш цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караецца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Парушэнне правіл абыходжання з радыеактыўнымі матэрыяламі, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека, або прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання, або іншыя цяжкія наступствы, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 326. Выключаны**

**Артыкул 327. Раскраданне наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсараў і аналагаў**

1. Раскраданне наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або іх прэкурсараў ці аналагаў –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў.

2. Тое ж дзеянне, учыненае паўторна, або групай асоб, або асобай, якой указаныя сродкі даверany ў сувязі з яе службовым становішчам, прафесійнай дзейнасцю або пад ахову, або асобай, якая раней учыніла злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 328, 329 або 331 гэтага Кодэкса, або ў дачыненні да асабліва небяспечных наркатычных сродкаў ці псіхатропных рэчываў, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў са штрафам або без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя шляхам разбою або вымагання, або арганізаванай групай, або ў буйным памеры, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да пятнаццаці гадоў са штрафам або без штрафу.

Заўвагі:

1. Пад наркатычнымі сродкамі, псіхатропнымі рэчывамі і іх прэкурсарамі ў артыкулах гэтага Кодэкса разумеюцца сродкі і рэчывы, а таксама прэпараты, якія іх змяшчаюць, што ўключаны ў Рэспубліканскі пералік наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў і іх прэкурсараў, якія падлягаюць дзяржаўнаму кантролю ў Рэспубліцы Беларусь, за выключэннем пералічаных у табліцы 2 «Хімічныя рэчывы, якія могуць быць выкарыстаны ў працэсе вырабу, вытворчасці і перапрацоўкі наркатычных сродкаў або псіхатропных рэчываў» спіса прэкурсараў наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў дадзенага Пераліку.

2. Пад асабліва небяспечнымі наркатычнымі сродкамі або псіхатропнымі рэчывамі ў артыкулах гэтага Кодэкса разумеюцца сродкі або рэчывы, уключаныя ў спіс асабліва небяспечных наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў, якія не выкарыстоўваюцца ў медыцынскіх мэтах, або спіс асабліва небяспечных наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў, дазволеных да кантраляванага абарачэння, указанага Пераліку.

3. Пад аналагамі наркатычных сродкаў і псіхатропных рэчываў у артыкулах гэтага Кодэкса разумеюцца хімічныя рэчывы, структурныя формулы якіх утвораны заменай у структурных формулах наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або базавых структурах аднаго або некалькіх атамаў вадароду на замяшчальнікі атамаў вадароду, уключаныя ў пералік замяшчальнікаў атамаў вадароду ў структурных формулах наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або базавых структурах, устаноўлены Дзяржаўным камітэтам судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь.

4. Буйны памер наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або іх прэкурсараў ці аналагаў для мэт гэтага артыкула, а таксама артыкулаў 328 і 328[1] гэтага Кодэкса ўстанаўлівае Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 328. Незаконнае абарачэнне наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсараў і аналагаў**

1. Незаконныя без мэты збыту выраб, перапрацоўка, набыццё, захоўванне, перавозка або перасылка наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або іх прэкурсараў ці аналагаў –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў.

2. Незаконныя з мэтай збыту выраб, перапрацоўка, набыццё, захоўванне, перавозка ці перасылка або незаконны збыт наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або іх прэкурсараў ці аналагаў –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да васьмі гадоў са штрафам або без штрафу.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткай 2 гэтага артыкула, учыненыя групай асоб, або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, або асобай, якая раней учыніла злачынствы, прадугледжаныя гэтым артыкулам, артыкуламі 327, 329 або 331 гэтага Кодэкса, або ў дачыненні да наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў у буйным памеры, або ў дачыненні да асабліва небяспечных наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, або збыт наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх прэкурсараў або аналагаў на тэрыторыі адукацыйнай установы, арганізацыі аховы здароўя, воінскай часці, папраўчай установы, арыштнага дома, у месцах знаходжання пад вартай, лячэбна-працоўным прафілакторыі, у месцы правядзення масавага мерапрыемства або заведама непаўналетняму –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад шасці да пятнаццаці гадоў са штрафам або без штрафу.

4. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 2 ці 3 гэтага артыкула, учыненыя арганізаванай групай або звязаныя з вырабам ці перапрацоўкай наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або іх прэкурсараў ці аналагаў з выкарыстаннем лабараторнага посуду ці лабараторнага абсталявання, прызначаных для хімічнага сінтэзу, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да дваццаці гадоў са штрафам або без штрафу.

5. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 2–4 гэтага артыкула, якія выклікалі з-за неасцярожнасці смерць чалавека ў выніку спажывання ім наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або іх аналагаў, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дванаццаці да дваццаці пяці гадоў са штрафам або без штрафу.

Заўвага. Асоба, якая добраахвотна здала наркатычныя сродкі, псіхатропныя рэчывы, іх прэкурсары або аналагі і актыўна садзейнічала выяўленню або стрыманню злачынства, звязанага з незаконным абарачэннем гэтых сродкаў, рэчываў, выкрыццю асоб, якія іх учынілі,

выяўленню маёмасці, здабытай злачынным шляхам, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці за дадзенае злачынства.

**Артыкул 328[1]. Незаконнае перамяшчэнне праз мытную мяжу Еўразійскага эканамічнага саюза і (або) Дзяржаўную мяжу Рэспублікі Беларусь наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або іх прэкурсараў ці аналагаў**

1. Незаконнае перамяшчэнне праз мытную мяжу Еўразійскага эканамічнага саюза і (або) Дзяржаўную мяжу Рэспублікі Беларусь наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або іх прэкурсараў ці аналагаў –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў са штрафам або без штрафу.

2. Дзеянне, прадугледжанае часткай 1 гэтага артыкула, учыненае групай асоб па папярэдняй змове, або паўторна, або асобай, якая раней учыніла злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 228 і 333[1] [1] гэтага Кодэкса, або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, або з ужываннем насілля да асобы, якая ажыццяўляе мытны ці памежны кантроль, або ў дачыненні да асабліва небяспечных наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, або ў дачыненні да наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або іх аналагаў у буйным памеры, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці гадоў са штрафам або без штрафу.

3. Дзеянне, прадугледжанае часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненае арганізаванай групай, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да дванаццаці гадоў са штрафам або без штрафу.

**Артыкул 328[2]. Спажыванне наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або іх аналагаў у грамадскім месцы або з'яўленне ў грамадскім месцы ці знаходжанне на працы ў стане, выкліканым спажываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў, таксічных ці іншых адурманьвальных рэчываў**

Спажыванне без прызначэння ўрача-спецыяліста наркатычных сродкаў або псіхатропных рэчываў у грамадскім месцы або спажыванне іх аналагаў у грамадскім месцы, а таксама з'яўленне ў грамадскім месцы ў стане, выкліканым спажываннем без прызначэння ўрача-спецыяліста наркатычных сродкаў ці псіхатропных рэчываў або спажываннем іх аналагаў, таксічных або іншых адурманьвальных рэчываў, якое абражае чалавечую годнасць і грамадскую маральнасць, або знаходжанне на працоўным месцы ў працоўны час у стане, выкліканым спажываннем без прызначэння ўрача-спецыяліста наркатычных сродкаў ці псіхатропных рэчываў або спажываннем іх аналагаў, таксічных ці іншых адурманьвальных рэчываў, учыненыя на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такія ж парушэнні, –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 329. Незаконныя сяўба і (або) вырошчванне раслін або грыбоў, якія змяшчаюць наркатычныя сродкі або псіхатропныя рэчывы**

1. Незаконныя сяўба і (або) вырошчванне раслін або грыбоў, якія змяшчаюць наркатычныя сродкі або псіхатропныя рэчывы, у мэтах іх збыту або вырабу або іншага атрымання наркатычных сродкаў ці псіхатропных рэчываў –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна, або групай асоб, або асобай, якая раней учыніла злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 327, 328, 331 і 332 гэтага Кодэкса, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя арганізаванай групай, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да пятнаццаці гадоў са штрафам або без штрафу.

**Артыкул 330. Парушэнне правіл абыходжання з наркатычнымі сродкамі, псіхатропнымі рэчывамі, іх прэкурсарамі і аналагамі**

Парушэнне правіл вытворчасці, перапрацоўкі, захоўвання, уліку, водпуску, рэалізацыі, размеркавання, перавозкі, перасылкі, набыцця, выкарыстання, увозу, вывазу або знішчэння наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў або іх прэкурсараў ці аналагаў, або інструментаў ці абсталявання, якія выкарыстоўваюцца для вырабу наркатычных сродкаў або псіхатропных рэчываў, што знаходзяцца пад спецыяльным кантролем, учыненае асобай, абавязанай выконваць указаныя правілы, якое выклікала з-за неасцярожнасці страту або раскраданне названых сродкаў, рэчываў або прадметаў, –

караецца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 331. Схіленне да спажывання наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў ці іх аналагаў**

1. Схіленне да спажывання наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў ці іх аналагаў –

караецца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, учыненае ў дачыненні да дзвюх або больш асоб, або заведама непаўналетняга асобай, якая дасягнула васямнаццацігадовага ўзросту, або з прымяненнем насілля ці з пагрозай яго прымянення, або групай асоб, або асобай, якая раней учыніла злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 327-329 і 332 гэтага Кодэкса, а таксама схіленне да спажывання асабліва небяспечных наркатычных сродкаў ці псіхатропных рэчываў –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў.

**Артыкул 331[1]. Схіленне спартсмена да выкарыстання рэчыва і (або) метаду, уключаных у Рэспубліканскі пералік забароненых у спорце рэчываў і метадаў**

1. Схіленне спартсмена да выкарыстання рэчыва і (або) метаду, уключаных у Рэспубліканскі пералік забароненых у спорце рэчываў і метадаў, трэнерам, педагагічным работнікам, менеджарам, спартыўным агентам, медыцынскім работнікам або іншай асобай, якая ўдзельнічае ў спартыўнай падрыхтоўцы гэтага або іншага спартсмена, пры адсутнасці прыкмет злачынства, прадугледжанага артыкулам 331 гэтага Кодэкса, –

караецца штрафам або абмежаваннем волі на тэрмін да аднаго года.

2. Тое ж дзеянне, учыненае групай асоб па папярэдняй змове, або ў дачыненні да заведама непаўналетняга спартсмена, або ў дачыненні да двух ці больш спартсменаў, або шляхам прымянення шантажу, насілля або пагрозы яго прымянення, –

караецца штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, якія выклікалі з-за неасцярожнасці смерць спартсмена або прычыненне яму цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі гадоў.

**Артыкул 331[2]. Наўмыснае выкарыстанне ў дачыненні да спартсмена рэчыва і (або) метаду, уключаных у Рэспубліканскі пералік забароненых у спорце рэчываў і метадаў**

1. Наўмыснае выкарыстанне ў дачыненні да спартсмена незалежна ад яго згоды рэчыва і (або) метаду, уключаных у Рэспубліканскі пералік забароненых у спорце рэчываў і метадаў, за выключэннем выкарыстання такіх рэчыва і (або) метаду ў медыцынскіх мэтах пры наяўнасці дазволу на іх тэрапеўтычнае выкарыстанне, пры адсутнасці прыкмет злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 328 і 333 гэтага Кодэкса, –

караецца штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года.

2. Тое ж дзеянне, учыненае групай асоб па папярэдняй змове, або ў дачыненні да заведама непаўналетняга спартсмена, або ў дачыненні да двух ці больш спартсменаў, –

караецца штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, якія выклікалі з-за неасцярожнасці смерць спартсмена або прычыненне яму цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі гадоў.

**Артыкул 332. Даванне памяшканняў, арганізацыя або ўтрыманне прытонаў для вырабу, перапрацоўкі і (або) спажывання наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў або іншых адурманьвальных рэчываў**

1. Даванне памяшканняў для вырабу, перапрацоўкі і (або) спажывання наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў або іншых адурманьвальных рэчываў –

караецца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў.

2. Арганізацыя або ўтрыманне прытонаў для вырабу, перапрацоўкі і (або) спажывання наркатычных сродкаў, псіхатропных рэчываў, іх аналагаў або іншых адурманьвальных рэчываў –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў са штрафам або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў са штрафам.

**Артыкул 333. Незаконнае абарачэнне моцнадзейных або атрутных рэчываў**

1. Незаконныя з мэтай збыту выраб, перапрацоўка, набыццё, захоўванне, перавозка або перасылка моцнадзейных ці атрутных рэчываў, якія не з'яўляюцца наркатычнымі сродкамі, псіхатропнымі рэчывамі, іх аналагамі, або іх збыт, або раскраданне –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна, або групай асоб, або раскраданне моцнадзейных ці атрутных рэчываў шляхам разбою або вымагання, а таксама ў мэтах учынення злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 124-127, 131, 287, 289-292, 359 і 360 гэтага Кодэкса, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да дзесяці гадоў са штрафам або без штрафу.

Заўвага. Пералік моцнадзейных і атрутных рэчываў для мэт прымянення гэтага артыкула і артыкула 334 гэтага Кодэкса ўстанаўліваецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 333[1]. Незаконнае перамяшчэнне праз мытную мяжу Еўразійскага эканамічнага саюза або Дзяржаўную мяжу Рэспублікі Беларусь моцнадзейных, атрутных рэчываў, радыеактыўных матэрыялаў, агнястрэльнай зброі, боепрыпасаў, выбуховых рэчываў, выбуховых прылад, зброі масавага паражэння або сродкаў яе дастаўкі, а таксама іншых відаў узбраення і ваеннай тэхнікі**

1. Незаконнае перамяшчэнне праз мытную мяжу Еўразійскага эканамічнага саюза або Дзяржаўную мяжу Рэспублікі Беларусь моцнадзейных, атрутных рэчываў, радыеактыўных матэрыялаў, агнястрэльнай зброі, яе складаных частак або кампанентаў, боепрыпасаў, выбуховых рэчываў, выбуховых прылад, зброі масавага паражэння або сродкаў яе дастаўкі, матэрыялаў або абсталявання, якія могуць быць выкарыстаны пры стварэнні зброі масавага паражэння, а таксама іншых відаў узбраення і ваеннай тэхнікі –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў са штрафам або без штрафу.

2. Дзеянне, прадугледжанае часткай 1 гэтага артыкула, учыненае групай асоб па папярэдняй змове, або паўторна, або асобай, якая раней учыніла злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 228 і 328[1] гэтага Кодэкса, або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, або ўчыненае з прымяненнем гвалту да асобы, якая праводзіць мытны або ажыццяўляе памежны кантроль, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці гадоў са штрафам або без штрафу.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя арганізаванай групай, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да дванаццаці гадоў са штрафам або без штрафу.

**Артыкул 334. Парушэнне правіл абыходжання з моцнадзейнымі і атрутнымі рэчывамі**

Парушэнне правіл вытворчасці, набыцця, захоўвання, уліку, водпуску, перавозкі або перасылкі моцнадзейных і атрутных рэчываў, якія не з'яўляюцца наркатычнымі сродкамі, псіхатропнымі рэчывамі, іх аналагамі, якое выклікала з-за неасцярожнасці іх страту, раскраданне або прычыненне іншай істотнай шкоды, –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на той жа тэрмін, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 335. Незаконнае лячэнне**

1. Займанне лячэннем або фармацэўтычнай дзейнасцю як прафесіяй асобай, якая не мае належнай медыцынскай адукацыі або без належнага дазволу (незаконнае лячэнне), якое выклікала з-за неасцярожнасці прычыненне менш цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Незаконнае лячэнне, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека або прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі гадоў.

**Артыкул 336. Парушэнне санітарна-эпідэміялагічных, гігіенічных патрабаванняў і працэдур, устаноўленых тэхнічнымі рэгламентамі, санітарных норм і правіл, гігіенічных нарматываў**

1. Парушэнне санітарна-эпідэміялагічных, гігіенічных патрабаванняў і працэдур, устаноўленых тэхнічнымі рэгламентамі Мытнага саюза, Еўразійскага эканамічнага саюза, або санітарных норм і правіл, гігіенічных нарматываў, якое выклікала з-за неасцярожнасці захворванні або атручэнні людзей, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж парушэнне, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 337. Выпуск або рэалізацыя недабраякаснай прадукцыі**

1. Выпуск на таварны рынак або рэалізацыя спажыўцам недабраякаснай прадукцыі, заведама здольнай прывесці да захворванняў або атручэнняў людзей, або заведама забруджанай радыенуклідамі звыш допушчальных узроўняў (выпуск або рэалізацыя недабраякаснай прадукцыі), учыненыя на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такія ж парушэнні, –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам.

2. Выпуск або рэалізацыя недабраякаснай прадукцыі, якія выклікалі з-за неасцярожнасці прычыненне цяжкага або менш цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караюцца папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

3. Выпуск або рэалізацыя недабраякаснай прадукцыі, якія выклікалі з-за неасцярожнасці смерць чалавека, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

**Артыкул 338. Выкананне прац або аказанне паслуг, якія не адпавядаюць патрабаванням бяспекі**

1. Выкананне прац або аказанне паслуг, якія заведама не адпавядаюць патрабаванням бяспекі для жыцця або здароўя спажыўцоў, якія выклікалі з-за неасцярожнасці прычыненне менш цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тыя ж дзеянні, якія выклікалі з-за неасцярожнасці смерць чалавека або прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 338[1]. Падробка дакументаў якасці, маркіроўкі, упакоўкі лекавых сродкаў і (або) медыцынскіх вырабаў, дапаможных рэчываў, частак, матэрыялаў, аксесуараў**

Выраб у мэтах выкарыстання ці збыту або выкарыстанне ці збыт заведама падробленых дакументаў (рэгістрацыйнага пасведчання, дакумента, які пацвярджае якасць (сертыфіката якасці), або дэкларацыі аб адпаведнасці, інструкцыі па медыцынскім прымяненні лекавага прэпарата (лістка-ўкладыша), або нарматыўнай, тэхнічнай і (або) эксплуатацыйнай дакументацыі вытворцы (вырабляльніка)), або выкарыстанне падробленай упакоўкі, або нанясенне падробленай маркіроўкі на ўпакоўкі лекавых прэпаратаў, фармацэўтычных субстанцый, дапаможных рэчываў, медыцынскія вырабы, іх часткі, камплектуючыя і расходныя матэрыялы і аксесуары да медыцынскіх вырабаў пры адсутнасці прыкмет больш цяжкага злачынства –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 338[2]. Вытворчасць, увоз у Рэспубліку Беларусь, захоўванне або збыт фальсіфікаваных, няякасных, незарэгістраваных лекавых сродкаў і (або) медыцынскіх вырабаў**

1. Вытворчасць, увоз у Рэспубліку Беларусь і (або) захоўванне ў мэтах збыту або збыт фальсіфікаваных і (або) няякасных лекавых сродкаў і (або) медыцынскіх вырабаў або незарэгістраваных лекавых сродкаў і (або) медыцынскіх вырабаў, за выключэннем выпадкаў, устаноўленых актамі заканадаўства, міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, міжнародна-прававымі актамі, якія складаюць права Еўразійскага эканамічнага саюза, пры адсутнасці прыкмет больш цяжкага злачынства –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна або групай асоб па папярэдняй змове, –

караюцца папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткай 1 гэтага артыкула, якія ўчынены арганізаванай групай або выклікалі з-за неасцярожнасці прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання або смерць чалавека, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

# РАЗДЗЕЛ XI
# ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ГРАМАДСКАГА ПАРАДКУ І ГРАМАДСКАЙ МАРАЛЬНАСЦІ

## ГЛАВА 30
## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ГРАМАДСКАГА ПАРАДКУ І ГРАМАДСКАЙ МАРАЛЬНАСЦІ

Заўвагі:

1. Буйным памерам шкоды ў артыкулах гэтай главы прызнаецца памер шкоды на суму, якая ў дзвесце пяцьдзясят і больш разоў перавышае памер базавай велічыні, устаноўлены на дзень учынення злачынства, асабліва буйным – якая ў тысячу і больш разоў перавышае памер такой базавай велічыні.

2. Пад асабліва каштоўнымі матэрыяльнымі гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі ў артыкулах гэтай главы разумеюцца матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія ўключаны або прапанаваны для ўключэння ў Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны або ў Спіс сусветнай спадчыны, якая знаходзіцца пад пагрозай, а таксама матэрыяльныя гісторыка -культурныя каштоўнасці, якія маюць адметныя духоўныя, мастацкія і (або) дакументальныя вартасці, што маюць міжнароднае або нацыянальнае значэнне.

3. Пад асабліва каштоўнымі матэрыяльнымі культурнымі каштоўнасцямі ў артыкулах гэтай главы разумеюцца матэрыяльныя культурныя каштоўнасці, якія маюць адметныя духоўныя, мастацкія і (або) дакументальныя вартасці і адпавядаюць аднаму з крытэрыяў для надання ім статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, якая можа быць уключана або прапанавана для ўключэння ў Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны або ў Спіс сусветнай спадчыны, якая знаходзіцца пад пагрозай, а таксама матэрыяльныя культурныя каштоўнасці, якія маюць адметныя духоўныя, мастацкія і (або) дакументальныя вартасці, якія могуць мець міжнароднае або нацыянальнае значэнне, і адпавядаюць аднаму з крытэрыяў для надання ім статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.

**Артыкул 339. Хуліганства**

1. Наўмысныя дзеянні, якія груба парушаюць грамадскі парадак, выяўляюць яўную непавагу да грамадства, суправаджаюцца прымяненнем насілля ці пагрозай яго прымянення або знішчэннем ці пашкоджаннем чужой маёмасці або вылучаюцца па сваім змесце выключным цынізмам (хуліганства), –

карающца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

2. Хуліганства, учыненае паўторна, або групай асоб, або звязанае з супраціўленнем асобе, якая спыняе хуліганскія дзеянні, або спалучанае з прычыненнем менш цяжкага цялеснага пашкоджання (злоснае хуліганства), –

карающца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго года да шасці гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя з прымяненнем зброі, іншых прадметаў, якія выкарыстоўваюцца ў якасці зброі для прычынення цялесных пашкоджанняў, прымяненнем выбуховых рэчываў, выбуховых прылад або прадметаў, паражальнае дзеянне якіх заснавана на выкарыстанні гаручых рэчываў, або ўчыненыя з пагрозай іх прымянення, пры адсутнасці прыкмет больш цяжкага злачынства (асабліва злоснае хуліганства) –

карающца абмежаваннем волі на тэрмін ад трох да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў.

**Артыкул 339[1]. Жорсткае абыходжанне з жывёлай**

1. Жорсткае абыходжанне з жывёлай, якое выклікала яе гібель або калецтва, учыненае з хуліганскіх, карыслівых або іншых нізкіх меркаванняў або ў прысутнасці заведама малалетняга, –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да аднаго года, або арыштам.

2. Тое ж дзеянне, учыненае паўторна або групай асоб, –

караецца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 340. Заведама лжывае паведамленне аб небяспецы**

1. Заведама лжывае паведамленне аб рыхтаваным выбуху, падпале, або іншых дзеяннях, якія ствараюць небяспеку для жыцця і здароўя людзей, або прычынення шкоды ў буйным памеры, або надыходу іншых цяжкіх наступстваў, –

караецца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў.

2. Тое ж дзеянне, якое ўчынена паўторна ці групай асоб па папярэдняй змове, або выклікала прычыненне шкоду ў буйным памеры, або выклікала іншыя цяжкія наступствы, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў.

**Артыкул 341. Апаганенне збудаванняў і пашкоджанне маёмасці**

Апаганенне будынкаў або іншых збудаванняў цынічнымі надпісамі ці выявамі, пашкоджанне маёмасці на грамадскім транспарце або ў іншых грамадскіх месцах пры адсутнасці прыкмет больш цяжкага злачынства –

караюцца грамадскімі працамі, або штрафам, або арыштам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 341[1]. Прапаганда ці публічнае дэманстраванне, выраб, распаўсюджванне нацысцкай сімволікі ці атрыбутыкі**

Прапаганда ці публічнае дэманстраванне, у тым ліку з выкарыстаннем глабальнай камп’ютарнай сеткі Інтэрнэт ці іншай інфармацыйнай сеткі, выраб, распаўсюджванне нацысцкай сімволікі ці атрыбутыкі, а таксама захоўванне або набыццё такой сімволікі ці атрыбутыкі ў мэтах распаўсюджвання, учыненыя неаднаразова, –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох гадоў.

Заўвага. Для мэт гэтага артыкула дзеянне прызнаецца ўчыненым асобай неаднаразова, калі гэта асоба двойчы на працягу аднаго года падвяргалася адміністрацыйнаму спагнанню за ўчыненне адміністрацыйных правапарушэнняў, прадугледжаных артыкулам 19.10 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, і на працягу года пасля накладання другога адміністрацыйнага спагнання за такія дзеянні зноў іх учыніла.

**Артыкул 342. Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх**

1. Арганізацыя групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак і звязаны з яўным непадпарадкаваннем законным патрабаванням прадстаўнікоў улады або выклікалі парушэнне працы транспарту, прадпрыемстваў, устаноў ці арганізацый, або актыўны ўдзел у такіх дзеяннях пры адсутнасці прыкмет больш цяжкага злачынства –

караюцца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох гадоў.

2. Навучанне ці іншая падрыхтоўка асоб для ўдзелу ў групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак, а таксама фінансаванне ці іншае матэрыяльнае забеспячэнне такой дзейнасці пры адсутнасці прыкмет больш цяжкага злачынства –

караюцца арыштам або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

**Артыкул 342[1]. Прапаганда самагубства**

1. Наўмыснае распаўсюджванне ў любой форме інфармацыі ў мэтах выклікання ў індывідуальна-нявызначанага кола асоб рашучасці ўчыніць самагубства пры адсутнасці

прыкмет злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 145 і 146 гэтага Кодэкса (прапаганда самагубства), –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў.

2. Прапаганда самагубства, якая выклікала самагубства або замах на самагубства, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў.

3. Прапаганда самагубства, якая выклікала самагубства або замах на самагубства дзвюх ці больш асоб, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да шасці гадоў.

**Артыкул 342$^2$. Неаднаразовае парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў**

Парушэнне ўстаноўленага парадку арганізацыі або правядзення сходу, мітынгу, вулічнага шэсця, дэманстрацыі, пікетавання, іншага масавага мерапрыемства, у тым ліку публічныя заклікі да арганізацыі або правядзення сходу, мітынгу, вулічнага шэсця, дэманстрацыі, пікетавання, іншага масавага мерапрыемства з парушэннем устаноўленага парадку іх арганізацыі або правядзення (парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў), калі гэта дзеянне ўчынена неаднаразова, –

караецца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

Заўвага. Для мэт гэтага артыкула дзеянне прызнаецца ўчыненым асобай неаднаразова, калі гэта асоба двойчы на працягу аднаго года падвяргалася адміністрацыйнаму спагнанню за ўчыненне адміністрацыйных правапарушэнняў, прадугледжаных артыкулам 24.23 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях, і на працягу года пасля накладання другога адміністрацыйнага спагнання за такія дзеянні зноў парушыла парадак арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў.

**Артыкул 343. Выраб і распаўсюджванне парнаграфічных матэрыялаў або прадметаў парнаграфічнага характару**

1. Захоўванне з мэтай распаўсюджвання ці рэкламавання або распаўсюджванне, рэкламаванне парнаграфічных матэрыялаў, друкаваных выданняў, выяў, кіна-, відэафільмаў ці сцэн парнаграфічнага зместу, іншых прадметаў парнаграфічнага характару, учыненыя на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такое ж парушэнне, а таксама выраб з мэтай распаўсюджвання ці рэкламавання або трансляцыя ці публічная дэманстрацыя парнаграфічных матэрыялаў, друкаваных выданняў, выяў, кіна-, відэафільмаў ці сцэн парнаграфічнага зместу, іншых прадметаў парнаграфічнага характару –

караюцца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам.

2. Выраб або захоўванне з мэтай распаўсюджвання ці рэкламавання або распаўсюджванне, рэкламаванне, трансляцыя ці публічная дэманстрацыя парнаграфічных матэрыялаў, друкаваных выданняў, выяў, кіна-, відэафільмаў або сцэн парнаграфічнага зместу, іншых прадметаў парнаграфічнага характару, учыненыя з карыслівых меркаванняў або арганізаванай групай, а таксама распаўсюджванне, рэкламаванне, трансляцыя ці дэманстрацыя заведама непаўналетняму парнаграфічных матэрыялаў, друкаваных выданняў, выяў, кіна-, відэафільмаў ці сцэн парнаграфічнага зместу, іншых прадметаў парнаграфічнага характару, учыненыя асобай, якая дасягнула васямнаццацігадовага ўзросту, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да чатырох гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 343$^1$. Выраб і распаўсюджванне парнаграфічных матэрыялаў або прадметаў парнаграфічнага характару з выявай непаўналетняга**

1. Выраб або захоўванне з мэтай распаўсюджвання ці рэкламавання або распаўсюджванне, рэкламаванне, трансляцыя ці публічная дэманстрацыя парнаграфічных матэрыялаў,

друкаваных выданняў, кіна-, відэафільмаў ці сцэн парнаграфічнага зместу, іншых прадметаў парнаграфічнага характару з выявай заведама непаўналетняга –

караюцца папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя асобай, якая раней учыніла злачынствы, прадугледжаныя гэтым артыкулам або часткай 2 артыкула 343 гэтага Кодэкса, або групай асоб па папярэдняй змове або з выкарыстаннем глабальнай камп’ютарнай сеткі Інтэрнэт, іншай сеткі электрасувязі агульнага карыстання ці выдзеленай сеткі электрасувязі, а таксама выкарыстанне заведама непаўналетняга для вырабу парнаграфічных матэрыялаў, друкаваных выданняў, кіна-, відэафільмаў ці сцэн парнаграфічнага зместу, іншых прадметаў парнаграфічнага характару з яго выявай –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да васьмі гадоў са штрафам або без штрафу.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя арганізаванай групай, а таксама выкарыстанне заведама малалетняга для вырабу парнаграфічных матэрыялаў, друкаваных выданняў, кіна-, відэафільмаў ці сцэн парнаграфічнага зместу, іншых прадметаў парнаграфічнага характару з яго выявай –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да трынаццаці гадоў са штрафам або без штрафу.

**Артыкул 344. Наўмысныя знішчэнне або пашкоджанне гісторыка-культурных каштоўнасцей або культурных каштоўнасцей, якім можа быць нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці**

1. Наўмысныя знішчэнне або пашкоджанне гісторыка-культурных каштоўнасцей або культурных каштоўнасцей, якія маюць адметныя духоўныя, мастацкія і (або) дакументальныя вартасці і адпавядаюць аднаму з крытэрыяў для надання ім статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, –

караюцца грамадскімі працамі, або штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тыя ж дзеянні, якія ўчынены паўторна, або групай асоб, або ў дачыненні да асабліва каштоўных матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей ці асабліва каштоўных матэрыяльных культурных каштоўнасцей, або якія выклікалі прычыненне шкоды ў асабліва буйным памеры, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дванаццаці гадоў.

**Артыкул 345. Знішчэнне, пашкоджанне або страта гісторыка-культурных каштоўнасцей або культурных каштоўнасцей, якім можа быць нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, з-за неасцярожнасці**

1. Знішчэнне, пашкоджанне гісторыка-культурных каштоўнасцей або культурных каштоўнасцей, што маюць адметныя духоўныя, мастацкія і (або) дакументальныя вартасці і адпавядаюць аднаму з крытэрыяў для надання ім статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, учыненыя з-за неасцярожнасці, або іх страта з прычыны нядбайнага захоўвання, якія выклікалі прычыненне шкоды ў буйным памеры, –

караюцца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да аднаго года, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да аднаго года.

2. Тыя ж дзеянні, якія ўчынены ў дачыненні да асабліва каштоўных матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей або асабліва каштоўных матэрыяльных культурных каштоўнасцей ці выклікалі прычыненне шкоды ў асабліва буйным памеры, –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 346. Глумленне з гісторыка-культурных каштоўнасцей**

1. Глумленне з гісторыка-культурных каштоўнасцей пры адсутнасці прыкмет злачынства, прадугледжанага артыкулам 344 гэтага Кодэкса, –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або арыштам.

2. Тое ж дзеянне, учыненае ў дачыненні да асабліва каштоўных матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, або глумленне з помнікаў абаронцам Айчыны пры адсутнасці прыкмет злачынства, прадугледжанага артыкулам 344 гэтага Кодэкса, –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 347. Глумленне з трупа або магілы**

1. Глумленне з трупа або магілы, або крадзеж трупа, або крадзеж прадметаў, якія знаходзяцца ў пахаванні, –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя ў дачыненні да брацкай магілы або магілы абаронца Айчыны, –

караюцца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 348. Незаконнае адабранне органаў або тканак у памерлага донара**

1. Незаконнае адабранне органаў або тканак у памерлага донара –

караецца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, учыненае з карыслівых меркаванняў, –

караецца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

## РАЗДЗЕЛ XII
## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ КАМП'ЮТАРНАЙ БЯСПЕКІ

### ГЛАВА 31
### ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ КАМП'ЮТАРНАЙ БЯСПЕКІ

Заўвага. Крымінальнае пераследаванне блізкіх асобы, пацярпелай ад злачынства, якія ўчынілі злачынствы, прадугледжанае часткай 1 артыкула 349, або часткай 1 артыкула 350, або часткай 1 артыкула 352, распачынаецца толькі па заяве асобы, пацярпелай ад злачынства, а ў выпадку яе нядздольнасці з-за ўзросту ці стану здароўя выказваць сваю волю ў крымінальным працэсе або ў выпадку яе смерці – любога з яе дарослых блізкіх сваякоў або членаў сям'і, яе законнага прадстаўніка.

**Артыкул 349. Несанкцыянаваны доступ да камп'ютарнай інфармацыі**

1. Несанкцыянаваны доступ да камп'ютарнай інфармацыі, які суправаджаецца парушэннем сістэмы абароны (несанкцыянаваны доступ да камп'ютарнай інфармацыі), які ўчынены з карыслівай зацікаўленасці або выклікаў з-за неасцярожнасці прычыненне істотнай шкоды, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Несанкцыянаваны доступ да камп'ютарнай інфармацыі або самавольнае карыстанне камп'ютарнай сістэмай ці сеткай, якія выклікалі з-за неасцярожнасці крушэнне, аварыю, катастрофу, няшчасныя выпадкі з людзьмі, адмоўныя змены ў навакольным асяроддзі або іншыя цяжкія наступствы, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі гадоў.

**Артыкул 350. Знішчэнне, блакаванне або мадыфікацыя камп'ютарнай інфармацыі**

1. Наўмысныя знішчэнне, блакаванне, прывядзенне ў непрыдатны стан камп'ютарнай інфармацыі, разбурэнне, блакаванне або парушэнне працы камп'ютарнай сістэмы, сеткі ці машыннага носьбіта або мадыфікацыя камп'ютарнай інфармацыі пры адсутнасці прыкмет злачынства супраць уласнасці, якія выклікалі прычыненне істотнай шкоды, –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна або групай асоб па папярэдняй змове, –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той ж тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, якія выклікалі з-за неасцярожнасці наступствы, указаныя ў частцы 2 артыкула 349 гэтага Кодэкса, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 351. Выключаны**

**Артыкул 352. Неправамернае завалоданне камп’ютарнай інфармацыяй**

1. Наўмысныя несанкцыянаванае капіраванне, перахопліванне камп’ютарнай інфармацыі або іншае неправамернае завалоданне камп’ютарнай інфармацыяй, якія выклікалі прычыненне істотнай шкоды, –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна або групай асоб па папярэдняй змове, –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, якія выклікалі з-за неасцярожнасці наступствы, указаныя ў частцы 2 артыкула 349 гэтага Кодэкса, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 353. Выключаны**

**Артыкул 354. Распрацоўка, выкарыстанне, распаўсюджванне або збыт шкодных камп’ютарных праграм або спецыяльных праграмных ці апаратных сродкаў**

1. Распрацоўка, выкарыстанне, распаўсюджванне або збыт камп’ютарнай праграмы або спецыяльнага праграмнага ці апаратнага сродку, заведама прызначаных для парушэння сістэмы абароны, несанкцыянаванага доступу да камп’ютарнай сістэмы, сеткі ці машыннага носьбіта, несанкцыянаванага знішчэння, блакавання, мадыфікацыі камп’ютарнай інфармацыі або неправамернага завалодання камп’ютарнай інфармацыяй або парушэння працы камп’ютарнай сістэмы, сеткі ці машыннага носьбіта, –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя групай асоб па папярэдняй змове, –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, якія выклікалі з-за неасцярожнасці наступствы, указаныя ў частцы 2 артыкула 349 гэтага Кодэкса, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 355. Парушэнне правіл эксплуатацыі камп’ютарнай сістэмы або сеткі**

1. Наўмыснае парушэнне правіл эксплуатацыі камп’ютарнай сістэмы або сеткі асобай, якая мае доступ да гэтых сістэмы або сеткі, якое выклікала з-за неасцярожнасці прычыненне істотнай шкоды, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала з-за неасцярожнасці наступствы, указаныя ў частцы 2 артыкула 349 гэтага Кодэкса, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

## РАЗДЗЕЛ XIII
## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ДЗЯРЖАВЫ І ПАРАДКУ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ ЎЛАДЫ І КІРАВАННЯ

### ГЛАВА 32
### ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ДЗЯРЖАВЫ

**Артыкул 356. Здрада дзяржаве**

1. Выдаванне замежнай дзяржаве, міжнароднай або замежнай арганізацыі ці іх прадстаўнікам дзяржаўных сакрэтаў Рэспублікі Беларусь, а таксама звестак, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі іншых дзяржаў, перададзеных Рэспубліцы Беларусь у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, або шпіянаж, або пераход на бок ворага падчас вайны ці ўзброенага канфлікту, або іншае аказанне дапамогі замежнай дзяржаве, міжнароднай або замежнай арганізацыі ці іх прадстаўнікам у правядзенні дзейнасці, накіраванай на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь, наўмысна ўчыненыя грамадзянінам Рэспублікі Беларусь (здрада дзяржаве), –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да пятнаццаці гадоў са штрафам або без штрафу.

2. Здрада дзяржаве, учыненая службовай асобай, якая займае адказнае становішча, або асобай, на якую распаўсюджваецца статус ваеннаслужачага, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да дваццаці гадоў са штрафам або без штрафу.

Заўвага. Асоба, якая ўчыніла дзеянні, прадугледжаныя гэтым артыкулам, а таксама артыкуламі 358 і 358[1] гэтага Кодэкса, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці, калі яна добраахвотна і своечасова заявіла дзяржаўным органам аб учыненых ёй дзеяннях, спыніла дзейнасць, накіраваную на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь, і садзейнічала ў прадухіленні шкодных наступстваў.

**Артыкул 357. Змова або іншыя дзеянні, учыненыя з мэтай захопу дзяржаўнай улады**

1. Змова або іншыя дзеянні, учыненыя з мэтай захопу або ўтрымання дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да дванаццаці гадоў.

2. Захоп або ўтрыманне дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да пятнаццаці гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткай другой гэтага артыкула, якія выклікалі гібель людзей або звязаныя з забойствам, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да дваццаці пяці гадоў, або пажыццёвым пазбаўленнем волі, або смяротным пакараннем.

Заўвага. Удзельнік змовы або іншых дзеянняў, учыненых з мэтай захопу або ўтрымання дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам, вызваляецца ад адказнасці па частцы першай гэтага артыкула, калі ён своечасова і добраахвотна заявіў аб злачынстве дзяржаўным органам і актыўна дапамагаў яго выяўленню.

**Артыкул 358. Шпіянаж**

Перадача, а таксама збіранне, крадзеж або захоўванне ў мэтах перадачы замежнай дзяржаве, міжнароднай або замежнай арганізацыі ці іх прадстаўнікам звестак, якія з'яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі Рэспублікі Беларусь, а таксама звестак, якія з'яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі іншых дзяржаў, перададзеных Рэспубліцы Беларусь у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, наўмысна ўчыненыя замежным грамадзянінам або асобай без грамадзянства, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад сямі да пятнаццаці гадоў.

**Артыкул 358[1]. Агентурная дзейнасць**

Супрацоўніцтва замежнага грамадзяніна або асобы без грамадзянства са спецыяльнай службай, органам бяспекі або разведвальным органам замежнай дзяржавы, міжнароднай або замежнай арганізацыяй, звязанае са здзяйсненнем дзеянняў, заведама накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь, пры адсутнасці прыкмет іншых больш цяжкіх злачынстваў супраць дзяржавы (агентурная дзейнасць) –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў.

**Артыкул 359. Акт тэрарызму ў дачыненні да дзяржаўнага або грамадскага дзеяча**

1. Насілле ў дачыненні да дзяржаўнага або грамадскага дзеяча, захоп і (або) утрыманне яго ў якасці заложніка, крадзеж і (або) пазбаўленне яго волі, учыненыя ў сувязі з яго дзяржаўнай ці грамадскай дзейнасцю ў мэтах аказання ўздзеяння на прыняцце рашэнняў органамі ўлады, або перашкаджэння палітычнай ці іншай грамадскай дзейнасці, або запалохвання насельніцтва, або дэстабілізацыі грамадскага парадку, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да пятнаццаці гадоў.

2. Забойства дзяржаўнага або грамадскага дзеяча, учыненае ў сувязі з яго дзяржаўнай ці грамадскай дзейнасцю ў мэтах аказання ўздзеяння на прыняцце рашэнняў органамі ўлады, або перашкаджэння палітычнай ці іншай грамадскай дзейнасці, або запалохвання насельніцтва, або дэстабілізацыі грамадскага парадку, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да дваццаці пяці гадоў, або пажыццёвым пазбаўленнем волі, або пакараннем смерцю.

Заўвага. Асоба, якая ўдзельнічала ў прыгатаванні да дзеянняў, прадугледжаных гэтым артыкулам, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці за гэтыя дзеянні, калі яна своечасовым папярэджаннем дзяржаўных органаў або іншым чынам прадухіліла акт тэрарызму ў дачыненні да дзяржаўнага або грамадскага дзеяча.

**Артыкул 360. Дыверсія**

1. Учыненне выбуху, падпалу або іншых дзеянняў, якія ствараюць небяспеку гібелі людзей, прычынення ім цялесных пашкоджанняў, разбурэння або пашкоджання будынкаў, збудаванняў, шляхоў і сродкаў зносін, сродкаў сувязі або іншай маёмасці, у мэтах нанясення ўрону эканамічнай бяспецы і абараназдольнасці Рэспублікі Беларусь (дыверсія) –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да пятнаццаці гадоў.

2. Дыверсія, якая ўчынена арганізаванай групай або выклікала гібель людзей ці іншыя цяжкія наступствы, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да дваццаці пяці гадоў, або пажыццёвым пазбаўленнем волі, або пакараннем смерцю.

**Артыкул 361. Заклікі да дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь**

1. Публічныя заклікі да захопу дзяржаўнай улады, або гвалтоўнага змянення канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, або здрады дзяржаве, або ўчынення акта тэрарызму ці дыверсіі, або ажыццяўлення дзеянняў, накіраваных на парушэнне тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь, або ўчынення іншых дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь, або распаўсюджванне матэрыялаў, якія змяшчаюць такія заклікі, –

караюцца арыштам або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў.

2. Заклікі, звернутыя да замежнай дзяржавы, замежнай ці міжнароднай арганізацыі ўчыніць дзеянні, накіраваныя на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь, або распаўсюджванне матэрыялаў, якія змяшчаюць такія заклікі, пры адсутнасці прыкмет больш цяжкага злачынства –

караюцца арыштам або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя з выкарыстаннем сродкаў масавай інфармацыі або глабальнай камп’ютарнай сеткі Інтэрнэт або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў.

**Артыкул 361[1]. Стварэнне экстрэмісцкага фарміравання або ўдзел у ім**

1. Стварэнне экстрэмісцкага фарміравання, а таксама фарміравання, дзейнасць якога накіравана на рэабілітацыю нацызму, або кіраўніцтва такім фарміраваннем ці падраздзяленнем, якое ўваходзіць у яго структуру, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін ад трох да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад шасці да дзесяці гадоў.

3. Уваходжанне асобы ў склад экстрэмісцкага фарміравання ў мэтах учынення злачынства экстрэмісцкай накіраванасці (удзел у экстрэмісцкім фарміраванні) –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да шасці гадоў.

Заўвагі:

1. Асоба вызваляецца ад крымінальнай адказнасці па гэтым артыкуле і артыкулах і 361[5] гэтага Кодэкса, калі яна своечасовым паведамленнем дзяржаўным органам або іншым чынам дапамагала выяўленню, прадухіленню або стрыманню дзеянняў, аднесеных заканадаўствам да экстрэмісцкай дзейнасці.

2. Пад злачынствам экстрэмісцкай накіраванасці ў гэтым артыкуле разумеюцца злачынства, звязанае з учыненнем наўмысных дзеянняў, якія адносяцца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі да экстрэмізму, а таксама іншае злачынства, прадугледжанае гэтым Кодэксам, учыненае з-за расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці ці звады, палітычнай ці ідэалагічнай варожасці або з-за варожасці ці звады ў дачыненні да якой-небудзь сацыяльнай групы.

**Артыкул 361[2]. Фінансаванне экстрэмісцкай дзейнасці**

1. Даванне або збор грашовых сродкаў, каштоўных папер ці іншай маёмасці, у тым ліку маёмасных праў і выключных праў на вынікі інтэлектуальнай дзейнасці, любым спосабам для заведамага забеспячэння экстрэмісцкай дзейнасці, дзейнасці, накіраванай на рэабілітацыю нацызму, –

караюцца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да пяці гадоў.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна, або групай асоб па папярэдняй змове, або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да васьмі гадоў са штрафам.

Заўвага. Асоба, якая ўчыніла фінансаванне экстрэмісцкай дзейнасці, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці па гэтым артыкуле, калі яна своечасова заявіла аб учыненым і (або) іншым чынам садзейнічала прадухіленню або выяўленню гэтага злачынства.

**Артыкул 361[3]. Удзел на тэрыторыі замежнай дзяржавы ва ўзброеным фарміраванні або ўзброеным канфлікце, ваенных дзеяннях, вярбоўка або падрыхтоўка асоб да такога ўдзелу**

1. Удзел грамадзяніна Рэспублікі Беларусь або асобы без грамадзянства, якая пастаянна пражывае ў Рэспубліцы Беларусь, на тэрыторыі замежнай дзяржавы ва ўзброеным фарміраванні аднаго з супраціўных бакоў, а таксама ўдзел ва ўзброеным канфлікце, ваенных дзеяннях без упаўнаважання дзяржавы і пры адсутнасці прыкмет злачынства, прадугледжанага артыкулам 133 гэтага Кодэкса, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў.

2. Вярбоўка, навучанне, іншая падрыхтоўка або выкарыстанне грамадзян Рэспублікі Беларусь ці асоб без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, для ўдзелу на тэрыторыі замежнай дзяржавы ва ўзброеным фарміраванні аднаго з супраціўных бакоў ва ўзброеных канфліктах, ваенных дзеяннях, а таксама фінансаванне або іншае матэрыяльнае забеспячэнне такой дзейнасці пры адсутнасці прыкмет злачынства, прадугледжанага артыкулам 132 гэтага Кодэкса, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці гадоў.

**Артыкул 361$^{4}$. Садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці**

1. Вярбоўка, іншае ўцягненне асобы ў экстрэмісцкую дзейнасць, навучанне, а таксама іншае садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да шасці гадоў.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна, або групай асоб па папярэдняй змове, або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў.

**Артыкул 361$^{5}$. Праходжанне навучання або іншай падрыхтоўкі для ўдзелу ў экстрэмісцкай дзейнасці**

Праходжанне асобай навучання або іншай падрыхтоўкі, якія заведама для навучэнца маюць на мэце яго наступны ўдзел у экстрэмісцкай дзейнасці, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

## ГЛАВА 33
## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ПАРАДКУ КІРАВАННЯ

**Артыкул 362. Забойства супрацоўніка органаў унутраных спраў, ваеннаслужачага**

Забойства супрацоўніка органаў унутраных спраў, ваеннаслужачага ў сувязі з выкананнем імі абавязкаў па ахове грамадскага парадку –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дванаццаці да дваццаці пяці гадоў, або пажыццёвым пазбаўленнем волі, або пакараннем смерцю.

**Артыкул 363. Супраціўленне супрацоўніку органаў унутраных спраў або іншай асобе, якая ахоўвае грамадскі парадак**

1. Супраціўленне супрацоўніку органаў унутраных спраў або іншай асобе пры выкананні імі абавязкаў па ахове грамадскага парадку –

караецца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, учыненае групай асоб або звязанае з прымяненнем насілля або з пагрозай яго прымянення, а таксама прымус гэтых асоб шляхам прымянення насілля або пагрозы яго прымянення да выканання яўна незаконных дзеянняў –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі гадоў.

**Артыкул 364. Насілле або пагроза прымянення насілля ў дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў**

Насілле або пагроза прымянення насілля ў дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў або яго блізкіх у мэтах перашкаджэння яго законнай дзейнасці або прымусу да змянення характару гэтай дзейнасці або з помсты за выкананне службовай дзейнасці –

караюцца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі гадоў.

**Артыкул 365. Умяшанне ў дзейнасць супрацоўніка органаў унутраных спраў**

Уздзеянне на супрацоўніка органаў унутраных спраў з мэтай змянення характару яго законнай дзейнасці шляхам пагрозы знішчэннем або пашкоджаннем маёмасці або распаўсюджваннем паклёпніцкіх ці выдаваннем іншых звестак, якія ён жадае захаваць у тайне, або шляхам выкарыстання службовай асобай сваіх службовых паўнамоцтваў –

караецца штрафам, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

**Артыкул 366. Насілле або пагроза ў дачыненні да службовай асобы, якая выконвае службовыя абавязкі, або іншай асобы, якая выконвае грамадскі абавязак**

1. Насілле або пагроза насіллем, знішчэннем або пашкоджаннем маёмасці ў дачыненні да службовай асобы, якая выконвае службовыя абавязкі, або іншай асобы, якая выконвае грамадскі абавязак па ахове грамадскага парадку ці стрыманні правапарушэнняў, або іх блізкіх у мэтах перашкаджэння законнай дзейнасці або прымусу да змянення характару гэтай дзейнасці або з помсты за выкананне службовых абавязкаў ці грамадскага абавязку –

караюцца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі гадоў.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя ў дачыненні да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да васьмі гадоў.

**Артыкул 367. Паклёп у дачыненні да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**

1. Паклёп у дачыненні да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у публічным выступленні, або ў друкаваным ці публічна дэманстраваным творы, або ў сродках масавай інфармацыі, або ў інфармацыі, размешчанай у глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт, –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў.

2. Тое ж дзеянне, учыненае асобай, раней судзімай за паклёп ці знявагу, або злучанае з абвінавачаннем ва ўчыненні цяжкага або асабліва цяжкага злачынства, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да шасці гадоў.

**Артыкул 368. Знявага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**

1. Публічная знявага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, учыненае асобай, раней судзімай за знявагу або паклёп, або злучанае з абвінавачаннем ва ўчыненні цяжкага або асабліва цяжкага злачынства, –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

Заўвага. Пад знявагай у гэтым артыкуле, артыкулах 369, 391 і 444 гэтага Кодэкса разумеецца наўмысная знявага гонару і годнасці асобы, выказаная ў непрыстойнай форме.

**Артыкул 369. Знявага прадстаўніка ўлады**

Знявага прадстаўніка ўлады або яго блізкіх у сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў, учыненая ў публічным выступленні, або ў друкаваным ці публічна дэманстраваным творы, або ў сродках масавай інфармацыі, або ў інфармацыі, размешчанай у глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт, –

караецца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў са штрафам, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін са штрафам.

**Артыкул 369[1]. Дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь**

Распаўсюджванне заведама ілжывых звестак аб палітычным, эканамічным, сацыяльным, ваенным або міжнародным становішчы Рэспублікі Беларусь, прававым становішчы грамадзян у Рэспубліцы Беларусь, дзейнасці дзяржаўных органаў, якія дыскрэдытуюць Рэспубліку

Беларусь, учыненае ў публічным выступленні, або друкаваным ці публічна дэманстраваным творы, або ў сродках масавай інфармацыі, або ў інфармацыі, размешчанай у глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт, накіраванае на прычыненне істотнай шкоды дзяржаўным або грамадскім інтарэсам, –

караецца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін са штрафам або без штрафу.

**Артыкул 369[2]. Выкарыстанне замежнай бязвыплатнай дапамогі ў парушэнне заканадаўства Рэспублікі Беларусь**

Выкарыстанне замежнай бязвыплатнай дапамогі для ажыццяўлення тэрарыстычнай і іншай экстрэмісцкай дзейнасці або іншых дзеянняў, забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, або фінансавання палітычных партый, саюзаў (асацыяцый) палітычных партый, падрыхтоўкі ці правядзення выбараў, рэферэндумаў, адклікання дэпутата, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, арганізацыі або правядзення сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў, дэманстрацый, пікетавання, забастовак, вырабу або распаўсюджвання агітацыйных матэрыялаў, правядзення семінараў ці іншых форм палітычнай і агітацыйна-масавай працы сярод насельніцтва, учыненае на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такія ж парушэнні, –

караецца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 369[3]. Публічныя заклікі да арганізацыі або правядзення незаконных сходу, мітынгу, вулічнага шэсця, дэманстрацыі ці пікетавання або ўцягненне асоб ва ўдзел у такіх масавых мерапрыемствах**

Публічныя заклікі да арганізацыі або правядзення сходу, мітынгу, вулічнага шэсця, дэманстрацыі ці пікетавання з парушэннем устаноўленага парадку іх арганізацыі ці правядзення, або ўцягненне асоб ва ўдзел у такіх масавых мерапрыемствах шляхам насілля, пагрозы прымянення насілля, падману або выплаты ўзнагароджання, або іншая арганізацыя ці правядзенне такіх масавых мерапрыемстваў, калі іх правядзенне выклікала з-за неасцярожнасці гібель людзей, прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання адной ці некальким асобам або прычыненне шкоды ў буйным памеры пры адсутнасці прыкмет злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 293 і 342 гэтага Кодэкса, –

караюцца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

Заўвага. Буйным памерам шкоды ў гэтым артыкуле прызнаецца памер шкоды, які ў пяцьсот і больш разоў перавышае базавую велічыню, устаноўленую на дзень учынення злачынства.

**Артыкул 370. Глумленне з дзяржаўных сімвалаў**

Глумленне з Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 371. Незаконнае перасячэнне Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь**

1. Наўмыснае незаконнае перасячэнне Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь з выкарыстаннем механічнага транспартнага сродку, судна ўнутранага плавання (самаходнага), судна змяшанага (рака — мора) плавання (самаходнага), маламернага маторнага судна, судна з падвесным рухавіком, гідрацыкла, паветранага судна з рухавіком, а таксама наўмыснае незаконнае перасячэнне Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь іншым спосабам, учыненае на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такое ж парушэнне, –

караюцца штрафам, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

2. Наўмыснае незаконнае перасячэнне Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь, учыненае асобай, раней судзімай за злачынствы, прадугледжанае гэтым артыкулам, або замежным грамадзянінам, асобай без грамадзянства, дэпартаванымі ці высланымі з Рэспублікі Беларусь,

да заканчэння тэрміну забароны ўезду ў Рэспубліку Беларусь, або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, –

караецца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

3. Наўмыснае незаконнае перасячэнне Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь, учыненае арганізаванай групай, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў са штрафам або без штрафу.

Заўвага. Дзеянне гэтага артыкула не распаўсюджваецца на выпадкі прыбыцця ў Рэспубліку Беларусь з парушэннем правіл перасячэння Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія хадайнічаюць аб даванні статусу ўцекача, дадатковай абароны або прыстанішча ў Рэспубліцы Беларусь, пры ўмове, што яны без прамаруджання звярнуліся з такім хадайніцтвам.

**Артыкул 371[1]. Арганізацыя незаконнай міграцыі**

1. Арганізацыя або кіраўніцтва ці садзейнічанне дзейнасці па незаконным уездзе ў Рэспубліку Беларусь, знаходжанні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, транзітным праездзе (транзіце) праз тэрыторыю Рэспублікі Беларусь або выездзе з Рэспублікі Беларусь замежных грамадзян або асоб без грамадзянства (арганізацыя незаконнай міграцыі) –

караюцца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Арганізацыя незаконнай міграцыі, учыненая спосабам, які ўяўляе небяспеку для жыцця ці здароўя замежных грамадзян або асоб без грамадзянства, або звязаная з жорсткім абыходжаннем ці абыходжаннем, якое зневажае іх годнасць, або ўчыненая паўторна, або групай асоб па папярэдняй змове, або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў са штрафам або без штрафу.

**Артыкул 371[2]. Парушэнне тэрміну забароны ўезду ў Рэспубліку Беларусь**

Знаходжанне ў Рэспубліцы Беларусь замежнага грамадзяніна або асобы без грамадзянства, дэпартаваных ці высланых з Рэспублікі Беларусь, да заканчэння тэрміну забароны ўезду ў Рэспубліку Беларусь пры адсутнасці прыкмет злачынства, прадугледжанага часткай 2 артыкула 371 гэтага Кодэкса, –

караецца штрафам, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года.

**Артыкул 372. Парушэнне правіл аховы ліній сувязі**

Парушэнне правіл аховы ліній сувязі, якое выклікала з-за неасцярожнасці пашкоджанне лініі міжгародняй, гарадской, сельскай сувязі і радыёфікацыі, або пашкоджанне з-за неасцярожнасці збудаванняў сувязі, тэлебачання і радыёвяшчання, якое выклікала перапынак сувязі, тэле- і радыёвяшчання з прычыненнем шкоды ў буйным памеры, –

караюцца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

Заўвага. Буйным памерам шкоды ў гэтым артыкуле прызнаецца памер шкоды на суму, якая ў дзвесце пяцьдзясят і больш разоў перавышае памер базавай велічыні, устаноўлены на дзень учынення злачынства.

**Артыкул 373. Наўмыснае выдаванне дзяржаўнай тайны**

1. Наўмыснае выдаванне звестак, якія з'яўляюцца дзяржаўнай тайнай, асобай, якая мае або мела доступ да гэтых звестак, пры адсутнасці прыкмет здрады дзяржаве або шпіянажу –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала цяжкія наступствы, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 374. Выдаванне дзяржаўнай тайны з-за неасцярожнасці**

1. Выдаванне звестак, якія з’яўляюцца дзяржаўнай тайнай, асобай, якая мае або мела доступ да гэтых звестак, або страта дакументаў ці камп’ютарнай інфармацыі, якія змяшчаюць звесткі, якія з’яўляюцца такой тайнай, або прадметаў, звесткі аб якіх з’яўляюцца такой тайнай, учыненыя з-за неасцярожнасці асобай, якая мае або мела да іх доступ, калі страта з’явілася вынікам парушэння ўстаноўленых правіл абыходжання з указанымі дакументамі, камп’ютарнай інфармацыяй ці прадметамі, –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да аднаго года, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года.

2. Тыя ж дзеянні, якія выклікалі цяжкія наступствы, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 375. Наўмыснае выдаванне службовай тайны**

1. Наўмыснае выдаванне эканамічных, навукова-тэхнічных або іншых звестак, якія з’яўляюцца службовай тайнай, асобай, якая мае або мела доступ да гэтых звестак, пры адсутнасці прыкмет злачынстваў, прадугледжаных артыкуламі 226[1], 254, 255, 356 і 358 гэтага Кодэкса, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала цяжкія наступствы, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 375[1]. Незаконныя збіранне або атрыманне звестак, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі**

1. Незаконныя збіранне або атрыманне звестак, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі Рэспублікі Беларусь, а таксама звестак, якія з’яўляюцца дзяржаўнымі сакрэтамі іншых дзяржаў, перададзеных Рэспубліцы Беларусь у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, з мэтай іх распаўсюджвання пры адсутнасці прыкмет здрады дзяржаве або шпіянажу –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

2. Дзеянні, прадугледжаныя часткай 1 гэтага артыкула, якія ўчынены з выкарыстаннем спецыяльных тэхнічных сродкаў, прызначаных для тайнага атрымання інфармацыі, або якія выклікалі цяжкія наступствы, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 376. Незаконныя выраб, набыццё або збыт сродкаў для тайнага атрымання інфармацыі**

1. Незаконныя выраб ці набыццё ў мэтах збыту або збыт спецыяльных тэхнічных сродкаў, прызначаных для тайнага атрымання інфармацыі, –

караюцца штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна, або групай асоб па папярэдняй змове, або службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да чатырох гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі першай ці другой гэтага артыкула, учыненыя арганізаванай групай, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў.

**Артыкул 377. Раскраданне, знішчэнне, пашкоджанне або скрыванне дакументаў, штампаў, пячатак, раскраданне бланкаў**

1. Раскраданне, знішчэнне, пашкоджанне або скрыванне афіцыйных дакументаў, штампаў, пячатак, учыненыя з карыслівых або іншых асабістых меркаванняў, –

караюцца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тыя ж дзеянні, якія ўчынены ў дачыненні да дакументаў дзяржаўнай часткі Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь, або іншых дакументаў Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь, перададзеных на дзяржаўнае захоўванне, або афіцыйных дакументаў асаблівай важнасці ці выклікалі цяжкія наступствы, а таксама раскраданне штампаў, пячатак ці бланкаў асаблівай важнасці, а таксама паўфабрыкатаў ці матэрыялаў, якія выкарыстоўваюцца для вырабу такіх бланкаў і змяшчаюць элементы абароны ад падробкі, –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 378. Крадзеж або знішчэнне асабістых дакументаў**

Крадзеж у грамадзяніна пашпарта ці іншага важнага асабістага дакумента або наўмыснае знішчэнне чужога пашпарта ці іншага важнага асабістага дакумента –

караюцца грамадскімі працамі, або штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 379. Незаконныя набыццё або збыт афіцыйных дакументаў**

Незаконныя набыццё або збыт афіцыйных дакументаў, якія даюць правы або вызваляюць ад абавязкаў, –

караюцца грамадскімі працамі, або штрафам, або арыштам.

**Артыкул 380. Падробка, выраб, выкарыстанне або збыт падробленых дакументаў, штампаў, пячатак, бланкаў**

1. Падробка пасведчання ці іншага афіцыйнага дакумента, які дае права або вызваляе ад абавязкаў, у мэтах выкарыстання такога дакумента самім выканаўцам або іншай асобай, або збыт такога дакумента, або выраб падробленых штампаў, пячатак, бланкаў у тых жа мэтах, або іх збыт, або выкарыстанне заведама падложнага дакумента –

караюцца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна або групай асоб па папярэдняй змове, –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

**Артыкул 381. Падробка або знішчэнне ідэнтыфікацыйнага нумара транспартнага сродку**

1. Падробка або знішчэнне ідэнтыфікацыйнага нумара, нумара кузава, шасі, рухавіка або падробка рэгістрацыйнага (нумарнога) знака транспартнага сродку ў мэтах эксплуатацыі ці збыту транспартнага сродку, або збыт транспартнага сродку, кузава, шасі або рухавіка з такімі падробкамі –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна або групай асоб па папярэдняй змове, –

караюцца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 382. Самавольнае прысваенне звання або ўлады службовай асобы**

Самавольнае прысваенне звання або ўлады службовай асобы, злучанае з учыненнем на гэтай падставе грамадска небяспечных дзеянняў, якія маюць прыкметы злачынства або адміністрацыйнага правапарушэння, або злучанае з удзелам на гэтай падставе ў перамовах ці іншых сустрэчах з прадстаўнікамі замежных дзяржаў, замежных ці міжнародных арганізацый або ў пасяджэннях міжнародных арганізацый, –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 383. Выключаны**

**Артыкул 384. Прымус да выканання абавязацельстваў**

1. Прымус да выканання дагаворных абавязацельстваў, пакрыцця прычыненай шкоды, выплаты доўгу, штрафу, няўстойкі або пені пад пагрозай прымянення насілля, знішчэння ці пашкоджання маёмасці або распаўсюджвання звестак, здольных прычыніць істотную шкоду правам і законным інтарэсам пацярпелага або яго блізкіх, пры адсутнасці прыкмет вымагання –

караецца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, учыненае паўторна, або з прымяненнем насілля, бяспечнага для жыцця ці здароўя, або групай асоб, –

караецца штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да шасці гадоў.

3. Дзеянне, прадугледжанае часткай 1 гэтага артыкула, учыненае з прымяненнем насілля, небяспечнага для жыцця ці здароўя, або арганізаванай групай, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў.

**Артыкул 385. Выключаны**

**Артыкул 386. Выключаны**

**Артыкул 387. Незаконныя дзеянні ў дачыненні да дзяржаўных узнагарод**

1. Незаконныя набыццё або збыт ордэна, медаля Рэспублікі Беларусь, СССР або БССР, нагруднага знака да ганаровага звання Рэспублікі Беларусь, СССР або БССР, учыненыя на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання за такое ж парушэнне, –

караюцца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да аднаго года.

2. Падробка ў мэтах збыту або збыт падробленага ордэна, медаля Рэспублікі Беларусь, СССР або БССР, нагруднага знака да ганаровага звання Рэспублікі Беларусь, СССР або БССР –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

## ГЛАВА 34
## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ПРАВАСУДДЗЯ

**Артыкул 388. Насілле ў дачыненні да суддзі або народнага засядацеля**

Насілле ў дачыненні да суддзі, народнага засядацеля або іх блізкіх з мэтай перашкаджэння законнай дзейнасці суддзі ці народнага засядацеля або прымусу да змянення характару гэтай дзейнасці або з помсты за ажыццяўленне імі правасуддзя –

караецца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў.

**Артыкул 389. Пагроза ў дачыненні да суддзі або народнага засядацеля**

Пагроза забойствам, насіллем, знішчэннем або пашкоджаннем маёмасці ў дачыненні да суддзі, народнага засядацеля ці іх блізкіх або пагроза распаўсюджваннем паклёпніцкіх ці выдаваннем іншых звестак, якія гэтыя асобы жадаюць захаваць у тайне, учыненая ў сувязі з ажыццяўленнем суддзёй або народным засядацелем правасуддзя, –

караецца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 390. Умяшанне ў вырашэнне судовых спраў або правядзенне папярэдняга расследавання**

Умяшанне службовай асобы з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў у любой форме ў дзейнасць суддзі, народнага засядацеля, пракурора, следчага або асобы, якая праводзіць дазнанне, з мэтай перашкаджэння ўсебаковаму, поўнаму і аб'ектыўнаму разгляду або расследаванню справы або з мэтай дабіцца вынясення незаконнага судовага прыгавору,

рашэння, іншага судовага акта або незаконнай пастановы органа крымінальнага праследавання пры вядзенні па крымінальнай справе –

караецца пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 391. Знявага суддзі або народнага засядацеля**

Знявага суддзі або народнага засядацеля ў сувязі з ажыццяўленнем імі правасуддзя –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў.

**Артыкул 392. Вынясенне заведама неправасудных прыгавору, рашэння або іншага судовага акта**

1. Вынясенне суддзёй (суддзямі) заведама неправасудных прыгавору, рашэння або іншага судовага акта –

караецца пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала цяжкія наступствы, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 393. Прыцягненне ў якасці абвінавачанага заведама невінаватага**

1. Прыцягненне ў якасці абвінавачанага заведама невінаватай асобы –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

2. Тое ж дзеянне, злучанае з абвінавачаннем у цяжкім або асабліва цяжкім злачынстве або са штучным стварэннем доказаў абвінавачання, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго года да пяці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі першай ці другой гэтага артыкула, якія выклікалі цяжкія наступствы, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 394. Прымус да дачы паказанняў**

1. Прымус падазраванага, абвінавачанага, пацярпелага, сведкі да дачы паказанняў або эксперта да дачы заключэння шляхам прымянення пагрозы, шантажу або ўчынення іншых незаконных дзеянняў асобай, якая праводзіць дазнанне, папярэдняе следства або ажыццяўляе правасуддзе, –

караецца пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

2. Тое ж дзеянне, злучанае з насіллем або здзекам, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Дзеянне, прадугледжанае часткай першай гэтага артыкула, злучанае з прымяненнем катавання, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 395. Фальсіфікацыя доказаў**

1. Фальсіфікацыя доказаў па грамадзянскай ці гаспадарчай справе асобай, якая ўдзельнічае ў справе, або яе прадстаўніком –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам.

2. Фальсіфікацыя доказаў па крымінальнай справе асобай, якая праводзіць дазнанне, следчым, пракурорам, суддзёй або абаронцам –

караецца пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

3. Дзеянне, прадугледжанае часткай 2 гэтага артыкула, якое выклікала цяжкія наступствы, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 396. Інсцэніроўка атрымання хабару, незаконнага ўзнагароджання або камерцыйнага подкупу**

Перадача службовай асобе, работніку дзяржаўнага органа або іншай дзяржаўнай арганізацыі, якая не з'яўляецца службовай асобай, або работніку індывідуальнага прадпрымальніка ці юрыдычнай асобы грошай, каштоўных папер, іншай маёмасці або аказанне паслуг маёмаснага характару ў мэтах штучнага стварэння доказаў учынення злачынства ці шантажу –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 397. Заведама незаконныя затрыманне або ўзяцце пад варту**

1. Заведама незаконныя затрыманне або ўзяцце пад варту або ўтрыманне пад вартай –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тыя ж дзеянні, якія выклікалі цяжкія наступствы, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 398. Правядзенне заведама незаконнага вобшуку**

Правядзенне заведама незаконнага вобшуку –

караецца пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 399. Незаконнае вызваленне ад крымінальнай адказнасці**

1. Заведама незаконнае вызваленне ад крымінальнай адказнасці асобы, якая падазраецца або абвінавачваецца ва ўчыненні злачынства, пракурорам, следчым ці асобай, якая праводзіць дазнанне, –

караецца пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

2. Тое ж дзеянне, учыненае ў дачыненні да асобы, якая падазраецца або абвінавачваецца ў цяжкім ці асабліва цяжкім злачынстве, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да шасці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

**Артыкул 400. Заведама лжывы данос**

1. Заведама лжывы данос аб учыненні злачынства –

караецца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, злучанае з абвінавачаннем у цяжкім або асабліва цяжкім злачынстве, або са штучным стварэннем доказаў абвінавачання, або ўчыненае з карыслівых меркаванняў, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 401. Заведама лжывае паказанне**

1. Заведама лжывае паказанне сведкі або пацярпелага, або заведама лжывае заключэнне эксперта, або зроблены перакладчыкам заведама няправільны пераклад у судзе пры разглядзе

крымінальных, грамадзянскіх і эканамічных спраў або пры правядзенні папярэдняга следства ці дазнання –

караюцца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

2. Тыя ж дзеянні, злучаныя з абвінавачаннем у цяжкім або асабліва цяжкім злачынстве або са штучным стварэннем доказаў абвінавачання або ўчыненыя з карыслівых меркаванняў, –

караюцца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 402. Адмова або ўхіленне сведкі ці пацярпелага ад дачы паказанняў або эксперта ці перакладчыка ад выканання ўскладзеных на іх абавязкаў**

Адмова або ўхіленне сведкі ці пацярпелага ад дачы паказанняў або эксперта ці перакладчыка без уважлівых прычын ад выканання ўскладзеных на іх абавязкаў на судовым пасяджэнні пры разглядзе крымінальных, грамадзянскіх і эканамічных спраў або пры правядзенні папярэдняга следства ці дазнання –

караюцца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам.

Заўвага. Асоба не падлягае крымінальнай адказнасці пры адмове або ўхіленні ад дачы паказанняў супраць самога сябе, членаў сваёй сям'і, блізкіх сваякоў.

**Артыкул 403. Перашкаджэнне яўцы сведкі, пацярпелага або дачы імі паказанняў**

Перашкаджэнне яўцы сведкі, пацярпелага ў суд, органы папярэдняга следства ці дазнання або дачы імі паказанняў –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да аднаго года, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 404. Прымус сведкі, пацярпелага або эксперта да адмовы ад дачы паказанняў ці заключэння або да дачы лжывых паказанняў ці заключэння**

Прымус сведкі, пацярпелага або эксперта да адмовы ад дачы паказанняў ці заключэння або да дачы заведама лжывых паказанняў ці заключэння шляхам пагрозы забойствам, насіллем, знішчэннем або пашкоджаннем маёмасці гэтых асоб ці іх блізкіх, распаўсюджваннем паклёпніцкіх або выдаваннем іншых звестак, якія гэтыя асобы жадаюць захаваць у тайне, або подкуп сведкі, пацярпелага ці эксперта з той жа мэтай, або пагроза ўчынення ўказаных вышэй дзеянняў з помсты за раней дадзеныя паказанні або заключэнне –

караюцца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 405. Укрывальніцтва злачынстваў**

1. Загадзя не абяцанае ўкрывальніцтва асобы, якая ўчыніла цяжкае злачынства, або прылад і сродкаў учынення гэтага злачынства, слядоў злачынства або прадметаў, здабытых злачынным шляхам, –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам.

2. Тое ж дзеянне ў дачыненні да асабліва цяжкага злачынства –

караецца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 406. Неданясенне аб злачынстве**

1. Неданясенне аб дакладна вядомым учыненым асабліва цяжкім злачынстве або аб дакладна вядомай асобе, якая ўчыніла гэта злачынства, або аб месцы знаходжання такой асобы –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або арыштам.

2. Неданясенне аб дакладна вядомым рыхтаваным цяжкім або асабліва цяжкім злачынстве –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

Заўвага. Не падлягаюць крымінальнай адказнасці за неданясенне аб злачынстве члены сям'і і блізкія сваякі асобы, якая ўчыніла злачынства, святар, які даведаўся аб злачынстве на споведзі, а таксама абаронца, які даведаўся аб злачынстве падчас выканання сваіх прафесійных абавязкаў.

**Артыкул 407. Выдаванне даных дазнання, папярэдняга следства або закрытага судовага пасяджэння**

Наўмыснае выдаванне даных дазнання, папярэдняга следства або закрытага судовага пасяджэння асобай, папярэджанай ва ўстаноўленым законам парадку аб недапушчальнасці іх выдавання, без дазволу асобы, якая праводзіць дазнанне, следчага, пракурора або суда –

караецца штрафам або арыштам.

**Артыкул 408. Наўмыснае выдаванне звестак аб мерах бяспекі, якія прымяняюцца ў дачыненні да асобы, якая абараняецца**

1. Наўмыснае выдаванне звестак аб мерах бяспекі, што прымяняюцца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі ў дачыненні да асобы, якая абараняецца, учыненае асобай, якой гэтыя звесткі былі давераны або сталі вядомыя ў сувязі з яе службовай дзейнасцю, або іншай асобай, папярэджанай ва ўстаноўленым законам парадку аб недапушчальнасці іх выдавання, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала цяжкія наступствы, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад аднаго года да пяці гадоў.

**Артыкул 409. Незаконныя дзеянні ў дачыненні да апісанай ці арыштаванай маёмасці**

Пашкоджанне, зрасходаванне, скрыванне або адчужэнне (пры адсутнасці прыкмет раскрадання) маёмасці, прызнанай ва ўстаноўленым законам парадку рэчавым доказам, або іншай апісанай ці арыштаванай маёмасці, учыненыя асобай, якой гэта маёмасць была даверана, або ажыццяўленне работнікам банка і (або) нябанкаўскай крэдытна-фінансавай арганізацыі аперацый з грашовымі сродкамі, размешчанымі на рахунках і (або) ва ўклады (дэпазіты), на якія накладзены арышт, –

караюцца штрафам, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 410. Дзеянні, якія дэзарганізуюць працу папраўчай установы, якая выконвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, або арыштнага дома**

1. Дзеянні, якія выявіліся ў тэрарызаванні асуджанага з мэтай перашкаджэння яго выпраўленню або з помсты за выкананне ім грамадскага абавязку, або ў нападзе на прадстаўніка адміністрацыі папраўчай установы, якая выконвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, або арыштнага дома, або ў стварэнні арганізаванай злачыннай групы з мэтай тэрарызавання асуджаных або нападу на прадстаўнікоў адміністрацыі папраўчай установы, якая выконвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, або арыштнага дома, учыненыя асобай, якая адбывае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі або арышту, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя асобай, якая асуджана за цяжкае або асабліва цяжкае злачынства ці дапусціла асабліва небяспечны рэцыдыў, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў.

**Артыкул 411. Злоснае непадпарадкаванне патрабаванням адміністрацыі папраўчай установы, якая выконвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі**

1. Злоснае непадпарадкаванне законным патрабаванням адміністрацыі папраўчай установы, якая выконвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, або іншае процідзеянне адміністрацыі ў ажыццяўленні яе функцый асобай, што адбывае пакаранне ў папраўчай установе, якая выконвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, калі гэта асоба за парушэнне рэжыму адбывання пакарання падвяргалася на працягу года дысцыплінарнаму спагнанню ў выглядзе пераводу ў памяшканне камернага тыпу, спецыялізаваную палату, адзіночную камеру

або пераводзілася ў турму (злоснае непадпарадкаванне патрабаванням адміністрацыі папраўчай установы, якая выконвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі), –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года.

2. Злоснае непадпарадкаванне патрабаванням адміністрацыі папраўчай установы, якая выконвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, учыненае асобай, якая асуджана за цяжкае або асабліва цяжкае злачынства або дапусціла асабліва небяспечны рэцыдыў, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 412. Выключаны**

**Артыкул 413. Уцёкі з папраўчай установы, якая выконвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, арыштнага дома або з-пад варты**

1. Уцёкі з папраўчай установы, якая выконвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, арыштнага дома або з-пад варты, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

2. Тое ж дзеянне, учыненае групай асоб па папярэдняй змове, або з прымяненнем насілля, небяспечнага для жыцця і здароўя, або з пагрозай прымянення такога насілля, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў.

**Артыкул 414. Ухіленне ад адбывання пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі або арышту**

Ухіленне ад адбывання пакарання асобы, якая была асуджана да пазбаўлення волі або арышту і не знаходзіцца пад вартай на момант уступлення прысуду ў законную сілу, або наўмыснае невяртанне асобы, асуджанай да пазбаўлення волі або арышту, якой дазволены кароткатэрміновы выезд за межы папраўчай установы, якая выконвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, або арыштнага дома, або невяртанне асобы, асуджанай да пазбаўлення волі, якой дадзена адтэрміноўка адбывання пакарання, пасля сканчэння тэрміну выезду ці адтэрміноўкі або асобы, асуджанай да пазбаўлення волі, якой дадзена права выхаду за межы выхаваўчай калоніі, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 415. Ухіленне ад адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі**

Ухіленне асуджанага ад адбывання пакарання ў выглядзе абмежавання волі –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

**Артыкул 416. Ухіленне ад адбывання пакарання ў выглядзе папраўчых прац**

Злоснае ўхіленне асуджанага ад адбывання пакарання ў выглядзе папраўчых прац –

караецца арыштам або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 417. Невыкананне прысуду суда аб пазбаўленні права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю**

Ухіленне асуджанага ад выканання прысуду суда аб пазбаўленні права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю –

караецца штрафам або арыштам.

**Артыкул 418. Ухіленне ад выплаты штрафу**

Ухіленне асуджанага ад пакарання ў выглядзе штрафу, прызначанага прысудам суда, пры магчымасці яго заплаціць –

караецца арыштам.

**Артыкул 419. Ухіленне ад адбывання пакарання ў выглядзе грамадскіх прац**

Злоснае ўхіленне асуджанага ад адбывання пакарання ў выглядзе грамадскіх прац –

караецца арыштам.

**Артыкул 420. Перашкаджэнне канфіскацыі маёмасці**

Адчужэнне, скрыванне маёмасці, якая падлягае канфіскацыі, або іншае перашкаджэнне канфіскацыі маёмасці –

караюцца штрафам, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

**Артыкул 421. Невыкананне патрабаванняў прэвентыўнага нагляду**

Невыкананне патрабаванняў прэвентыўнага нагляду без уважлівых прычын, учыненае асобай, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд, якая двойчы на працягу года падвяргалася адміністрацыйнаму спагнанню за такія ж парушэнні, –

караецца арыштам або пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года.

**Артыкул 422. Ухіленне ад прэвентыўнага нагляду**

Непрыбыццё асобы, за якой устаноўлены прэвентыўны нагляд, без уважлівых прычын да выбранага ёй месца жыхарства ва ўстаноўлены тэрмін з дня вызвалення з папраўчай установы ці арыштнага дома або з дня спынення знаходжання ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, а таксама няяўка такой асобы ў той жа тэрмін у орган унутраных спраў для пастаноўкі на ўлік або самавольнае пакіданне месца жыхарства, учыненыя ў мэтах ухілення ад прэвентыўнага нагляду, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 423. Невыкананне прысуду, рашэння або іншага судовага акта**

Невыкананне службовай асобай прысуду, рашэння або іншага судовага акта, якія ўступілі ў законную сілу, або перашкаджэнне іх выкананню –

караюцца штрафам або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

**Артыкул 423[1]. Невыкананне рашэння аб прызнанні арганізацыі, дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка экстрэмісцкімі, аб спыненні дзейнасці прадстаўніцтва замежнай або міжнароднай арганізацыі і (або) прыпыненні іх дзейнасці**

Невыкананне службовай асобай арганізацыі, прадстаўніцтва замежнай або міжнароднай арганізацыі, размешчанага на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, індывідуальным прадпрымальнікам рашэння суда, якое ўступіла ў законную сілу, аб прызнанні арганізацыі экстрэмісцкай, забароне яе дзейнасці, яе ліквідацыі і забароне выкарыстання яе сімволікі і атрыбутыкі, аб спыненні дзейнасці прадстаўніцтва замежнай або міжнароднай арганізацыі, размешчанага на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, прызнанні гэтай замежнай або міжнароднай арганізацыі, зарэгістраванай за межамі Рэспублікі Беларусь, экстрэмісцкай, забароне яе дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, забароне выкарыстання іх сімволікі і атрыбутыкі, аб прызнанні дзейнасці індывідуальнага прадпрымальніка экстрэмісцкай і яе спыненні, забароне выкарыстання яго сімволікі і атрыбутыкі, а таксама невыкананне службовай асобай арганізацыі, прадстаўніцтва замежнай або міжнароднай арганізацыі, размешчанага на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, індывідуальным прадпрымальнікам пастановы аб прыпыненні дзейнасці арганізацыі, прадстаўніцтва замежнай або міжнароднай арганізацыі, размешчанага на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, індывідуальнага прадпрымальніка, вынесенага ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам аб процідзеянні экстрэмізму, –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

## ГЛАВА 35
## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ІНТАРЭСАЎ СЛУЖБЫ

Заўвагі:

1. Службовая асоба, якая выкарыстоўвала свае ўладныя або іншыя службовыя паўнамоцтвы для ўчынення злачынства, не названага ў гэтай главе, нясе адказнасць па сукупнасці злачынстваў. Пры гэтым учыненне такога злачынства прызнаецца істотнай шкодай, прадугледжанай артыкуламі гэтай главы. Правіла аб сукупнасці злачынстваў не прымяняецца, калі ўчыненне службовай асобай злачынства прадугледжана ў якасці прыкметы іншага злачынства.

2. Буйным памерам (шкодай у буйным памеры) у артыкулах гэтай главы прызнаецца памер (шкода) на суму, якая ў дзвесце пяцьдзясят і больш разоў перавышае памер базавай велічыні, устаноўлены на дзень учынення злачынства, асабліва буйным памерам (шкодай у асабліва буйным памеры) – якая ў тысячу і больш разоў перавышае памер базавай велічыні.

3. Не падлягае накіраванню ў даход дзяржавы маёмасць, перададзеная ў якасці хабару або незаконнага ўзнагароджання асобамі:

1) якія апынуліся ў стане крайняй неабходнасці, з прычыны чаго былі дадзены хабар або незаконнае ўзнагароджанне;

2) якія да перадачы прадмета хабару або незаконнага ўзнагароджання добраахвотна паведамілі органам крымінальнага пераследавання аб вымаганні хабару або незаконнага ўзнагароджання і ў далейшым дапамагалі выкрыццю атрымальніка хабару або незаконнага ўзнагароджання.

4. Злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 430, 431 і 432 гэтага Кодэкса, прызнаюцца ўчыненымі паўторна, калі ім папярэднічала ўчыненне любога з пералічаных злачынстваў.

**Артыкул 424. Злоўжыванне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі**

1. Выключана.

2. Наўмыснае насуперак інтарэсам службы ўчыненне службовай асобай з карыслівай або іншай асабістай зацікаўленасці дзеянняў з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, якое выклікала прычыненне шкоды ў буйным памеры або істотнай шкоды правам і законным інтарэсам грамадзян або дзяржаўным ці грамадскім інтарэсам (злоўжыванне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі), –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да шасці гадоў са штрафам або без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткай 2 гэтага артыкула, якія ўчынены службовай асобай, якая займае адказнае становішча, або пры ажыццяўленні функцый па раздзяржаўленні ці прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці, або выклікалі цяжкія наступствы, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў са штрафам або без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

**Артыкул 425. Бяздзейнасць службовай асобы**

1. Выключана.

2. Наўмыснае насуперак інтарэсам службы невыкананне службовай асобай з карыслівай або іншай асабістай зацікаўленасці дзеянняў, якія яна павінна была і магла зрабіць паводле ўскладзеных на яе службовых абавязкаў, якое злучана з патураннем злачынству або выклікала невыкананне паказчыкаў, дасягненне якіх з'яўлялася ўмовай аказання дзяржаўнай падтрымкі, або прычыненне шкоды ў буйным памеры ці істотнай шкоды правам і законным інтарэсам грамадзян або дзяржаўным ці грамадскім інтарэсам (бяздзейнасць службовай асобы), –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю са штрафам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў са штрафам або без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткай 2 гэтага артыкула, якія ўчынены службовай асобай, якая займае адказнае становішча, або выклікалі  цяжкія наступствы, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў са штрафам або без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

**Артыкул 426. Перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў**

1. Наўмыснае ўчыненне службовай асобай дзеянняў, якія яўна выходзяць за межы праў і паўнамоцтваў, дадзеных ёй па службе, якое выклікала шкоду ў буйным памеры або істотную шкоду правам і законным інтарэсам грамадзян або дзяржаўным ці грамадскім інтарэсам (перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў), –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю са штрафам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

2. Перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў, учыненае з карыслівай або іншай асабістай зацікаўленасці, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да шасці гадоў са штрафам або без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, якія ўчынены асобай, якая займае адказнае становішча, або выклікалі цяжкія наступствы, а таксама наўмыснае ўчыненне службовай асобай дзеянняў, якія яўна выходзяць за межы праў і паўнамоцтваў, дадзеных ёй па службе, злучанае з насіллем, катаваннем пацярпелага або прымяненнем зброі ці спецыяльных сродкаў, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў са штрафам або без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

**Артыкул 427. Службовы падлог**

1. Унясенне службовай або іншай упаўнаважанай асобай заведама лжывых звестак і запісаў у афіцыйныя дакументы, або падробка дакументаў, або складанне і выдача заведама фальшывых дакументаў, учыненыя з карыслівай або іншай асабістай зацікаўленасці, пры адсутнасці прыкмет больш цяжкага злачынства –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або абмежаваннем волі на той жа тэрмін, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя з мэтай скажэння даных дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці, –

караюцца пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю са штрафам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

**Артыкул 428. Службовая халатнасць**

1. Невыкананне або неналежнае выкананне службовай асобай сваіх службовых абавязкаў з прычыны нядобрасумленнага або нядбайнага стаўлення да службы, якое выклікала з-за неасцярожнасці прычыненне шкоды дзяржаўнай маёмасці ў асабліва буйным памеры, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін ад двух да пяці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

2. Тыя ж дзеянні, якія выклікалі з-за неасцярожнасці смерць чалавека або іншыя цяжкія наступствы, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін ад трох да пяці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да шасці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

**Артыкул 429. Незаконны ўдзел у прадпрымальніцкай дзейнасці**

Заснаванне службовай асобай, якая знаходзіцца на дзяржаўнай службе, арганізацыі, якая ажыццяўляе прадпрымальніцкую дзейнасць, або ўдзел яе ў кіраванні такой арганізацыяй асабіста або праз іншую асобу насуперак забароне, устаноўленай законам, калі службовая асоба, выкарыстоўваючы свае службовыя паўнамоцтвы, дала такой арганізацыі льготы і перавагі ці пратэжыравала ў іншай форме, –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю са штрафам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў са штрафам або без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

**Артыкул 430. Атрыманне хабару**

1. Прыняцце службовай асобай для сябе або для блізкіх матэрыяльных каштоўнасцей або набыццё выгад маёмаснага характару, якія даюцца выключна ў сувязі са службовым становішчам, якое яна займае, за пратэжыраванне або патуранне па службе, спрыяльнае вырашэнне пытанняў, што ўваходзяць у яе кампетэнцыю, або за выкананне ці невыкананне ў інтарэсах асобы, якая дае хабар, або асоб, якіх яна прадстаўляе, якога-небудзь дзеяння, якое гэта асоба павінна была або магла зрабіць з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў (атрыманне хабару), –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін ад трох да пяці гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або пазбаўленнем волі на тэрмін

да сямі гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

2. Атрыманне хабару паўторна, або шляхам вымагання, або групай асоб па папярэдняй змове, або ў буйным памеры –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі першай ці другой гэтага артыкула, учыненыя асобай, раней судзімай за злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 430, 431 і 432 гэтага Кодэкса, або ў асабліва буйным памеры, або арганізаванай групай, або асобай, якая займае адказнае становішча, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да пятнаццаці гадоў са штрафам і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

**Артыкул 431. Дача хабару**

1. Дача хабару –

караецца штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў са штрафам або без штрафу, або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў са штрафам або без штрафу.

2. Дача хабару паўторна, або ў буйным памеры, або з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў са штрафам або без штрафу або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў са штрафам або без штрафу.

3. Дача хабару ў асабліва буйным памеры або асобай, раней судзімай за злачынствы, прадугледжаныя гэтым артыкулам, артыкуламі 430 і 432 гэтага Кодэкса, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці гадоў са штрафам або без штрафу.

Заўвага. Асоба, якая дала хабар, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці, калі ў дачыненні да яе мела месца вымаганне хабару або калі гэта асоба пасля дачы хабару добраахвотна заявіла аб учыненым і актыўна дапамагала раскрыццю і (або) расследаванню злачынства.

**Артыкул 432. Пасрэдніцтва ў хабарніцтве**

1. Непасрэдная перадача хабару па даручэнні хабарадавальніка або хабарніка (пасрэдніцтва ў хабарніцтве) –

караецца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох гадоў.

2. Пасрэдніцтва ў хабарніцтве, учыненае паўторна, або з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, або пры атрыманні хабару ў буйным памеры, –

караецца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да шасці гадоў.

3. Пасрэдніцтва ў хабарніцтве, учыненае асобай, раней судзімай за злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 430, 431 і 432 гэтага Кодэкса, або пры атрыманні хабару ў асабліва буйным памеры –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў са штрафам або без штрафу.

Заўвага. Вінаваты ў пасрэдніцтве ў хабарніцтве або саўдзельнік у дачы або атрыманні хабару вызваляецца ад крымінальнай адказнасці, калі ён пасля ўчынення злачынных дзеянняў добраахвотна заявіў аб учыненым і актыўна дапамагаў раскрыццю і (або) расследаванню злачынства.

**Артыкул 433. Незаконнае ўзнагароджанне**

1. Прыняцце работнікам дзяржаўнага органа або іншай дзяржаўнай арганізацыі, які не з'яўляецца службовай асобай, маёмасці або іншай выгады маёмаснага характару, дадзеных яму за ўчыненае ў межах яго службовых паўнамоцтваў (працоўных абавязкаў) дзеянне (бяздзейнасць) на карысць асобы, якая дае такую маёмасць або іншую выгаду маёмаснага характару, або за выкананую працу, якая ўваходзіць у кола яго службовых (працоўных)

абавязкаў, апрача прадугледжанай заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аплаты працы (прыняцце незаконнага ўзнагароджання) або даванне такога ўзнагароджання –

караюцца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або папраўчымі працамі на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў са штрафам або без штрафу, або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў са штрафам або без штрафу.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя паўторна, або групай асоб па папярэдняй змове, або ў буйным памеры, а таксама прыняцце незаконнага ўзнагароджання, учыненае шляхам вымагання, –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў са штрафам або без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў са штрафам або без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя ў асабліва буйным памеры, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да васьмі гадоў са штрафам або без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

Заўвага. Асоба, якая дала ўзнагароджанне, вызваляецца ад крымінальнай адказнасці, калі ў дачыненні да яе мела месца вымаганне такога ўзнагароджання або калі гэта асоба пасля давання ўзнагароджання добраахвотна заявіла аб учыненым і актыўна дапамагала раскрыццю і (або) расследаванню злачынства.

## РАЗДЗЕЛ XIV
## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ПАРАДКУ ВЫКАНАННЯ ВОІНСКАГА АБАВЯЗКУ, НАКІРАВАННЯ І ПРАХОДЖАННЯ АЛЬТЭРНАТЫЎНАЙ СЛУЖБЫ

### ГЛАВА 36
### ЗЛАЧЫНСТВЫ ПРЫЗЫЎНІКОЎ, РЭЗЕРВІСТАЎ І ВАЕННААБАВЯЗАНЫХ

**Артыкул 434. Ухіленне ад мерапрыемстваў па прызыве на ваенную службу па мабілізацыі**

Ухіленне ад мерапрыемстваў па прызыве на ваенную службу па мабілізацыі –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў.

**Артыкул 435. Ухіленне ад мерапрыемстваў па прызыве на воінскую службу**

1. Ухіленне ад мерапрыемстваў па прызыве на воінскую службу –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Ухіленне ад мерапрыемстваў па прызыве на воінскую службу, учыненае шляхам наўмыснага прычынення сабе цялеснага пашкоджання, або сімуляцыі захворвання, або падлогу дакументаў ці іншага падману, –

караецца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

Заўвага. Прызыўнік, рэзервіст або ваеннаабавязаны, якія ўпершыню ўчынілі дзеянні, прадугледжаныя часткай 1 гэтага артыкула, часткай 1 артыкула 436, артыкулам 437 гэтага Кодэкса, могуць быць вызвалены ад крымінальнай адказнасці, калі ўчыненае было следствам збегу цяжкіх абставін.

**Артыкул 436. Ухіленне рэзервіста або ваеннаабавязанага ад яўкі на зборы (заняткі)**

1. Ухіленне рэзервіста або ваеннаабавязанага ад яўкі на зборы (заняткі) –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да аднаго года, або арыштам.

2. Ухіленне рэзервіста або ваеннаабавязанага ад яўкі на зборы (заняткі), учыненае шляхам наўмыснага прычынення сабе цялеснага пашкоджання, або сімуляцыі захворвання, або падлогу дакументаў ці іншага падману, –

караецца штрафам, або арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 437. Ухіленне прызыўніка або ваеннаабавязанага ад воінскага ўліку**

Ухіленне прызыўніка або ваеннаабавязанага ад воінскага ўліку –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або арыштам.

## ГЛАВА 37
## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ВОІНСКАЙ СЛУЖБЫ

Заўвагі:

1. Злачынствамі супраць воінскай службы прызнаюцца прадугледжаныя гэтай главой злачынствы супраць устаноўленага парадку праходжання воінскай службы, учыненыя асобамі, на якія распаўсюджваецца статус ваеннаслужачага.

2. Асобы, не згаданыя ў частцы першай гэтых заўваг, нясуць адказнасць за саўдзел ва ўчыненні злачынстваў супраць воінскай службы ў якасці арганізатараў, падбухоршчыкаў і саўдзельнікаў.

3. Не з'яўляецца злачынствам дзеянне, прадугледжанае гэтым Кодэксам, але ўчыненае дзеля выканання загаду начальніка, аддадзенага па службе. Адказнасць за наступствы выканання загаду нясе начальнік, які аддаў загад. За ўчыненне злачынства па заведама злачынным загадзе начальніка падначалены падлягае адказнасці на агульных падставах. Пры гэтым выкананне загаду можа быць прызнана абставінамі, якія змякчаюць адказнасць. За невыкананне заведама злачыннага загаду падначалены не нясе адказнасці.

4. Выключана.

5. Буйным памерам шкоды ў артыкулах гэтай главы прызнаецца памер шкоды на суму, якая ў дзвесце пяцьдзясят і больш разоў перавышае памер базавай велічыні, устаноўлены на дзень учынення злачынства, асабліва буйным – якая ў тысячу і больш разоў перавышае памер базавай велічыні.

**Артыкул 438. Непадпарадкаванне**

1. Адкрытая адмова ад выканання загаду начальніка або іншае наўмыснае невыкананне загаду (непадпарадкаванне), за выключэннем выпадкаў, калі падначалены адмовіўся выканаць заведама злачынны загад, –

караюцца абмежаваннем па ваеннай службе на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

2. Непадпарадкаванне, якое ўчынена групай асоб, або ў ваенны час ці ў баявым становішчы, або выклікала цяжкія наступствы, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да сямі гадоў.

**Артыкул 439. Невыкананне загаду**

1. Невыкананне загаду начальніка, учыненае з-за нядбайнасці або легкадумнасці, –

караецца абмежаваннем па ваеннай службе на тэрмін да аднаго года, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала цяжкія наступствы, –

караецца абмежаваннем па ваеннай службе на тэрмін да двух гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

**Артыкул 440. Супраціўленне начальніку або прымус яго да парушэння службовых абавязкаў**

1. Супраціўленне начальніку або іншай асобе, якая выконвае ўскладзеныя на яе абавязкі па воінскай службе, або прымус іх да парушэння гэтых абавязкаў –

караюцца абмежаваннем па ваеннай службе на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў.

2. Тыя ж дзеянні, якія ўчынены групай асоб, або з прымяненнем зброі, або ў ваенны час або баявым становішчы, або выклікалі цяжкія наступствы, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да дванаццаці гадоў.

**Артыкул 441. Гвалтоўныя дзеянні ў дачыненні да начальніка**

1. Гвалтоўныя дзеянні ў дачыненні да начальніка ў сувязі з выкананнем ім абавязкаў па воінскай службе –

караюцца абмежаваннем па ваеннай службе на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў.

2. Тыя ж дзеянні, якія ўчынены групай асоб, або з прымяненнем зброі, або ў ваенны час або ў баявым становішчы, або выклікалі цяжкія наступствы, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да дванаццаці гадоў.

**Артыкул 442. Пагроза начальніку**

Пагроза начальніку забойствам, прычыненнем цялесных пашкоджанняў, знішчэннем або пашкоджаннем маёмасці ў сувязі з выкананнем ім абавязкаў па воінскай службе, калі меліся падставы асцерагацца яе ажыццяўлення, –

караецца штрафам, або абмежаваннем па ваеннай службе на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

**Артыкул 443. Парушэнне статутных правіл узаемаадносін паміж асобамі, на якіх распаўсюджваецца статус ваеннаслужачага, пры адсутнасці адносін падпарадкаванасці**

1. Насілле, здзек з асобы, на якую распаўсюджваецца статус ваеннаслужачага, або жорсткае абыходжанне з ім, або прымусовае выкарыстанне асобы, на якую распаўсюджваецца статус ваеннаслужачага, у асабістых інтарэсах, або вымаганне ці адабранне ў яе прадметаў ваеннага забеспячэння, учыненыя асобай, на якую распаўсюджваецца статус ваеннаслужачага, якая не знаходзіцца ў адносінах падпарадкаванасці з пацярпелым, –

караюцца арыштам або пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох гадоў.

2. Тыя ж дзеянні, якія ўчынены паўторна, або з-за расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці або звады, палітычнай або ідэалагічнай варожасці, а таксама з-за варожасці або звады ў дачыненні да якой-небудзь сацыяльнай групы, або ў дачыненні да некалькіх асоб, або групай асоб, або выклікалі прычыненне пацярпеламу менш цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караюцца арыштам, або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, якія ўучынены з прымяненнем зброі або выклікалі цяжкія наступствы, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дванаццаці гадоў.

**Артыкул 444. Знявага падначаленым начальніка або начальнікам падначаленага**

Знявага падначаленым начальніка або начальнікам падначаленага, учыненая ў сувязі з выкананнем імі абавязкаў воінскай службы, –

караецца абмежаваннем па ваеннай службе на тэрмін да аднаго года або арыштам.

**Артыкул 445. Самавольнае пакіданне часці або месца службы**

1. Самавольнае пакіданне часці або месца службы ваеннаслужачым тэрміновай ваеннай службы, рэзервістам пры знаходжанні на занятках ці навучальных зборах, ваеннаабавязаным, які праходзіць ваенныя ці спецыяльныя зборы, з ліку радавога і сяржанцкага складу, або няяўка яго ў тэрмін без уважлівых прычын пры звальненні з часці, пры прызначэнні, пераводзе, з камандзіроўкі, водпуску або арганізацыі аховы здароўя працягласцю большай за двое сутак, але не большай за дзесяць сутак, або ўхіленне ад воінскай службы на той жа тэрмін шляхам падлогу дакументаў ці іншага падману –

караюцца арыштам.

2. Самавольнае пакіданне часці або месца службы асобай, на якую распаўсюджваецца статус ваеннаслужачага, або няяўка яе ў тэрмін на службу без уважлівых прычын працягласцю большай за дзесяць сутак, але не большай за месяц, або ўхіленне ад воінскай службы на той жа тэрмін шляхам падлогу дакументаў ці іншага падману –

караюцца абмежаваннем па ваеннай службе на тэрмін да двух гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, калі самавольная адсутнасць працягвалася больш за месяц, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў.

4. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1, 2 ці 3 гэтага артыкула, учыненыя ў ваенны час, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дзесяці гадоў.

Заўвага. Асоба, на якую распаўсюджваецца статус ваеннаслужачага, якая ўпершыню ўчыніла дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1, 2 ці 3 гэтага артыкула і часткай 1 артыкула 446 гэтага Кодэкса, можа быць вызвалена ад крымінальнай адказнасці, калі ўчыненае было следствам збегу цяжкіх абставін.

**Артыкул 446. Дэзерцірства**

1. Самавольнае пакіданне часці або месца службы з мэтай зусім ухіліцца ад воінскай службы або няяўка з той жа мэтай на службу пры прызначэнні, пераводзе, з камандзіроўкі, водпуску або арганізацыі аховы здароўя (дэзерцірства) –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў.

2. Дэзерцірства, учыненае ў ваенны час або ў баявым становішчы, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да пятнаццаці гадоў.

**Артыкул 447. Ухіленне ад воінскай службы шляхам самакалецтва або іншым спосабам**

1. Ухіленне асобы, на якую распаўсюджваецца статус ваеннаслужачага, ад нясення абавязкаў воінскай службы шляхам наўмыснага прычынення сабе цялеснага пашкоджання (самакалецтва) ці сімуляцыі захворвання або адмова ад нясення абавязкаў воінскай службы –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да шасці гадоў.

2. Тыя ж дзеянні, учыненыя ў ваенны час або ў баявым становішчы, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад васьмі да пятнаццаці гадоў.

**Артыкул 448. Самавольнае пакіданне месца службы ў баявым становішчы**

Самавольнае пакіданне часці або месца службы ў баявым становішчы незалежна ад працягласці –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў.

**Артыкул 449. Самавольнае пакіданне поля бою або адмова дзейнічаць зброяй**

Самавольнае пакіданне поля бою або адмова падчас бою дзейнічаць зброяй –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад дзесяці да пятнаццаці гадоў.

**Артыкул 450. Парушэнне правіл нясення баявога дзяжурства**

1. Парушэнне правіл нясення баявога дзяжурства (баявой службы) –

караецца абмежаваннем па ваеннай службе на тэрмін да двух гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала цяжкія наступствы, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі першай ці другой гэтага артыкула, учыненыя ў ваенны час або ў баявым становішчы, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да пятнаццаці гадоў.

**Артыкул 451. Парушэнне правіл нясення вартавой службы**

1. Парушэнне правіл нясення каравульнай службы –

караецца абмежаваннем па ваеннай службе на тэрмін да аднаго года або арыштам.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала наступствы, для папярэджання якіх прызначана дадзеная варта, –

караецца абмежаваннем па ваеннай службе на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя ў ваенны час або ў баявым становішчы, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да пятнаццаці гадоў.

**Артыкул 452. Выключаны**

**Артыкул 453. Парушэнне правіл нясення памежнай службы або ажыццяўлення памежнага кантролю**

1. Парушэнне правіл нясення памежнай службы або ажыццяўлення памежнага кантролю асобай, якая ўваходзіць у склад нарада па ахове Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь, якое выклікала наступствы, для папярэджання якіх прызначаны дадзены нарад, –

караецца абмежаваннем па ваеннай службе на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала цяжкія наступствы, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў.

**Артыкул 454. Парушэнне правіл нясення ўнутранай службы**

Парушэнне правіл нясення ўнутранай службы асобай, якая ўваходзіць у сутачны нарад часці (акрамя варты), якое выклікала наступствы, для папярэджання якіх прызначаны дадзены нарад, –

караецца абмежаваннем па ваеннай службе на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 455. Злоўжыванне ўладай, бяздзейнасць улады або перавышэнне ўлады**

1. Злоўжыванне начальніка або службовай асобы ўладай або службовымі паўнамоцтвамі, бяздзейнасць улады, учыненыя з карыслівай або іншай асабістай зацікаўленасці, перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў, якія выклікалі прычыненне шкоды ў буйным памеры або істотнай шкоды правам і законным інтарэсам грамадзян або дзяржаўным ці грамадскім інтарэсам, –

караюцца абмежаваннем па ваеннай службе на тэрмін да двух гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да шасці гадоў са штрафам або без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

2. Дзеянні, прадугледжаныя часткай 1 гэтага артыкула, якія выклікалі цяжкія наступствы, а таксама перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў, звязанае з насіллем, катаваннем пацярпелага або прымяненнем зброі ці спецыяльных сродкаў, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да дзесяці гадоў са штрафам або без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя ў ваенны час або ў баявым становішчы, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад пяці да дванаццаці гадоў са штрафам або без штрафу і з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

**Артыкул 456. Халатныя адносіны да службы**

1. Невыкананне або неналежнае выкананне начальнікам або іншай службовай асобай сваіх абавязкаў з прычыны нядобрасумленных ці нядбайных адносін да службы (халатныя адносіны да службы), якія выклікалі прычыненне шкоды ў асабліва буйным памеры, –

караюцца абмежаваннем па ваеннай службе на тэрмін да двух гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

2. Халатныя адносіны да службы, якія выклікалі смерць чалавека або іншыя цяжкія наступствы, –

караюцца абмежаваннем па ваеннай службе на тэрмін да двух гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да шасці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі 1 ці 2 гэтага артыкула, учыненыя ў ваенны час або ў баявым становішчы, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад трох да сямі гадоў.

**Артыкул 457. Выключаны**

**Артыкул 458. Выключаны**

**Артыкул 459. Наўмысныя знішчэнне або пашкоджанне ваеннай маёмасці**

1. Наўмысныя знішчэнне або пашкоджанне зброі, боепрыпасаў, ваеннай тэхнікі або іншай ваеннай маёмасці –

караюцца штрафам або пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

2. Тыя ж дзеянні, якія выклікалі цяжкія наступствы або былі ўчынены ў ваенны час або ў баявым становішчы, –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да дзесяці гадоў.

**Артыкул 460. Выключаны**

**Артыкул 461. Знішчэнне або пашкоджанне ваеннай маёмасці з-за неасцярожнасці**

Знішчэнне або пашкоджанне зброі, боепрыпасаў, ваеннай тэхнікі або іншай ваеннай маёмасці, якія ўчынены з-за неасцярожнасці і выклікалі цяжкія наступствы, –

караюцца штрафам, або абмежаваннем па ваеннай службе на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў.

**Артыкул 462. Страта ваеннай маёмасці**

Страта зброі, боепрыпасаў, ваеннай тэхнікі, а таксама іншай ваеннай маёмасці ў буйным памеры, давераных для службовага карыстання, –

караецца штрафам, або абмежаваннем па ваеннай службе на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

**Артыкул 463. Парушэнне правіл абыходжання са зброяй, матэрыяламі, рэчывамі і прадметамі, якія ўяўляюць павышаную небяспеку для навакольных**

1. Парушэнне правіл абыходжання са зброяй, боепрыпасамі, радыеактыўнымі матэрыяламі, выбуховымі і іншымі рэчывамі і прадметамі, якія ўяўляюць павышаную небяспеку для навакольных, якое выклікала прычыненне з-за неасцярожнасці цяжкага ці менш цяжкага цялеснага пашкоджання або шкоды ў асабліва буйным памеры, –

караецца арыштам або пазбаўленнем волі на тэрмін да чатырох гадоў.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека або іншыя цяжкія наступствы, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў.

3. Дзеянне, прадугледжанае часткай 1 гэтага артыкула, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць дзвюх або больш асоб, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў.

**Артыкул 464. Парушэнне правіл ваджэння або эксплуатацыі машын**

1. Парушэнне правіл ваджэння або эксплуатацыі баявой, спецыяльнай ці транспартнай машыны, якое выклікала з-за неасцярожнасці прычыненне менш цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караецца штрафам, або пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю, або абмежаваннем па ваеннай службе на тэрмін да двух гадоў, або арыштам, або пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў.

2. Тое ж дзеянне, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека або прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання, –

караецца абмежаваннем па ваеннай службе на тэрмін да двух гадоў або пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

3. Дзеянне, прадугледжанае часткай 1 гэтага артыкула, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць дзвюх або больш асоб, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю або без пазбаўлення.

**Артыкул 465. Парушэнне правіл палётаў або падрыхтоўкі да іх**

1. Парушэнне правіл палётаў або падрыхтоўкі да іх або іншых правіл эксплуатацыі ваенных лятальных апаратаў, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць чалавека або іншыя цяжкія наступствы, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да пяці гадоў.

2. Дзеянне, прадугледжанае часткай першай гэтага артыкула, якое выклікала з-за неасцярожнасці смерць дзвюх або больш асоб, –

караецца пазбаўленнем волі на тэрмін ад двух да сямі гадоў.

## ГЛАВА 38
## ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ПАРАДКУ НАКІРАВАННЯ І ПРАХОДЖАННЯ АЛЬТЭРНАТЫЎНАЙ СЛУЖБЫ

Заўвага. Асоба, якая ўчыніла прадугледжанае гэтай главой дзеянне, якое не ўяўляе вялікай грамадскай небяспекі, пры змякчальных абставінах можа быць вызвалена ад крымінальнай адказнасці.

**Артыкул 465[1]. Няяўка грамадзяніна, у дачыненні да якога прынята рашэнне аб замене воінскай службы на альтэрнатыўную службу, у орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне**

Няяўка грамадзяніна, у дачыненні да якога прынята рашэнне аб замене воінскай службы на альтэрнатыўную службу, без уважлівых прычын у орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы свайго жыхарства ў тэрмін, указаны ў накіраванні ваеннага камісарыята (адасобленага падраздзялення ваеннага камісарыята), –

караецца грамадскімі працамі, або штрафам, або папраўчымі працамі на тэрмін да аднаго года.

**Артыкул 465[2]. Ухіленне грамадзяніна ад праходжання альтэрнатыўнай службы**

1. Ухіленне грамадзяніна ад праходжання альтэрнатыўнай службы шляхам невыканання або неналежнага выканання абавязкаў альтэрнатыўнай службы або невыканання абмежаванняў, звязаных з праходжаннем альтэрнатыўнай службы, якое выклікала ў перыяд праходжання альтэрнатыўнай службы накладанне трох вымоў, не пагашаных ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку, або няяўка яго без уважлівых прычын да месца праходжання альтэрнатыўнай службы, у тым ліку пры пераводзе ў іншую арганізацыю або прыбыцці з водпуску, на тэрмін больш за трое сутак, але не больш за месяц, або ўхіленне ад праходжання альтэрнатыўнай службы на той жа тэрмін шляхам падлогу дакументаў ці іншага падману –

караюцца арыштам.

2. Няяўка грамадзяніна без уважлівых прычын да месца праходжання альтэрнатыўнай службы, у тым ліку пры пераводзе ў іншую арганізацыю або прыбыцці з водпуску, на тэрмін больш за месяц, або ўхіленне яго ад праходжання альтэрнатыўнай службы на той жа тэрмін шляхам падлогу дакументаў ці іншага падману –

караюцца абмежаваннем волі на тэрмін да пяці гадоў або пазбаўленнем волі на той жа тэрмін.

3. Самавольнае пакіданне грамадзянінам месца праходжання альтэрнатыўнай службы з мэтай зусім ухіліцца ад яе праходжання, а таксама ўхіленне яго ад праходжання альтэрнатыўнай службы шляхам наўмыснага прычынення сабе цялеснага пашкоджання (самакалецтва) або сімуляцыі захворвання –

караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да шасці гадоў.

## РАЗДЗЕЛ XV
## ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 466. Увядзенне ў дзеянне гэтага Кодэкса**

Гэты Кодэкс уводзіцца ў дзеянне спецыяльным законам.

| | |
|---|---|
| **Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь** | **А. Лукашэнка** |